**Радзім Гарэцкі**

# Вечна жыве Беларусь!

**Артыкулы, інтэрв'ю, замалёўкі**

Мінск, "Беларускі кнігазбор»", 2003

УДК 882.6-8
ББК 84 (4 Беи) 6
Г 21

**Гарэцкі Р.**
Г 21 Вечна жыве Беларусь!: Артыкулы, інтэрв'ю, замалёўкі / Радзім Гарэцкі. — Мн.: «Беларускі кнігазбор», 2003. — 144 с.
ISBN 985-6730-28-7.

У кнізе сабраны артыкулы, выступленні, інтэрв'ю акадэміка Р. Г. Гарэцкага за апошнія пяць гадоў. Некаторыя матэрыялы друкуюцца ўпершыню. У іх — роздум пра дзяржаўнасць, незалежнасць, дэмакратыю, нацыянальнае адраджэнне Беларусі, становішча беларускай мовы, развіццё культуры, навукі, адукацыі, успаміны і нарысы пра дзеячаў навукі, а таксама абразкі і кароткія мініяцюры розных гадоў.

**УДК 882.6-8**
**ББК 84 (4 Беи) 6**

Аўтар выказвае шчырую падзяку
**МГА «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына»**
і **МГА «Беларускі кнігазбор»**
за спрыянне пры падрыхтоўцы кнігі

**ISBN 985-6730-28-7**

© Гарэцкі Р., 2003

# ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ, НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ, ДЭМАКРАТЫЯ, АДРАДЖЭННЕ

## І ЎСЁ Ж МЫ РУХАЕМСЯ*

Ён не прызнае некампетэнтнасці, бо ўпэўнены, што ўсё ў гэтым жыцці трымаецца на прафесіяналізме і сумленнасці. Ён верыць у будучае Беларусі, і гэтая вера дае яму сілы і натхненне, абараняе ад спакусы не жыць, а існаваць. Ён ганарыцца сваім радаводам, адстойвае нацыянальнае, любіць вандроўкі і апантана займаецца навукай. Амерыканскі біяграфічны інстытут прысвоіў яму ганаровае званне «Чалавек года 1997», Міжнародны біяграфічны цэнтр Кембрыджа надаў ганаровае званне «Міжнародны чалавек года 1997 — 1998» і ўключыў у спіс «Выдатныя людзі XX стагоддзя». Акадэмік Радзім Гарэцкі — аўтар тэктанічных карт Еўразіі і Беларусі, кнігі «Ахвярую сваім «я» (Максім і Гаўрыла Гарэцкія)», прэзідэнт Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына».

**Яўген Рагін.** Радзім Гаўрылавіч, наколькі я ведаю, тэктоніка — частка геалогіі і, у адпаведнасці з энцыклапедыяй, вывучае структуру зямной кары, яе дэфармацыі, звязаныя з планетарным развіццём.

**Радзім Гарэцкі.** Усё так. Адна з выключна важных для нас навук. Таму і здзіўляюся, чаму такі прымітыўны падыход у людзей да геалогіі. Вось біялогію ў школе вывучаюць, фізікай займаюцца, а геалогіяй па невядомых прычынах грэбуюць. А гэта ж гісторыя нашай Зямлі, на якой мы жывём, кахаем і працуем! Аказваецца, не ведаем гэтай гісторыі зусім. Пераважная большасць беларусаў перакanana, што краіна наша бедная ды голая. Элементарнае ігнараванне геалогіі! А Беларусь між тым уваходзіць у першую дзесятку краін Еўропы — па асаблівасцях тэрыторыі, па свайму этнасу, па наяўнасці карысных выкапняў і іншых паказчыках. Так што ўсё ў беларуса ёсць для самапавагі, незалежнасці ды руху наперад...

**Я. Р.** Дарэчы, наконт руху. Бадай адзінае, што ведаю з тэктонікі, дык тое, што вычытаў у дзяцінстве з часопіса «Техника молодежи»: існуюць у гэтай навуцы гіпотэзы «мабілізму» і «фіксізму». У адпаведнасці з першай — мацерыкі паступова рухаюцца па гарызанталі. Паводле другой — зафіксаваны на месцы, з цягам часу мяняюць памеры толькі па вертыкалі. А вы прыхільнік якой з дзвюх плыняў?

**Р. Г.** Да гаворкі, я бачу, падрыхтаваліся... Так, праблема (дый увогуле яе гісторыя) даволі цікавая. Я б сказаў, нават паказальная

---

* Літ. і мастацтва. 1999. 31 снеж. Гутарка з Я. Рагіным.

для ўсяго развіцця колішняй савецкай навукі... Першым на пачатку стагоддзя загаварыў пра мабілізм зямной кары амерыканскі геафізік Тэйлар. Больш дасканала распрацаваў ідэю немец Вагенар. Маўляў, на паверхні існуе больш трывалая корка Зямлі, а глыбей — больш вадкая. Таму мацерыкі на працягу стагоддзяў і сходзяцца-разыходзяцца, нібыта вясновыя крыгі на рацэ. Рух для нас амаль незаўважны (скажам, некалькі сантыметраў у год), але ўсё ж такі рух... Ну і як, вы думаеце, паставілася савецкае чынавенства ад навукі да гэтай тэорыі? Усё правільна, успрыняла ўштыкі! Як, зрэшты, і кібернетыку з генетыкай. Ці ж магла таталітарная дзяржава, безнадзейна хворая на ленінізм са сталінізмам, пазбавіцца палітычнай манаполіі на навуковую думку?! Таталітарызм заўжды сляпы ў сваёй бязглуздай ваяўнічасці. Нават у 60-х адстойваўся толькі фіксізм. Хто быў супраць — лічыўся амаль ці не шкоднікам і праціўнікам савецкага ладу. Але амерыканцы ў гэты час настойліва вялі марскія даследаванні акіянічнага рэльефу, рабілі свідравіны дна, ладзілі навуковыя міжнародныя праекты. У 68-м канадскія, амерыканскія, французскія и англійскія даследчыкі прыйшлі да высновы: кантыненты рухаюцца! Узнікла тэорыя так званага неамабілізму, тэорыя тэктонікі літасферных пліт... Вось так і робяцца «рэвалюцыі» ў навуцы. Натуральна, палітыка на яе ўплывае заўжды, але здаровы сэнс (няхай і праз пэўны час) пастаянна перамагае! Так што я за мабілізм. Але ж не забываюся ніколі і на словы Сакрата: «Я ведаю толькі тое, што нічога не ведаю». Унавуцы няма нічога канчатковага. Яна развіваецца не па лінейных законах. Так што сярод маіх калег і прыхільнікі фіксізму ёсць. Прырода — рэч размаітая, а навука — спрадвечны пошук ісціны...

**Я. Р.** Але што б там ні было, а верыць хочацца менавіта вам — усё ж на месцы не топчамся, рухаемся. Вось толькі ў якім кірунку?

**Р. Г.** А геалогія з вызначэннем накірунку не дапаможа! Адказ на пытанне хутчэй у галіне духу ці маралі шукаць трэба. І самасвядомасць маю на ўвазе, і нацыянальную годнасць, і святую веру ў Адраджэнне...

**Я. Р.** Ды ўражанне такое, што колькі ні існуе Беларусь, столькі і адраджаецца...

**Р. Г.** Чаму ўражанне, даражэнькі?! Так яно і ёсць насамрэч. Ды не было б на карце месца для Беларусі, каб не меў народ здольнасці супрацьстаяць злу ды адраджацца з попелу і крыві. Нас мэтанакіравана і бязлітасна знішчаюць якое ўжо стагоддзе, але, дзякаваць Богу, заўжды існавалі, існуюць і будуць існаваць сілы (няхай і невялікія), якія адстойваюць беларушчыну. У нас ёсць што адраджаць і ёсць каму гэтым займацца. Натуральна, хацелася б на ўласныя вочы паглядзець, якой жа яна будзе — вольная ды сапраўды незалежная Беларусь. Але не забывайце: мацерыкі і кантыненты зрушваюцца на сантыметр-два ў год.

**Я. Р.** Месца Беларусі на тэктанічнай карце Еўропы вызначана. Акалі б вам, Радзім Гаўрылавіч, давялося складаць іншую, умоўную карту нейкай сусветнай дабрыні ці спрадвечнага зла, якое месца тады заняла б на ёй наша Бацькаўшчына?

**Р. Г.** Ну, тут праблем ніякіх. Шмат краін пабачыў за сваё жыццё. І ў Амерыцы быў, і ў Афрыцы. Няма ў свеце людзей дабрэйшых за бе-

ларусаў. Так што на ўсіх картах адзначыў бы нашу радзіму як выспу надзвычайнай дабрыні. Але вось які парадокс: там, дзе дабрыня красуе, заўжды непадалёк і зло блытаецца, падман, хлусня ды зайздрасць... Вось такія не зусім навуковыя і не вельмі суцяшальныя назіранні.

**Я. Р.** Давайце пакуль адкінем убок пытанні філасофскія і пагаворым пра рэчы самыя што ні ёсць канкрэтныя... Наколькі бацька, Гаўрыла Іванавіч, паўдзейнічаў на ваш выбар у прафесіі?

**Р. Г.** Ды самым прамым чынам паўздзейнічаў! Дый не толькі ў прафесіі, але і ў жыцці. Як і для дзядзькі Максіма, для бацькі лёс Беларусі быў уласным болем, уласнай бядою. Вучыўся ён у Пятроўскай (Ціміразеўскай) сельскагаспадарчай акадэміі. Пад уплывам Максіма ўжо тады адстойваў наша, беларускае. Артыкулы супраць кадэцкіх русіфікатарскіх думак падпісваў «Сын маці-Беларусі». Быў знаёмы з Купалам, Лёсікам, Ракам-Міхайлоўскім. Кіраваў Асацыяцыяй беларускіх студэнтаў. Менавіта за прагу да беларушчыны пражыў пад кляймом «вораг народа» больш за 25 год... У 27-м бацька пераязджае ў Мінск, узначальвае Навукова-даследчы інстытут сельскай і лясной гаспадаркі. Вельмі шмат працуе. Займаецца сельскагаспадарчай навукай, эканамічнай геаграфіяй Беларусі. «Беларусы перажываюць працэс асіміляцыі выключнай моцы, які ставіць іх на ўзровень да найбольш «некультурных» нацыянальнасцяў СССР, што стаяць на грані ўжо фізічнага змяншэння і вымірання»,— піша ён у 29-м на старонках «Полымя». А ў 30-м маладога акадэміка арыштоўваюць па так званай справе Працоўнай сялянскай партыі, Максіма Гарэцкага — па справе «Саюза вызвалення Беларусі». Бацьку асудзілі да расстрэлу, які замянілі на 10 гадоў лагераў. Ён трапіў на будаўніцтва Беламорска-Балтыйскага канала, з агранома перакваліфікаваўся ў геолага... У 1934 годзе абодва браты былі вызвалены, але ў 1937 годзе зноў арыштаваны. Як вы ведаеце, Максіма Іванавіча ў пачатку 38-га расстралялі. Бацька таксама атрымаў прысуд да расстрэлу, але ўсё ж быў ненадоўга вызвалены, а з 38-га па 39-ты ён зноў у сталінскай турме... Пасля вайны абараняе ў Маскве доктарскую, а пасля поўнай рэабілітацыі, у канцы 60-х, вяртаецца на Беларусь, дзе яго адначаўляюць у званні акадэміка, але ўжо не па эканоміцы, а па геалогіі... Бацька для мяне — прыклад стойкасці і нязломнасці духу, прыклад свядомага беларуса, барацьбіта за нацыянальнае і сумленнага высокапрафесійнага навукоўца. Гэта ён захаваў для мяне маю Беларусь, навучыў змагацца са злом, любіць і паважаць народ, яго мову... Я ж за час сваіх экспедыцый ледзьве не ва ўсіх куточках радзімы пабываў. А ў час летніх адпачынкаў з жонкай і дачкой на чоўне па Бярэзіне, Нёмане, Дзвіне і іншых рэчках вандравалі. Сустракаліся з людзьмі, пераконваліся з радасцю кожны раз — які ж прыхільны, ласкавы і адкрыты ў сваёй дабрыні беларус!

**Я. Р.** А як пачынаўся ваш шлях у навуку?

**Р. Г.** У Мінску толькі нарадзіўся. А вучыўся ў больш чым 10 школах розных месц Расіі, у Маскве скончыў нафтавы інстытут, працаваў пасля ў Геалагічным інстытуце АН СССР. А з канца 71-га — загадчык аддзела геатэктонікі Інстытута геахіміі і геафізікі Акадэміі навук БССР. На той час навукоўцы ў Маскву рваліся, а я — у Мінск. Вар'ятам мяне

ўсе лічылі... Потым дырэктарстваваў у гэтым інстытуце, віцэ-прэзідэнтам быў... І справа не ў бацькавай пратэкцыі. Ягоная заслуга адзіная і бясконца важная: ён навучыў мяне не «казаться, а быть». Наўмысна перадаю сэнс гэтага дэвіза па-руску, бо беларускамоўны варыянт — выйгрышны ўдвая: «Не здавацца, а быць!» Вось такая шматзначнасць і двухсэнсоўнасць мне даспадобы. І хто там кажа пра абмежаванасць беларускай мовы?

**Я. Р.** Дарэчы, аграном, а потым геолаг Гаўрыла Гарэцкі, наколькі я ведаю, быў сааўтарам пісьменніка Максіма Гарэцкага ў стварэнні руска-беларускага слоўніка?

**Р. Г.** Так. У 1918 годзе ў Смаленску яны падрыхтавалі і выдалі руска-беларускі слоўнік, які бацька вазіў у мінскую кнігарню да Алеся Гаруна...

**Я. Р.** Як спалучалася ў адным чалавеку такая шматграннасць прыхільнасцяў і інтарэсаў?

**Р. Г.** Думаю, тлумачыцца ўсё толькі адным: палымянай любоўю да ўсяго беларускага: слова, думкі, палітыкі. Не ўяўляю без гэтай любові ні дзядзькі, ні бацькі. Такая скіраванасць у спалучэнні з магутнасцю духу, сэрца і розуму закладзена была, відаць, з дзяцінства. Ад непаўторнай прыроды беларускай ўсё йшло, ад песень і казак, якія чулі Гарэцкія ў роднай Багацькаўцы ад маці і цёткі Хрысцёны. Максім занатоўваў тэксты гэтых песень. У свой час нават кніжка выйшла, дзе змешчана больш за 300 песень Ефрасінні Міхайлаўны Гарэцкай... Бацька стаў навукоўцам, усё жыццё самаўдасканальваў свой прафесійны ўзровень, але ў душы заставаўся гэткім шчырым лірыкам, як, дарэчы, і любы вясковага паходжання інтэлігент... Дзядзьку і бацьку хвалявала ўсё, што адбывалася ў маладой Беларусі. Бацьку, напрыклад, надта турбавала беларусізацыя нашага тэатра. Ад імя праўлення Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі ён вітаў Акадэмічную канферэнцыю па рэформе беларускага правапісу і азбукі, з радасцю адзначаў пры гэтым, што «каля 75 працэнтаў асістэнцкага складу Акадэміі і 50 працэнтаў навуковых супрацоўнікаў пераходзяць на родную мову». Дый увогуле ён не стамляўся паўтараць, што Беларусі патрэбна *свая* інтэлігенцыя. Скажыце, калі ласка, ці ж згубілі на сёння актуальнасць гэтыя словы?!

**Я. Р.** І хацеў бы запярэчыць, ды няма як... У адным з апошніх нумароў «ЛіМа» Леанід Маракоў дае поўныя спісы рэпрэсаваных у 37-м беларускіх пісьменнікаў. Здавалася б, хрэстаматыйныя звесткі, але калі ў адзіноце перачытваеш безліч прозвішчаў, за якімі столькі нязбыўнага ў жыцці, каханні і творчасці, — холад па спіне. «З дзвюх тысяч рэпрэсаваных у СССР літаратараў — каля 20 працэнтаў прыходзіцца на Беларусь». Вынішчалася сумленне Беларусі, а выдаткі такой «дзяржаўнай палітыкі» адчуваюцца і па сёння... А хтосьці з сучасных гісторыкаў апраўдвае сталінізм. Кожны зарабляе свой кавалак хлеба па-свойму. Іяк гэта ўсё, супярэчлівае і дзікае, спалучаецца ў межах беларускага жыцця-быцця?

**Р. Г.** Так і спалучаецца. Дабро і зло спрадвеку ходзяць поруч... Трэба не здавацца, верыць у лепшае, адстойваць сваё, пакрысе адбу-

доўваць у беларускай душы тое, што калісьці пашанотна называлася інтэлігентнасцю.

**Я. Р.** Мы зноў пра Адраджэнне. Якой жа, на ваш погляд, павінна быць гэтая самая «свая інтэлігенцыя»?

**Р. Г.** Такой, каб услед за Максімам Гарэцкім свядома сцвердзіла і засвоіла як уласнае: «Ахвярую сваім «я» ва ймя святога ўсім нам Адраджэння!»... Проста асобным з нас на сёння хранічна не хапае элементарнага чалавечага сумлення. Амаль усіх апанаваў страх. Страх згубіць працу, заробак, «добрае імя», высокую пасаду. А рух нацыі, як вядома, вызначаецца духоўнымі высілкамі інтэлігенцыі. Ці ж варта лічыць інтэлігентамі тых, хто апусціў сарамліва галаву, не хоча заўважаць, які непрафісіяналізм пануе наўкола, хто не здольны на мужчынскі ўчынак, на адстойванне элементарнага права бачыць уласных дзяцей шчаслівымі і вольна жыць у вольнай ды незалежнай краіне. Ідэі ленінізму буяюць на Беларусі: упарта будуецца бальшавізм, сутнасць якога я б растлумачыў прымусовай культывацыяй таталітарызму, а значыць, насаджэннем страху... А народ наш беларускі не забіты і не абыякавы. Ён проста стаміўся ад хлусні і адсутнасці здаровага сэнсу ва ўсім. Ён хоча вынікова працаваць, каб паважаць сябе, але ніхто яму не дае для гэтага ніякіх магчымасцяў. І калі я чую з афіцыйна-дзяржаўных трыбун: «Працаваць трэба лепей, каб жыць заможна», то проста вар'яцею ад чынавенскай бязглуздасці. Куды ўжо лепей працаваць таму калгасніку ці рабочаму. Мо час уладам урэшце навучыцца па-людску дзяржавай кіраваць?! Дык не! Не кіруюць, а камандуюць ды палохаюць...

**Я. Р.** Радзім Гаўрылавіч, пераканананасць вашых жыццёвых поглядаў добра адчуваецца і ў кнізе «Ахвярую сваім «я». Жанр яе бліжэй да мемуарнага?

**Р. Г.** Я б вызначыў яго так: дакументальная аповесць — споведзь аб самых блізкіх мне людзях. Я вельмі задаволены, што змог сказаць праўду. Пра сапраўдныя прычыны смерці Максіма Іванавіча, напрыклад. Бацька ж так і не ведаў пры жыцці, што брата расстралялі. Афіцыйна сцвярджалася, што ён памёр ад кровазліцця ў мозг. Бацька вельмі любіў старэйшага брата...

**Я. Р.** І не было паміж імі ніякага, нават творчага саперніцтва?

**Р. Г.** Ніякага! Жылі адным, змагаліся за адно. Еднасць гэтая зноўтакі з дзяцінства. Сям'я ж вялікая была. Самы старэйшы брат Іван гаспадаркай займаўся. Для таго каб Максім вывучыцца змог. Следам па ўзросту за Іванам ды Максімам Парфір ішоў. Таксама на гаспадарцы завіхаўся, каб і ў Гаўрылы была магчымасць вучыцца. Вось такім сялянскім «канвеерам» і ішло жыццё. Дзядзька з бацькам заўжды адчувалі на сабе цяжар гэтай адказнасці, ведалі, за кошт каго выйшлі ў людзі, і давер гэты апраўдалі спаўна. Без узаемавыручкі і падтрымкі ці ж сталі б Гарэцкія Гарэцкімі! Натуральны шлях вясковай беларускай інтэлігенцыі.

**Я. Р.** «Беларускай літаратуры суджана сказаць многае новае ў вобласці духу», — пісаў Максім Гарэцкі. Што, як вы думаеце, укладвалася ў гэтыя словы?

**Р. Г.** Марыў, відаць, каб «беларускія Дастаеўскія і Гогалі» стварылі прозу сапраўднага еўрапейскага ўзроўню. У нас заўжды, як мне думаецца, была вельмі магутная паэзія. Багдановіч, Купала, Дубоўка... Гарэцкі хацеў, каб кніга беларускай прозы была «не ценейшая» за купалаўскія паэтычныя зборнікі. І сам у гэтым стараўся паказаць прыклад. Лічу, што ягоны твор «На імперыялістычнай вайне» — жывы і праўдзівы. Праўда гэтая патыхае пахам крыві, сырой акопнай зямлі, смерці. Вельмі моцная гуманістычная рэч. Чалавек у любых, нават самых безвыходных абставінах імкнецца застацца чалавекам. Гэта вельмі па-беларуску, у межах нашай, калі так можна казаць, нацыянальнай духоўнасці. І дзякаваць Богу, што пасля прыйшлі Чорны, Мележ, Брыль, Адамовіч, Быкаў. Прыйшлі, каб застацца назаўжды...

**Я. Р.** Гаўрыла Гарэцкі гаварыў калісьці, што «факт дзяржаўнага будаўніцтва Савецкай Беларусі павінен быць падмацаваны і іншымі фактамі — утварэннем навуковай беларускай мовы, самастойнай беларускай навукі. Толькі тады будзе цалкам запоўнена гістарычная гама будаўніцтва беларускай культуры...» Вяртаючыся ў дзень сённяшні, давайце, Радзім Гаўрылавіч, паразважаем пра стан спраў у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Ці з'яўляецца зараз наша акадэмія сапраўды нацыянальнай?

**Р. Г.** Ці ж можна тут даваць сцвярджальны адказ, калі нават яе прэзідэнт Вайтовіч скрозь размаўляе па-руску?! Прыкрываецца дзяржаўным двухмоўем ці не ведае роднага слова? Ды не! Аляксандр Пятровіч цудоўна валодае беларускай мовай. Проста палітыка зараз такая: нацыянальнае ў адзін бок крочыць, дзяржаўнае — у адваротны рухаецца. Знаёмая і ганебная справа! А ў беларусаў жа такая неад'емная спрадвеку рыса: пана-начальніка паважаць ды слухацца. Вось калі ён па-беларуску распачне, тады ўжо і астатнія, простыя і падначаленыя, не разгубяцца... Здавалася б, акадэмікі — людзі незалежныя ды паважаныя. Дык не — туды ж! Баяцца беларусамі сябе адчуць! Таму і амаль не пачуеш у акадэмічных аўдыторыях ды калідорах роднага слова. Больш таго, за гісторыю нацыянальную ўзяліся. У адпаведным інстытуце акадэміі кіраўніцтва памянялі. Мне Касцюка, напрыклад, вельмі шкада. Спецыяліст сур'ёзны! А палітыка ў дадзеным выпадку вельмі зразумелая: чалавек, які сваё мінулае ведае, — заўжды за будучыню змагаецца, ніякага страху ў яго, ніякага чынашанавання і паслухмянасці. Дык навошта ўладам такія праблемы! У кожнага свае святыні... Ці вось яшчэ дзівосы. Як і раней, акадэмікам і членам-карэспандэнтам выплачваюць штомесячныя грашовыя надбаўкі за навуковае званне. Па новаму загаду Прэзідэнта РБ, спіс прэтэндэнтаў пасля зацвярджэння ў аддзяленнях акадэміі і ў яе прэзідыуме на самым высокім дзяржаўным узроўні канчаткова зацвярджаецца. Не атрымалі гэтыя грошы летась ні Карпенка, ні Шушкевіч, ні Ціхіня, ні Міхайлаў. Што сёлета будзе — невядома. Вось такі палітычны падыход да нашай навукі. А той Шушкевіч, хоць і былы Старшыня Вярхоўнага Савета, а атрымлівае зараз ганебна мізэрную пенсію...

**Я. Р.** Дзесьці напрадвесні ў Маскве прайшоў Першы з'езд беларусаў Расіі, удзельнікі якога абмяркоўвалі хваравіты стан дзяржаўнай палітыкі

ў дачыненні да ўсяго нацыянальнага на этнічнай радзіме. Прыкладна ў той жа час адбыўся і так званы альтэрнатыўны з'езд «рускіх» беларусаў, якія быццам падтрымлівалі такую палітыку. Супрацьстаянне дзяржаўнага і нацыянальнага працягваецца і за межамі Бацькаўшчыны. Вы ўзначальваеце Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына», а таму чытачу «ЛІМа» цікава пачуць ваша меркаванне наконт спроб падзяліць беларускія дыяспары на «свае» і «чужыя».

**Р. Г.** «Бацькаўшчына» — арганізацыя культурна-асветніцкая, не палітычная. Але захаванне нацыянальнай культуры, навукі, роднай мовы, з'яднанне людзей свету беларускага паходжання на глебе адраджэння беларушчыны — гэта ва ўмовах сучаснай Беларусі ўжо палітыка, а значыць, рэч амаль незаконная. Горка і крыўдна! І з'езд у Маскве быў «двайным», і «Бацькаўшчына», ходзяць чуткі, будзе заменена праз час альтэрнатыўнай арганізацыяй. Адзінае, што магу паўтарыць: здаровы сэнс, будзем спадзявацца, пераможа.

**Я. Р.** Радзім Гаўрылавіч, вас часта падманвалі ў жыцці?

**Р. Г.** Шкада, але так. Даверлівы я вельмі. І тут у мяне адзіны прынцып: калі хто падмануў, здрадзіў — спраў з ім стараюся не мець.

**Я. Р.** Пра што марылі ў дзяцінстве, пра што марыце зараз?

**Р. Г.** Заўжды хацеў адчуваць нармальны ход жыцця. Жыць і радавацца, карацей. Не марыць, не зайздросціць, а рабіць. Адразу, мэтанакіравана і настойліва, не пачынаючы новага жыцця з чарговага панядзелка. Каб не было сорамна, каб не шкадаваць, што не паспеў. Не паспеў збегаць ранкам па грыбы, усхваляваццa ўдзень ад прачытанай кнігі, а ўвечары — ад цёплай і шчырай гаворкі з мілым чалавекам. Так што мар няма, толькі канкрэтныя мэты: паспець скончыць кнігу ўспамінаў пра бацьку да стагоддзя з дня ягонага нараджэння (выходзіць кніга ў выдавецтве «Тэхналогія»), хачу апублікаваць таксама бацькавы агульнаграмадскія творы па беларусізацыі, праблемах Адраджэння, дэмаграфіі. Шмат і ўласнай навуковай працы па геалогіі.

**Я. Р.** Радзім Гаўрылавіч, шмат гаворак пра цэнтр Еўропы, ледзве не кожны беларускі раённы цэнтр прэтэндуе на яго блізкае местазнаходжанне.

**Р. Г.** Ну, тут, здаецца, праблем ніякіх. Калі гаварыць пра кантынентальную сухапутную Еўропу (без уліку астравоў), то цэнтр яе акурат у раёне вёскі Чыжаха паблізу рэчкі Бярэзіна.

**Я. Р.** І калі прагназаваць неамабілісцкую тэорыю руху і канчатковага з'яднання мацерыкоў, то ўсе яны...

**Р. Г.** Хочаце сказаць: «згуртуюцца» ўрэшце вакол Беларусі? Будзем вельмі на гэта спадзявацца!

**Я. Р.** Вялікі дзякуй за гутарку, Радзім Гаўрылавіч. Шчасця і здароўя вам і вашай сям'і ў новым годзе!

## БЕЛАРУСЬ — БАГАТАЯ ЕЎРАПЕЙСКАЯ КРАІНА*

Мэта Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» — культурна-асветніцкай арганізацыі: аб'яднанне ўсіх самасвядомых шчырых беларусаў на аснове нацыянальнай беларускай ідэі, якая накіроўвае на стварэнне моцнай суверэннай дэмакратычнай дзяржавы Беларусь шляхам інтэгральнага адраджэння мовы, культуры, адукацыі, эканомікі. Паколькі галоўныя напрамкі дзейнасці нашага згуртавання і Кангрэса дэмакратычных сілаў у асноўным супадаюць, пастольку мне асабліва прыемна вітаць усіў удзельнікаў кангрэса з гэтай выдатнай падзеяй у жыцці беларускага народа і пажадаць усім плённай працы, добрага настрою і разумных канструктыўных думак.

Мне заўсёды вельмі прыкра чуць, калі многія кіраўнікі нашай краіны (нават самага высокага рангу) гавораць аб тым, што Беларусь — зусім маленечкая, такая бедная на прыродныя рэсурсы, што самастойна пражыць яна не можа. Таму неабходна хутчэйшае аб'яднанне з магутнай Расіяй, а яшчэ лепш — усіх славянскіх дзяржаў (праўда, пад гэтым чамусьці разумеюць толькі тры — Расію, Украіну і Беларусь, а забываюць, што такіх дзяржаў значна больш, а ў нашых трох і асабліва ў Расіі жывуць мільёны неславянскіх народаў). З гонарам падкрэсліваецца, што галоўная мэта аб'яднання з Расіяй — адзіная дзяржава, але (каб супакоіць многіх беларусаў) — з поўным захаваннем суверэнітэту Беларусі. Хіба гэта не абсурдная, зусім алагічная ідэя: адзіная дзяржава і поўны суверэнітэт? Як такое можа быць? Гэта падобна на тое, калі б акула праглынула рыбку, а тая, ледзь жывая, плаваючы ў страўніку акулы, крычала: «Вось як я здорава аб'ядналася, цяпер я ў поўнай небяспецы, мне не патрэбна ежа, а я поўнасцю самастойная».

Калі па многіх паказчыках (тэрыторыя, насельніцтва, прыродныя рэсурсы, рабочыя і інтэлектуальныя сілы і г. д.) параўнаць Беларусь з іншымі больш чым сарака краінамі Еўропы, дык наша краіна ўваходзіць ці ў першую дзясятку, ці ў першую палову. У Беларусі знаходзіцца трэцяе па запасах не толькі ў Еўропе, але і ва ўсім свеце радовішча калійных і каменных солей. Экспарт калійных солей прыносіць краіне больш валюты, чым продаж трактароў і аўтамабіляў разам узятых. Большасць краін Еўропы не могуць пахваліцца такім пералікам карысных выкапняў, як у нас, — гэта нафта і гаручыя сланцы, вугалі і торф, даўсаніт (алюмініевая і содавая сыравіна), мінеральныя і пітныя воды, мінералізаваныя рассолы (вадкая руда для атрымання ёду, брому, калія, ліція, стронцыя і інш.), жалезныя руды, фасфарыты, сапрапелі, даламіты, цэаліты, гіпс і ангідрыт, рэдкія зямельныя элементы, золата і серабро, бурштын, цэментная сыравіна, вытворчыя многіх будаўнічых матэрыялаў і інш. Японія, напрыклад, не мае і сотай часткі такіх выкапняў.

Вялізнае багацце Беларусі — землі з даволі ўрадлівымі глебамі, лугамі, прыдатнымі для вытворчасці прадуктаў земляробства і жывёлага-

* Выступленне на Кангрэсе дэмакратычных сілаў 2 ліп. 2000 г.

доўлі не менш, чым у Даніі ці Нідэрландах. Толькі для гэтага патрэбны не калгасы са старшынямі шклоўскага тыпу, а хаця б акцыянерныя таварыствы старавойтаўскага тыпу, а яшчэ лепш — нармальныя фермерскія гаспадаркі сучаснага еўрапейскага тыпу.

Шматлікія і разнастайныя лясы Беларусі з іх травянымі, грыбнымі і жывёльнымі кампанентамі; цудоўныя краявіды, азёры і рэчкі — гэта не толькі гаспадарчая, але і велізарная турыстычная сфера. Тут мы можам нават спаборнічаць з Балгарыяй, якая амаль трэць бюджэту зарабляе на турыстах. Да гэтага трэба далучыць нашы старажытныя гістарычныя аб'екты: замкі і палацы, касцёлы і цэрквы, размаітыя помнікі прыроды.

Лес, трасніковая і рапсавая біямасы, рэкі і азёры, сонейка і вецер, выкарыстанне змены ціску ў нафта- і газаправодах і інш. — добрыя нетрадыцыйныя крыніцы атрымання энергіі.

Геаграфічнае месцазнаходжанне ў цэнтры Еўропы дазваляе выкарыстоўваць транзіт розных транспартных сродкаў, нафты і газа для значнага павелічэння бюджэту краіны.

Галоўнае багацце Беларусі — працавіты беларускі народ: выдатныя работнікі сельскай гаспадаркі, высокакваліфікаваны рабочы клас, вялікі навукова-тэхнічны патэнцыял, цудоўныя майстры фальклору, народных промыслаў, мастацтва і г. д.

Я думаю, што ні ў каго не засталося сумнення: Беларусь — багатая краіна. Вось толькі давесці такую багатую краіну да сучаснага жабрацтва (тут мы па многіх паказчыках амаль на апошніх месцах нават сярод краін СНД) — гэта трэба мець надзвычайныя адмоўныя якасці ў яе кіраванні. А зрабіць з міралюбівай талерантнай дзяржавы пугала Еўропы — гэта проста ганьба!

Мэтай дэмакратычных сілаў павінна быць стварэнне самастойнай дэмакратычнай дзяржавы Беларусь, якая разам з усімі іншымі краінамі свету і ў першую чаргу са сваімі суседзямі — Расіяй, Украінай, Польшчай, краінамі Балтыі — будуе нацыянальна свядомае грамадства, у якім незалежна ад веравызнання і нацыянальнасцяў багата, спакойна жывуць людзі, працуюць над паляпшэннем экалагічнага стану, развіццём культуры, адукацыі, навукі, эканомікі. Жыве Беларусь!

## МІНЕРАЛЬНЫЯ РЭСУРСЫ БЕЛАРУСІ*

### ГЕАЛАГІЧНАЯ БУДОВА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Уся тэрыторыя нашай краіны належыць да Усходне-Еўрапейскай старажытнай платформы (кратона) — найбольш устойлівых літасферных пліт (буйных блокаў літасферы Зямлі). Кратон складаецца з крышталічных парод фундамента (гнейсы, гранітагнейсы, амфібаліты, сланцы і інш. узростам ад 1,6 да 3,5 млрд. гадоў) і адкладаў платформавага чахла (пяскі, пясчанікі, гліны, мергелі, солі і інш. узростам ад 1,6 млрд. гадоў

* Полымя. 1999. № 12.

да сучасных). Крышталічны фундамент залягае на розных глыбінях: у кар'ерах Мікашэвічы і Глушкавічы ён выходзіць на паверхню зямлі, на вялікіх абшарах Міншчыны і часткова Гродзеншчыны распаўсюджаны неглыбока — да 500 м (тут знаходзіцца Беларуская антэкліза), каля Брэста апушчаны на 1—1,5 км (Брэсцкая ўпадзіна), каля Магілёва, Віцебска і Оршы — на 1,2—1,7 км (Аршанская ўпадзіна), а на поўдні Беларусі — галоўным чынам Гомельшчына, часткова поўдзень Міншчыны і ўсход Брэстчыны — аж на 3—4 і нават да 5—6 км (Прыпяцкі прагін). З пародамі крышталічнага фундамента звязаны свой набор карысных выкапняў, з асадкавымі адкладамі — іншы. Таму там, дзе фундамент выходзіць на паверхню зямлі ці залягае неглыбока, рацыянальна шукаць мінеральныя ўтварэнні, якія знаходзяцца ў пародах фундамента, і наадварот, там, дзе ён пахаваны магутнымі асадкавымі адкладамі — выкапні, звязаныя з апошнімі.

Гісторыя геалагічнага развіцця тэрыторыі Беларусі вельмі складаная і разнастайная: тут былі вулканы і землятрусы, невялікія горы і лававыя плато, раўнінная суша і мора з рознай глыбінёй і салёнасцю (у тым ліку глыбокія — да 700 м тыпу сучаснага Чырвонага мора), буйныя азёры і рэкі, пакроўныя ледавікі і густыя трапічныя лясы і г. д.

Кожная геалагічная эпоха пакінула пасля сябе своеасаблівыя пароды з характэрнымі для іх карыснымі выкапнямі. Найбольш малады (ад 1,5 млн. гадоў таму да сучаснасці) так званы чацвярцічны (ці антрапагенавы) перыяд характэрны некалькімі пакроўнымі (мацерыковымі) абледзяненнямі, якія пакінулі ледавіковыя вельмі стракатыя па складу і магутнасці (таўшчыне) адклады (пяскі, гліны, супесі, жвір, валуны і інш.). Яны пакрылі тоўстым (да 100—300 м) слоем усю тэрыторыю краіны і пахавалі пад сабой больш старажытныя пароды, якія толькі ў некаторых месцах выходзяць на зямную паверхню па берагах рэк, у кар'ерах, у гляцыядыслакацыях (пароды, якія выціснуў, выараў ці адарваў ледавік пры сваім руху).

## ЯКІЯ КАРЫСНЫЯ ВЫКАПНІ ВЯДОМЫ ДАЎНО

У сувязі з тым, што ледавіковыя адклады чацвярцічнага перыяду пакрываюць амаль усю тэрыторыю Беларусі, тут аж да пачатку пасляваенных гадоў былі вядомыя галоўным чынам тыя карысныя выкапні, якія звязаны з гэтымі найбольш маладымі геалагічнымі ўтварэннямі. Да іх перш-наперш належыць *торф*, здабыча якога ў Беларусі вядзецца здаўна, а ў савецкі час дасягала 50% ад усесаюзнай вытворчасці. Першасныя тарфяныя рэсурсы ацэньваліся ў 5,7 млрд. т, адкрыта больш за 9 тыс. радовішчаў. Здабыта ўжо больш за 1 млрд. т торфу. Цяпер засталося прамысловых запасаў толькі 588 млн. т. Пры сучасным узроўні здабычы іх хопіць прыблізна на 35 гадоў. Таму торф як паліва рацыянальна захаваць для выкарыстання ў бытавым сектары і больш эфектыўна спажываць у сельскай гаспадарцы (падсцілка, угнаенні і інш.), а таксама хімічнай, медычнай прамысловасці (лекі, шампунь, новыя матэрыялы і інш.).

З балотамі Беларусі звязаны жалезістыя адклады — *бурыя жалезнякі*, якія раней выкарыстоўвалі як жалезныя руды. Але яны маюць толькі гістарычнае значэнне і далі назвы некаторым населеным пунктам (Рудня, Рудзенск і інш.).

Нетры Беларусі багатыя featурознымі *будаўнічымі матэрыяламі* (пяскі, жвір, гліны, мел, мергель), вядомымі з даўніны. Важнае значэнне маюць радовішчы *мергельна-мелавых парод* — сыравінная база цэментнай прамысловасці (ПА «Валкавыскцэментшыфер», «Крычэўцэментшыфер», Беларускі цэментны завод у Магілёўскай вобл.). Разведана 15 радовішчаў з агульнымі запасамі 831 млн. т. Распрацоўваюцца з іх 8. Гадавая здабыча больш за 4 млн. т. Разам з мергельна-мелавымі пародамі сустракаецца *крэмень*, які залягае сярод іх у выглядзе жаўлакоў, сцяжэнняў, канкрэцый самых мудрагелістых формаў (шары, яйкі, палачкі, звярушкі, птушкі і г. д.). Пра іх многа пісалася ў прэсе як пра выдатную сыравіну для ачысткі вады, медычных мэтаў і г.д. Але канчаткова пытанне засталося адкрытым. Запасы яго досыць вялікія — пакуль таксама дасканала яшчэ не падлічаныя. Для вытворчасці будаўнічай і тэхналагічнай вапны эксплуатуюцца радовішчы *мела* (іх разведана 32 з агульным запасам 137 млн. т). Гадавая здабыча каля 1,5 млн. т.

Вядомы два радовішчы *шкляных пяскоў*: Лоеўскае ў Гомельскай вобласці і Гароднае ў Брэсцкай (запасы 15 млн. т). Гэтых пяскоў не хапае, і таму іх часткова прывозяць з Украіны і Расіі. Разведана 80 радовішчаў *будаўнічых і сілікатных пяскоў* (агульныя запасы 348 млн. м$^3$), з іх эксплуатуюцца 40 з гадавой здабычай каля 8 млн. м$^3$.

*Фармовачныя пяскі*, неабходныя для металургічнай прамысловасці, вядомы ў трох радовішчах з агульным запасам больш за 44 млн. т. Цяпер распрацоўваюцца з іх два — Ленінскае і Жлобінскае.

На паўднёвым усходзе Беларусі вядомы радовішчы *глаўканіта-кварцавых пяскоў*. Запасы толькі аднаго з іх блізу Лоева ацэнены ў 15—18 млн. т. Глаўканіт — важная сыравіна для вытворчасці многіх рэчаў: мінеральнай фарбы, угнаенняў, сарбентаў, паверхнева-актыўных рэчаваў і г. д.

*Пясчана-гравійных* кар'ераў больш за 80 з гадавой здабычай прыблізна 25 млн. м$^3$, а ўсіх радовішчаў гэтых матэрыялаў — 140 млн. м$^3$ (запасы — больш 700).

Разведана 212 радовішчаў *легкаплаўкіх глін* для вытворчасці цэглы (запасы 208 млн. м$^3$), эксплуатуецца з іх 113 млн. м$^3$ (здабыча каля 3). *Тугаплаўкія гліны* (6 радовішчаў з запасамі 54 млн. т) патрэбны для сценавых камянёў і каналізацыйных труб. Вядомы 9 радовішчаў глін (запасы 61 млн. м$^3$) для вытворчасці аглапарыту і керамзіту.

*Будаўнічыя і абліцовачныя камяні* з крышталічных парод фундамента здабываюцца ў кар'ерах Мікашэвічы (Брэстская вобл.) і Глушкавічы (Гомельская вобл.), агульныя запасы якіх складаюць 340 млн. м$^3$. Мікашэвіцкі драбільна-сартыравальны камбінат — адзін з буйнейшых у Еўропе з прадукцыйнасцю 8 млн. м$^3$ шчэбня ў год. Абліцовачныя камяні з радовішча мігмацітаў кар'ера Надзея (Лельчыцкі р-н Гомельскай вобл.) з запасамі больш за 3 млн. м$^3$ выкарыстоўваюцца для насціла падлогі, ступенек у метро, абліцоўкі будынкаў і г. д. Дарэчы, сярод крышталіч-

ных парод Мікашэвіцкага кар'ера, а таксама на глыбінях у дзясяткі метраў навакол пас. Жыткавічы распаўсюджаны *дыябазы і габра-дыябазы*, з якіх можна атрымліваць мінеральныя валокны, кераміку і інш.

З даўніх часоў селяне выкарыстоўвалі гразі і ілы азёр для ўгнаення агародаў. Гэта так званыя *сапрапелі* (запасы іх — больш за 4 млрд. м$^3$). Яны апрача сельскай гаспадаркі (арганамінеральныя ўгнаенні, кармавыя дабаўкі) карысныя для медычных мэтаў (лячэбныя гразі), для свідравальных раствораў і г. д. Вядома 560 радовішчаў сапрапеляў, але распрацоўваецца з іх толькі 23 са здабычай каля 1 млн. т у год. Патрэбна больш сучасная тэхналогія іх здабычы. Некаторыя віды сапрапеляў зніжаюць утрыманне радыенуклідаў у глебе.

Па далінах многіх рэк Беларусі знаходзяцца вялікія запасы *мaроннага дубу*.

*Даламіты*, якія выходзяць на паверхню і якія можна добра бачыць па абрывістых берагах рэк на Віцебшчыне, даўно выкарыстоўвалі ў якасці карбанатных угнаенняў для вапнавання кіслых глебаў, а таксама для будаўнічых мэтаў. Радовішча Руба паблізу Віцебска мае запасы 800 млн. т. Тут знаходзіцца буйнейшае ў Еўропе прадпрыемства па вытворчасці даламітавай мукі (7 — 8 млн. т у год). Апрача таго, даламіты можна выкарыстоўваць як абліцовачны камень, для вытворчасці шчэбню, баласту і г. д.

Упрыгожанні з *бурштыну* археолагі знаходзяць пры многіх раскопках. Пароды з кавалкамі бурштыну шырока распаўсюджаны на паўднёвым захадзе Беларусі і асабліва ў раёне паміж гарадамі Пінск, Іванава, Бяроза. Тут знойдзены ўжо не толькі адзінкі, але і першыя радовішчы бурштыну.

## ШТО ВЯДОМА ЦЯПЕР

Да 1940 г. самая глыбокая свідравіна ў Беларусі дасягала ўсяго каля 300 м, і толькі перад самым пачаткам вайны была зроблена свідравіна глыбінёй троху болей за 1000 м. Яна адкрыла соль на Палессі. Геалагічная будова Беларусі была настолькі мала вывучана, што геолагі звярнуліся да вывучэння яе тэрыторыі, як да «белай плямы» на карце былога СССР. Былі шырока праведзены геалагічныя (у тым ліку свідравальныя) і геафізічныя работы, і Беларусь стала сапраўдным адкрыццём як у сэнсе яе геалагічнай будовы, так і пошукаў карысных выкапняў, сярод якіх аказалася многа новых і важных. Міф пра беднасць нетраў Беларусі быў адкінуты.

Адно з галоўных мінеральных сыравін Беларусі — *калійныя солі*, якія з 1963 г. здабываюцца на Старобінскім радовішчы (Прыпяцкі прагін), прычым яно давала прыблізна 50% калійных угнаенняў усяго былога СССР. Разведаныя запасы калійных солей Старобінскага радовішча разам з яшчэ не эксплуатуемымі Петрыкаўскім, Жыткавіцкім і Акцябрскім дасягаюць 9,7 млрд. т, а прагнозныя — звыш 80 млрд. т, з іх да глыбіні 1200 м (да якой рацыянальны шахтавы метад здабычы) — каля 20 млрд. т. Разам з калійнай соллю можна здабываць і спажывецкую соль, што ў апошнія часы, нарэшце, пачалі рабіць. Тут прысутнічаюць і прамысло-

выя канцэнтрацыі брому і рубідзія, але яны, на жаль, не здабываюцца. Выбар не найлепшай схемы распрацоўкі і тэхналогіі перапрацоўкі солей стварылі шэраг сур'ёзных праблем: высокі ўзровень страт руды ў нетрах, нізкае вылучэнне карыснага кампанента на ўзбагачальных фабрыках, страта ворных зямель пад солеадваламі і шламасховішчамі, засаленне падземных вод і глебы, прасадкі, забалочванне і г. д. Раён Салігорска стаў зонай экалагічнага бедства.

Запасы *спажывецкай солі* ў Прыпяцкім прагіне практычна невычарпальныя. Яна залягае на глыбінях ад 400 да 4000 м, магутнасць яе слоя дасягае 1 — 3 км, а плошча распаўсюджвання — прыблізна 30 тыс. км$^2$. Цяпер разведаны тры радовішчы — Давыдаўскае, Старобінскае і Мазырскае. На базе апошняга працуе Мазырскі камбінат, які дае высакаякасную спажывецкую соль (больш за 250 тыс. т солі «Экстра» ў год) шляхам падземнага растварэння.

З солямі звязаны радовішчы *гіпса*. Адно з іх разведана недалёка ад в. Брынёў Петрыкаўскага р-на. Глыбіня яго залягання 170 — 470 м, а запасы больш 1000 млн. т. Тут можна падрыхтаваць здабычу гіпса ў 1 млн. т у год.

Да Прыпяцкага прагіну — гэтай сапраўднай скарбніцы карысных выкапняў Беларусі — адносяцца радовішчы высакаякаснай *нафты*. Першае (Рэчыцкае) было адкрыта ў 1956 г. Ужо ў 1998 г. урачыста адзначалі здабычу 100-мільённай тоны нафты. Тут вядома больш за 60 невялікіх радовішчаў нафты, а яе здабыча трымаецца на ўзроўні 2 млн. т у год. Астаткавые запасы нафты прамысловых катэгорый складаюць каля 70 млн. т, і газу — каля 10 млрд. м$^3$.

У заходняй і цэнтральнай частках Прыпяцкага прагіну размешчаны басейн *гаручых сланцаў*. Магутнасць пластоў гаручых сланцаў — ад 0,2 да 3,7 м, цеплыня згарання 4,2 — 5,5 мДж/кг, зольнасць 75%, выхад смол 6,0 — 9,2%. Агульныя прагнозныя запасы 8 млрд. т, глыбіні залягання сланцаў 50 — 600 м. Найбольш вывучана Тураўскае радовішча. Сланцы прыгодныя дзеля перагонкі на вадкае і газавае паліва, яны цікавыя як каштоўны хімічны прадукт, будаўнічыя матэрыялы, угнаенне. Апрача таго, з імі звязаны некаторыя рэдкія элементы. Толькі комплекснае выкарыстанне гаручых сланцаў можа зрабіць іх здабычу рэнтабельнай.

На тэрыторыі Беларусі было тры эпохі вугалеўтварэння. Найбольш старажытны (300 млн. гадоў таму) *вугаль* знаходзіцца ў Прыпяцкім прагіне на глыбінях звыш 300 м. Яго падлічаныя запасы — прыблізна 300 млн. т. Больш маладыя — юрскага і неагенавага перыядаў — вуглі распаўсюджаны на поўдні Беларусі ад Гомеля да Брэста. Першыя з іх залягаюць на глыбінях 100 — 300 м, і іх прагнозныя запасы толькі на найбольш вывучанай Лельчыцкай плошчы перавышаюць 500 млн. т. Самыя блізкія да зямной паверхні (25 — 100 м) і самыя разведаныя — гэта неагенавыя вуглі. Іх прагнозныя запасы дасягаюць 3 млрд. т. Дэталёва разведаны тры радовішчы: Жыткавіцкае, Брынёўскае і Тонежскае. Для першага з іх распрацаваны праект, па якім тут можна здабываць у кар'еры кожны год па 2 — 2,4 млн. т вуглю, а тэрмін працы 20 — 25 гадоў. Адмоўныя экалагічныя праблемы не дазваляюць пакуль што здзейсніць гэты праект. Вуглі Беларусі — бурыя, па якасці блізкія да

торфу, але прыгодныя для вытворчасці энергетычнага і камунальна-бытавога паліва. У перспектыве ў Беларусі можна здабываць каля 5 млн. т бурага вуглю ў год.

У Прыпяцкім прагіне геолагі знайшлі рэдкі мінерал — *даўсаніт*, які ўтварае тут прамысловыя радовішчы і можа быць добрай сыравінай для вырабу *алюмінію і кальцыніраванай соды*. Гэта адно з унікальных радовішчаў прыроднай соды ў свеце і першае на тэрыторыі былога СССР. На Заазёрным радовішчы ён залягае адносна неглыбока (240—1000 м), рудныя лінзы маюць магутнасць 0,4—5,7 м, а ўтрыманне даўсаніту ў рудзе 26—38%. На базе гэтага радовішча маюцца добрыя магчымасці па арганізацыі адпаведнай вытворчасці. Яно будзе рэнтабельным пры ўмове прымянення геатэхналагічных метадаў (падземнае вышчалочванне). Эфектыўнасць асваення радовішча можа быць павялічана пры ўмове прыцягнення да эксплуатацыі баксітаў і каалінітаў, вылучэння з руды рэдкіх металаў — галію, ліцію, ніобію, тытана.

На поўдні Беларусі знойдзены два *фасфарытаносныя* басейны — Сожскі і Прыпяцкі. Першы знаходзіцца на ўсходзе Магілёўскай вобласці, дзе разведаны Мсціслаўскае і Лабковіцкае радовішчы *фасфарытаў* з запасамі 30 млн. т. У межах другога знаходзіцца Брэсцкі фасфарытаносны раён (запасы 53 млн. т) з Арэхаўскім радовішчам. Востры дэфіцыт фасфатных угнаенняў у краіне прымушае звярнуць асаблівую ўвагу на гэтыя радовішчы фасфарытаў. Цяпер іх вырабляюць у Гомелі з прывезенай сыравіны (апатыты Кольскага паўвострава).

У Магілёўскай вобласці знойдзены радовішчы *цэалітаносных сіліцытаў* (трэпелы, апокі, крэменязёмныя мергелі) — Дружба (запасы 81 млн. т) і Стальное (запасы 134 млн. т). Гэтыя пароды ўтрымліваюць 50% і больш мінералаў крэмнязёму і да 10—15, а зрэдку 25—30% цэаліту. Яны з'яўляюцца выдатнымі прыроднымі сарбентамі і патрэбны ў многіх відах вытворчасці: цэментнай і цагельнай прамысловасці, сельскай гаспадарцы, ачыстцы харчовых прадуктаў, адпрацаваных масел, сточных вод, газаў, нафтапрадуктаў і г. д. Да апошняга часу цэалітаносныя трэпелы прывозяць з радовішча Фокіна (Бранская вобл., Расія). Нашы радовішчы нягоршыя, і на іх неабходна звярнуць увагу.

Каля Жыткавічаў і Мікашэвічаў вядомы 4 радовішчы *кааліна* (Сітніца, Дзедаўка, Людкевічы, Бярэзіна) з агульнымі прагнознымі рэсурсамі 27 млн. т. Яны залягаюць на глыбінях 13—35 м, з магутнасцю пластоў 1,2—29 м. Кааліны могуць знайсці прымяненне ў вытворчасці фарфоравых, фаянсавых вырабаў і інш.

Усцяж паўднёвага борта Прыпяцкага прагіну праходзіць паласа распаўсюджання *пірафіліту* — якаснай керамічнай і вогнеўстойлівай сыравіны. Асабліва перспектыўная Лельчыцкая плошча.

Надзвычайна важнае значэнне маюць радовішчы *падземных вод*: пітных і тэхнічных, мінеральных — бальнеалагічных і прамысловых. Пітныя падземныя воды Беларусі — адны з лепшых у Еўропе. Большасць беларускіх гарадоў карыстаюцца гэтай вадой. Мінеральныя воды рознага складу шырока распаўсюджаны па тэрыторыі краіны, і іх здабыча ідзе са свідравін. На іх базе функцыянуе шэраг санаторыяў, а таксама заводаў па іх розліву. У 1998 г. за адкрыццё і асваенне мінеральных вод група спецыялістаў атрымала Дзяржаўную прэмію Беларусі. На

жаль, рацыянальнае выкарыстанне пітных вод, асабліва іх эканомія і ахова ад забруджвання патрабуюць значна большай увагі ўладных, вытворчых структур, усіх жыхароў краіны. Падземныя воды — адно з самых галоўных карысных выкапняў, гэта наша сапраўднае неацэннае багацце. Пытанне з вадою ў многіх рэгіёнах, краінах, гарадах стала праблемай нумар адзін.

Некаторыя воды — *тэрмальныя* (гарачыя) і могуць выкарыстоўвацца ў лекавых мэтах, абагравання кватэр і цяпліц. Найбольш гарачыя воды ў Прыпяцкім прагіне (да 40 — $90^0$), у Брэсцкай упадзіне (да $40^0$).

У Прыпяцкім прагіне, а часткова і ў Аршанскай упадзіне асадкавы чахол змяшчае вялікія запасы высокаканцэнтраваных *расолаў*. Гэта — «вадкая руда», з якой можна вылучыць ёд, бром, цэзій, калій, ліцій, рубідзій, стронцый і многія іншыя рэдкія і рассеяныя элементы. Тут сур'ёзныя праблемы з тэхналогіяй здабычы і перапрацоўкі расолаў. Сам расол можна выкарыстоўваць у медыцыне, раслінаводстве, жывёлагадоўлі, прамысловасці.

Пералічаныя мінеральныя рэсурсы звязаны галоўным чынам з адкладамі асадкавага чахла. Самыя разнастайныя карысныя выкапні прыстасаваны да парод крышталічнага фундамента. З іх раней ужо ўзгадваліся будаўнічыя матэрыялы. Разведана два радовішчы *жалезнай руды*: Навасёлкаўскае паблізу Карэлічаў і Аколаўскае каля Стоўбцаў. Першае — *ільменіт-магнетытавыя руды* з сярэднім утрыманнем жалеза 32% знаходзяцца на глыбіні 150 м. Прагнозныя рэсурсы жалеза 76 млн. т. Другое — *жалезістыя кварцыты* з сярэднім утрыманнем жалеза 27%. Запасы на глыбіні 700 м — 500 млн. т. Руды радовішчаў комплексныя: тут ёсць тытан, ванадзій, фосфар, кобальт, германій, серабро, золата. На базе Аколаўскага радовішча магчыма збудаваць руднік з гадавой вытворчасцю 14 млн. т руды і тэрмінам існавання 30 гадоў. Руды прыдатныя для перапрацоўкі на Беларускім металургічным заводзе (г. Жлобін). У гэтым раёне вядомы шэраг рудапраяўленняў жалеза — Аталез, Сула, Рубяжэвіцкае.

У межах Жыткавіцкага горста (падняцця) разведана *рэдкаметальнае* радовішча — Дыябазавае, якое таксама з'яўляецца комплексным. Яно прыгодна для вытворчасці рэдкіх металаў, рэдкіх зямель цэрыевай групы, а таксама мінеральных валокан, шчэбня і інш. Радовішча знаходзіцца ў спрыяльных горна-геалагічных умовах і можа быць у бліжэйшыя гады асвоена. Здабыча рэдкіх зямель будзе мець вялікае значэнне для эканомікі краіны і можа стаць крыніцай атрымання валюты, бо гэтая сыравіна вельмі патрэбна ў многіх напрамках вытворчасці: радыётэхнічнай, самалётабудаўнічай, касмічнай і інш.

## ШТО МОЖНА ЧАКАЦЬ У БУДУЧЫМ?

З крышталічнымі пародамі фундамента звязаны перспектывы пошукаў радовішчаў самых разнастайных карысных выкапняў: *чорных* і *легіруючых* (жалеза, ванадзій, тытан, кобальт, нікель, малібдэн, вальфрам), *каляровых* (медзь, цынк, свінец, олава), *высакародных* (золата і серабро) *металаў*; *рэдкіх* і *рэдказямельных элементаў*. Багатыя

рудапраяўленні ўсіх гэтых выкапняў геолагі ўжо знайшлі ў многіх мясцінах Беларусі. Вядомы таксама праяўленні многіх неметалічных карысных выкапняў: *графіту, мармуру, гранату.* Плошча, на якой можна шукаць такія мінеральныя рэсурсы ў пародах фундамента на адносна невялікіх глыбінях (менш за 500 м), дасягае амаль 80 тыс. км$^2$ (тэрыторыя Беларускай антэклізы, Мікашэвіцкі і Жыткавіцкі горсты, край Украінскага шчыта — раён Глушкавіч і інш.).

З эпохамі вулканізму (венд — 650 млн. гадоў таму і позній дэвон — 360 млн. гадоў таму) звязаны своеасаблівыя тэктанічныя элементы, так званыя трубкі выбуху — канцэнтрычныя структуры дыяметрам ад некалькіх соцень метраў да першага дзесятка кіламетраў і глыбінёй да 20 — 60 км (да ніжняй зямной кары і нават верхняй мантыі). Да іх адносяцца розныя карысныя выкапні і найбольш важныя з іх — *алмазы.* Вендскі вулканізм распаўсюджаны ў Брэсцкай упадзіне і Палескай седлавіне (Брэстская вобл.), а познедэвонскі — самы ўсход Прыпяцкага прагіна, Брагінска-Лоеўская і Жлобінская седлавіны (Гомельская вобл.). Ужо знойдзена 30 такіх трубак выбуху. Такога ж тыпу структуры можна шукаць на поўначы Віцебскай вобласці, у раёне Полацкай зоны разломаў, якая праходзіць у субшыротным напрамку амаль праз Полацк.

З асадкавым чахлом апрача пошуку новых радовішчаў ужо пералічаных раней карысных выкапняў звязаны перспектывы знаходжання рассыпных радовішчаў розных металаў (цыркон, ільменіт, тытан, руціл, касітэрыт, гранат, золата, рэдкія і рэдказямельныя элементы і інш.). На поўдні Беларусі магчымы пошукі *меднай руды, ртуці.*

Такім чынам, геалагічныя пошукі могуць прывесці да пашырэння запасаў ужо раней вядомых відаў мінеральных рэсурсаў і адкрыцця новых, нават такіх, якіх зараз мы яшчэ і не чакаем.

## ГЕАЛОГІЯ НЕАБХОДНАЯ ШКОЛЕ

Кожны, хто скончыў школу, многае можа ўспомніць пра космас і зоркі, жывёлаў і расліны, рэкі і ўзвышшы, бо калісьці вывучаў астраномію, заалогію, батаніку, геаграфію. А спытайце, чым адрозніваецца мінерал ад горнай пароды, што было на месцы роднага краю сто мільёнаў гадоў назад ці што яшчэ можна знайсці ў нетрах Беларусі, звычайна пацісне плячыма, бо не ведае — геалогію ў школе амаль не вывучаў. Справа дайшла да таго, што ў газетах аднačасова з'яўляюцца артыкулы, адны з якіх запэўніваюць — быццам бы мы бедна жывём таму, што ў нас няма мінеральнай сыравіны, а другія — што мы казачна багатыя. Геалогію не ведаюць ні вучні, ні журналісты, ні міністры.

Геалогія — адзін з падмуркаў сучаснага навуковага светапогляду. Яна, як ні адна з іншых навук, раскрывае ролю і месца чалавека ў прыродзе, высвятляе ход самых розных працэсаў на Зямлі, тлумачыць крохкасць нашага наваколля. Без гэтай навукі нельга вывучыць свой край, яго адметнасць і прыгажосць.

У большасці краін свету курс геалогіі праходзяць у школе, асабліва ў старэйшых класах. Там даўно створаны багатыя геалагічныя музеі,

у якіх можна ўбачыць узоры горных парод і мінералаў са ўсяго свету, акамянелыя рэшткі насельнікаў нашай планеты з мінулых геалагічных эпох, маляўнічыя стэнды і макеты геалагічных падзей і працэсаў. Мне неяк давялося пабываць у Геалагічным музеі Лондана, якому ўжо больш за 150 гадоў. Гэта — адзін з лепшых геалагічных музеяў свету, змешчаны ў вялікім прыгожым палацы. Музей пакідае вялікае ўражанне. Але ў мяне яшчэ большае здзіўленне выклікалі дзяўчынкі і хлопчыкі, якія з вялікай увагай гадзінамі стаялі каля стэндаў і калекцый. У кожнага з іх сшытачкі, куды заносіцца ўбачанае. Атрыманыя веды застаюцца надоўга.

Да вайны геалогію выкладалі ў школе і ў нас. Існаваў неблагі для таго часу падручнік М. Пацёмкіна і В. Малінка «Мінералогія і геалогія» для 10 класа. Але пазней, калі «шукалі гадзіны» для ідэалагічных дысцыплінаў, ад навукі аб Зямлі адмовіліся.

Цяпер у Беларусі маецца вялікая неабходнасць адрадзіць нацыянальную культуру. У гэтай справе найважнейшае месца належыць адукацыі. У распрацоўцы новай канцэпцыі адукацыі прыярытэт патрэбна аддаць вывучэнню напрамкаў, якія маюць жыццёва важнае значэнне для Беларусі, і тут не ў апошнюю чаргу важныя прыродазнаўчыя навукі.

Сярод дысцыплін прыродазнаўчага цыкла геалогія павінна заняць важнае месца. Прыйшла пара ўнесці ў праграму старшых класаў сярэдняй беларускай школы курс «Геалогія». Тыя кароткія звесткі па геалогіі, якія выкладаюцца ў прыродазнаўстве і геаграфіі, трэба захаваць і разглядаць у якасці папярэдніх звестак да курса геалогіі.

У падручнік па геалогіі павінны трапіць агульныя звесткі пра гэту навуку і яе практычным значэнні, аб Зямлі як планеце, геалагічнай дзейнасці ветра, рэк, падземных вод, мора, лёду і яго талых вод, азёр, балот, вулканаў, розных геалагічных працэсах.

Без геалагічных ведаў немагчыма вырашыць такія важнейшыя праблемы, як нараджэнне планеты Зямля, будова і развіццё іншых планет і ўсёй іх сістэмы. Геалогія вывучае цікавейшыя пытанні аб тым, як і калі ўзнікла зямная кара, кантыненты і акіяны — іх паходжанне і ўзрост, які быў клімат і фізіка-геаграфічныя ўмовы ў розныя перыяды развіцця Зямлі. Узнікненне жыцця на Зямлі, росквіт і вялікія выміранні і аднаўленні арганічнага свету і іх прычыны, вялікія кантынентальныя абледзяненні — іх колькасць і прычыны, уплыў касмічных працэсаў на развіццё Зямлі, праявы вулканічнай дзейнасці і землятрусаў, унутранае цяпло Зямлі, крыніца энергіі глыбінных геалагічных працэсаў і многія іншыя феномены — усё гэта асноўныя праблемы геалогіі.

Важнае месца неабходна адвесці этапам развіцця прыроды ва ўсе геалагічныя перыяды — ад часу ўзнікнення жыцця на Зямлі да з'яўлення чалавека і нашых дзён. Геалогія — навука гістарычная, яна вывучае гісторыю развіцця асобных краін, рэгіёнаў, усёй Зямлі. Гэтай гісторыі каля 4,5 млрд. гадоў. Дык чаму мы ў школе вывучаем гісторыю краіны толькі з паяўлення чалавека, а гісторыю той зямлі, на якой мы жывём, не ведаем? Вывучаем, што здарылася за апошнія некалькі дзесяткаў тысяч гадоў, а што было мільёны гадоў раней — нас чамусьці не цікавіць. Тут вучні даведаюцца, што кантыненты павольна

падарожнічалі на паверхні планеты. Таму і тэрыторыі Беларусі давялося пабываць у розных шыротах. Напрыклад, 600 млн. гадоў назад наш кавалачак Еўропы знаходзіўся недалёка ад паўднёвага полюса, і таму сюды напаўзалі ледавікі. Затое каля 370 млн. гадоў назад беларуская зямля апынулася ля экватара, і ў марскіх лагунах, якія тады былі на месце Прыпяцкага Палесся, назапасіліся магутныя пласты солей. У апошнія ж мільён гадоў, калі наш край заняў на планеце сваё сучаснае месца, ледавікі некалькі разоў прыпаўзалі ўжо з поўначы, са Скандынавіі.

Важную ролю трэба будзе адвесці карысным выкапням, бо вучні павінны ведаць, што большасць рэчаў, патрэбных чалавеку, выраблена з мінеральнай сыравіны. Як ужо было паказана, па еўрапейскіх мерках мы досыць багатая на такую сыравіну краіна.

Геалогія не толькі глабальная навука аб будове і развіцці ўсёй Зямлі, але ў значнай меры і рэгіянальная навука. Таму ў падручніку давядзецца спалучаць звесткі па геалогіі розных куткоў Зямлі з інфармацыяй па Беларусі, прычым галоўны акцэнт прыйдзецца рабіць на мясцовыя матэрыялы. Тут дарэчы сказаць, што ў апошнія дзесяцігоддзі беларускія геолагі здабылі такія багатыя звесткі пра будову і багацці свайго краю, што многія лічаць яго адным з найбольш дэталёва вывучаных месцаў Усходне-Еўрапейскай платформы.

Падручнік па геалогіі здольны хутка падрыхтаваць выкладчыкі нашых ВНУ і навукоўцы. У бліжэйшыя гады весці гэты курс у школе маглі б пры мінімальнай падрыхтоўцы настаўнікі геаграфіі. Зараз на геаграфічным факультэце БДУ рыхтуюцца спецыялісты-геолагі — частка з іх маглі б пайсці ў школу. Часам акрамя падручніка спатрэбіцца «Кніга для чытання па геалогіі Беларусі» (хрэстаматыя), адпаведны падручнік для вышэйшых устаноў, розныя метадычныя распрацоўкі.

Наспеў час прыйсці геалогіі ў беларускую школу!

## НА СТЫКУ НАВУК

Усё ў прыродзе ўзаемазвязана і ўзаемаабумоўлена, і чалавек, як частка прыроды, таксама поўнасцю падпарадкаваны ёй. Яшчэ адносна нядаўна мы — асабліва савецкія людзі — лічылі, што чалавек павінен перарабіць прыроду, цалкам падначаліць яе сабе, узяць ад яе ўсё, што можна, — і прывялі яе, а разам з ёй і экалагічную сітуацыю, на грань катастрофы. Праблема экалогіі — пабудова нашага зямнога дому і нармальнага жыцця ў ім — стала праблемай нумар адзін для ўсяго чалавецтва. Тэхнагенныя дзеянні цяпер дасягаюць моцы прыродных геалагічных працэсаў. Экалогія — навука ўсеабдымная: яна мае адносіны і да ўсяго чалавецтва, да ўсяго зямнога шара і датычыцца кожнага з нас, бо парадак і нармальныя ўмовы ў доме людзей патрэбны ўсюду — як цалкам на Зямлі, так і ў кожнай краіне, у кожнай хаце, у кожнай сям'і.

Як мы бачылі, геалогія — вельмі шырокі комплекс навук аб літасферы, іншых зямных абалонках і аб Зямлі цалкам, яе складзе, будове, рухах, гісторыі развіцця, знаходжанні ў ёй карысных выкапняў. У сувязі з канкрэтнымі задачамі вылучаецца шэраг больш вузкіх навуковых геалагічных дысцыплін: дынамічная геалогія, гістарычная геалогія,

інжынерная, вугальная, нафтавая, касмічная і г. д. У апошні час у самастойны напрамак стала вылучацца *экалагічная геалогія* і яе раздзелы (экалагічная геафізіка, экалагічная геахімія і інш.). Яна займаецца тымі геалагічнымі даследаваннямі, якія звязаны з рашэннем праблем экалогіі, захаваннем прыроднага асяроддзя.

Тут можна вызначыць два аспекты: уздзеянне чалавека на прыроднае асяроддзе, што прыводзіць да парушэння нармальнага стану апошняга, і, наадварот, уплыў натуральных і штучных фізічных палёў на чалавека і яго гаспадарчую дзейнасць. Чалавек так моцна ўздзейнічае на натуральныя ландшафты, што яны ўжо нярэдка змяняюцца на тыповыя тэхнагенныя. Ён стварае новыя геахімічныя правінцыі, прыкладам чаго стала вялізная па плошчы Чарнобыльская зона радыеактыўнага забруджвання. З другога боку, чалавек і асобныя яго органы з'яўляюцца генератарамі фізічных палёў, якія ўступаюць у ўзаемадзеянне з геафізічнымі палямі Зямлі. Важна вывучыць характар гэтага ўзаемадзеяння, каб выключыць яго адмоўныя моманты.

Шырока вядома, што магнітныя буры змяняюць параметры біямагнітнага поля чалавека і адмоўна ўплываюць на стан здароўя людзей. Яны таксама індуцыруюць электрычныя (тэлурычныя) токі, якія парушаюць работу электрамагнітнай апаратуры. Вядомы выпадкі адключэння светлафораў на Беларускай чыгунцы ў час інтэнсіўных магнітных бур.

На тэрыторыі Беларусі бываюць як мясцовыя землятрусы, так і такія, якія ідуць ад далёкіх эпіцэнтраў у Карпатах ці Скандынавіі. Іх інтэнсіўнасць можа даходзіць да 6—7 балаў. Яны звычайна адбываюцца на глыбокіх разломах (расколах, трэшчынах) у зямной кары. Добра, што значныя па сіле землятрусы на Беларусі досыць рэдкія, але ўсё роўна неабходна сейсмічнае раянаванне ўсёй тэрыторыі краіны. Больш слабыя землятрусы ў некаторых месцах праяўляюцца значна часцей. Так, напрыклад, у раёне Салігорска зафіксавана больш 100 такіх землятрусаў у год, што ў значнай ступені звязана з горнымі работамі па выемцы парод з глыбінь нетраў, таму адбываюцца і парушэнні напружанага стану зямной кары. У час нават і слабых (але частых) землятрусаў узнікаюць інфрагукавыя і ультрагукавыя хвалі, якія адмоўна ўплываюць на здароўе людзей. Гэтыя феномены яшчэ вельмі слаба вывучаны.

Яшчэ менш вывучаны ўплыў гравітацыйнага поля Зямлі і яго варыяцый на чалавека, хаця падставы для гэтага значныя.

Многія геафізічныя і геахімічныя анамальныя з'явы (у тым ліку і пералічаныя раней) часта звязаны з глыбіннымі разломамі зямной кары. Таму такія разломы патрабуюць асаблівай увагі ў іх вывучэнні з боку экалагічнай геалогіі, як магчымыя геапатагенныя зоны. Экалагічная геалогія — гэта такі раздзел геалогіі, які ў першую чаргу вывучае негатыўныя ўздзеянні розных фактараў — геафізічных, геатэктанічных, геахімічных, гідрагеалагічных і іншых — на біялагічныя аб'екты (перш-наперш на чалавека) і розныя збудаванні. Гэта —адносна новы напрамак даследаванняў, таму яшчэ слаба распрацаваны. Галоўнае ў іх — экагеалагінае картаграфаванне, якое дазволіць планаваць экалагічна бяспечныя ўмовы існавання і дзейнасці чалавека.

## ШТО ЯШЧЭ ТРЭБА РАБІЦЬ?

Развіццё цывілізацыі заўсёды апіралася на спажыванне карысных выкапняў. Без мінеральнай сыравіны немагчыма гаспадарчая дзейнасць чалавека, само існаванне чалавецтва. Мінеральна-сыравінная база — аснова навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Якія агульныя праблемы паўстаюць перад чалавецтвам у сувязі з выкарыстаннем мінеральнай сыравіны? Рэзка павялічваецца ўзровень спажывання мінеральнай сыравіны (кожныя прыблізна 10 гадоў у два разы), што вядзе да хуткага вычэрпвання радовішчаў карысных выкапняў да *мінеральна-сыравіннай катастрофы*. Адсюль вынікае неабходнасць *эканамічнага* і *рацыянальнага спажывання прыродных рэсурсаў*. Цяпер большасць радовішчаў карысных выкапняў, якія залягаюць блізка ад паверхні Зямлі, знойдзены і таму прыходзіцца шукаць больш глыбокія, а гэта вядзе да павялічэння выдаткаў на іх пошукі і эксплуатацыю. Каб хутчэй і танней знайсці такія радовішчы, патрэбен дасканалы *навуковы прагноз*. Пры здабычы мінеральнай сыравіны ўзнікаюць праблемы *павелічэння яе выбрання* з радовішчаў (яно невялікае: нафты — 30 – 40%, калійных солей — 40 – 50%, вугля — 60 – 80% і г. д.) і *змяншэнне страт* пры перапрацоўцы і абагачэнні руд. Пры гэтым трэба скараціць колькасць адходаў, для чаго неабходна распрацаваць *малаадходныя*, а яшчэ лепш *безадходныя тэхналогіі*. Радовішчы звычайна змяшчаюць некалькі карысных мінералаў, а вельмі часта здабываецца толькі адзін з іх. Таму ўзнікае праблема *комплекснага выкарыстання* мінеральнай сыравіны.

З некалькіх тысяч мінералаў і соцень горных парод, што вядомыя ў зямной кары, цяпер толькі нязначная частка з іх лічыцца ў якасці карысных выкапняў. З развіццём *новых тэхналогій* усё большая колькасць мінералаў і горных парод будуць пераходзіць у разрад карысных выкапняў. Неабходна арганізаваць дэталёвае вывучэнне найбольш распаўсюджаных відаў мінералаў і горных парод і вызначыць, які карысны кампанент і якім шляхам можна з іх атрымаць. Для паспяховага вырашэння гэтай праблемы неабходны сумесныя комплексныя даследаванні геолагаў, хімікаў, фізікаў, тэхнолагаў. Гэта — адзін з шляхоў пазбаўлення чалавецтва ад мінеральна-сыравіннага голаду.

Важны аспект праблемы мінеральнай сыравіны — *міжнародны*, які звязаны з нераўнамерным распаўсюджваннем і выкарыстаннем карысных выкапняў. Увесь час ідзе барацьба за мінеральныя рэсурсы. Краіны свету падзяляюцца на экспарцёраў і імпарцёраў той ці іншай сыравіны. Гандаль мінеральнай сыравінай складае чвэрць усяго міжнароднага тавараздвароту. Важна адзначыць, што сучасная структура цэн на сыравіну, прадукты яе перапрацоўкі і гатовыя вырабы вельмі часта прыносяць найбольшыя выгады імпарцёрам. Выгадней прадаваць гатовы прадукт, чым сыравіну. Яскравы прыклад — Японія, прамысловасць якой працуе галоўным чынам на прывазной сыравіне. Бывае і наадварот, калі краіна някепска жыве за кошт экспарту нафты, як Кувейт. Але гэта крайнія выпадкі. Звычайна бываюць прамежныя сітуацыі. Чым больш багацце нетраў тэрыторыі краіны, чым лепш яно рацыя-

нальна выкарыстоўваецца, тым больш магчымасцяў мець сапраўдную незалежнасць. У гісторыі мінулай і сучаснай мы маем шмат прыкладаў палітычнага націску праз мінеральную сыравіну. Добра вядома, як Беларусь і Украіна цяпер залежаць ад паліва Расіі.

Нарэшце, здабыча, перапрацоўка і выкарыстанне мінеральнай сыравіны патрабуе спачатку вялікіх *фінансавых* затрат (якія з часам, безумоўна, акупяцца), а таксама выклікае складаныя *экалагічныя* праблемы, якія неабходна адразу прадбачыць і ўлічваць.

Як яскрава бачна з пераліку мноства карысных выкапняў, якія ўтрымлівае беларуская зямля, традыцыйнае ўяўленне аб беднасці нетраў Беларусі павінна быць адкінута. Шэраг відаў мінеральнай сыравіны ўжо здабываецца, але большасць яшчэ нерухома ляжыць у зямлі, а многія чакаюць сваіх адкрыццяў.

Новыя палітычныя і эканамічныя ўмовы самастойнай Беларусі патрабуюць і новы, больш гаспадарчы падыход да мінеральных рэсурсаў. Неабходна распрацоўка *спецыяльнай дзяржаўнай праграмы* па праблемах мінеральнай сыравіны. Патрэбна глыбокая эканамічная ацэнка мінеральна-сыравіннай базы. Адсутнасць навукова распрацаванай ацэнкі *каштоўнасці карысных выкапняў* у нетрах і практыка дармавой перадачы іх запасаў прамысловай вытворчасці робіць уражанне, што багацце нетраў для грамадства не мае цаны. Прыняты закон аб нетрах не павінен застацца толькі на паперы. Багацце нетраў — багацце народа. Але яно не павінна падначальвацца вядомаму безгаспадарчаму прынцыпу «всё вокруг колхозное — всё вокруг моё». Пакуль прадпрыемства зацікаўлена ў найбольш поўным выкарыстанні нетраў, усе мерапрыемствы па зніжэнню стратаў карысных выкапняў будуць мець фармальны характар.

Незалежнасць краіны патрабуе карэннай змены кіравання народнай гаспадаркай, замены многіх структур урада, многіх кіраўнікоў, якія засталіся з часоў каманднa-адміністратыўнай сістэмы. Апошняе асабліва важна, бо сучаснай гаспадаркай незалежнай краіны можа кіраваць толькі высокакампетэнтны спецыяліст. Час, калі дзейнічаў прынцып «где бы не работать, лишь бы руководить», прайшоў. Аб гэтым прыходзіцца нагадваць, бо да нашага часу многія кіруючыя асобы, узгадаваныя на сістэме валюнтарызму і бяздумнага выканання загадаў зверху, лічаць, што кіраваць можна любым напрамкам прамысловасці, сельскай гаспадаркі, культуры, навукі, адукацыі, не маючы для гэтага спецыяльнай падрыхтоўкі.

Цяпер геалагічная служба Беларусі рэзка скарацілася, раскідана па розных міністэрствах і ведамствах. Яе галоўнае ядро — аб'яднанне «Белгеалогія» належыць да Міністэрства прыродных рэсурсаў, сярод кіруючых кадраў якога няма ніводнага спецыяліста-геолага. Для пошукаў новых карысных выкапняў, разведкі і распрацоўкі ўжо вядомых радовішчаў, эканамічнай ацэнкі мінеральных рэсурсаў і іх выкарыстання, а таксама для вядзення агульнай мінеральна-сыравіннай палітыкі неабходна стварыць спецыяльнае *Міністэрства ці асобны Камітэт геалогіі і выкарыстання мінеральных рэсурсаў* (можа, і ў рамках Міністэрства прыродных рэсурсаў).

Ва ўсіх краінах свету, як і ў былым СССР, так і некаторых дзяржавах СНД, вялася і праводзіцца *дзяржаўная геалагічная здымка* па тапаграфічных лістах усёй тэрыторыі, прычым маштаб такой здымкі павялічваецца ад дробнамаштабнай (1:1 млн, 1:500 тыс.) да больш буйной (1:200 тыс., а затым і 1:50 тыс., 1:10 тыс.). Краіны Еўропы ўжо поўнасцю пакрыты буйнамаштабнай здымкай, якая праз некаторы час зноў паўтараецца. Цяпер мы павінны праводзіць не проста геалагічную здымку, а *эколага-геалагічную* ці нават здымку *прыроднага патэнцыялу*. *Комплекс карт прыроднага патэнцыялу* павінны складаць шэраг самых разнастайных карт: геалагічных, геафізічных, геамарфалагічных, геахімічных, гідрагеалагічных, глебавых і г. д. Ва ўмовах Беларусі асабліва важна сістэматычна праводзіць здымку распаўсюджвання радыенуклідаў — ад асобных абласцей і раёнаў да кожнай гаспадаркі і асабістай сядзібы. Радыенукліды мігрыруюць, адбываюцца змены па плошчы іх утрымання, таму патрэбна рэгулярная перыядычнасць правядзення такіх работ. Неабходна шырокае давядзенне вынікаў да насельніцтва. Карты прыроднага патэнцыялу — база не толькі для пошукаў карысных выкапняў, але і асновы для любых народна-гаспадарчых дзеянняў. Аснова правільнага асваення любой тэрыторыі, рацыянальнага прыродакарыстання, бяспечнага існавання чалавека і прыроды, канструявання гармоніі чалавека і прыроды. Кожная вобласць краіны, кожны раён павінен мець камплект карт прыроднага патэнцыялу. Аптымальна весці ўсю народную гаспадарку можна толькі на падставе такіх карт, якія аб'ектыўна даюць комплекснае веданне прыроднага патэнцыялу вобласці, раёна, любога аб'екта гаспадарання. Гэта — галоўная праца Міністрэства (ці Камітэта) геалогіі.

Апрача таго, яно павінна праводзіць дзяржаўнае зацвярджэнне запасаў радовішчаў розных карысных выкапняў, складаць іх кадастр і баланс, праводзіць інспекцыю дзяржаўнага геалагічнага кантролю, экспертызу ўсіх відаў геолагаразведачных работ, мець рэдакцыйна-выдавецкі савет па зацвярджэнню і выданню геалагічных і іншых карт, геалагічны фонд і бібліятэку справаздач, графічных матэрыялаў, даведачна-інфармацыйны цэнтр з банкам геолага-геафізічных і іншых дадзеных і г. д. Патрэбна не змяншаць, а пашыраць геалагічныя арганізацыі — напрыклад, у Германіі кожны рэгіён («зямля»), а ён не большы па плошчы, чым наша вобласць, мае сваю геалагічную службу. Неабходна дэталёвае вывучэнне шматлікіх *рудапраяўленняў*, зон і кропак мінералізацыі, якія ўжо выяўлены геолагамі ў фундаменце і асадкавым чахле, з мэтаю пераводу некаторых з іх у ранг радовішчаў. Патрэбна рэвізія і ацэнка многіх геахімічных анамалій.

У сваёй дзейнасці Міністэрства (Камітэт) геалогіі і мінеральных рэсурсаў павінна апірацца на акадэмічную і галіновую навуку. На жаль, у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі навукі аб Зямлі таксама не маюць належнага развіцця. Неабходна стварыць *самастойнае аддзяленне навук аб Зямлі* (як гэта ёсць у акадэміях большасці краін свету) і пашырыць яго шэрагам інстытутаў (водных праблем, геаграфіі і інш.). Даўно не стае нашай краіне і добрага *геалагічнага музея*.

## МЫ ХОЧАМ ЖЫЦЬ ДРУЖАЛЮБНА З РАСІЯЙ, АЛЕ НЕЗАЛЕЖНА*

29 ліпеня ў Палацы культуры Тонкасуконнага камбіната «Сукно» ў Мінску пройдзе Усебеларускі з'езд. На форуме плануецца выпрацаваць і прыняць Акт Незалежнасці — сведчанне і імкненне народа захаваць самастойнасць краіны.

Напярэдадні падзеі карэспандэнт «Нашай свабоды» ўзяў інтэрв'ю ў сустаршыні з'езда прэзідэнта Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» акадэміка Радзіма Гарэцкага пра мэты форума.

**Рыгор Буян.** Радзім Гаўрылавіч, І Усебеларускі з'езд прайшоў у снежні 1917 года. Як вядома, з яго пачалося адраджэнне дзяржаўнасці Беларусі. І вось склікаецца ІІ Усебеларускі з'езд. Цяпер гаворка ідзе пра пагрозу суверэнітэту нашай краіны. Няўжо небяспека быць паглынутай Расіяй настолькі рэальная?

**Радзім Гарэцкі.** Назва форуму гаворыць сама за сябе: «Усебеларускі з'езд за незалежнасць». Калі пачытаеш дзяржаўную прэсу, паслухаеш радыё і тэлебачанне, то можна падумаць, што ўсе 100% беларусаў толькі спяць і мараць трапіць у абдымкі Расіі. На самой справе гэта не так. Адна з мэтаў з'езда — паказаць гэта і насельніцтву Беларусі, і іншым краінам, у першую чаргу той жа Расіі. Кіраўніцтва Расіі і Беларусі падпісалі, здаецца, ужо 16 саюзных дакументаў, але мы іх і ў вочы не бачылі. Ад Лукашэнкі мы раптам даведваемся, што ён цалкам згодны з адзінай валютай — расійскім рублём з адзіным эмісійным цэнтрам у Маскве. Гэта ўжо гаворыць за тое, што ніякай фінансавай, а значыць, і эканамічнай незалежнасці няма. Ужо ёсць «саюзны бюджэт», рыхтуюцца выбары ў «саюзны парламент» — гэта аднасэнсоўныя крокі па інкарпарацыі Беларусі ў Расію. Таму мы вельмі занепакоеныя, што гэта можа сапраўды адбыцца. Вось таму мы хочам паказаць усяму свету, што значная частка беларускага народа хоча жыць незалежна.

**Р. Б.** Дзеля гэтага аргкамітэт актывізаваў сваю дзейнасць сярод замежнага дыпламатычнага корпуса, акрэдытаванага ў Мінску?

**Р. Г.** Мы ўжо сустракаліся з дыпламатамі буйных краінаў, і перш за ўсё з дыпламатамі краінаў-суседзяў. Мы паспрабавалі давесці да іх інфармацыю пра Усебеларускі з'езд з першых рук. Бо нехта пастаянна запускае — я не ведаю, хто гэта робіць — разнастайныя плёткі, што мы нібыта ставім перад сабой звышпалітычныя мэты. Амерыканцы, напрыклад, думалі, што гэта Лукашэнка праводзіць Усебеларускі з'езд. Мы ж расказалі, што галоўная наша мэта — выпрацаваць і прыняць з дэлегатамі, якія прадстаўляюць ці не ўсе беларускія рэгіёны, Акт Незалежнасці. Па-другое, мы запрашалі дыпламатаў прыняць удзел у з'ездзе. Дарэчы, я спрабаваў сустрэцца і з паслом Расіі ў Мінску. Але расійскі пасол адмовіўся прыняць мяне, замежнага сябра Расійскай акадэміі навук. Відаць, нездарма мы хвалюемся, раз ён так адрэагаваў на нашую просьбу сустрэцца.

---

* Наша свабода. 2000. 25 ліп. Інтэрв'ю Р. Буяна.

**Р. Б.** У канцы траўня — першай палове чэрвеня паміж арганізатарамі Кангрэса дэмакратычных сілаў і Усебеларускага з'езда назіраліся напружаныя адносіны з-за даты правядзення абодвух форумаў. Была небяспека, што і кангрэс і з'езд — незалежніцкія форумы — пройдуць амаль аднačасова. У чым заключаліся асноўныя супярэчнасці?

**Р. Г.** Я б хацеў сказаць, што ёсць пэўнае перабольшванне гэтых супярэчнасцяў. Галоўнай мэтай кангрэса была выпрацоўка пазіцыі дэмакратычных сілаў адносна парламенцкіх выбараў. У нас — іншая мэта. Хаця без складанасцяў не абышлося — пэўныя плыні ў аргкамітэце хацелі, напрыклад, каб наш форум быў больш палітызаваны. Але сустаршыні адхілілі падобныя прапановы. Ініцыятарамі кангрэса выступалі палітычныя партыі, а ідэя Усебеларускага з'езда ідзе знізу, гэта грамадская ініцыятыва.

Галоўная супярэчнасць датычылася тэрміну правядзення. І мы хацелі крыху раней правесці з'езд, і яны — кангрэс. Але, як бачыце, перапынак паміж форумамі складае амаль месяц. Некаторыя партыі хацелі перанесці з'езд ледзь не на канец года, калі павінны прайсці выбары ў Палату прадстаўнікоў. Мы палічылі гэта няправільным: у канцы года адбудуцца выбары, могуць стварыць так званы «саюзны парламент». І, як бачыце, нагода ў нас добрая — 10-я гадавіна незалежнасці Беларусі. Самы момант сказаць, што мы — за незалежнасць, што яе трэба мацаваць.

**Р. Б.** Радзім Гаўрылавіч. Адзінай, бадай, афіцыйнай рэакцыяй на Усебеларускі з'езд сталася нядаўняя заява Міністэрства юстыцыі. Беларуская Феміда заявіла, што любыя рашэнні з'езда «не будуць мець ніякай юрыдычнай сілы і не пацягнуць прававых наступстваў». А ўсё таму, што «для рашэння важнейшых пытанняў дзяржаўнага і грамадскага жыцця могуць праводзіцца рэспубліканскія і мясцовыя рэферэндумы, парадак правядзення якіх вызначаны Канстытуцыяй і Выбарчым кодэксам Беларусі».

**Р. Г.** Гэта дзіўна: дакумента яшчэ няма, а мінюст заяўляе, што ён ўжо неюрыдычны. Я наогул дзіўлюся — чаго яны так спалохаліся? Яны супраць незалежнасці, калі заяўляюць, што Акт Незалежнасці будзе неюрыдычны? Мне незразумела і крыху сорамна за нашае Міністэрства юстыцыі. Больш за тое, Акт Незалежнасці не носіць характару абавязковага дакумента. Мы проста хочам заявіць, што мы — за незалежнасць.

**Р. Б.** Даруйце, Радзім Гаўрылавіч, але ўсё ж у заяве мінюста ёсць пытанне: якім чынам будуць рэалізоўвацца прынятыя з'ездам дакументы?

**Р. Г.** Мы, безумоўна, не прымусім улады выконваць гэты Акт. Але мы прымусім іх задумацца. Мы хочам давесці да ведама нашых суседзяў і ўласнага народа (таму што народ, забіты ўрадавай прапагандай, думае, што сапраўды 80% беларусаў хочуць у Расію), што гэта не так. Мы хочам жыць дружалюбна з Расіяй, але незалежна.

**Р. Б.** Пасля дазволу Мінгарвыканкама на правядзенне з'езда ў Палацы культуры «Сукно» заява мінюста насцярожвае. Вы не баіцеся, што ў апошні момант памяшканне для правядзення Усебеларускага з'езда не дадуць?

**Р. Г.** Такое можа быць. Я ўжо сутыкнуўся аднойчы з такой сітуацыяй, калі праводзіўся II з'езд беларусаў свету. Але гэта будзе сорам для ўлады, бо яна адкрыта прызнаецца і свайму народу, і на ўвесь свет, што хоча здаць незалежнасць рэспублікі і баіцца тых, хто выступае супраць гэтага.

## БОЛЬШАЯ ЧАСТЬ БЕЛОРУСОВ ХОЧЕТ ЖИТЬ В НЕЗАВИСИМОМ ГОСУДАРСТВЕ*

29 июля в Минске пройдет Всебелорусский съезд за независимость. О том, каковы цели и задачи съезда, «Известиям» рассказывает один из четырех сопредседателей оргкомитета съезда, академик Радим Гарецкий.

**Виктория Леонтьева.** Радим Гаврилович, недавно в прессе появилось сообщение Министерства юстиции о том, что документы, принятые на съезде, не будут иметь никакой юридической силы.

**Радим Горецкий.** Меня эта информация удивила. Ведь независимость Беларуси закреплена в Конституции. И Акт Независимости, который планируется принять на съезде, преследует цель сказать своему народу, России, соседям, всему миру, что большая часть белорусов хочет жить в независимом государстве. Ведь сегодня, по сути, идет речь о создании единого с Россией государства. Но при этом все время говорится о том, что будет сохранен суверенитет каждой страны. Но ведь это нереально, такого не может быть. Нас, интеллигенцию, испугала угроза потери Беларусью независимости. Смотрите, идет речь о единой валюте и едином эмиссионном центре. Конечно, он будет в Москве, и мы потеряем финансовый суверенитет. А он — один из важнейших составляющих государственного суверенитета.

В сущности, мы даже опоздали с проведением съезда — его нужно было проводить, может быть, еще год назад. Нам казалось раньше, что двусторонняя интеграция не будет угрожать белорусской независимости. Но сейчас мы видим, что это не так. Я совершенно уверен, что большое количество граждан Беларуси видит свою жизнь в суверенной стране. Именно поэтому было инициировано проведение съезда.

**В. Л.** Не опасаетесь ли вы того, что съезду припишут антироссийскую направленность?

**Р. Г.** Нет, это совершенно неправильно. Никогда против России никто не выступал. Мы, организаторы съезда, наоборот, за тесную дружбу с Российской Федерацией, за эффективные экономические связи. Но — как два самостоятельных государства. Об этом речь и идет. И в опубликованном в СМИ проекте Акта Независимости так и записано, что мы хотим видеть Россию великой демократической и

---

* Известия. 2000. 28 июля. Ответы на вопросы В. Леонтьевой.

дружественной нам державой. Развивать активно двусторонние связи можно и без образования единого государства. Наоборот, и России, и Беларуси выгоднее иметь два голоса на международной арене, высказывая свою точку зрения по тем или иным вопросам, чем один.

**В. Л.** Я знаю, что во многих регионах на съезд выдвигались делегаты. Сколько их примет участие в предстоящем форуме?

**Р. Г.** Официально нам разрешено проведение мероприятия с участием 800 человек. И у нас примерно столько же делегатов есть на сегодняшний день. Был довольно четкий регламент при выдвижении — от 10 тысяч человек один делегат. Конечно, нельзя сказать, что мы стопроцентно справились с этой задачей, были некоторые трудности на местах. Но мы постарались охватить максимум территории республики. Кроме этого, в работе съезда примут участие представители различных организаций, партий и движений — всего их около 200. Мы бы не возражали и против того, чтобы в работе съезда участвовали и представители официальных властей.

## НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ БЕЛАРУСІ*

Адна з галоўных каштоўнасцяў кожнага народа — незалежная дзяржава, пабудова якой перш-наперш справа самога народа. Дзяржаўнасць беларускага народа мае тысячагадовыя вытокі і была закладзена ў самастойных княствах — Полацкім, Смаленскім, Тураўскім і інш. Найбольшага росквіту яна дасягнула ў XV — XVI стст. («залатым веку») у Вялікім княстве Літоўскім. Пасля страты дзяржаўнасці беларуская нацыянальная ідэя, стрыжнем якой было стварэнне незалежнай дзяржавы і нацыянальнае адраджэнне, увесь час жыла ў сэрцах і розуму лепшых сыноў беларускага народа. Спроба аднавіць самастойную дзяржаву была зроблена абвяшчэннем БНР. Затым была стрована БССР. І вось 27 ліпеня 1990 г. была прынята Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі. Як бачыце, наш з'езд невыпадкова сабраўся менавіта цяпер. Мы адзначаем 10-ю гадавіну гэтага важнейшага Акта. Сардэчна віншую ўсіх са святам Дня незалежнасці! Дарэчы, вельмі паказальна, што нашы ўлады зусім не адзначаюць такі важны для дзяржавы дзень і іншым таксама стараюцца забараніць гэта рабіць.

Выступаючы ў філармоніі на ўрачыстым пасяджэнні, прысвечаным першай гадавіне аб'яўлення суверэнітэту Беларусі, я тады сваё выступленне закончыў словамі: «Гісторыя дала нам яшчэ адзін (магчыма, апошні) шанц, калі мы можам змяніць лёс нашай Радзімы. Галоўная мэта — зрабіць Дэкларацыю рэальнай. Прыняць Дэкларацыю — гэта яшчэ не набыць незалежнасць. Гэта толькі першы крок. Усе павінны

* Народная воля. 2000. 2 жн. Даклад на Усебеларускім з'ездзе за незалежнасць (29 ліпеня 2000 г.) «Толькі адна поўная дзяржаўная незалежнасць можа даць і праўдзівую свабоду, і багатае існаванне, і добрую славу нашаму народу».

клапаціцца аб тым, каб яна не засталася толькі на паперы». На жаль, зараз я зноў вымушаны выступаць з тым жа непакоем, а можа, яшчэ і з большым.

Суверэнітэт — гэта незалежнасць дзяржавы ад іншых дзяржаў у яе ўнутраных справах і міжнародных зносінах, калі ўлады вырашаюць свае справы самастойна і перш-наперш на карысць сваёй краіны, свайго народа. Незалежнасць — інтэгральны феномен, які складаецца з многіх кампанентаў, страта аднаго з якіх можа нанесці частковую ці значную страту незалежнасці, а то і зусім пахіснуць яе. Гэтыя кампаненты — родная мова і нацыянальная культура, адукацыя і навука, эканоміка (прамысловы і аграрны яе сектары, фінансава-крэдытная сфера), рознабаковая бяспека: харчовая, ваенная, інфармацыйная, здароўя, сацыяльная, экалагічная, дэмаграфічная і інш. Вырашэнне азначаных накірункаў можа выканаць толькі вельмі адукаванае, культурнае, кампетэнтнае, нацыянальна свядомае кіраўніцтва, якое павінна праводзіць шэраг разумных эканамічных, сацыяльных і палітычных рэформаў.

Для Беларусі надзвычай актуальная праблема мовы. Трэба помніць, што менавіта ліквідацыя беларускай мовы як дзяржаўнай, паланізацыя грамадства паступова прывяла да аслаблення і амаль страты незалежнасці Вялікага княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай, а затым з уваходам у Расійскую імперыю — і дзяржаўнасці.

Стан з беларускай мовай катастрафічны. Ідзе знішчэнне беларускамоўнага навучання: няма адпаведных садкоў, беларускамоўная школа — рэдкая, ужо амаль унікальная з'ява, ідэя стварыць Беларускі нацыянальны універсітэт выклікае ва ўладзе адмоўную рэакцыю. Ва ўрадзе беларускай мовы амаль не чуваць, нашы заканадаўцы — «сенатары і палатнікі» — поўнасцю цураюцца роднага слова. Кіраўнік дзяржавы за 6 гадоў троху больш за гэтую лічбу разоў звяртаўся да свайго народа на роднай мове. Калі такое здараецца (а бывае яно толькі на свята), дык успрымаецца як сенсацыя. Нядаўна нават маскоўскае тэлебачанне падкрэсліла, што выступленне было па-беларуску. Звычайна ён стараецца размаўляць на мове суседняга народа, а калі скажа пару слоў на роднай, дык яны маюць здзеклівы сэнс, накіраваны ў бок апазіцыі. Лічыць, што беларуская мова недасканалая. Прачытаў бы выказванне Адама Міцкевіча! Няўжо не разумее, што гэтым ён абражае ўвесь народ беларускі, а сябе ставіць перад усім светам у неймаверна смешнае становішча.

Нашы кіраўнікі часта любяць нагадваць, што двухмоўе ёсць і ў іншых краінах — напрыклад, у Фінляндыі. Але там, у адрозніванне ад нас, сапраўднае двухмоўе: калі не ведаеш і не карыстаешся абедзвюма мовамі, а толькі шведскай, дык Вас, шаноўныя, не выбралі б не тое што ў дэпутаты ці прызначылі міністрам, а нават не паставілі кіяскёрам, клеркам на пошту ці прыбіральшчыкам. Дарэчы, гэта датычыцца амаль усіх дырэктараў і кіраўнікоў заводаў, прадпрыемстваў, калгасаў Беларусі. Няма роднай мовы ў большасці навучальных устаноў і навуковых інстытутаў, магазінах і паліклініках, банках і пошце. Знікла яна з урадавай і іншай дакументацыі. Сорам! Асабліва сумна, калі не карыстаюцца мовай карэннага насельніцтва прыхільнікі незалежнасці

Беларусі — усе грамадзяне краіны любой нацыянальнасці, асабліва беларусы. Закон аб мовах трэба выконваць — яго, дзякуй Богу, яшчэ ніхто не адмяняў! А нашы шыльды, назвы пасёлкаў, калгасаў, вуліц? — няма ў іх беларускай адметнасці! Вось чаму беларускамоўны беларус часта так няўтульна пачувае сябе ў сваёй роднай Беларусі, як быццам ён — носьбіт самай малой нацыянальнай меншасці сярод чужынцаў. Так не павінна быць! Трэба спыніць этнацыд беларускага народа!

Не будзе мовы, не будзе беларусаў, не будзе дзяржавы. Беларус па паходжанню, але без роднай мовы — гэта ўжо не сапраўдны беларус, а наша краіна без сапраўдных беларусаў — ужо не Беларусь. Таму беларуская мова — галоўны атрыбут дзяржаўнасці і незалежнасці Беларусі. Страта беларускай мовы — вось дзе самая вялікая небяспека для самастойнасці краіны. Для рускай мовы ў Беларусі ніякай небяспекі няма — яна была, ёсць і павінна заставацца мовай міжнацыянальных зносін, як і запісана ў Канстытуцыі 1994 года.

Дзіву даешся: мова, якая ўжо больш за тры стагоддзі знаходзіцца пад моцным уціскам неспрыяльных умоў і нават забаронай, жыве! Значыць, будзе жыць і квітнець наша цудоўная беларускай мова!

Нельга пахваліцца нам развіццём нашай самабытнай нацыянальнай культуры, дзяржаўнай падтрымкай друку кніг беларускіх пісьменнікаў, беларускамоўнага тэатра, — усё гэта не «славянскі базар». Нядаўні яскравы прыклад: міністр культуры зняў з пасады мастацкага кіраўніка Тэатра беларускай драматургіі («Вольная сцэна») Валерыя Мазынскага. Васіль Быкаў у інтэрв'ю (Наша свабода. 2000. 11 ліп.) сказаў на гэты конт: «Беларуская літаратура сёння ў стане катастрафічнага заняпаду. Не з прычыны браку таленавітых аўтараў і добрых тэкстаў, колькі з выніку палітыкі ўладаў, скіраванай на выціскання беларускай мовы з жыцця грамадства і замены яе мовай рускай. Ці можна сабе ўявіць большую катастрофу для нацыянальнай культуры? Уплыў гэтай трагедыі перабольшвае памеры Чарнобыльскай бяды, бо наступствы Чарнобыля закранулі адну пятую тэрыторыі Беларусі, а моўная палітыка рэжыму ахоплівае тэрыторыю ўсёй краіны».

У гісторыі Беларусі рэлігія, на жаль, не спрыяла дзяржаўнасці і незалежнасці. Яна больш раз'ядняла беларусаў, працавала на іх русіфікацыю ці паланізацыю, бо лічылася, калі праваслаўны — дык рускі, калі каталік — дык паляк. Можа, некаторы час слабым выключэннем было уніяцтва. Цяпер вельмі важна, каб галоўныя канфесіі Беларусі (праваслаў'е, пратэстанства, каталіцтва, уніяцтва) сталі беларускамоўнымі, па-сапраўднаму нацыянальнымі. Можа, тады Беларусь нават стане цэнтрам экуменічнага руху ў сусветным царкоўным жыцці.

Калі глядзіш наша тэлебачанне, дык можа здацца, што ўжо жывеш у Расіі, таму нас часам больш хвалююць расійскія падзеі. Мы ведаем іх шматлікіх палітыкаў, а ў сябе — толькі аднаго. Чаму амаль зусім не паказваюць жыццё суседзяў — асабліва Украіны, краін Балтыі? У Беларусі інфармацыйнай прасторы няма!

Адзначаныя працэсы прыводзяць да страшэннай асіміляцыі беларусаў, русіфікацыі іх свядомасці не толькі ў эміграцыі, але ў самой

метраполіі. Часта пры звычайнай размове пра якую-небудзь з'яву ў замежжы можна пачуць ад беларуса: «А ў нас, рускіх» ці «а ў нас, славян».

У цяжкім стане знаходзіцца беларуская навука (а яе патэнцыял вялікі!), і што асабліва крыўдна — яе шматлікія распрацоўкі (у тым ліку і розныя прагрэсіўныя тэхналогіі) застаюцца незапатрабаванымі. Менавіта ж развіццё навукі, энерга- і неметалаёмістых галін вытворчасці пры значных інвестыцыях і дэмакратызацыі грамадства вывелі на высокія паказчыкі гаспадаркі і жыцця Японію і некаторыя іншыя дзяржавы.

Эканамічную сітуацыю ў Беларусі нядаўна падсумоўваў Васіль Шлындзікаў у артыкуле, надрукаваным у «Народнай волі» 7 ліпеня 2000 г. Ён робіць вывад, што за 6 апошніх гадоў «давялі да галечы лепшыя прадпрыемствы краіны, стварылі крызіс неплацяжоў», «правялі арышты найбольш вядомых гаспадарнікаў», «фактычна нацыяналізавалі банкаўскую сістэму», «кінуты акцыянеры айчынных прадпрыемстваў», ідзе «мэтанакіраваная ліквідацыя прыватнага сектара эканомікі, малога і сярэдняга прадпрымальніцтва», «стала магчымым без суда і следства канфіскоўваць маёмасць прыватных фірм і грамадзян», «Беларусь становіцца ізгоем міжнароднага грамадства», «выціскаюцца апошнія сокі праз падаткі, інфляцыю, розніцу валютных курсаў, цэнаўтварэнне», «праца калгаснікаў, па сутнасці, ператварылася ў рабскую», «асноўныя фонды прамысловасці фізічна і маральна старацца», «нацыянальная гаспадарчая эліта шэльмуецца, знішчаецца, дэмаралізуецца», «прамысловасць губляе нават традыцыйныя рынкі, у тым ліку і расійскія» і г. д.

А вось адтуль жа некаторыя лічбы: «вытворчасць кормаўборачных камбайнаў у 1999 г. склала 28,6% да ўзроўня1994 г., трактароў — 64%, грузавых аўтамабіляў — 54,3%, зерня — 59,8%, бульбы — 90,9%, жывёлы і птушкі — 77%, малака — 79%»; «33,6% прадпрыемстваў стратныя, 29,2% — наогул не маюць абаротных сродкаў; у Магілёўскай вобл. стратныя 43% прадпрыемстваў, у Віцебскай — 42%»; «у вёсцы спраўных трактароў засталося толькі 45% ад неабходных», «каля 80% сельскіх гаспадарак стратныя», «пасевы зерня выкарыстоўваліся амаль на 180 тыс. га са зніжэннем ураджаю з 20,4 да 14,5 цэнтнера з га», «за шэсць гадоў рубель стаў больш танны ў 440 разоў» і г. д. Запазычанасць па зарплаце дасягнула 22,7 млрд. руб. Другі наш выдатны эканаміст У. Кулажанка таксама прыйшоў да высновы, што ў краіне «складваецца тупіковая сітуацыя».

Выклікае трывогу экалагічны стан краіны, асабліва ў сувязі з паступовай звыкласцю і нават абыякавасцю ў адносінах да Чарнобыльскай навалы. Адносіны да прыроды, да лясных, рыбных, жывёльных, глебавых, мінеральных багаццяў застаюцца драпежніцкімі. Цяпер можна ўжо гаварыць і пра сацыяльную бяспеку, бо большасць насельніцтва Беларусі жыве па-за рысай беднасці.

Эканамічны і сацыяльны стан, бездухоўнасць, крыміналізацыя, адмоўная экалогія прыроды і жыцця прыводзяць да маральнага, фізічнага і грамадскага заняпаду, а ўсё разам — да сумных дэмаграфічных вынікаў: Беларусь займае адно з высокіх месц па самагубствах, захворваннях (і што найбольш небяспечна — па дзіцячых, толькі 10%

дзяцей нараджаюцца здаровымі, а ў чарнобыльскіх раёнах — 2,5%), інваліднасці, абяздоленых старых, за апошнія гады смяротнасць пачала значна апярэджваць нараджальнасць — ідзе фізічнае змяншэнне карэннага насельніцтва.

Ваенная дактрына нашай краіны павінна адпавядаць Канстытуцыі, у якой запісана: «Рэспубліка Беларусь... зыходзіць з прынцыпаў... непрымянення сілы або пагрозы сілай,... ставіць за мэту зрабіць сваю тэрыторыю бяз'ядзернай зонай, а дзяржаву — нейтральнай». Апошнія падпісаныя ваенныя дагаворы, настальгічныя заявы кіраўніка дзяржавы аб яе мінулай ядзернай зброі, вывад якой з тэрыторыі краіны ён кваліфікавай як злачынства, 300-, а то і 500-тысячнай расійска-беларускай ваеннай групоўкі, якая будзе ратаваць Беларусь і Расію ад НАТА — усё гэта пярэча узгаданаму артыкулу Канстытуцыі і выклікае адмоўную рэакцыю як у насельніцтва краіны, так і ва ўсім свеце.

Як бачым, па вельмі многіх паказчыках улады Беларусі паступова губляюць суверэнітэт краіны. Чаму так здарылася? Пасля распаду СССР бальшавіцкі рэжым не быў асуджаны і ва ўсіх уладных структурах засталіся былыя наменклатуршчыкі БССР, якія не навучыліся і шагу рабіць без дазволу Масквы, маюць вялікую настальгію па Саюзу і таму не ведалі і да гэтага часу не ведаюць, што ж рабіць з гэтай незалежнасцю, якая спусцілася на іх галавы так нечакана, як ад Бога, і што рэдка бывае — без усякіх ахвяр. Выкарыстаць гэты Божы дар яны няздольныя. І адразу ўладамі распачаўся працэс аб'яднання з Расіяй, спачатку павольны — уваход у адзіную грашовую зону, а ў апошнія пяць гадоў усё больш жорсткі і мэтанакіраваны — стварэнне адзінай дзяржавы.

Дык гэта вынік некампетэнтнасці ўлад ці мэтанакіраваная работа па інкарпарацыі Беларусі ў склад Расіі? Відаць, і тое і другое, але больш апошняе. Аб гэтым сведчаць нядаўнія паспешлівыя і мітуслівыя сустрэчы чыноўнікаў розных рангаў і ў Маскве, і ў Мінску; падпісанне кіраўнікамі абедзвух краін дагавораў і пагадненняў, зацвярджэнне ўякасці гімна Саюзнай дзяржавы былога гімна СССР, згода мець адзіныя расійскія грошы і адзіны эмесійны цэнтр (Гяращчанка два дні назад выказаў упэўненасць, што пагадненне будзе падпісана ўжо сёлета); агульную мытню, агульны саюзны бюджэт; правесці выбары ў агульны парламент, удзел нашых усходніх трох абласцей у Асацыяцыі абласцей Цэнтральнай Расіі і г. д. У любым выпадку такое «добраахвотнае» (а я думаю, для большасці жыхароў Беларусі — гвалтоўнае) аб'яднанне ўадзіную дзяржаву — самае страшнае, да чаго можа прывесці палітыка сучаснага рэжыму, — поўнай страты незалежнасці Беларусі. Хаця дзеянні кіраўнікоў дзяржавы і іх прыслужнікаў хаваюцца за рознымі хітрымі словамі пра захаванне суверэнітэту Беларусі, але не можа быць у адной дзяржавы двух дзяржаўных суверэнітэтаў. Чаму па такой важнай справе не зрабіць рэферэндум? Відаць, няма ўпэўненасці ў спрыяльным выніку.

Трэба нагадаць, што ў Канстытуцыі 1994 г. і нават ў дадатках да яе, прынятых на рэферэндуме 1996 г., напісана, што Прэзідэнт РБ

выбіраецца на 5 гадоў. Пытання аб працягу тэрміну прэзідэнства не было. Таксама народ не даваў дазволу на замену дэпутатаў Вярхоўнага Савета РБ з 260 выбарчых акругоў на 110 прызначаных прадстаўнікоў Палаты. Яны прадстаўляюць менш паловы выбаршчыкаў краіны. Мы павінны падзякаваць быламу Прэзідэнту РБ, што ён цяпер падпісвае такія недапушчальныя дакументы з урадам Расіі ў поўным нелігітымным стане — лягчэй будзе іх ліквідаваць.

Нам, беларусам, трэба не забываць, што Расіі яшчэ значна цяжэй, чым нам, будаваць дэмакратычную цывілізаваную дзяржаву, бо яна доўгія гады была, па Леніну, «турмой народаў», затым стала ядром таталітарнай краіны — «архіпелагам ГУЛАГ», а цяпер, па словах Яўлінскага, — суцэльным мінным полем. Расія не здольна забяспечыць усе свае тэрыторыі нармальным жыццём, вядзе вайну, мае велізарныя даўгі перад многімі краінамі, праядае свае апошнія нафта- і газадолары, клянчыць крэдыты і інвестыцыі і г. д. Кіраўнікам Расіі неабходна кінуць імперскія імкненні і амбіцыі па пашырэнні сваёй тэрыторыі, поўнасцю заняцца наладжваннем гаспадаркі, жыцця народа ў сябе. Калі нашы кіраўнікі добра ставяцца да свайго «старэйшага брата» (у чым бясконца яны клянуцца), дык неабходна не цягнуць з яго танныя энергарэсурсы, улязая ў пастаянныя даўгі, не перакладваць ва ўмовах аб'яднання ўвесь цяжар эканамічнага крызісу на яго плечы, не клянчыць падачку ўжабрака, а будаваць самастойную дзяржаву, для чаго правесці адпаведныя дэмакратычныя рэформы, выйсці з сучаснага стану міжнароднай ізаляцыі.

Мы ўжо былі ў адзінай дзяржаве пад назвай СССР і па той Канстытуцыі таксама самастойнай БССР. Але па так званай «незалежнасці» таго часу кожную дробязь — напрыклад, дазвол на змену назвы інстытута, выданне кнігі, кандыдатуры для выбараў у акадэмікі (не кажучы ўжо аб больш сур'ёзных справах) — трэба было ўзгадніць і атрымаць дазвол у Маскве, ды прытым, як кажуць, яшчэ везці з сабой прыніжаючы годнасць абодвух бакоў «падаруначкі» ў дыпламаце. Калі гэта нашы «інтэгратары» лічаць захаваннем суверэнітэту, дык няхай для аб'яднання пакінуць Беларусь у спакоі! Канстытуцыя РБ гаворыць: «Рэспубліка Беларусь... самастойна ажыццяўляе ўнутраную і знешнюю палітыку. ...абараняе сваю незалежнасць і тэрытарыяльную цэласнасць, канстытуцыйны лад, забяспечвае законнасць і правапарадак». Парушаць Канстытуцыю не можа ніхто! Калі сыходзіць з міжнароднага разумення правоў чалавека, дык кожны жыхар Беларусі мае права патрабаваць суверэнітэт і незалежнасць сваёй дзяржавы.

Вельмі паказальна, што калі сустаршыні аргкамітэта Усебеларускага з'езда сустракаліся з пасламі шэрага краін, каб растлумачыць мэты форума і запрасіць іх на яго, дык пасол толькі адной краіны, а менавіта Расіі, не захацеў нават размаўляць пра незалежнасць Беларусі і адмовіўся іх прыняць, а мінюст Беларусі так спалохаўся, што яшчэ за некалькі дзён да з'езда і да прыняцця Акта Незалежнасці абвясціў, што гэты і іншыя дакументы не маюць юрыдычнай сілы, хаця артыкул пра незалежнасць Рэспублікі Беларусь запісаны ў Канстытуцыі.

Трэба зразумець, што з усіх бакоў і Расіі, і Беларусі больш выгадна, каб абедзве краіны захоўвалі незалежнасць і выступалі на міжнароднай арэне не як адна дзяржава, а як дзве дружалюбныя суседкі. Тады будзе і «калідор» у Еўропу для Расіі, і энергетычны партнёр для Беларусі, бо эканамічныя, гандлёвыя, культурныя і іншыя ўсебаковыя зносіны ніхто не перашкаджае паспяхова развіваць і цяпер. Спасылка на аб'яднанне краін Еўропы недарэчная, бо яно там робіцца зусім на іншых падставах. Няхай жывуць дзве незалежныя дэмакратычныя дружалюбныя дзяржавы — вялікая Расія і вольная Беларусь! Тое ж самае хочацца сказаць і пра іншыя нашы суседнія краіны — Украіну, Польшчу, Літву і Латвію.

Калі параўнаць Беларусь з іншымі краінамі Еўропы, дык па многіх галоўных паказчыках (тэрыторыя, насельніцтва, багацце нетраў, біялагічныя рэсурсы, прыродныя ландшафты і турыстычныя магчымасці, рабочы і інтэлектуальны патэнцыялы, развіццё навукі і культуры, старажытнасць гісторыі, перспектывы пашырэння сельскай гаспадаркі, прамысловасці і г. д.) наша краіна ўваходзіць ці ў першую дзесятку, ці ў першую палову. Калі да гэтага дадаць выгаднае геаграфічнае палажэнне краіны ў самым цэнтры Еўропы, Беларусь, безумоўна, мае ўсе падставы стаць багатай дэмакратычнай квітнеючай дзяржавай у шэрагу цывілізаваных краін Еўропы. Для гэтага неабходныя эканамічныя, сацыяльныя, палітычныя рэформы ва ўмовах дэмакратызацыі і свабоды СМІ, нармальныя міжнародныя зносіны з суседнімі і ўсімі краінамі свету, значныя інвестыцыі і г. д.

Шлях да Беларусі яшчэ далёкі: трэба пераадолець усе тыя недахопы, пра якія гаварылася вышэй. Сярод іх вельмі важна, каб Homo soveticus пераўтварыўся ў Homo belarusicus. Толькі беларуская нацыянальная ідэя (дзяржаўнасць, незалежнасць, дэмакратыя, нацыянальнае адраджэнне) можа аб'яднаць народ Беларусі. Але галоўнае — каб шлях не абарваўся ў бездань. Для гэтага патрэбен суверэнітэт, патрэбна незалежная дзяржава Беларусь! Трэба помніць прарочыя словы вялікага Янкі Купалы, якія ён напісаў яшчэ ў 1919 г.: «Толькі адна поўная дзяржаўная незалежнасць можа даць і праўдзівую свабоду, і багатае існаванне, і добрую славу нашаму народу».

Няхай па ўсёй Беларусі гучыць цудоўная мова наша, квітнее культура і навука, лунае над вольнай краінай бел-чырвона-белы сцяг і наперад ляціць Пагоня! Няхай багата і шчасліва жывуць усе народы Беларусі паміж дружалюбных краін-суседак! Незалежнасць Беларусі навечна! Бог не пакіне землю нашу! Жыве Беларусь!

# ДВАЦЦАТАЕ СТАГОДДЗЕ СЯМ'І ГАРЭЦКІХ*

## РАДЗІМ ГАРЭЦКІ: «ЖАДАЮ, КАБ У XXI СТАГОДДЗІ ЖЫЛА БЕЛАРУСКАСЦЬ, БЫЛА БЕЛАРУСЬ!»

У гісторыі гэтай сям'і — трагічная гісторыя нашай Беларусі на працягу XX стагоддзя.

Максім Гарэцкі — класік беларускай літаратуры — быў рэпрэсаваны і расстраляны па рашэнню «тройкі» ў 1938 годзе. Яго малодшы брат, акадэмік Гаўрыла Іванавіч Гарэцкі, таксама праследаваўся ўладамі. Яго арыштоўвалі пяць разоў, двойчы прыгаворвалі да растрэлу. Ён цудам застаўся ў жывых.

Сын Гаўрылы Іванавіча — Радзім Гарэцкі — беларускі вучоны ўгаліне геалогіі, акадэмік, прэзідэнт Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына».

**М. Э.** Радзім Гаўрылавіч, у Вас няма асабістай нянавісці да гэтага стагоддзя — стагоддзя бязлітаснага, жорсткага, несправядлівага? У тым ліку — і да Вашай сям'і?

**Р. Г.** Як ні дзіўна, нянавісці няма. Не было яе нават і ў майго бацькі, і я ведаю, што не было ў дзядзькі Максіма. Мне не давялося бачыць Максіма Іванавіча. Я нарадзіўся ў канцы 1928 года, а яго ў 30-м забралі бальшавікі. Але па расказах маёй стрыечнай сястры і бацькі я ведаў, што Максім Іванавіч быў надзвычай добрым, лагодным чалавекам. Да ўсіх людзей адносіўся вельмі спагадліва.

**М. Э.** Калі Вы пазнаёміліся з творчасцю Максіма Гарэцкага? Ад Вас не ўтойвалі праўду пра лёс дзядзькі?

**Р. Г.** У той час, асабліва пры Сталіне, гэта была забароненая тэма. Нават у нашай сям'і. З аднаго боку, гаварыць пра тое, што адбываецца ў краіне, было небяспечна: сёння скажаш — заўтра цябе забяруць. З другога боку, бацька не любіў успамінаць перажытае. Тое-сёе я ведаў, але некаторыя дэталі, падрабязнасці — не. Я сам бачыў, што адбываецца ў краіне. Я жыў з бацькамі на Поўначы, вакол было шмат зняволеных...

Праўду пра смерць Максіма Гарэцкага не ведаў нават мой бацька. У нашай сям'і доўгі час захоўвалася афіцыйнае паведамленне, што Максім загінуў ад кровазліцця ў мозг у КоміАССР у 1939 годзе. Ва ўсіх даведках, падручніках пазней таксама тыражыравалася гэтая інфармацыя. І ўвесь час мы так і думалі. Бацька памёр у 1988 годзе і, на жаль, так і не даведаўся праўды. А на самой справе Максіма Гарэцкага забралі ў канцы 1937 года, а ўжо 10 лютага 1938 года расстралялі ў Вязьме. Яго абвінавацілі ў контррэвалюцыйнай дзейнасці. Я даведаўся аб гэтым не так даўно, калі трапіў у архівы КДБ. Перабудова дала нам той невялікі адрэзак часу, калі мы свабодна ўздыхнулі, калі не было бясконцага страху, навалы дзяржаўнай хлусні.

---

* Народная воля. 2000. 3 снеж. Гутарка з М. Эйсмант.

Наш зямляк, падпалкоўнік КДБ Мікалай Ількевіч, які доўгі час працаваў у Смаленску і займаўся рэпрэсаванымі, знайшоў пратакол расстрэлу Максіма Гарэцкага і перапісаў яго. Жудасны, страшны дакумент. Калі я чытаў гэты пратакол, мне, 60-гадоваму мужчыну, было не па сабе: за 15 хвілін служакі НКУС паспелі вывесці з турмы майго дзядзьку і яшчэ 39 чалавек, усіх расстраляць, а затым закапаць «на адпаведную глыбіню». За 15 хвілін — 40 чалавек! І так адбывалася амаль штодзённа.

Я падлічыў, што Максіму Гарэцкаму давялося пражыць у больш-менш нармальных умовах усяго каля 13 гадоў. Ён рана пакінуў бацькоўскую хату, пайшоў вучыцца... Потым пачалася Першая імперыялістычная вайна. Максім Іванавіч ваяваў 4 гады. Быў паранены, доўга лячыўся, атрымаў Георгіеўскі крыж. У сваіх успамінах Максім пісаў, што 4 гады жыцця прайшлі дарма. Але ў тыя часы Максім Іванавіч напісаў выдатны твор «На імперыялістычнай вайне», які параўноўваюць з творамі Рэмарка, Барбюса. Гэта адзін з найлепшых твораў Гарэцкага.

**М. Э.** Вы ведалі, што давялося перажыць Вашаму бацьку ў 30-я гады? Ён расказваў Вам аб гэтым?

**Р. Г.** Ён не любіў гаварыць аб тым, што яму давялося перажыць. Майго бацьку пяць разоў арыштоўвалі, два разы прыгаворвалі да вышэйшай меры — расстрэлу. Ён нейкім цудам выратоўваўся. Больш за 25 гадоў — з 1930 па 1956-ты — пражыў пад кляймом «вораг народа».

Пакаленне майго бацькі — трагічнае пакаленне. На нашу долю выпала многа, на вашу — ужо менш, але таксама хапае. А тое пакаленне — вельмі трагічнае. Што яно атрымала? Гора, пакуты, страты. Спачатку імперыялістычная вайна, потым — рэвалюцыя, голад.

Глыток свабоды, надзеі быў вельмі кароткім. 10 гадоў. З 1920 па 1930 год, калі ўтварылася савецкая ўлада, калі на словах бальшавікі гаварылі аб незалежнасці кожнай рэспублікі. І цэлае пакаленне верыла. 20-я гады — час беларусізацыі, адраджэння. Маладой беларускай інтэлігенцыі здавалася, што тое, аб чым яны марылі, збываецца. Яны кінуліся працаваць на росквіт сваёй Радзімы. Маладыя, таленавітыя, рамантычныя. У тыя гады стваралася Беларуская акадэмія навук. 1 студзеня 1929 года адбылося яе ўрачыстае адкрыццё. Разам з іншымі вучонымі ў яе стварэнні прымаў удзел і мой бацька. Гаўрыла Гарэцкі быў самым маладым беларускім акадэмікам і застаецца ім па сённяшні дзень — ён атрымаў званне ў 28 гадоў...

Пасля прыйшлі калектывізацыя, індустрыялізацыя, ГУЛАГ. У ліпені 1930 года многіх, хто ўдзельнічаў у стварэнні Акадэміі навук Беларусі, забралі. Арыштавалі амаль 20 чалавек, сярод якіх было 6 вядомых акадэмікаў: Ластоўскі, Пічэта, Лёсік, Некрашэвіч, Гарэцкі, Дубах. Бацьку прыгаварылі да вышэйшай меры і толькі ў апошні момант замянілі меру пакарання на 10 гадоў лагера. Яго паслалі на Беламорска-Балтыйскі канал. Ён займаўся інжынернай геалогіяй, а без інжынернай геалогіі нельга было будаваць усе гэтыя ГЭСы, каналы, шлюзы. Пазней бацька расказваў, што яму па сакрэту следчы Юдашкін паведаміў страшэнную тайну: быццам бы многія спісы на расстрэл у пачатку 30-х гадоў

падпісваў сам Сталін. І калі ў 31-м годзе Чарвякоў і Галадзед павезлі прысуды па розных справах у Маскву, яны папрасілі зменшыць меру пакарання Гаўрылу Гарэцкаму. Сталін спытаў: «Так сколько ему лет?» — «Трыццаць», — адказалі беларускія партыйцы. Тады ён і кажа: «Еще молодой — пусть немного поживет», — і выкрасліў прозвішча са спіса.

Бацьку рэабілітавалі пасля смерці Сталіна. У 1956 годзе. Але нягледзячы на тое, што ён ужо быў «чыстым» з усіх бакоў, удзельнічаў у многіх вялікіх будоўлях савецкага часу, ён не мог вярнуцца на Радзіму. Бацька пісаў Якубу Коласу: «Мая мара зноў бы, хоць пад канец жыцця, вярнуцца на Радзіму, не дзеля таго, каб проста легчы ў зямлю, але каб хоць трошкі папрацаваць, аддаць свае апошнія сілы Радзіме». Вярнуцца ў Беларусь яму дазволілі толькі праз 10 год. У 1968 годзе, калі бацьку ўжо было 68 гадоў.

**М. Э.** Вы таксама ўвесь гэты час жылі далёка ад Радзімы?

**Р. Г.** І я, і мой бацька — мы амаль сорак гадоў не былі ў Беларусі. Мяне заўсёды нейкай неверагоднай сілай цягнула на Радзіму, дзе я, па сутнасці, ніколі не жыў. Мяне вывезлі з Беларусі 5-гадовым хлопчыкам. Я добра памятую, як мы жылі. Бадзяліся па Расіі. Мяняліся будоўлі, і мы ўвесь час пераязджалі. Я паспеў павучыцца ў 13 школах, пакуль скончыў 10 класаў. Потым быў Маскоўскі нафтавы інстытут, праца ў адным з лепшых інстытутаў свету — Геалагічным інстытуце Акадэміі навук СССР. Я меў добрую пасаду, добрую перспектыву. Але калі бацьку дазволілі вярнуцца на радзіму, я паехаў следам.

Бацька жыў у Беларусі апошнія гады свайго жыцця, з 1969 па 1988 год. Ён казаў, што гэта былі самыя шчаслівыя гады. Увесь час я прасіў яго напісаць успаміны. Ён ведаў усіх нашых адраджэнцаў — Ластоўскага, Лёсіка, Якуба Коласа, Янку Купалу, сябраваў з усімі вучонымі, прадстаўнікамі культуры, многімі палітыкамі. Але ён увесь час адкладваў гэта на потым. Можна сказаць, што аб сваім жыцці ён расказваў мне толькі ў апошні год, і я, дзякуй богу, паспеў штосьці запісаць.

**М. Э.** Радзім Гаўрылавіч, а чаму Вы ўступілі ў партыю? Савецкая ўлада прынесла гора ў Вашу сям'ю. Вы самі кажаце, што разумелі, што адбывалася ў краіне ў тыя часы, і ўсё роўна сталі членам гэтай партыі.

**Р. Г.** Няпростае пытанне... Мой бацька ніколі не быў членам партыі. Я быў, а ён — не. Ведаеце, у жыцці ўсё адбываецца нечакана, і ў мяне склалася такая сітуацыя. Я ўступіў у партыю пад уплывам «хрушчоўскай адлігі», у 1963 годзе.

Я працаваў у Геалагічным інстытуце Акадэміі навук СССР, па натуры быў вельмі актыўным чалавекам, мяне заўсёды некуды «піхалі». Аднойчы мяне выклікае дырэктар інстытута — вядомы акадэмік А. В. Пейве — і давіць на мяне: «Уступі ў партыю. Ты зразумей, калі ў партыі будуць адны гады, то што гэта будзе за партыя. Трэба, каб і нармальныя людзі ўступалі». І я ўступіў. Праўда, мяне раздражняла хлусня: гаварылі адно, а рабілі іншае. Як пісаў Максім Гарэцкі: дзве душы. Двудушша ўсюды...

**М. Э.** Потым было сорамна? Партыйны білет публічна не рвалі?

**Р. Г.** Сорам быў. Але я ніколі не лаяў гэтую партыю. Я выйшаў з партыі ціха, калі пачалася перабудова, калі яшчэ была партыя, ЦК. Упачатку 90-х мяне ўразілі трагічныя падзеі ў Вільнюсе, калі ўвесь горад выйшаў да тэлецэнтра бараніць дэмакратыю. Тады ў Вільнюс паехала наша дэлегацыя, у складзе якой быў мой сябра Ніл Гілевіч. Ён расказваў мне, што там адбывалася на самой справе, а не тое, што нам казалі партыйныя лідэры па радыё і тэлебачанні. Я зноў убачыў гэтую хлусню... Я ўстаў на партыйным сходзе і ціха сказаў: «Я выходжу з партыі». І выйшаў. Не пісаў ніякіх заяў, а проста перастаў хадзіць на сходы. Гэта было падобна на ўзрыў бомбы. Аб маім «учынку» стала вядома партарганізацыі акадэміі, мяне выклікалі ў ЦК, сарамацілі... А пазней пачалі ўсе выходзіць. Многія гучна, праз газету...

**М. Э.** Вы вярнуліся ў Беларусь у 43 гады. І так добра ведаеце родную мову.

**Р. Г.** З мовай сітуацыя цяжкая. Я ніколі яе не вучыў. Да 9-га класа ўвесь час знаходзіўся ў рускамоўным асяроддзі. Нас з братам гадавалі бабуля і дзядуля па матчынай лініі. Яны — рускамоўныя беларусы, з Беластока. Дзед працаваў на чыгунцы, быў правадніком, начальнікам станцыі, ездзіў увесь час на Украіну, у Нямеччыну. Па лініі бабулі ў нашым родзе былі казакі. Мая маці добра ведала беларускую мову. Яна вучылася разам з бацькам у Ціміразеўскай акадэміі. Была членам Беларускай культурна-навуковай асацыяцыі студэнтаў, дзе пазнаёмілася з бацькам. Студэнтамі яны і ажаніліся. Паміж сабою бацькі заўсёды размаўлялі па-беларуску. У 30-м годзе бацьку забралі. Маці, маладая 28-гадовая жанчына, засталася адна з двума сынамі на руках. Яе выкінулі з кватэры, выкінулі з працы, усе ад яе, жонкі «ворага народа», шарахаліся. З вялікай цяжкасцю яна змагла ўладкавацца на працу ў Брылёва, пад Гомелем: яе пашкадаваў знаёмы і ўзяў на працу. З Мінска мы пераехалі ў вёску, маці працавала дзень і ноч. Потым, калі ў 34-м годзе мы паехалі да бацькі ў Карэлію, я ўсё роўна з ім амаль не бачыўся: то ён у камандзіроўцы, то зноў у турме. Яго нават у Карэліі бралі два разы: у 37-м і 38-м гадах. Потым пачалася вайна, бацька працаваў на абарончых будаўнічых аб'ектах, а мы паехалі ва Удмурцію. Праўда, іншы раз я атрымліваў ад бацькі лісты, ён пісаў і мне, і маці па-беларуску. Бацька вельмі перажываў, што мы з братам не ведаем родную мову. І толькі калі мы пачалі жыць разам з бацькам, я пачаў патроху размаўляць па-беларуску.

**М. Э.** Адкуль у Вас такое імя — Радзім?

**Р. Г.** Мой бацька — вялікі патрыёт нашай Беларусі. Яго называлі нацыяналістам, саджалі за яго бязмежную любоў і адданасць сваёй Бацькаўшчыне. Але па-сапраўднаму нацыяналіст — гэта патрыёт. Толькі ў нас гэтае слова мае такое бязглуздае тлумачэнне. У Амерыцы або ў Еўропе нацыяналіст гучыць як пахвала.

Бацька вельмі добра ведаў гісторыю Беларусі, і яму хацелася даць такія імёны сваім сынам, каб адразу было відаць, адкуль яны, дзе нарадзіліся. Майго старэйшага брата ён назваў Усяславам. Гэта мы зараз ведаем, хто такі Усяслаў, а раней не ведалі. Радзім — гэта ад радзімічаў. На Беларусі былі плямёны радзімічаў, крывічоў і дрыгавічоў. Ёсць такі

міф, што два браты спусціліся з Карпацкіх гор. Адзін — Радзім, другі Вятка. Радзім асеў у раёне Дняпра і Сожа і стварыў племя радзімічаў, а Вятка пайшоў далей.

**М. Э.** Радзім Гаўрылавіч, Вы калі-небудзь задавалі сабе пытанне: чаму менавіта Гарэцкім выпаў лёс змагацца за Беларусь? Адкуль такая самаахвярнасць?

**Р. Г.** Мне часта даводзілася чуць: ты прадстаўнік такога роду, знакавая фігура. А я заўсёды адчуваў сябе звычайным чалавекам. Беларускасць у мяне ўнутры, сама сабою, без усялякага асэнсавання. А пачуццё Радзімы перадалося ад бацькі. Ён, яшчэ будучы студэнтам, пад сваім першым артыкулам паставіў подпіс: «Сын маці-Беларусі». Бацька заўсёды выступаў супраць русіфікацыі, за беларускасць. У яго гэтая адданасць Бацькаўшчыне — ад Максіма. Максім быў на 7 гадоў старэйшы. Іх бацькі былі непісьменныя, але жылі ў народным асяроддзі, сярод беларускіх песень, фальклору. Маці выдатна ведала мову. Менавіта адтуль да Максіма прыйшла паэтычнасць, як ён сам пісаў, крышталёвая народная паэзія.

**М. Э.** Сёння, калі мы кажам пра род Гарэцкіх, то ўзгадваем толькі тры імёны: Максім, Гаўрыла, Радзім. А як склаўся лёс дачкі Максіма?

**Р. Г.** Дачка Максіма — Галіна Максімаўна жыве у Санкт-Пецярбургу. Зараз — моцна хварэе. Ёй быў наканаваны вельмі цяжкі лёс. Спачатку — трагічны лёс бацькі. Потым — вайна, на якой загінуў яе брат Лёня. А ў канцы жыцця захварэла маці Леаніла Усцінаўна, сем гадоў была прыкавана да ложка, і Галя даглядала яе, ахвяравала сваё асабістае жыццё дзеля маці. І Галя, і Леаніла Усцінаўна вельмі многа зрабілі дзеля ўшанавання памяці пісьменніка. Дзякуючы ім захавалася спадчына Максіма Гарэцкага, яго творы.

Сёння працягу роду Гарэцкіх, можна сказаць, няма. Праўда, у Маскве жыве Максім Гарэцкі. Унук майго старэйшага брата. Але ён ужо — рускі. Нарадзіўся ў Маскве. Брат, пляменнік гаворыць па-беларуску, а Максім — ужо не. Даводзіцца толькі спадзявацца, што ён падрасце і сам зразумее, што Гарэцкія — беларусы. Майго брата Усяслава ведаюць усе дзеці Расіі. Ён аўтар розных «Букварей», галоўны рэдактар часопіса «Начальная школа».

**М. Э.** Калі ішла на сустрэчу з Вамі, чытала публіцыстыку Максіма, Гаўрылы Гарэцкіх. І мне стала вельмі сумна: за цэлае стагоддзе ў Беларусі амаль нічога не змянілася. І тыя звышзадачы культурна-адраджэнскіх сіл, якія браты Гарэцкія сфармулявалі яшчэ ў 1920 годзе, застаюцца па-ранейшаму актуальнымі. Быццам бы і не мінула 80 гадоў...

**Р. Г.** 20-я гады — час вялікіх мар беларускіх адраджэнцаў. Яны марылі аб новай, чыстай, адроджанай Беларусі. Але, на жаль, лёс нашай краіны не атрымаўся такім, беларусы не пайшлі па шляху адраджэння, як пайшлі, напрыклад, літоўцы. Разважанні Максіма Гарэцкага аб нацыянальным адраджэнні, беларусізацыі, аб тых мэтах і напрамках, па якіх павінна пайсці краіна, якімі павінны стаць беларусы, і сёння гучаць актуальна. Я чытаю гэтыя артыкулы, і часам мне здаецца, што яны напісаны сёння. Кажуць, развіццё ідзе па спіралі, угару. А мы ўсе 80 гадоў стаім на адным месцы, вырашаем адны і тыя ж задачы.

**М. Э.** Чаму так адбываецца менавіта з беларусамі? Чаму мы так абыякава ставімся да гісторыі сваёй краіны? Чаму з такой лёгкасцю адмаўляемся ад незалежнасці?

**Р. Г.** 300 гадоў у нас была забаронена мова. Спачатку нам насаджалі польскую мову, потым — расійскую. Мой дзед, бацька Максіма Гарэцкага, у свой час служыў у пана і мог сказаць сыну: «Чаму ты гаворыш на гэтай халопскай мове?» Мы, як ледніковыя людзі, замарожаныя халуйствам. У нас жыве рабства. Але мяне цешыць тое, што ў пачатку 90-х гадоў, калі ў Беларусіназіраўся час адраджэння, мы перажывалі велізарны ўздым! Мы пачалі размаўляць па-беларуску, мы ўспомнілі сваю сапраўдную гісторыю. Колькі тады было выдадзена кніг пра нашу Беларусь, мастацкіх твораў, аб існаванні якіх мы нават і не ведалі! Мы пазнаёміліся з гісторыяй і літаратурай беларускага замежжа. Адкрылі імёны Арсенневай, Сяднёва, Акулы, Віцьбіча і іншых. Калі б тая плынь пайшла і далей, мы сёння не размаўлялі б з вамі аб гэтым.

Што мяне асабліва цешыць — гэта наша моладзь. Моладзь, якая так шчыра прыхільная да Беларушчыны, добра размаўляе па-беларуску, нягледзячы на ўціск зверху... Пра нас вельмі добра сказаў Колас: калі начальства загаворыць па-беларуску, дык і народ загаворыць па-беларуску.

**М. Э.** Як Вы ставіцеся да вядомага сцвярджэння, што кожны народ заслугоўвае свайго правіцеля?

**Р. Г.** Мне гэта не падабаецца... Але, на жаль, так і ёсць. Праўда, тая сітуацыя, якая складвалася на Беларусі, — гэта не толькі тое, што «заслужыў» наш народ, але і нейкае супадзенне. Калі мы галасавалі на прэзідэнцкіх выбарах, мы галасавалі не за Лукашэнку, мы галасавалі супраць Кебіча. Тады быў настолькі вялікі нацыянальны ўздым, што нам здавалася дзікім намаганне Кебіча ўвесці агульную валюту. Мы баяліся згубіць свой суверэнітэт. Хацелі, як лепей...

У тыя часы я многа спрачаўся з нашымі маладымі палітыкамі — Майсенем, Ганчаром, Фядутам, Булахавым — хлопцамі разумнымі, актыўнымі. Яны выцягнулі Лукашэнку. Я казаў ім тады па-руску: «Хрен редьки не слаще». А яны спрачаліся ў адказ: не, ён будзе нас слухаць. Вось і атрымалі... Народ не робіць гісторыю. На самай справе яе робіць інтэлігенцыя, эліта.

**М. Э.** А ў нас сёння ёсць такая эліта, якая магла б змяніць сітуацыю ў Беларусі?

**Р. Г.** Безумоўна, ёсць. У Беларусі многа разумных людзей. Праўда, гэтая сістэма ўзяла ўсіх у такія ціскі, што народ, асабліва ў вёсцы, нікога, акрамя Лукашэнкі, не ведае...

На мой погляд, у нашай апазіцыі многа амбіцыёзнасці, па-сапраўднаму ахвяраваць сваё «я» дзеля агульнай справы з сучасных палітыкаў ад апазіцыі не можа ніхто. Нават Зянон Пазьняк. Хаця ён і ахвяраваў сябе дзеля гэтай справы, але ахвяраваў толькі ў тым выпадку, калі лідэрам будзе ён, іншых ён не прызнае...

**М. Э.** «Бацькаўшчына» не збіраецца выставіць свайго кандыдата на будучых прэзідэнцкіх выбарах? Можа, за межамі Беларусі жыве наш Валдус Адамкус?

**Р. Г.** Беларускага Адамкуса не можа быць. Па-першае, па так званай лукашэнкаўскай Канстытуцыі прэзідэнтам Беларусі не можа стаць той, хто больш за 10 год жыве за мяжой краіны. І Івонка Сурвіла вылучаць сваю кандыдатуру не можа. Па-другое, у Літве, Чэхіі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў была дэмакратычная сітуацыя, больш-менш роўныя ўмовы. Нават — у Расіі. А ў Беларусі тэлебачанне, радыё ў руках аднаго чалавека.

**М. Э.** Чаму акадэмік Радзім Гарэцкі прыйшоў у палітыку?

**Р. Г.** Я ў палітыку не прыйшоў. Я сябе палітыкам не лічу. Больш за тое, я не люблю палітыку і ўпэўнены, што палітыка — справа вельмі брудная і хлуслівая. Але я выступаю за незалежнасць нашай Радзімы, за дзяржаўнасць, за мову, за развіццё Беларушчыны. Атрымліваецца, што гэта — палітыка. У нас нават мова — палітыка. Культура, навука — усё палітыка. Такая пазіцыя ўлады.

**М. Э.** Колькі беларусаў свету аб'ядноўвае Згуртаванне «Бацькаўшчына»?

**Р. Г.** Дакладнага спісу ў нас няма. Думаю, тысячы дзве беларусаў свету згуртаванне аб'ядноўвае. Але ўся бяда ў тым, што наш урад раскалоў нават «Бацькаўшчыну». Калі раней мы былі ўсе разам, то зараз амаль у кожнай краіне ёсць дзве суполкі. Гэта адбылося пасля II з'езда беларусаў свету, які праходзіў у Мінску. Мы запрасілі тады на з'езд усіх: і членаў нашай арганізацыі, і прадстаўнікоў урада, паслалі ліст да Лукашэнкі.

Улады не ведалі, што з намі рабіць. Да апошняга моманту не давалі нам памяшкання. Вы разумееце: беларусы не маглі спакойна сабрацца на сваёй Радзіме! Я хадзіў да Замяталіна, сядзеў у яго прыёмнай да шасці гадзін вечара, каб ён даў дазвол правесці з'езд. А ў гэты час Вялікая рада сядзела і чакала: дадуць нам памяшканне ці не. Тады ж Замяталін запрасіў частку нашых членаў у рэзідэнцыю прэзідэнта, і пачалося... Сярод членаў «Бацькаўшчыны» былі тыя, хто пайшоў у абдымку з рэжымам. Мы — не. «Бацькаўшчына» — не палітычная арганізацыя, мы — культурна-асветніцкае згуртаванне. Мы цвёрда стаім на пазіцыі нацыянальнага адраджэння, адраджэння мовы, культуры, незалежнасці краіны. Гэта не падабаецца нашаму рэжыму...

**М. Э.** Радзім Гаўрылавіч, вось-вось наступіць новы век. Які ўрок мы павінны вынесці з XX стагоддзя? Што пакінуць у мінулым, а што ўзяць з сабою ў будучае?

**Р. Г.** Дваццатае стагоддзе — вельмі супярэчлівае. З аднаго боку, больш крывавага, больш жудаснага веку, чым гэты, не было ў гісторыі чалавецтва. Мы перажылі два таталітарных рэжымы — сталінскі і гітлераўскі. Але бальшавіцкі рэжым — больш жорсткі, бязлітасны. Ён знішчыў больш людзей, прычым сваіх людзей, самых лепшых, годнасць і розум нацыі. Мы з жудасцю ўспамінаем інквізіцыю. Тады загінулі сотні людзей. Пры бальшавіках — мільёны. І самае страшнае, што нават яшчэ і сёння мы дакладна не ведаем, колькі людзей знішчыла сістэма. Сталін казаў, што ў вайну загінула 7 мільёнаў — і мы верылі. Потым казалі, што 20 мільёнаў — і мы верылі. Зараз кажуць — 30 мільёнаў. Плюс-мінус 10 мільёнаў — як жартачкі. А калі ўзяць сталінскі генацыд,

то загінула 50 мільёнаў. А за кожнай лічбаю — Чалавек, які толькі аднойчы з'яўляецца на гэты свет.

З другога боку, дасягненні чалавецтва за гэты час дзіўныя. Інфармацыйны ўсплеск незвычайны: тэлефон, радыё, тэлебачанне. Інтэрнет. Космас. Падводныя лодкі. Інжынерная генетыка. Кланаванне. Штучнага чалавека могуць зрабіць! І гэтыя незвычайныя з'явы, узлёт чалавечага розуму на фоне нейкага варварства. Гэта дзівіць: як можна спалучыць узлёты розуму чалавека і неразуменне?

Калі чалавек будзе амбіцыёзным, калі будзе знішчаць прыроду, то невядома, чым гэта можа скончыцца. Але я спадзяюся, што розум чалавека ўсё ж пераможа. Асабліва хацелася пажадаць, каб жыла наша беларускасць, каб жылі беларусы. У сярэдзіне лета 2001 года адбудзецца з'езд «Бацькаўшчыны», які таксама будзе мець назву «Беларусь і беларусы на мяжы тысячагоддзяў». Нам трэба будзе падвесці вынікі: што Беларусь за 1000 гадоў набыла, куды яна пойдзе, ці будзе яна жыць. Бо калі так будзе складвацца і далей, то ў будучым стагоддзі нас, беларусаў, можа ўжо і не быць. Але калі мы возьмемся за розум, адкінем гэты страх, хлусню, халуйства, ад якіх пакутуем, то беларусы ўздымуцца, іх уклад у цывілізацыю будзе выдатным. Будзе Беларусь!

## РАДЗІМ ГАРЭЦКІ: Я АДКАЗНЫ ЗА СВОЙ РОД І БЕЛАРУСЬ*

5—7 ліпеня Менск прымае беларусаў замежжа. Напярэдадні III з'езду прэзідэнт Згуртавання беларусаў сьвету «Бацькаўшчына» Радзім Гарэцкі завітаў у рэдакцыю «Згоды», каб адказаць на шэраг пытаньняў.

**Аляксей Кароль.** Пытаньне да Вас як да прадстаўніка роду Гарэцкіх. Як так адбылося, што ўся Ваша сям'я — удзельнікі адраджэнскага руху, нягледзячы на тое, што й Гаўрыла, і Максім былі рэпрэсаваныя?

**Радзім Гарэцкі.** Максім настолькі быў адданы беларускаму народу, Бацькаўшчыне, мове, што ён паўплываў і на іншых сваіх родных, на братоў і на сястру, якая, на жаль, загінула. І асабліва яго ўплыў быў, канешне, на майго бацьку Гаўрылу Гарэцкага. Як Вы ведаеце, іх лёс вельмі складаны, але ўжо са школы яны палюбілі сваю Радзіму. А паўплывала на гэта, як яны гаварылі, «крышталёвая прыгажосьць беларускага фальклёру», песень, якія яны з маленства чулі ад маці. Максім нават пазьней запісаў цэлую кніжку з 318 беларускіх песень, выдадзеную Інбелкультам. Праз фальклёр браты Гарэцкія адчулі свае родныя карані й сталі барацьбітамі за Бацькаўшчыну, заўсёды былі адданыя гэтай справе.

У мяне больш складаная сытуацыя. Я нарадзіўся ў Менску, але быў вывезены зь Беларусі, калі мне было 4 гады. На жаль, я ня памятаю свайго дзядзьку, бо быў зусім малы, калі яго арыштавалі. Разам з маці

* Згода. 2001. 7 ліп. Гутарка ў рэдакцыі газеты.

мы паехалі на Беламорска-Балтыйскі канал. І сорак гадоў я жыў у Расеі, і нават ніколі мовы не вучыў беларускай, ня чуў яе й ня ведаў. З бацькам мы сустракаліся мала [...]. Але бацька з маці заўсёды размаўлялі па-беларуску, і ўсе лісты да маці бацька пісаў па-беларуску. Адтуль я ўпершыню пачуў роднае слова.

Акрамя таго, бацька настолькі шчыра заўсёды распавядаў пра сваю Багацькаўку на Магілёўшчыне, што гэта аказвала на мяне вялікі ўплыў. Калі маці падавала на стол крупеню, бацька хваліў: «Якая добрая крупеня, як у Багацькаўцы!» Ці, наадварот, ён казаў: «Вінаград я не люблю — у Багацькаўцы ён не расьце». І толькі ў 1961 годзе я ўпершыню трапіў з братам і бацькам у Беларусь, былі ў Менску, заязджалі да сястры Кузьмы Чорнага. Спачатку праз бацьку Беларусь запала мне ўдушу, а пасьля я яе пабачыў, і яна мне вельмі спадабалася.

Галоўнай марай для бацькі на працягу ўсяго жыцьця было вярнуцца сюды, каб хоць у апошнія гадкі папрацаваць дзеля Беларусі. Ён здолеў гэта зрабіць, калі яму было 68 гадоў. У гэты час я працаваў у Геалягічным інстытуце ў Маскве, меў добрую кар'еру, быў доктарам навук, лаўрэатам Дзяржпрэміі СССР, былі добрыя пэрспэктывы. Але бацька паклікаў у Беларусь, мяне запрасіў і Барысевіч, прэзідэнт АН, і я пераехаў у Менск у 1971 годзе. І яшчэ больш палюбіў наш народ і нашу краіну.

**А. Кароль.** Першыя адраджэнскія хвалі — БНР і беларусізацыя ўБССР — сышлі й не дасягнулі сваёй мэты. Якія магчымыя вынікі сёньняшняй хвалі, якую мы зараз перажываем?

**Р. Гарэцкі.** Зараз я чытаю артыкулы, што друкаваў мой бацька на пачатку 20-х гадоў. Настолькі ўсё падобнае: усе тыя праблемы актуальныя й у сучаснасьці, як быццам гэта напісана сёньня. Усё атрымліваецца, як у зачараваным коле. І гэта вельмі сумна. Тады, у 20-я, беларусізацыя падтрымлівалася ўладамі, бо на чале БССР стаялі нацыянал-камуністы Чарвякоў, Галадзед. Інтэлігенцыя паверыла ў шчырасьць гэтага працэсу, але аказалася, што гэта палітыка бальшавікоў на самой справе мела на мэце сусьветную рэвалюцыю.

Цяперашняя хваля была вельмі малая: з пачатку 90-х да 1994 году. Але мяне цешыць, што за гэтыя 4 — 5 гадоў адбыўся такі моцны выбух. Я думаю, меў рацыю Якуб Колас, які сказаў, што калі ўлады загавораць па-беларуску, то й народ загаворыць. Толькі Шушкевіч і яшчэ хто-ніхто з кіраўніцтва краіны пачаў размаўляць па-беларуску, як усё зьмянілася. Я адчуў гэта па Акадэміі навук: у нас і справаводзтва перавялі на беларускую мову, і мова пачала гучаць. Таму мяне цешыць, што ўнутры беларусаў жыве нейкая прага быць беларусамі й жыве беларуская мова, але на ёй беларус баіцца гаварыць. Ня ведаю чаму: мо таму, што начальства на ёй не гаворыць, мо забыўся на яе, мо саромеецца. Зараз зноў беларус схаваўся, і ягоная беларускасьць сядзіць недзе глыбока ўнутры, ён баіцца яе раскрыць. Але глядзіце, які добры паказчык перапісу насельніцтва: 82 адсоткі насельніцтва краіны лічаць сябе беларусамі, а 37 адсоткаў сказалі, што ў хаце размаўляюць па-беларуску, хоць перапіс быў з русыфікатарскім прыцэлам.

І што яшчэ мяне цешыць — скалыхнулася наша моладзь. Я некалькі гадоў быў загадчыкам кафедры на геафаку БДУ. Той жа Павал Севярынец — мой вучань, выдатны хлопец, вельмі здольны. І многія з моладзі прыхінуліся сэрцам да Беларусі. Моладзь ня мае ўжо таго страху й хлусьні, на якіх узгадавана маё пакаленьне. Маё пакаленьне трохі баязьлівае. Таму я думаю, што калі наш народ здолее павярнуць на сапраўды дэмакратычны шлях, захавае сваю дзяржаўнасьць, то тады можа адрадзіцца й наш народ.

**А. Кароль.** Гаўрыла Іванавіч у 20-я гады абгрунтаваў практычны шлях рэалізацыі канцэпцыі «Беларусь — Чырвоная Данія». Зараз модная ідэя: Беларусь і швэдскі сацыялізм. Якая Ваша ацэнка магчымага шляху Беларусі?

**Р. Гарэцкі.** Па-першае, я хацеў бы сказаць, што каб не было зьнішчэньня нашай інтэлігенцыі й лепшых нашых людзёў у 30-я, тое, аб чым пісаў мой бацька, спраўдзілася б, і мы б зараз жылі вельмі багата. Па прыродных умовах Данія ў горшым становішчы, чым мы, ня кажучы нават пра Швэцыю, якая на 80 адсоткаў складаецца са скалаў. Тым ня менш, у гэтых краінах такая добрая сельская гаспадарка, якая корміць ня толькі сваіх грамадзян, але экспартуе ў іншыя дзяржавы. У нас быў таталітарны рэжым, сталінізм ды бальшавізм, а добры лад пабудавалі ў разьвітых краінах Захаду. Я згодзен, што, канешне, нам патрэбна свая праграма разьвіцьця. Але нічога ня трэба выдумляць нанава. Трэба ўзяць усё самае лепшае ў Нямеччыне, у Даніі. Гэта вельмі прывабныя для нас краіны, якія могуць стаць для нас добрым прыкладам.

**А. Сдвіжкоў.** Ці можна гэта зрабіць зь сёньняшняй сістэмай улады? Размова не асабіста пра Лукашэнку ці яго навакольле, а менавіта пра сыстэму.

**Р. Гарэцкі.** Думаю, не. Таму што пры гэтай ўладзе людзі не зьмяніліся, яны засталіся тымі ж самымі, што былі пры саветах. Зь імі пабудаваць нічога добрага нельга. Мы альбо стаім на месцы, альбо круцімся па коле.

**А. Сдвіжкоў.** А якое выйсьце з гэтага заганнага кола?

**Р. Гарэцкі.** Выйсьце — у Адраджэньні. Але Адраджэньне павінна быць інтэгральным, па ўсіх накірунках. І бацька мой змагаўся, каб перш-наперш было адраджэньне эканамічнае. А нашая ўлада, на жаль, займаецца палітычнымі гульнямі. У пачатку 90-х я прапанаваў: давайце адкрыем свае канцэсыі ў Сібіры, Казахстане, Башкірыі, возьмем добрыя радовішчы нафты й газу. Усе ківалі галовамі, казалі: вельмі цікава. Але ніхто нічога не рабіў. Я нават сам пачаў дамаўляцца. Тады гэта амаль нічога не каштавала, і ўлады Расеі, Казахстана былі ня супраць. Таму з гэтай уладай нічога не атрымаецца, трэба, каб яна зьмянілася. А зьменіцца яна, толькі калі зьменіцца народ. Калі ён ня будзе чакаць, што хтосьці прыйдзе яго ратаваць, а будзе спадзявацца на сябе. І трэба аб'яднацца ўсім вакол нацыянальнай беларускай ідэі, якая будзе мець на ўвазе інтэгральнае адраджэньне: палітычнае, эканамічнае, культурнае, моўнае.

**Тацьцяна Палякова.** У Вярхоўным Савеце 12 скліканьня апазыцыя ўсё ж мела нейкую вагу й магла б садзейнічаць прыняцьцю патрэбных эканамічных законаў. Чаму яна гэтага не зрабіла?

**Р. Гарэцкі.** Я з вамі тут ня згодны. Я быў дарадчыкам у ценявым кабінэце БНФ, які ўзначальваў Заблоцкі. Мы распрацавалі эканамічную праграму. Я, напрыклад, працаваў над канцэпцыяй закону аб зямлі. Быў шэраг іншых напрацовак. Але ўлады й той жа Кебіч гэта не ўспрымалі, таму ўсё засталося на паперы.

**Аляксандр Кавальскі.** Ёсьць меркаваньне, што любая дыяспара — гэта пытаньне аднаго-двух пакаленьняў. А потым ўсё роўна яны інкарпаруюцца ў склад іншай культуры. Таму пытаньне такое: ці патрэбна падтрымліваць беларускія дыяспары за мяжой?

**Р. Гарэцкі.** Канешне, асыміляцыя ідзе страшэнная. Але яшчэ невядома, дзе большая: за межамі Беларусі ці ў самой Беларусі. У нас ёсьць этнічна беларускія раёны, што не належаць сёньня нам. Гэта Беласточчына, Віленшчына, заходнія раёны Смаленшчыны, Пскоўшчыны, Браншчыны. Там жывуць сапраўдныя беларусы, размаўляюць у вёсках па-беларуску, на трасянцы, канешне. Яны сябе ўжо ня лічаць беларусамі, але беларускасьць у іх сядзіць — фальклёр, культура. Некаторыя расейцы нават нам кажуць, што мы адзін зь імі народ, бо Смаленшчына нічым не адрозьніваецца ад нас. Але гэта не з-за таго, што мы рускія, а проста там жывуць беларусы.

Цяпер возьмем дыяспару далёкую. Напрыклад, у ЗША й Канадзе дыяспара настолькі беларуска сьвядомая, што яны й кніжкі з газэтамі выдаюць, маюць сваю аўтакефальную праваслаўную царкву, ёсьць каталіцкая й уніяцкая цэрквы, беларускія культурныя цэнтры ў Кліўлендзе й Лёндане. Амэрыканская ды канадзская дыяспары вельмі моцныя. Яны сябруюць з сэнатарамі, 25 сакавіка яны афіцыйна сьвяткуюць Дзень Волі, і ў гэты дзень над мэрыямі Кліўленда, Чыкага, Вашынгтона, Нью-Ёрка ўздымаецца бел-чырвона-белы сьцяг. Там ідзе, канешне, спад, але многія беларусы здолелі перадаць сваю беларускасьць дзеткам. Узяць таго ж Кіпеля: яго дачка й сын працягваюць справу свайго бацькі, выдатна размаўляюць па-беларуску. Такія ж прыклады ёсьць і ў Расеі, асабліва ў Сібіры. Таму наша Згуртаваньне беларусаў будзе працягваць змагацца за дыяспару. А яны ў адказ будуць змагацца за нас, дапамагаць шукаць інвэстыцыі. Яны вельмі гэтага хочуць.

**А. Кавальскі.** Тая моцная паўночна-амэрыканская дыяспара — гэта пасьляваенная хваля эміграцыі. Тым часам зараз ужо ў ЗША ды Канадзе шмат прадстаўнікоў новай хвалі з Савецкага Саюзу, ім цяжка знайсьці агульную мову з першай хваляй, апантанай беларускасьцю. Але яны таксама беларусы й могуць дапамагаць Бацькаўшчыне. Чаму ніхто над гэтым не працуе?

**Р. Гарэцкі.** На жаль, гэта праўда. Зараз эміграцыя ў асноўным эканамічная. ЗБС займалася гэтым, але нам цяжка, бо няма падтрымкі. Як толькі моладзь, прыехаўшы туды, заводзіць свой бізнэс, Беларусь ім становіцца «да лямпачкі». Але сапраўды, нам трэба працаваць над сучаснай маладой эміграцыяй.

**Максім Канстанцінаў.** 5—6 ліпеня мае адбыцца чарговы зьезд беларусаў сьвету. Ці не будзе на ім нейкага палітычнага расколу?

**Р. Гарэцкі.** Такі раскол, трэба сказаць, ужо адбыўся з часу нашага II зьезду. Зараз ён увесь час павялічваецца, але не па нашай ініцыя-

тыве, а ініцыятыве нашых урадавых структур. Вы ведаеце, што былі цяжкасьці нават з памяшканьнем пад зьезд. Толькі ў пятніцу 29 чэрвеня вырашана гэта пытаньне, прычым ня так, як мы хацелі. Так сама ў газэце «Голас Радзімы» намесьнік старшыні Камітэту па справах рэлігіяў і нацыянальнасцяў, што курыруе працу з дыяспарай, Іван Яновіч, абазваў зьезд палітычнай акцыяй перад выбарамі. Гэта глупства, таму што пра выбары мы ня ведалі, калі чатыры гады таму на мінулым зьездзе абазначалі гэтую дату. Мы ўвогуле арганізацыя не палітычная й прымаем усіх, хто стаіць на пазыцыі захаваньня дзяржаўнасьці й нацыянальнага Адраджэньня. Але зараз дыяспары на прасторы былога Саюзу й нават Польшчы разьбіліся на дзьве часткі: адна падтрымлівае сучасны рэжым, другая — наш статут. І Яновіч заклікаў беларускія суполкі ігнараваць гэты зьезд, бо ў 2002 годзе пад дзяржаўным крылом будзе яшчэ адзін зьезд. Акрамя таго, яны ўжо стварылі альтэрнатыўную асацыяцыю беларусаў на чале з кіраўнікοм Дзяржкамітэту Білыкам.

**Алесь Саковіч.** Якое памяшканьне ўсё ж такі знайшлі?

**Р. Гарэцкі.** Мы спачатку прасілі розныя памяшканьні ў цэнтры. Больш за ўсё нам падабаўся КЗ «Мінск», потым, калі нам адмовілі зь «Мінскам», мы папрасілі залю Акадэміі навук, потым Дом літаратара, хаця там нам і цесна. Але нам прапанавалі з самага пачатку ДК «Сукно».

**А. Саковіч.** То-бок, гэта той жа Бангалёр, толькі ў памяшканьні?

**Р. Гарэцкі.** Так, гэта кшталту Бангалёру, але мы пагадзіліся. Мы там недалёка знайшлі сталоўку, дзе зьбіраліся карміць гасьцёў, і пачалі рассылаць усім запрашэньні (паколькі там вялікае памяшканьне, то запрасілі шмат гасьцёў), замовілі аўтобусы. Раптам а палове на другую гадзіну 29 чэрвеня раздаецца званок з Камітэту па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, і кажуць, што нас запрашаюць у Саўмін, каб абмеркаваць некаторыя тэхнічныя пытаньні, і дадаюць, што працуюць над тым, каб нам далі Дом літаратараў. Я ім кажу, што нам ня трэба другога памяшканьня, бо мы ўсіх ужо запрасілі ў «Сукно». Я не паехаў, паехала старшыня нашай рабочай групы Алена Макоўская. Яна таксама адмовілася ад памяшканьня, хоць Дзямчук і ўгаворваў яе пагадзіцца на Дом літаратараў. Урэшце яны сказалі: «Як хочаце». Праўда, удалося дамовіцца аб арганізацыі сустрэчы для ўдзельнікаў зьезду з рознымі міністрамі (замежных справаў, культуры, адукацыі), да якіх у нашай дыяспары заўсёды шмат пытаньняў. Час ад часу ўзьнікаюць праблемы зь візамі, камусьці трэба дапамога з культурным цэнтрам, хтосьці хоча вярнуцца ў Беларусь на сталае жыхарства, а ў яго чамусьці ўзнікаюць праблемы. Шэраг такіх пытаньняў. Таму мы ім падзякавалі за арганізацыю сустрэчаў, што павінны адбыцца 4 і 6 ліпеня.

Але прыблізна каля пяці гадзін у гэты апошні працоўны дзень перад чатырма сьвяточнымі днямі да Алены Макоўскай патэлефанавалі ад намесьніка мэра, які кажа, што яны дазваляюць Дом літаратараў. Мы зноўку адмаўляемся. А яны кажуць, што ня могуць дапусьціць, каб наша беларуская дыяспара зьбіралася на ўскрайку Менска, у «Сукне», і ўвогуле там пажарнікі забараняюць. І, як кажуць, volens nolens прыйшлося пагадзіцца, зноў сесьці за тэлефоны й пачаць усіх абзваньваць.

Паўтарылася сытуацыя, як перад II зьездам, калі за дзень да яго я ў кабінэце Замяталіна адмовіўся выходзіць, пакуль ня будзе вырашана пытаньне з памяшканьнем.

**А. Саковіч.** Чаго Вы чакаеце ад зьезду?

**Р. Гарэцкі.** Тэма абвешчана. Рэдка здараецца, каб людзі жылі на мяжы ня толькі стагоддзяў, але тысячагоддзяў. Таму мы павінны падсумаваць пэўныя вынікі разьвіцьця нацыі з дыяспарай (кожны трэці беларус жыве па-за межамі Беларусі) і намеціць шлях на XXI стагоддзе. У нас ёсьць шэраг дакладаў на тэму «Беларусь і беларусы на мяжы тысячагоддзяў», і, апрача таго, мы паспрабуем паразважаць, як мы можам аб'яднаць беларусаў вакол нашай нацыянальнай ідэі. І другая частка, больш фармальная, — не пазьней ліпеня павінны адбыцца перавыбары кіруючых органаў ЗБС «Бацькаўшчына». Таму, калі нам раілі праводзіць зьезд пасьля прэзідэнцкіх выбараў, мы адказвалі, што пасьля ліпеня мы, кіраўніцтва згуртаваньня, будзем нелегітымнымі.

**М. Канстанцінаў.** Зараз ідзе вылучэньне ў кандыдаты ў прэзыдэнты. Ці ёсьць у Вас пэўныя сымпатыі да кагосьці з прэтэндэнтаў?

**Р. Гарэцкі.** Я адкажу так: я ведаю дакладна, хто зь іх мне больш за ўсё не падабаецца. І вы гэта ведаеце. А любы кандыдат з гэтай пяцёркі, апроч, можа быць, Калякіна, таму што я ня надта прыхільны да камуністаў, будзе на галаву, а можа, і на пяць галоў лепшы, чым сучасны прэзыдэнт. Спадзяюся толькі, што пяцёрка здолее выбраць са свайго складу адзінага кандыдата.

**А. Кароль.** Вы лічыце сябе адказным за свой род, за краіну?

**Р. Гарэцкі.** Безумоўна. Я за іх адказны. Я мог бы зараз адпачываць, але пачуцьцё адказнасьці прымушае мяне змагацца за беларушчыну. Уся бяда нашага народу ў тым, што мала хто лічыць сябе адказным. А на самой справе, мы ўсе адказныя. І вельмі шкада, што мы не пакаяліся за камуністычнае мінулае.

## БЕЛАРУСЬ І БЕЛАРУСЫ НА МЯЖЫ ТЫСЯЧАГОДДЗЯЎ*

Больш чым тысячагадовая наша гісторыя была і гераічнай і трагічнай. Пабудова княстваў першых беларускіх дзяржаў, а затым і магутнага Вялікага княства Літоўскага — і іх разбурэнне; вялікае пашырэнне старабеларускай мовы — і яе забарона; уздым нацыянальнай культуры — і яе заняпад; развіццё рамёстваў, гандлю і сельскай гаспадаркі — і іх развал; змаганне асноўных рэлігійных канфесій — праваслаўя і каталіцтва паміж сабой; вялікі ўздым уніяцтва — і поўны яго разгром; вызвольныя паўстанні — і іх жорсткія падаўленні і г. д. Усе гэтыя падзеі суправаджаліся амаль несупыннымі крывавымі войнамі, кожная з якіх для беларусаў была, як правіла, грамадзянскай, калі беларус змагаўся

* Народная воля. 2001. 26 ліп. Даклад на III з'ездзе беларусаў свету. 5 ліпеня 2001 г.

не толькі са знешнім ворагам, але і са сваімі суайчыннікамі. Вынікі многіх з гэтых войнаў — страшэнныя ахвяры: гінуў кожны чацвёрты, трэці, а то і другі жыхар беларускіх зямель. Многіх з тых, хто выжываў, чакала інтэнсіўнае перасяленне ў чужыну, шырокая эміграцыя, гвалтоўнае высяленне.

Асабліва супярэчлівым (узлёт розуму — і дзікае варварства) для ўсяго чалавецтва і, у прыватнасці, беларусаў было XX стагоддзе. З аднаго боку, дасягненні чалавецтва, у якія зрабілі свой унёсак і беларусы, за гэты час дзівосныя: інфармацыя (тэлефон, радыё, тэлебачанне, інтэрнет), космас, асваенне гідрасферы і атмасферы, інжынерная генетыка, кланаванне і г. д. А з другога боку, разбуральныя рэвалюцыі, дзве сусветныя вайны, два крывавыя таталітарныя рэжымы — фашысцка-гітлераўскі і бальшавіцка-сталінскі. У выніку загінула каля сотні мільёнаў чалавек. Сярод іх больш за тры мільёны беларусаў. Многія з тых, хто застаўся жывым, былі раскіданы па ўсім свеце, і цяпер звыш трох мільёнаў беларусаў жыве па-за межамі сваёй Бацькаўшчыны ў 75 краінах свету. Гэта значыць, што кожны трэці жыхар Беларусі стаў замежным грамадзянінам.

Калі звалілася «жалезная заслона» і краіны былога Савецкага Саюза (у тым ліку і Беларусь) сталі больш адкрытымі, з'явілася магчымасць для прыцягнення беларускай дыяспары ў справу станаўлення Беларусі як дэмакратычнай дзяржавы. На жаль, у сучаснай Беларусі патэнцыял эміграцыі выкарыстоўваецца вельмі слаба. Беларусы замежжа — неад'емная частка нацыі, велізарны чалавечы рэсурс, які можаператварыцца ў найважнейшы фактар эканамічнага і духоўнага ўздыму Беларусі. Яны могуць стаць галоўнымі чыннікамі ў разнастайных гаспадарча-эканамічных сферах (знешні гандль, інвестыцыі, новыя тэхналогіі і інш.), у наладжванні ўзаемавыгадных кантактаў паміж беларускімі ўрадавымі і няўрадавымі арганізацыямі з адпаведнымі ўстановамі іншых краін.

Эміграцыя беларусаў працягваецца і ў наш час — толькі за апошнія 5 гадоў з'ехала за мяжу больш 12 тысяч жыхароў краіны. Сучасная эміграцыя носіць палітыка-эканамічны характар. Патрэбна значная праца, каб новыя эмігранты не забыліся пра сваю Бацькаўшчыну. Спадзяюся, што ў новым стагоддзі беларусы і метраполіі, і дыяспары змогуць уключыцца ў сумесную справу пабудовы агульнай Радзімы — дэмакратычнай еўрапейскай дзяржавы Беларусь.

Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» прапануе Вашай увазе праграму «Сусветная беларуская супольнасць у XXI стагоддзі (Асноўныя дзеянні па кансалідацыі і дапамозе беларускай дыяспары на перыяд да 2005 г.)».

## НАША НАЙВЯЛІКШАЯ КАШТОЎНАСЦЬ

Найвялікшая каштоўнасць, якую здолеў здабыць беларускі народ напрыканцы мінулага тысячагоддзя і ўвайсці ў новае, гэта незалежная дзяржава Беларусь. Як вядома, дзяржаўнасць нашага народа складвалася ў першым тысячагоддзі н. э., яе вытокі — у самастойных княствах — Полацкім, Тураўскім і інш. Найбольшага росквіту дзяржаўнасць дасягнула ў XV — XVI стст. («залатым веку») у Вялікім княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім — «краіне замкаў», дзе дзяржаўнай мовай была старабеларуская. Адметных вяршынь дасягнулі культура, літаратура, мастацтва, тэатр, кнігадрукаванне, адукацыя, навука, гістарычна-архіўная справа (Літоўская метрыка), заканадаўства (тры рэдакцыі Статута Вялікага княства Літоўскага, прычым апошні (1588) вытрымаў тры выданні, а пазней быў перавыдадзены на польскую, нямецкую і рускую мовы і паслужыў асноўнай крыніцай для юрыдычных актаў суседніх дзяржаў), рамёствы, сельская гаспадарка і іншае. Можна казаць пра стварэнне ў той час у цэнтры Еўропы сапраўднай беларускай (літоўскай) цывілізацыі.

Аб'яднанне ВКЛ і Польшчы ў адзіную дзяржаву Рэч Паспалітую паступова прывяло да моцнай паланізацыі, затым забароны беларускай мовы ў якасці афіцыйнай, частковай страты дзяржаўнай незалежнасці. Апошняя канчаткова была страчана пасля ўваходу беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі. Але беларуская нацыянальная ідэя, стрыжнем якой было стварэнне незалежнай дзяржавы, увесь час жыла ў сэрцах і розуме лепшых сыноў нашага народа. Спробай аднавіць самастойную дзяржаву было абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1918 годзе. Затым была створана БССР. У час Другой сусветнай вайны была арганізавана Беларуская Цэнтральная Рада. Нарэшце 27 ліпеня 1990 года была прынята Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі.

## ЗНОЎ «САВЕЦКІ САЮЗ»? НЕМАГЧЫМА!

Многія ў нашай краіне (у тым ліку амаль усё кіраўніцтва дзяржавы), як і ў некаторых краінах былога СССР, хацелі б зноў вярнуцца ў Савецкі Саюз. Але трэба помніць і разумець, што гэта немагчыма, бо кола гісторыі нельга павярнуць назад. Гісторыя — гэта рух толькі ў нешта новае (праўда, на жаль, не заўсёды прагрэсіўнае). Дарэчы, трэба нагадаць, што СССР развалiла зусім не «тройка белавежскіх зуброў». Апошнія толькі канстатавалі вынікі гэтага працэсу і паставілі ў ім кропку. Наадварот, яны імкнуліся захаваць хоць нейкае падабенства Саюза, таму і стварылі СНД. Як ні парадаксальна, але Саюз развалiла сама бальшавіцкая наменклатура, якая яшчэ да падпісання белавежскіх пагадненняў вылучыла асобную Расійскую кампартыю, а затым прыпыніла дзейнасць КПСС, правяла «парад суверэнітэтаў» усіх былых рэспублік. Прычым усе гэтыя акты былі юрыдычна замацаваны ў Вярхоўных Саветах кожнай рэспублікі, якія тады амаль цалкам складаліся з камуністаў. Але бальшавіцкая наменклатура і пасля абвяшчэння незалежнасці фактычна засталася пры ўладзе: многія былыя кіраўнікі-камуністы ўзначалілі ўрады і парламенты новых самастойных

дзяржаў, занялі іх высокія дзяржаўныя пасады, зрабіліся вядучымі прадпрымальнікамі, алігархамі. «Новыя» кіраўнікі незалежных дзяржаў займаліся больш палітычнымі разборкамі, гульнямі, чым эканомікай краін, што і прывяло да заняпаду гаспадаркі, страшэннага збяднення і без таго бедных людзей краін СНД.

І ў Беларусі ва ўладзе засталася галоўным чынам былая савецкая адміністратыўная каманда, якая самастойна жыць так і не навучылася. Замест таго каб перш-наперш дбаць пра развіццё эканомікі, карысці для сваёй дзяржавы, незалежна ад таго, адкуль яна ідзе — з Захаду ці Усходу, — нашы палітыкі думалі, ды і зараз думаюць толькі пра тое, як ім захаваць уладу. Таму адразу распачалі працэс аб'яднання з Расіяй: спачатку ўваход у адзіную грашовую зону, а цяпер — стварэнне адзінай дзяржавы. Ужо падпісаны пагадненні аб адзінай расійскай грашовай сістэме і эмісійным цэнтры, агульных мытні, саюзным бюджэце, парламенце, ваенных групоўках і г. д.

Што нам дасць стварэнне адзінай з Расіяй дзяржавы? Безумоўна, значную, а з часам і поўную страту незалежнасці Беларусі. Апантаныя «інтэгратары» заяўляюць, што аб'яднанне ў адзіную дзяржаву гарантуе, маўляў, яшчэ большы суверэнітэт для Беларусі. Больш адкрыта пра сутнасць аб'яднання гавораць некаторыя палітыкі Расіі. Прыехаўшы ў Мінск, Я. Строеў заявіў: «Мы — русские и белорусы — один народ, мы — одно государство». Але зусім зразумела, што ў адной дзяржаве не можа быць двух дзяржаўных суверэнітэтаў. Адна дзяржава не можа мець двух прадстаўнікоў у ААН, пры стварэнні якой толькі СССР прадстаўляла агульную дзяржаву — і выключэнне — у склад ААН увайшлі Беларусь і Украіна ў сувязі з іх вялікім укладам у разгром фашызму. Іншыя, фармальна суверэнныя савецкія рэспублікі, нягледзячы на вялікія намаганні кіраўнікоў СССР, не былі прыняты ў гэтую аўтарытэтную міжнародную арганізацыю. У адзінай дзяржаве зноў будзем зацвярджаць бюджэт Беларусі ў Маскве, клянчыць энергетычныя рэсурсы, пасылаць нашых сыноў на абарону межаў агульнай дзяржавы.

Усе аб'яднальныя працэсы, заўважым, ідуць з парушэннем Канстытуцый і Беларусі і Расіі. На самой справе абедзвюм краінам не выгадна ствараць адзіную дзяржаву, больш разумна захаваць іх незалежнасць і выступаць на міжнароднай арэне як дзве дэмакратычныя, суверэнныя і дружалюбныя суседкі.

Вялікі Янка Купала яшчэ ў 1919 годзе пісаў: «Толькі адна поўная дзяржаўная незалежнасць можа даць і праўдзівую свабоду, і багатае існаванне, і добрую славу нашаму народу». Таму я поўнасцю падтрымліваю Акт Незалежнасці Беларусі, які быў прыняты 29 ліпеня 2000 г. Усебеларускім з'ездам за незалежнасць. Безумоўна, нам неабходна пашыраць эканамічныя, гандлёвыя, культурныя і іншыя ўсебаковыя зносіны з Расіяй, але не ў яе складзе, а ў якасці незалежнай краіны. Добрыя, раўнапраўныя і ўзаемавыгадныя адносіны Беларусь павінна мець перш-наперш і з іншымі сваімі суседзямі — Украінай, Польшчай, Літвой, Латвіяй, а таксама з усімі краінамі свету.

Знікненне незалежнай дзяржавы Беларусь з палітычнай карты свету непазбежна прывядзе да паслаблення, а потым і заняпаду і нават поўнаму сыходу беларускай прысутнасці ў свеце, паскарэння асіміляцыі

і дэнацыяналізацыі беларусаў як у метраполіі, так і сярод замежных суайчыннікаў, спынення кансалідацыі беларусаў як нацыянальнага і культурнага цэлага. Толькі самастойная Беларусь у стане стварыць умовы для захавання беларускай этнічнай супольнасці на беларускіх землях і ў розных краінах, зберажэння і развіцця традыцый, мовы, культуры свайго народа, умацавання повязі суродзічаў з гістарычнай Бацькаўшчынай.

## ГАНЕБНЫ ЎЦІСК УСЯГО БЕЛАРУСКАГА

Вялікі непакой выклікае сучасны стан беларускай мовы, беларускай культуры, выхавання, адукацыі і нацыянальнага адраджэння — адных з галоўных кампанентаў захавання і жыцця беларускай нацыі.

На жаль, вельмі кароткая беларусізацыя і досыць інтэнсіўны працэс нацыянальнага адраджэння пачатку 90-х гадоў з часу ператварэння Беларусі ў прэзідэнцкую дзяржаву змяніліся на супрацлеглую арыентацыю. У выніку закрыліся большасць беларускамоўных школ, класаў і садкоў. Зменшыліся колькасць і тыражы беларускамоўных кніг, часопісаў і газет. СМІ (у тым ліку найбольш сярод іх уплывовае — тэлебачанне і радыё) усё больш пераходзяць на рускую мову і расійскую тэматыку. Спроба адкрыць Нацыянальны беларускамоўны універсітэт выклікае адмоўную рэакцыю ўладавых структур.

Многія талерантныя беларусы, звыклыя бяздумна браць прыклад са свайго начальства, перасталі размаўляюць на роднай мове. Яскрава гэта назіраецца ва ўрадавых структурах, палатах Нацыянальнага схода і наогул ва ўсёй прэзідэнцкай «вертыкалі», адкуль беларуская мова зусім выкінута. На жаль, гэтая плынь моцна захапіла і кіраўнікоў школ, вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, Нацыянальнай акадэміі навук, навуковых інстытутаў, прадпрыемстваў, калгасаў і г. д. Дакументацыя і абслугоўванне ва ўсіх грамадскіх установах, уключаючы пошту, магазіны, паліклінікі і інш., вядзецца амаль выключна на рускай мове. Закон аб мовах не выконваецца, нават і двухмоўя сапраўднага няма. Усё разам прывяло да катастрафічнага стану беларускай мовы, калі яе практычна не чуваць на вуліцах гарадоў і нават вёсак.

Такая сітуацыя стварае ўмовы для новага выбуху імклівай асіміляцыі беларусаў, якая працягваецца ўжо многія дзесяткі і нават сотні гадоў. Яшчэ ў канцы 20-х гадоў мінулага стагоддзя мой бацька Гаўрыла Гарэцкі апублікаваў працу «Нацыянальныя асаблівасці БССР і беларускага насельніцтва СССР паводле перапісу 1926 г.». Ён прыйшоў да вельмі сумнай высновы, што «беларусы перажываюць працэс асіміляцыі выключнай моцы, які ставіць беларусаў на ўзровень (у гэтых адносінах) да найбольш «некультурных» нацыянальнасцей СССР, што стаяць на грані ўжо фізычнага змяншэння і вымірання (камчадалы, асьцякі і да т. п.)». За савецкі час русіфікацыя насельніцтва СССР была такая моцная, што загінула больш чым 50 моваў народаў Саюза, а многія трапілі ў Чырвоную кнігу. Нядаўна па тэлебачанні расказвалі пра ліваў у Латвіі, якіх засталося каля 100 чалавек і якія валодаюць гэтай старажытнай мовай угра-фінскай групы. Страх ахоплівае, калі падумаеш пра такі

магчымы лёс нашай мовы. Наша агульная галоўная задача — не дапусціць беларускую мову ў Чырвоную кнігу! Успамінаю верш Пімена Панчанкі, у якім ён развітваецца з роднай мовай.

Родны Янка Купала,
Вы пісалі:
«Я веру: настане...!»
Дарагі мой Іван Дамінікавіч,
Не, не настане!
Гэта ўжо не світанне,
Гэта наша настала змяркanne,
Гэта з мовай маёй,
Гэта з песняй маёй
Развітанне.

Уяўляю, як расколвалася на дробныя кавалкі сэрца песняра, як было цяжка дыхаць яму, калі ён пісаў гэты верш. Мо і пайшоў таму ад нас заўчасна. Ад крыўды плачу, ад болі крычу, чытаючы гэтыя Панчанкавы радкі.

## НЕ, НЕ ЎСЁ ЯШЧЭ СТРАЧАНА

Нягледзячы на такі стан беларускай мовы, мы ў Беларусі бачым яшчэ адзін дзівосны парадокс: апошні перапіс насельніцтва, які, дарэчы, праводзіўся пад русіфікатарскім націскам, паказаў, што беларусамі сябе лічаць 81,9% жыхароў краіны, роднай мовай беларускую — 73,7%, а 37% размаўляюць на ёй. Значыць, жыве беларускасць і любоў да мовы ў многіх беларусаў! Неабходна ствараць беларускамоўнае асяроддзе, неабходна падтрымка мовы дзяржавай. Калі будуць такія ўмовы, можна чакаць інтэнсіўны выбух беларускамоўнасці, які патрэбны нам, бы паветра. Бо без мовы няма нацыі.

Многае робіць для пашырэння мовы тытульнай нацыі Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны, Таварыства беларускай школы, Скарынаўскі цэнтр, Міжнародная асацыяцыя беларусістаў, свядомая інтэлігенцыя (пісьменнікі, мастакі, настаўнікі, навукоўцы), шэраг партый дэмакратычнага напрамку. Усё гэта ўсяляе надзею, што агульнымі намаганнямі мы не дадзім загінуць мове беларускай. Будзе жыць беларуская мова, будзе жыць цудоўная краіна свету — Беларусь!

Супярэчлівасць нашага сучаснага жыцця выяўляецца ў многіх аспектах. Напрыклад, шматлікія музычныя і іншыя фестывалі (асабліва найбольш любімы кіраўніком краіны «Славянскі базар») характэрны амаль поўнай адсутнасцю беларускасці. У той жа час намаганнямі Міхаіла Фінберга ў гэтым годзе пасля трохгадовага маўчання быў праведзены нацыянальны фестываль беларускай паэзіі і песні «Маладзечна-2001». На фоне нязменнага антыбеларускага шляху назіраюцца вось такія праявы падтрымкі нацыянальнага кшталту (у тым ліку прэміі, стыпендыі дзеячам культуры, навукі, маладым талентам і г. д.), — відаць, каб «выпусціць пар».

Прывяду два нядаўнія выпадкі, якія датычаць асабіста мяне. У канцы сакавіка былі юбілеі дзвюх выдатных жанчын Беларусі. Я тады знаходзіўся ў бальніцы, таму напісаў віншавальныя тэлеграмы па-беларуску і папрасіў жонку іх адаслаць. На пошце № 100 па вул. Максіма Багдановіча (!) груба адказалі: «Мы принимаем только обычные телеграммы». Аказалася, што тэлеграмы, напісаныя па-руску, прымаюць ва ўсіх аддзяленнях сувязі, а па-беларуску — толькі ў некаторых. Вось вам і двухмоўе! У Мінску 7 чэрвеня гэтага года праходзілі Дзесятыя (юбілейныя) Гарэцкія чытанні, прысвечаныя жыццю і дзейнасці братоў Максіма і Гаўрылы Гарэцкіх. У гэты ж дзень мемарыяльная дошка Максіма Гарэцкага, устаноўленая ў 1993 г. на доме былога Інбелкульта, дзе цяпер размяшчаюцца ЗБС «Бацькаўшчына» і Навукова-асветніцкі цэнтр імя Ф. Скарыны, была нейкімі бандытамі выкрадзена... Вось у якой рэчаіснасці мы жывём.

У сувязі з 60-годдзем пачатку Другой сусветнай вайны мы нядаўна адзначалі Дзень памяці і смутку, успомнілі ўсе жудасці вайны, якія былі асабліва крывавыя і жорсткія для Беларусі і яе жыхароў. Каб у новым стагоддзі нашу краіну зноў не ўцягнулі ў ваенныя канфлікты, неабходна, як запісана ў Канстытуцыі, «зыходзіць з прынцыпаў... непрымянення сілы або пагрозы сілай... ставіць за мэту зрабіць сваю тэрыторыю бяз'ядзернай зонай, а дзяржаву — нейтральнай».

Перад Беларуссю і беларусамі ўжо цяпер паўсталі складаныя праблемы, якія звязаны з экалагічнай бяспекай. Апошняя значна павялічылася ў сувязі з Чарнобыльскай катастрофай. З цягам часу гэтыя праблемы, як і ва ўсім свеце, будуць узрастаць. Многія з іх носяць глабальны характар (ахова чысціні атмасферы і гідрасферы, захаванне азонавага слою, розныя стыхійныя бедствы і г. д.), і іх трэба вырашаць разам з суседнімі краінамі і ўсім чалавецтвам. Але не менш значныя рэгіянальныя і лакальныя пытанні экалогіі.

На жаль, большасць паказчыкаў жыцця ў сучаснай Беларусі маюць адмоўны характар: падае ўзровень забяспечанасці жыхароў, расце іх колькасць па-за рысай беднасці, рэзка змяншаецца сярэдняя працягласць жыцця. Толькі 10% народжаных немаўлятак здаровыя. Расце наркаманія, алкагалізм, крыміналізацыя, самазабойствы, колькасць вязняў у турмах, разводаў, пазашлюбных дзетак і г. д. У выніку па прычыне перавышэння смяротнасці над нараджальнасцю зараз у Беларусі жыве менш за 10 мільёнаў чалавек, нягледзячы на значны прыток імігрантаў. Шэраг гэтых працэсаў носяць не толькі беларускі, але і сусветны характар (тэрарызм і крыміналізацыя, наркаманія і адмоўныя экалагічныя працэсы, разбурэнне маралі і разбэшчанасць), таму і вырашаць іх трэба сумесна з іншымі дзяржавамі.

Перад беларусамі і Беларуссю, як і перад усім чалавецтвам у новым стагоддзі паўстае важнейшая суперпраблема ўстойлівага развіцця, якая з'яўляецца шматмернай і звязана не толькі з экалогіяй і катастрафічным змяншэннем і недахопам прыродных рэсурсаў, але і з пытаннямі эканамічнымі, сацыяльнымі, дэмаграфічнымі, палітычнымі і інш. Патрэбен разумны баланс усіх гэтых праблем на карысць сучасных і будучых пакаленняў.

У сувязі з інтэнсіўнымі працэсамі глабалізацыі перад кожным народам, у тым ліку і беларусамі, паўстаюць сур'ёзныя праблемы па захаванню сваіх нацыянальных асаблівасцяў. Неабходна пашыраць нацыянальныя свядомасць і салідарнасць. Вырашэнне ўсіх гэтых праблем ў першую чаргу залежаць толькі ад нас саміх.

Згуртаванне ўсіх беларусаў свету вакол беларускай нацыянальнай ідэі, у аснове якой знаходзіцца дзяржаўная незалежнасць, дэмакратыя і інтэгральнае адраджэнне палітыкі, эканомікі, культуры, мовы, адукацыі, навукі, павінна прывесці не толькі да выжывання, але і далейшага развіцця беларускай нацыі. Гэта дазволіць стварыць незалежную эканамічна моцную дэмакратычную еўрапейскую дзяржаву з высокаразвітай культурай, у першую чаргу беларускай, але з аднначасовым раўнапраўным росквітам культур усіх нацыянальных меншасцяў краіны, усіх існуючых рэлігійных канфесій. Такая краіна — квітнеючая цудоўная Беларусь, родная Бацькаўшчына ўсіх беларусай свету — будзе жыць у новым XXI стагоддзі, у новым тысячагоддзі. Няхай вечна жывуць беларусы, вечна жыве Беларусь!

## СТВАРАЦЬ БЕЛАРУСКАМОЎНАЕ АСЯРОДДЗЕ*

Ад імя Згуртавання беларусай свету «Бацькаўшчына» сардэчна віншую ўдзельнікаў VII чарговага з'езда самай беларускай арганізацыі ў свеце — Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны. Шчырая падзяка ўсім сябрам ТБМ, бо роля ТБМ ў захаванні і развіцці беларушчыны надзвычайна вялікая. Ужо 12 гадоў ТБМ пільна працуе на галоўным шляху жыцця беларусаў. Перш-наперш хочацца выказаць шчырую падзяку стваральніку і першаму старшыні таварыства Нілу Гілевічу, які так многа зрабіў на ніве слова беларускага, а як старшыня Камісіі па культуры і адукацыі Вярхоўнага Савета Беларусі — у прыняцці Закона аб мовах і ў наданні беларускай мове статуса адзінай дзяржаўнай мовы. Вялікі дзякуй скажуць усе беларусы свету і старшыням таварыства — Генадзю Бураўкіну і Алегу Трусаву за іх плённую працу. Асабіста я вельмі рады, што мне давялося ўдзельнічаць у працы таварыства з першых дзён яго ўтварэння ў якасці сябра рэспубліканскай рады.

У адносінах да сваёй роднай мовы Беларусь — краіна унікальная. Калі ў іншых краінах аналагічныя таварыства моваў працуюць галоўным чынам над удасканаленнем і развіццём роднай мовы, мы вымушаны займацца не толькі гэтымі праблемамі, але значна больш намаганняў траціць на пашырэнне і, што асабліва крыўдна, на выжыванне беларускай мовы ў беларускім грамадстве.

---

* Наша слова. 2001. 12 верас. Выступленне на VII з'ездзе Таварыства беларускай мовы.

Беларусы па адносінах да сваёй мовы дзеляцца на розныя катэгорыі. Значная колькасць беларусаў не толькі забыліся на сваю мову, але ўжо і не лічаць сябе беларусамі, а адносяць сябе да рускіх ці палякаў, у лепшым выпадке — да «тутэйшых». Не меньшая колькасць беларусаў яшчэ лічаць сябе беларусамі, але мову забылі зусім ці разумеюць яе, але па-беларуску не гавораць. Гэты працэс асіміляцыі надта магутны. На жаль, у сумную Чырвоную кнігу трапіла і беларуская мова. Наша галоўная задача — выкрасліць з гэтай кнігі мову беларускую.

Ёсць нават такія беларусы, якія прынцыпова выступаюць супраць беларускай мовы і нават ненавідзяць яе (асабліва іх многа сярод тых людзей, якія «пацярпелі» ад мовы, заваліўшы экзамен, атрымаўшы адмоўны імідж на працы і г. д.). Беларус, які ў сваёй большасці па натуры паслухмяны, паважае начальства і стараецца часта браць з яго прыклад, не размаўляе ці імкнецца не размаўляць на роднай мове, бо начальнік так робіць. [...]

Многія з беларусаў, асабліва сярод чыноўнікаў, хоць і ведаюць мову, але баяцца весці размову па-беларуску, бо іх начальнік гаворыць па-руску. Яскрава гэта выяўляецца ў нашым урадзе, Палатах Нацыянальнага сходу і наогул ва ўсёй «вертыкалі». На жаль, гэтая плынь моцна захапіла і нашых дырэктараў, рэктараў, кіраўнікоў школ, вышэйшых і сярэдніх навучальных ўстаноў, Акадэміі навук, навуковых інстытутаў, прадпрыемстваў і г. д. Наша краіна ў гэтым плане не толькі унікальная, але і абсурдная. Няма больш такой, дзе кіраўнік дзяржавы некалькі разоў зрабіў выступленне па-беларуску, а ў час многіх тысяч бясконцых прамоў і выступленняў беларускія словы гаворыць толькі ў здзеклівым тоне. І многія беларусы не крыўдуюць на гэта, а ўспрымаюць як належнае.

Ёсць беларусы, якія ведаюць сваю мову, але адвыклі аб яе і размаўляюць па-руску, бо ім так лягчэй, і думаюць яны ўжо на рускай мове.

Шэраг беларусаў, якія па-сапраўднаму любяць сваю мову, адпачываюць душой і сэрцам сярод пісьменнікаў, мастакоў, артыстаў, якія арганізуюць вечары, імпрэзы, выставы. Некаторыя беларусы так трапятліва адносяцца да роднай мовы, што ўспрымаюць яе як нешта такое ім блізкае, сардэчнае, амаль інтымнае, што гавораць на ёй толькі сярод такіх жа прыхільнікаў мовы і пераходзяць на рускую ў іншым асяроддзі.

Шмат беларусаў прытрымліваюцца двухмоўя і гавораць па-беларуску ці па-руску ў залежнасці ад таго, на якой мове да іх звярнуліся.

Нарэшце, ёсць вельмі нешматлікая катэгорыя беларусаў, якія ў любым асяроддзі — і ў хаце, і ў грамадстве — размаўляюць толькі па-беларуску.

На жаль, вельмі кароткая беларусізацыя пачатку 90-х гадоў змянілася антыбеларускай палітыкай сучасных улад. Закон аб мовах не выконваецца, нават і сапраўднага двухмоўя няма. Усе навучальныя ўстановы, тэлебачанне, газеты і іншыя СМІ ўсё больш робяцца рускамоўнымі. Усё разам прывяло да катастрафічнага стану беларускай мовы, калі яе практычна не чуваць на вуліцах гарадоў і нават вёсак. Беларускамоўны беларус ў Беларусі адчувае сябе вельмі няўтульна, мусіць, горш, чым у рэзервацыі. Таму мае рацыю Сакрат Яновіч у сваім нядаўнім артыкуле.

Але мае рацыю і Алег Трусаў, калі падкрэслівае яшчэ адну дзівосную якасць беларусаў, якія, нягледзячы на такі стан мовы, хочуць лічыць і лічуць сябе беларусамі, 81,9% якіх запісалі сябе, хоць і быў пэўны ўціск супраць гэтага, прычым 85,6% адзначылі, што для іх родная мова — беларуская. Значыць, жыве беларускасць і любоў да мовы ў многіх беларусаў. Гэтыя лічбы натхняюць. Неабходна стварыць беларускамоўнае асяроддзе. Калі яно патроху будзе пашырацца, будзе і выбух беларускамоўнасці. Адна з галоўных задач ТБМ — усюды ствараць такое асяроддзе. У гэтым сэнсе кожнаму сябру ТБМ трэба пачынаць з сябе і старацца ўвайсці ў тую катэгорыю беларусаў, якія ў Беларусі ўсюды размаўляюць па-беларуску.

Жадаю поспехаў у працы з'езду! Не дадзім загінуць мове беларускай! Жыве беларуская мова, жыве цудоўная краіна свету — Беларусь!

## МОЎНАЯ ТРАГЕДЫЯ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА*

Прыгажэйшы край у цэнтры Еўропы, які дадзены беларусам ад Бога, заўсёды прываблівае суседнія дзяржавы. Яны імкнуліся далучыць гэты край да сябе ўсякімі метадамі — і ваеннымі захопамі, і дыпламатычнымі мерапрыемставамі і інш. Адзін з галоўных — праца з тутэйшым працавітым і таленавітым насельніцтвам шляхам яго асіміляцыі і ў першую чаргу моўнай акупацыяй. Ішла дзяржаўная мэтанакіраваная палітыка разбурэння мовы карэннага насельніцтва Беларусі — аж да афіцыйнай забароны мовы спачатку ў Рэчы Паспалітай, а затым і ў царскай Расіі. Барацьба з мовай працягвалася некалькі стагоддзяў. Гэтаму працэсу садзейнічала і царква. У выніку прыпынілася развіццё беларускай цывілізацыі, а Беларусь стала выдатным донарам для іншых і асабліва суседніх культур. Дастаткова нагадаць геніяльных выхадцаў з Беларусі — польскага паэта Адама Міцкевіча і расійскага пісьменніка Фёдара Дастаеўскага. Магутная русіфікацыя не зменшылася і ў савецкі час: кароткая «беларусізацыя» хутка змянілася асабліва моцнай русіфікацыяй пасля барацьбы з «нацдэмаўшчынай» у 30-я гады.

Стан беларускай мовы на Беларусі катастрафічны. Апошнія носьбіты народнае мовы — вясковыя беларускія жанчыны — адыходзяць у нябыт. Амаль увесь люд беларускі ахапіла трасянка, якая, як нядаўна правільна адзначыў Анатоль Казловіч, стала народнай мовай беларусаў. За гэты працяглы час і трасянка змянілася. Калі спачатку яна была галоўным чынам на базе беларускай мовы, у якую ўносілася ўсё больш рускіх слоў з вялікім беларускім акцэнтам, дык цяпер яна стала амаль поўнасцю рускай, перамешанай асобнымі беларускімі словамі з характэрным беларускім вымаўленнем. Калі раней яна як бы трохі і ахоўвала беларусаў ад поўнай русіфікацыі, дык цяпер стала зусім знямоглай.

* Народная воля. 2002. 9 жн.

Пасля таго, як Беларусь атрымала самастойнасць і быў прыняты закон аб дзяржаўнай беларускай мове, апошняя пачала шпарка пашырацца. Асабліва яна замацавалася сярод прыхільнікаў нацыянальнага адраджэння (рух БНФ, літаратурныя і мастацкія суполкі і інш.). Але кароткі час нацыянальнага адраджэння і ўздыму беларускай мовы быў рэзка абарваны лукашэнкаўскім рэферэндумам (1995), які ўзаконіў так званае двухмоўе, а затым яго ж указам праз дапаўненні ў Закон аб мовах у Рэспубліцы Беларусь (1998) зусім адкінуў беларускую мову ў другарадны стан. Беларуская мова пачала выціскацца адусюль і затрымалася галоўным чынам сярод сяброў БНФ і іншых так званых «апазіцыянераў». Таму калі хто загаворыць па-беларуску, дык часта можна пачуць засцярожнае пытанне: «Ты што — бэнээфавец ці апазіцыянер?»

Не спрыяюць беларускай мове адмоўныя адносіны да яе кіраўніка дзяржавы, які неаднойчы з пагардай падкрэсліваў мізэрнасць мовы беларускай і з пафасам — веліч рускай. У сваіх выступленнях, калі гаворыць пра апазіцыю і каб падкрэсліць яе нікчэмнасць, ён раптоўна і са здзекам пераходзіць з рускай мовы на беларускую. Гэты прыём перанялі некаторыя парламентарыі і халуйскія «тэлевізійныя салаўі» тыпу Новікава. У выніку ўся «вертыкаль» — ад прэзідэнта краіны да старшыні сельсавета і калгаса — стараецца размаўляць па-руску, а ў сапраўднасці часцей за ўсё атрымліваецца тыповая трасянка. Апошняя цалкам авалодала нават членамі Адміністрацыі прэзідэнта, урада, парламентарыямі і інш. Многія проста баяцца размаўляць па-беларуску, каб не падумалі, што яны «нацыяналісты» або знаходзяцца ў апазіцыі. Асабліва сумна і нават сорамна слухаць нашых дзяржаўных дзеячаў (у тым ліку і міністраў) гуманітарнага напрамку (Міністэрства інфармацыі, культуры, адукацыі, шэрага універсітэтаў, акадэмій, інстытутаў і інш.), многія з якіх добра валодаюць беларускай мовай, але калі да іх звяртаецца з пытаннем карэспандэнт тэлебачання ці радыё па-беларуску, яны падкрэслена даюць адказ на рускай мове. Для чыноўніка самае галоўнае — захаваць сваё месца, не згубіць сваю ўладу, а словы аб «заботе о народе, его культуре» — звычайная дэмагогія.

У нармальнай краіне ўсе яе грамадзяне, незалежна ад таго, да якой партыі яны належаць, якога ідэалагічнага напрамку прытрымліваюцца, прыхільна ставяцца да ўладаў ці не, гавораць на мове карэннай нацыі, і апошняя квітнее і развіваецца, нягледзячы на палітычную сітуацыю. У нас жа ўсё наадварот: хто падтрымлівае сучасную ўладу, галоўным чынам размаўляе на мове магутнай суседняй дзяржавы, большасць тых, хто яе крытыкуе, — на сваёй роднай. Беларуская мова зноў, як і ў былыя гады, стала палітычным падзелам паміж адной часткай насельніцтва і другой, а гэтае становішча шкодзіць пашырэнню беларускай мовы, нармальнаму жыццю грамадства.

Афіцыйна ў Беларусі існуе двухмоўе, але ў рэальным жыцці — і яго няма. Кіраўнікі краіны, галоўная мэта якіх — зліццё Беларусі і Расіі ў адну дзяржаву, а больш правільна — паглынанне меншай вялікай, не зацікаўлены ў двухмоўі, і яны робяць усё магчымае, каб поўнасцю панавала руская мова, мэтанакіравана і няўхільна вядуць народ бела-

рускі да рускага аднамоўя. Ужо можна гаварыць аб акупацыі Беларусі рускай мовай. Для сучаснай нашай дзяржавы беларуская мова не патрэбна, яна толькі перашкаджае палітыцы ўладаў, і таму яе троху прымаюць у якасці фігавага лістка, каб хоць неяк прыкрыць існуючае варварскае разбурэнне беларушчыны. Без рускай мовы ў Беларусі пражыць немагчыма, а без беларускай нават лягчэй, бо менш шанцаў атрымаць знявагу тыпа злога вокрыку: «Говорите на нормальном языке» ці ярлык «нацыяналіста», «фашыста», «дерьмакрата». Мінімізіраваць беларускую мову ў садках, школах, вышэйшых навучальных установах, у сродках масавай інфармацыі, літаратуры, культуры, навуцы, сферы абслугоўвання і інш. — відавочная мэта ўладаў, якую яскрава бачна «невооруженным глазом». Асабліва гэтая палітыка праявілася ў апошні час у барацьбе з беларускамоўнай часткай Саюза пісьменнікаў, у зняцці з галоўных рэдактараў мастацкіх часопісаў выдатных пісьменнікаў, аб'яднанні ў выдавецкі холдынг шэрага часопісаў і газет пад кіраўніцтвам адыёзных антыбеларускіх фігур, закрыцці некаторых газет і г. д. Выклікае абурэнне нахабства некаторых халуйствуючых пісак, якія прапануюць забараніць друкаваць творы лепшых беларускіх пісьменнікаў, вядомых ва ўсім свеце.

Беларуская мова стала зусім незапатрабаванай дзяржавай і значнай часткай грамадскасці. Пакуль будзе такое становішча, цяжка разлічваць на адраджэнне мовы, а разам з ёй — на ўздым эканомікі, вытворчасці, культуры, навукі, на стварэнне квітнеючай багатай краіны. Такую дзяржаву могуць пабудаваць толькі сапраўдныя патрыёты сваёй Радзімы, а без роднай мовы яны не з'явяцца.

Каб беларуская мова была ў Беларусі запатрабавана (а гэта галоўная неабходнасць сучаснага і будучага развіцця народа і краіны), трэба ўсіх чыноўнікаў (ад прэзідэнта РБ да самага маленькага клерка) прывесці мінімум хаця б да сапраўднага двухмоўя. Напрыклад, ці можа карыстацца павагай парламентарый ці міністр, які не ведае роднай мовы свайго народа? Для яго калег з іншых краін — гэта проста нонсенс. Чаму ўбольшасці краін свету іх жыхары абавязкова павінны ведаць родную мову, а людзі, якія хочуць атрымаць грамадзянства краіны, павінны здаць экзамен па мове? Без ведання беларускай і рускай моваў не можа чалавек працаваць у сфере абслугоўвання, асабліва дзяржаўнага. Хіба гэта нармальна, што не з кожнай пошты можна паслаць тэлеграму на роднай мове, калі ў большасці ўстаноў заяву ці іншы дакумент прымаюць толькі па-руску? Любая дакументацыя (у тым ліку шыльды, назвы вуліц і г. д.) таксама павінна быць беларускамоўная ці хаця б двухмоўная. Бясспрэчна, беларускамоўная адукацыя павінна пашырацца — ад садкоў і школ да вышэйшых навучальных устаноў. Усё гэта прывядзе да стварэння беларускамоўнага асяроддзя, якое не дазволіць загінуць роднай мове, а разам з ёй і беларускай нацыі. Калі дзяржава лічыць сябе беларускай, яна павінна падтрымліваць родную мову, нарэшце нармалізаваць сітуацыю з мовамі ў Беларусі.

Справа захавання і развіцця беларускай мовы цяпер амаль цалкам перайшла да нацыянальна свядомай інтэлігенцыі, колькасць якой патроху расце, і што вельмі прыемна адзначыць — і за кошт моладзі.

Нас ратуе тое, што беларуская зямля з яе цудоўнай прыродай, мяккімі прыгажэйшымі краявідамі нараджае народ-лірыка, з якога безперапынна вылучаюцца паэты, мастакі, творцы з глыбокім пачуццём адданасці свайму роднаму куту, з нацыянальнай душой і сэрцам, цесна прывязанымі да родных каранёў. Ужо зараз яны ствараюць на беларускай мове выдатныя творы літаратуры і мастацтва, па розным напрамкам ведаў энцыклапедыі, слоўнікі і г. д. Нягледзячы на велізарные цяжкасці, якія ствараюць сучасныя ўлады, нацыянальна свядомая частка насельніцтва павінна зберагчы беларускую мову ад націску халуйствуючага чыноўніцтва, пранесці яе праз палітычныя буры аб'яднання, таталітарызму, савецкай (камуністычнай) настальгіі, глабалізацыі і да т. п., нармалізаваць у краіне моўнае жыццё, каб нашы нашчадкі былі ўдзячныя за тое, што мы не далі загінуць беларускай мове, а з ёю і ўсёй беларускай нацыі.

## ТВАР БЕЛАРУСКАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ*

Многія чулі, што 17 студзеня, калі я вяртаўся з пасяджэння Аргкамітэта па падрыхтоўцы святкавання 85-х угодкаў БНР, а гэта было каля 19 гадзін вечара, бліз пад'езда майго дома мяне чакаў сіні «Опель», з якога непрыкметна выйшлі бандыты, так моцна збілі мяне, што я на тры гадзіны згубіў прытомнасць і трапіў у нейрахірургічнае аддзяленне бальніцы № 9. Праз некалькі дзён вядомы фотакарэспандэнт Анатоль Кляшчук зрабіў маё фота, якое было змешчана ў газеце «Наша ніва» з подпісам «Твар беларускай інтэлігенцыі». Мой пабіты твар з сумнымі прыпухлымі вачыма стаў як бы сімвалам беларускай інтэлігенцыі. Яляжаў у бальніцы і думаў: «Дык які ж сапраўды твар беларускай інтэлігенцыі?»

Інтэлігенцыя ў Беларусі як сацыяльная група (слой) насельніцтва, якая займаецца пераважна разумовай працай, узнікла на мяжы XVIII і XIX ст. У той час і на працягу *ўсяго* XIX ст. сярод інтэлігенцыі Беларусі панавала польскамоўная і рускамоўная. Аднак ужо тады пачала з'яўляцца група інтэлігентаў, якую можна аднесці да нацыянальна свядомай, сапраўды беларускай інтэлігенцыі. Яны ўсведамлялі сябе беларускімі патрыётамі, а Беларусь як краіну са шматвяковай гісторыяй, своеасаблівай багатай культурай, мовай, менталітэтам народа. Асабліва гэтая частка інтэлігенцыі пашырылася і ўзмацнілася ў канцы XIX — пачатку XX ст. Гэты працэс атрымаў пэўны ўсплеск у сувязі з намаганнямі стварыць сваю дзяржаўнасць — спачатку аб'яўленне БНР, а затым утварэнне БССР з палітыкай беларусізацыі ў 20-х гадах мінулага стагоддзя. Але на фарміраванне беларускай інтэлігенцыі адмоўна ўплывалі многія фактары: адсутнасць незалежнай дзяржаўнасці, рэпрэсіі пасля нацыянальна-вызваленчых паўстанняў, шматлікая эміграцыя, адсутнасць нацыянальнай адукацыі, моцная асіміляцыя.

* Наша ніва. 2003. 4 крас. Упершыню друкуецца поўнасцю.

Найбольш магутны ўдар беларуская нацыянальная інтэлігенцыя атрымала ў часы бальшавіцка-сталінскіх рэпрэсій, калі многія сотні лепшых сыноў Бацькаўшчыны былі сасланы ў іншыя мясціны «архіпелага ГУЛАГ» і нават расстраляны. Бальшавіцкі рэжым імкнуўся да стварэння паслухмяных манкуртаў — «вінцікаў» для будаўніцтва віртуальнага сусветнага камунізму.

Як бачым, станаўленне беларускай інтэлігенцыі было вельмі цяжкім, а лёс яе прадстаўнікоў у значнай ступені трагічным. У выніку сучасная інтэлігенцыя Беларусі падзяляецца на беларускамоўную (а больш правільна двухмоўную) і рускамоўную, прычым апошняя колькасна зноў-такі пераважае. Сярод і той і другой часткі людзі розных нацыянальнасцяў: беларусы, рускія, украінцы, палякі, татары, габрэі і інш. Інтэлігенцыя Беларусі вельмі разнастайная — яна падзяляецца не толькі па мове, але і па многіх іншых паказчыках: адносінах да стварэння незалежнай краіны Беларусь ці аб'яднання з Расіяй у адну Саюзную дзяржаву, а то і ўваход у Расію цалкам; адмоўнай ацэнцы Савецкага Саюза і розных ступенях настальгіі па гэтай былой дзяржаве; адносінах да яе кіраўнікоў, пачынаючы з Леніна і Сталіна; патрабаванню пакаяння за балшавіцкія рэпрэсіі і іх апраўданню; па месцы працы (гарадская і вясковая); па інтэлігентнасці (інтэлігенты бываюць вельмі культурныя і нават хамскія — праўда, ці можна такіх адносіць да інтэлігентаў?); адносінах да сучаснага кіраўніка і ўлад краіны (ад поўнай падтрымкі да апазіцыйнасці) і многіх іншых.

Што ж цяпер наогул найбольш характэрна для большасці інтэлігенцыі Беларусі? Пасля нядаўняга, але вельмі кароткага часу нацыянальнага адраджэння і прабуджэння ад перыяду адміністратыўна-каманднага застою, калі многія адчулі вольнасць і смеласць, пасля стварэння прэзідэнцкай дзяржавы для большасці насельніцтва Беларусі, у тым ліку і беларускай інтэлігенцыі, пачаліся досыць хутка вяртацца тыя якасці, якія былі тыповымі для бальшавіцка-савецкага часу і ад якіх яшчэ не паспелі як мае быць адвучыцца. Гэта, перш за ўсё, пачуццё страху — найбольш пашыранага пачуцця ва ўсім жывёльным свеце. А ён вядзе за сабой такія адмоўныя з'явы, як рабскае паслухмянства, халуйства, падхалімства, дэмагогія, двудушша і інш.

Як прыклад такога бяздумнага паслухмянства, якое ахапіла нават членаў НАН Беларусі, прывяду нядаўнюю сесію агульнага сходу, на якой зацвярджаўся новы Статут НАН Беларусі. Кіраўнік дзяржавы, як і ва ўсіх іншых структурах краіны, вырашыў стварыць у акадэміі чыноўніцкую «вертыкаль» і выдаў указ, па якому поўнасцю ліквідаваў выбарнасць кіруючых пасад прэзідэнта НАНБ, віцэ-прэзідэнтаў, галоўнага вучонага сакратара, прэзідыума, якіх ён цяпер будзе прызначаць сам. Членаў агульнага сходу зацвярджае таксама ён, а кіраўнікоў устаноў НАНБ на кантрактнай аснове прызначае прэзідэнт акадэміі. Нават у самы дыктатарскі час пры Сталіне ў АН не адмянялі выбараў. Камісія па падрыхтоўцы Статута на чале з былым прэзідэнтам Акадэміі М. А. Барысевічам поўнасцю ўключыла ўказ у праект Статута. Галасаванне было не тайным, а адкрытым і таму ўсе 394 сябры агульнага сходу, які, праўда, быў на $^1/_3$ разбаўлены прадстаўнікамі неакадэмічных

устаноў, прагаласавалі «за». Я вельмі здзівіўся, калі ўбачыў, што «супраць» толькі я адзін, хаця я добра ведаў, што многія члены акадэміі не падтрымліваюць адмену выбараў сваіх кіраўнікоў. Цяпер па Статуту кіраўніком акадэміі можа стаць любы чыноўнік, нават не вучоны.

На жаль, апазіцыйная частка беларускай інтэлігенцыі вылучаецца, асабліва ў апошні час, многімі хістаннямі, няўпэўнасцю, вялікай асабістай ці калектыўнай амбіцыйнасцю, што прыводзіць да вядомай камбінацыі «лебедзь, рак ды шчупак» і нават да сварак. Яшчэ ў час адраджэння 20-х гадоў мінулага стагоддзя мой дзядзька Максім Гарэцкі, 110-годдзе з дня нараджэння якога мы адзначаем у гэтым годзе, сказаў: «Ахвярую сваім «я» ва ймя святога ўсім нам адраджэння». Змены існуючага зараз сумна-трагічнага твара беларускай інтэлігенцыі можна дабіцца толькі тады, калі кожны нацыянальна свядомы жыхар Беларусі (асабліва з ліку кіраўнікоў беларускіх партый і рухаў) будзе паступаць па запавету нашых адраджэнцаў-папярэднікаў.

Галоўныя праблемы небяспечнасці для існавання ўсяго чалавецтва: імклівае пагаршэнне экалагічнай сітуацыі, недахоп прыродных рэсурсаў, крыміналізацыя грамадства і тэрарызм, дыктатарскія рэжымы (дзе дыктатар, там канфлікты, а то і войны), магчымасць новай сусветнай вайны. Неабходна, каб наша краіна разам з усім цывілізаваным светам уключылася ў працэсы захавання ўсяго чалавецтва і асабліва сваёй нацыі. Толькі аб'яднанне беларускай інтэлігенцыі можа прывесці да пабудовы сапраўднай незалежнай дэмакратычнай еўрапейскай дзяржавы, і тады кожны жыхар без злога ўдару ў твар падтрымае вядомы вокліч «Жыве Беларусь!».

## КАНТРАСТЫ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЯ*

10 гадоў таму 8—10 ліпеня 1993 г. у Мінску ў Вялікім тэатры оперы і балета адбыўся Першы з'езд беларусаў свету, які наладзіла ЗБС «Бацькаўшчына» разам з урадавымі структурамі Беларусі. Са створанага мастаком Э. Агуновічам сімвала з'езда з гонарам глядзела Ефрасіння Полацкая на сваіх нашчадкаў, якія ўпершыню сабраліся на з'езд і ажыццявілі заклік Янкі Купалы: «На Вялікі Сход. Па Бацькаўшчыну!» З замежжа прыехалі сотні суайчыннікаў. Многія з іх, асабліва з далёкага замежжа, трапілі на Бацькаўшчыну пасля некалькіх дзесяткаў гадоў і са слязамі на вачах углядаліся ў родныя мясціны, якія ў сэрцы трымалі з дзяцінства і снілі ў светлых снах успамінаў, некаторыя падалі на калені і цалавалі сваю родную зямлю. Былі і такія, што баяліся за сябе і з недаверам аглядаліся вакол. Але ўжо аб'яўленая незалежнай краіна з адкрытым сэрцам сустракала землякоў...

* Народная воля. 2003. 17 чэрв. Пад назвай «З намі засталася толькі выява ахоўніцы зямлі беларускай — Еўфрасінні Полацкай».

Упершыню сабраліся разам прадстаўнікі беларусаў усяго свету, каб асэнсаваць сябе ў кантэксце сваёй прысутнасці ў свеце, кансалідаваць нацыю, абмеркаваць шляхі да сапраўднай незалежнасці, дзяржаўнага будаўніцтва і нацыянальнага адраджэння Беларусі. Тады мы з надзеяй глядзелі ў будучыню, і нам здавалася, што гэты з'езд толькі пачатак магутнага працэсу новага адраджэння, але ў хуткім часе мы ўпэўніліся, што то быў яго апагей, бо ў далейшым такога маштабу сустрэчы і такога адзінства волі і мэтаў нацыі стварыць не ўдалося, аб чым сведчаць II і III з'езды беларусаў свету.

У тэатры луналі прыгожыя старадаўнія бел-чырвона-белыя сцягі, толькі наперад клікаў непераможны вершнік Пагоні. Гэтыя святыя дзяржаўныя сімвалы былі прыняты Парламентам незалежнай Беларусі. А ўжо праз чатыры гады Ціцянкоў ірваў на шматкі такі сцяг, бо дзяржаўныя сімвалы былі заменены на падобныя да былых савецкіх, а за тыя, папярэднія, можна атрымаць вялікі штраф ці нават трапіць у турму.

Прагучаў недзяржаўны, але сапраўдны нацыянальны гімн «Пагоня», які выканаў Дзяржаўны народны хор пад кіраўніцтвам Міхася Дрынеўскага. Зараз у краіне ўстаюць пад музыку афіцыйнага гімна БССР.

З'езд адкрыў Васіль Быкаў — першы прэзідэнт ЗБС «Бацькаўшчына». Адзначыўшы цяжкі лёс беларускага народа, ён папярэдзіў: «Нават тыя малыя рэшткі дэмакратыі і свабоды, якія вялізнымі высілкамі дэмакратычных сілаў, і найперш іх авангарду — Беларускага Народнага Фронту, адваяваныя ў камуны, рызыкуюць быць адабранымі назад. [...] Толькі аб'яднанне, салідарнасць... вызначыць нацыянальна-дэмакратычнае адраджэнне нашай мілай Айчыны, Маці-Беларусі». І сапраўды, ужо некалькі гадоў наш выдатнейшы пісьменнік і грамадскі дзеяч вымушаны жыць і працаваць за межамі Радзімы. Стоячы, дэлегаты з'езда сустрэлі выхад на трыбуну Зянона Пазьняка, які пазней разам з іншымі дэпутатамі быў збіты ў зале Вярхоўнага Савета, а затым і зусім змушаны пакінуць Бацькаўшчыну. Некаторыя вядомыя палітычныя дзеячы наогул некуды зніклі ў невядомасць. БНФ, як і іншыя дэмакратычныя рухі і партыі, раскалоліся на больш дробныя, а адсюль і больш слабыя.

Вялікі тэатр, як ніколі, поўніўся роднай беларускай мовай, якая была адзінай дзяржаўнай і асабліва шырока пачала распаўсюджвацца пасля прыняцця Закона аб мовах. Замежныя беларусы дабавілі колькасць беларускамоўных грамадзян і таму нават на вуліцах Мінска можна было адчуць прыгажосць роднай мовы. Кіраўнік дзяржавы Станіслаў Шушкевіч і многія члены ўрада і Парламента (М. Дзямчук, П. Краўчанка, А. Бутэвіч, Я. Вайтовіч, В. Гайсёнак, У. Гілеп, І. Карэнда і інш.) выступалі па-беларуску. Пасля сумнавядомага рэферэндуму і прыняцця «двухмоўя» роднае слова зусім знікла з афіцыйнага ўжытку — пачуць яе ад кіраўніка дзяржавы ці прадстаўніка ўладаў можна як нейкі цуд. Усюду карыстаюцца ёю ўсё менш і менш.

У пачатку 90-х гадоў пашыраліся дэмакратычныя і беларускамоўныя СМІ, навучальныя ўстановы. Па тэлебачанні і радыё можна было ўбачыць і пачуць носьбітаў розных думак — і ўладных і апазіцыйных, іх спрэчкі паміж сабой. Адкрыўся і выдатны Гуманітарны ліцэй імя

Я. Коласа пад кіраўніцтвам У. Коласа. Цяпер ён на грані знішчэння. Беларускамоўныя садкі зніклі зусім, школы можна пералічыць па пальцах, а ВНУ так і не паспелі стаць беларускамоўнымі. Закрываюцца многія газеты, здымаюцца непажаданыя рэдактары часопісаў і газет і замяняюцца на больш паслухмяных шляхам аб'яднання ў холдынг ці атрымліваюць вялікія штрафы, а то і знявольваюцца; бібліятэкам забаронена выпісваць недзяржаўныя газеты і г. д.

У хуткім часе пасля з'езда была прынята Канстытуцыя краіны, на якой клятву прыняў і першы прэзідэнт і лічыў, што яна дае яму «царскія паўнамоцтвы», але з часам Канстытуцыя выклікала яго незадаволенасць, таму ён яе «падправіў», а цяпер свае ўказы і дэкрэты паставіў вышэй, чым многія яе артыкулы. Тады пашыралася выбарнасць кіруючых асоб у розных сферах жыцця — урадавых структур, дырэктараў, але яе замянілі сістэмай «вертыкалі». Гэты працэс закрануў нават навучальныя і навуковыя ўстановы. Напрыклад, у АН Беларусі перад выбарамі прэзідэнта і бюро прэзідыума мы па старой савецкай звычцы прыйшлі ўзгадніць кандыдатуры да тагачасных кіраўнікоў дзяржавы С. Шушкевіча і В. Кебіча, дык яны адказалі: «Выбірайце каго хочаце, гэта Ваша справа». У выніку кіраўніцтва Акадэміі навук тады першы і, на жаль, пакуль што апошні раз было выбрана сапраўды дэмакратычным шляхам. Зараз указам А. Лукашэнкі на ўсе галоўныя кіруючыя пасады не выбіраюць, а прызначаюць, што пярэчыць шматгадовай традыцыі ўсіх акадэмій, іх Статутаў і прынятаму раней закону. На жаль, паслухмянасць членаў акадэміі пад ціскам пачуцця страху і халуйства прывяла да ўключэння гэтага ўказа ў новы Статут НАН Беларусі пры адкрытым (а не тайным) амаль аднадушным галасаванні.

У пачатку 90-х гадоў грамадскасць Беларусі з надзеяй і аптымізмам глядзела на будучыню краіны, якая адрывалася ад таталітарызму і пастанова крочыла ў цывілізаваны мір, абмяркоўваючы магчымасці палітычнай і эканамічнай незалежнасці (свая фінансавая сістэма і грошы; Чарнаморска-Балтыйскі калектар, каб мець некалькі крыніц паступлення паліва; вольны многапалярны рынак і інвестыцыі; перабудова сельскай гаспадаркі і г. д.). Здавалася, што Беларусь цвёрда стала на гэты шлях і ў хуткім часе стане па-сапраўднаму краінай еўрапейскага ўзроўню, апраўдае сваё геаграфічнае палажэнне ў цэнтры Еўропы, тым больш што яе прыхільна пачалі прымаць у свеце, асабліва калі ўбачылі яе мірныя намеры (адмовілася ад ядзернай зброі), імкненне да росквіту і сяброўства. Але кіраўніцтва краіны ўмудрылася амаль з усімі дзяржавамі пасварыцца, апрача толькі дзяржаў з таталітарнымі рэжымамі. Поўная прывязка эканомікі да Расіі, палітыка аб'яднання ў адзіную дзяржаву Расіі і Беларусі (па-сапраўднаму мала выгадная для абедзвюх краін), шчырыя прызнанні А. Лукашэнкі ў тым, што ён прыхільнік парадку тыпу мінулага германскага і што «краіну сваю за цывілізаваным мірам не павядзе», прывяло да магчымасці страты яе суверэнітэту і яшчэ больш знізіла аўтарытэт Беларусі ў свеце і ўвяла ў ізаляцыйны тупіковы стан.

А. Лукашэнка і паслухмянае яму кіраўніцтва краіны ўпарта рухае Беларусь у савецкае мінулае: прасавецкія сцяг, герб і гімн; аднаўлен-

не піянерыі і камсамола; пасады, падобныя да былых палітрукоўскіх; стварэнне ідэалогіі (пакуль нікому не вядома якой, але блізкай да бальшавіцкай); забарона крытыкаваць былых савецкіх «вождей», у тым ліку Леніна і Сталіна (нягледзячы на знішчэнне па іх загадам мільёнаў невінаватых людзей); карыстацца словам «прэзідэнт» у адным выпадку — у адносінах да сябе (генеральны сакратар таксама быў толькі адзін у СССР), хаця «прэзідэнт» і «старшыня» — гэта амаль сінонімы. Трэба помніць, што ў гісторыі рух назад звычайна не бывае перспектыўным, і таму гэта з'ява будзе часовай.

Першы з'езд беларусаў свету паказаў, што беларусы могуць аб'яднацца для пабудовы новай незалежнай дэмакратычнай і багатай краіны, але азначаныя падзеі і з'явы пакуль не даюць магчымасці здзейсніць гэтую галоўную нацыянальную ідэю адраджэння. На жаль, мы стаім на краю страты сваёй незалежнасці, і з намі засталася толькі выява ахоўніцы зямлі беларускай — Еўфрасінні Полацкай, якая з вялікім сумам і кропелькамі слёз на вачах углядаецца ўсё яшчэ з надзеяй, але ўжо значна слабейшай, у свой запалоханы, збяднелы, занадта талерантны народ...

## 85-Я ЎГОДКІ БНР*

25 Сакавіка — адно з самых адметных святаў для беларусаў усяго свету, бо гэты дзень сімвалізуе волю нашай Бацькаўшчыны і дзяржаўную незалежнасць краіны. Гэта — галоўная мэта беларускай нацыянальнай ідэі, аб якой марылі і для здзяйснення якой ахвяравалі сваё жыццё лепшыя сыны Беларусі.

Калі ўзгадваеш БНР, дзівішся, як у тых вельмі цяжкіх, супярэчлівых і неспрыяльных умовах нацыянальныя адраджэнцы таго часу змаглі давесці ідэю афармлення беларускай дзяржаўнасці да абвяшчэння БНР і ў такі кароткі тэрмін яе рэальнага існавання многа зрабілі для пабудовы сапраўды нацыянальнай дзяржавы: беларуская мова была абвешчана дзяржаўнай, прыняты нацыянальныя сімвалы (бел-чырвона-белы сцяг і Пагоня), зацверджаны гімн, прынята часовая канстытуцыя, зроблены звычайныя і дыпламатычныя пашпарты, выпушчаны паштовыя маркі, у шэрагу краін адкрыты консульствы і прадстаўніцтвы БНР, здзейснены магутны прарыў у культуры і адукацыі (беларускія газеты, выдавецтвы, школы, гімназіі, тэатральныя калектывы, педагагічны інстытут, шляхі да адкрыцця нацыянальнага універсітэта) і інш. Кіраўнікі Рады БНР праявілі мудрасць: яны да нашага часу захавалі легітымны сімвал беларускай дзяржаўнасці і нікому не перадалі свае ўладныя паўнамоцтвы, хаця такія спробы і былі.

Мы з вялікай удзячнасцю ўспамінаем і будзем гэта рабіць кожны раз, асабліва ў дзень свята 25 Сакавіка, нашых славутых адраджэнцаў

* Выступленне на ўрачыстым сходзе ў гонар 85-годдзя БНР 25 сакавіка 2003 г.

пачатку мінулага стагоддзя, імёны якіх залатымі літарамі ўпісаны ў гісторыю Беларусі. Дзякуючы іх дзейнасці, іх ахвярнасці жыве Беларусь! З вялікім гонарам і адначасова з невыносным болем у сэрцы за іх трагічны лёс успамінаюцца імёны Ластоўскага, Луцкевіча, Смоліча і многіх іншых дзеячаў БНР!

Нягледзячы на тое, што цяпер мы жывём у фармальна суверэннай Рэспубліцы Беларусь, зноў паўстала рэальная пагроза згубіць незалежнасць краіны. У такі час трэба зрабіць вывады з гісторыі БНР, калі раскол у Беларускай сацыялістычнай грамадзе выклікаў крызіс БНР, а затым і раскол Рады БНР. Тыя праявы ганарлівасці, крыўд, пыхі і амбіцыйнасці, якія ў апошні час характэрныя для многіх кіраўнікоў партый і рухаў, аслабляюць дэмакратычныя сілы і гэтым дапамагаюць тым, хто хоча здаць незалежнасць Беларусі. Трэба ўспомніць словы майго дзядзькі пісьменніка Максіма Гарэцкага, якія ён сказаў яшчэ ў 20-я гады мінулага стагоддзя: «Ахвярую сваім «я» ва ймя святога ўсім нам адраджэння». Правільным быў лейтматыў нядаўна адбыўшагася Усебеларускага сходу інтэлігенцыі — аб'яднанне ўсіх дэмакратычных сіл краіны. Толькі яно можа прывесці для пабудовы сапраўды незалежнай дэмакратычнай еўрапейскай дзяржавы, якая мае імя гордае, светлае і сонечнае — Беларусь!

## НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ*

Незалежнасць — вельмі строгае і важкае слова, якое выклікае шмат думак, параўнанняў, асацыяцый, эмоцый. Гэта — нешта моцнае і нерухомае, як крэпасць, і ў той жа час дзейнае, бо яно адмаўляе «лежня» — лодыра; спакойнае і турботнае; магутнае и кволае; гаспадарчае, звязанае з законам, і свабоднае; гордае і смелае; вальнадумнае і гераічнае... Гэта — паняцце шматгранае, разнастайнае, бо яно існуе не толькі на бытавым і звычайным узроўні, але і ў многіх навуках: гісторыі, філасофіі, сацыялогіі, правасуддзі, матэматыцы, фізіцы, тэхніцы, геалогіі і іншых прыродазнаўчых напрамках ведаў. Для чалавека яно можа быць асабістым і калектыўным.

Асабліва вялікае кола людзей цікавіць і хвалюе незалежнасць у гістарычным плане, у развіцці чалавецтва. Канешне, поўнай, абсалютнай незалежнасці чалавек не можа мець, бо ён у значнай ступені залежыць ад прыродных з'яў і навакольнага асяроддзя (таму што і сам з'яўляецца часцінкай прыроды). Людзі не могуць не залежаць адзін ад аднаго, ад калектыву, ад вёскі і горада, ад дзяржавы і ўсяго сусвету. Колькі намаганняў паклаў чалавек дзеля таго, каб менш залежыць ад прыроды! Многае яму ўдалося, і адзін час ён нават адчуў сябе богам і вырашыў, што можа ўзяць ад прыроды ўсё, што захоча, перарабіць яе

---

* Друкуецца ўпершыню. Напісана ў верасні 2002 г. па просьбе С. Законнікава для часопіса «Ток», на друкаванне якога ўлады не даюць дазвол да гэтага часу.

так, як захоча. Але, нарэшце, зразумеў, што прырода і сусвет вышэй за яго, што Зямля і Космас — гэта яго адзіны дом, які дадзены яму на ўсе вякі і толькі адзін раз. Таму экалогія (навука аб доме людзей) стала чалавеку патрэбнай, ён зразумеў яе неабходнасць, і з часам яна робіцца ўсё больш важнай, бо без глыбокага і дасканалага вывучэння прыроды, без гарманічнага зліцця з ёй чалавецтва можа моцна дэградзіраваць, а то і зусім і назаўсёды загінуць. Тут патрэбна разумная мера незалежнасці.

З часам кожны чалавек, група людзей, а затым і асобныя народнасці і нацыі так ці інакш імкнуліся да сваёй незалежнасці, якая заўсёды заставалася адноснай. І нават наадварот, стала зразумела, што некаторая мера залежнасці (праз узаемную дапамогу, гандаль, мірнае існаванне і г. д.) дапамагае захаваць сваю незалежнасць. Колькі ў гісторыі прыкладаў барацьбы за дзяржаўнасць, за незалежнасць — гераічных і трагічных, яскравых і змрочных! Можна сказаць, што ўся гісторыя чалавецтва — гэта змаганне за незалежнасць. І амаль заўсёды такая барацьба прыводзіла да незлічонай колькасці людскіх ахвяр.

На жаль, Беларусь не стала тут выключэннем, а нават наадварот, па колькасці загінуўшых у адносінах да ўсіх жыхароў, уваходзіць у першыя рады краін свету. Нягледзячы на тое, што дзяржаўнасць нашага народа склалася яшчэ ў першым тысячагоддзі н. э., а затым дасягнула свайго росквіту ў XV — XVI стст. («залатым веку») у Вялікім княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім і большасць гарадоў, у якасці праявы самастойнасці, атрымалі граматы на магдэбургскае права, нацыянальная незалежнасць краіны паступова была згублена на некалькі стагоддзяў спачатку ў складзе Рэчы Паспалітай, а потым — Расійскай імперыі. Бязконцыя войны, гераічныя паўстанні, якія выклікалі многія тысячы людскіх ахвяр і расцярушванне беларусаў па ўсім свеце, не прывялі да аднаўлення незалежнай дзяржавы — стрыжня беларускай нацыянальнай ідэі.

На пачатку XX ст. намаганнямі нацыянальных адраджэнцаў быў сабраны Усебеларускі з'езд, які хоць і быў разагнаны бальшавікамі, але паспеў 25 сакавіка 1918 г. абвясціць Беларускую Народную Рэспубліку як незалежную вольную дзяржаву. Яе існаванне было вельмі кароткім. БССР таксама не стала незалежнай краінай.

Найвялікшая каштоўнасць, якую здолеў здабыць беларускі народ напрыканцы мінулага тысячагоддзя і ўвайсці ў новае, гэта — незалежная дзяржава Беларусь, што адзначана ў Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце (1991) і залатымі літарамі ўпісана ў Канстытуцыю краіны.

Незалежнасць Беларусі хоць фармальна і існуе, але яна вельмі кволая, далёкая ад сапраўднай, і ўвесь час над намі вісіць рэальная небяспека страціць яе, што было б смяротнай падзеяй для беларускай нацыі. Таму многія, каму дарагая Бацькаўшчына, сабраліся на II Усебеларускі з'езд за незалежнасць (ліпень 2000 г.) і прынялі Акт Незалежнасці Беларусі, за які прагаласавала 1376 дэлегатаў з усіх раёнаў краіны. Я вельмі задаволены, што мне давялося тады быць адным з чатырох сустаршынь Аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенню з'езда і рабіць асноўны даклад.

Якой жа ўяўляецца сапраўдная незалежнасць краіны? Толькі дэмакратычная цывілізаваная дзяржава можа гарантаваць незалежнасць сваім грамадзянам і самой краіне, якую здолеюць пабудаваць нацыянальна свядомыя жыхары — сапраўдныя патрыёты сваёй Бацькаўшчыны. Улады незалежнай дзяржавы ўнутраныя справы і міжнародныя адносіны вырашаюць, будуюць, як правіла, самастойна і абавязкова на карысць сваёй краіны, свайго народа. Улады павінны быць такімі, каб грамадзяне краіны не саромеліся за іх, а ганарыліся.

Незалежнасць — інтэгральны феномен, які складаецца з вельмі многіх кампанентаў, страта нават аднаго з якіх можа нанесці часткова ці значную страту, а то і зусім пахіснуць яе. Гэта — родная мова, нацыянальная культура і навука, адукацыя і выхаванне; эканоміка (прамысловы і аграрны яе сектары, фінансава-крэдытная сістэма); рознабаковая бяспека: харчовая, медычная (у тым ліку і лекавая), інфармацыйная, сацыяльная, экалагічная, дэмаграфічная, ваенная і інш. Вырашэнне адзначаных накірункаў можа выканаць толькі вельмі адукаванае, культурнае, кампетэнтнае, нацыянальна свядомае кіраўніцтва краіны, якое праводзіць шэраг разумных эканамічных, сацыяльных і палітычных рэформаў, — калі не народ для ўрада, а ўрад для народа. У такой дзяржаве ўсім кіруе Канстытуцыя і Закон, а не ўказы аднаго чалавека, Незалежнасць пануе ў той дзяржаве, у якой незалежныя ўсе чатыры ўлады: заканадаўчая, выканаўчая, судзебная і інфармацыйная. Беларусь стане па-сапраўднаму незалежнай толькі тады, калі адзначаныя паказчыкі будуць рэаліямі нашага жыцця.

Пакуль беларускамоўны беларус не будзе баяцца атрымаць абразлівы вокрык: «Говори на нормальном языке!» ці ярлык «нацыяналіста», «апазіцыянера», «бэнээфаўца», а то і «фашыста» толькі за тое, што размаўляе па-беларуску; пакуль не загучыць паўсюль беларуская мова — у дамах і на вуліцах, з вуснаў міністраў і парламентарыяў, вяскоўцаў і гараджан, — не зможам пабудаваць незалежную краіну. Пераважна беларускамоўнымі павінны стаць садкі і школы, гімназіі і вышэйшыя навучальныя ўстановы, тэлебачанне і радыё, тэатры і кіно, газеты і часопісы, цэрквы і касцёлы, пошта і магазіны і г. д. Адначасова ў некаторых раёнах патрэбна, каб былі школы, іншыя пералічаныя ўстановы і сродкі масавай інфармацыі на мовах нетытульных нацыянальнасцяў (рускай, польскай, украінскай, габрэйскай, татарскай, літоўскай), каб рускі чалавек мог пайсці ў царкву праслухаць службу на сваёй мове, паляк — у касцёл, татарын — у мячэць, а габрэй — у сінагогу.

Пакуль будзем у назвах вуліц, калгасаў і пасёлках, як і раней, упарта ўшаноўваць памяць многіх царскіх і бальшавіцкіх дзеячаў антыбеларускай накіраванасці (Сувораў, Дзяржынскі, Кнорын, Мяснікоў, Варашылаў і інш.) і, наадварот, ледзь-ледзь успамінаць, ігнараваць, а то і зусім забываць нашых шматлікіх беларускіх выдатных прадстаўнікоў літаратуры, культуры, навукі, грамадскіх і дзяржаўных дзеячаў, не жыць нам у самастойнай Беларусі.

Чым больш нашых жыхароў будуць трапляць у аддзяленні міліцыі і атрымліваць штрафы за падтрымку старадаўніх нацыянальных сім-

валаў (бел-чырвона-белы сцяг, Пагоня і інш.), за купалаўскі жыццярадасны патрыятычны покліч «Жыве Беларусь!», тым далей мы будзем ад незалежнасці. Толькі з гэтымі нацыянальнымі атрыбутамі можна пабудаваць суверэнную Беларусь.

Пакуль не пакаемся ў бальшавіцка-сталінскіх злачынствах, не пабудуем мемарыяльныя комплексы і помнікі не толькі ахвярам фашызму і Вялікай айчыннай вайны, але ў Курапатах і іншых многіх мясцінах «жоўтых пясочкаў» (па В. Быкаву), не жыць нам у самастойнай краіне.

Пакуль будзе існаваць занадта вялікая армія сілавых службаў і асабліва атрадаў тыпу «эскадронаў смерці», якія не могуць абараніць насельніцтва ад крымінальных структур, ад карупцыі, а нават садзейнічаюць знікненню шэрага вядомых палітычных дзеячаў-апазіцыянераў, не будзем мы адчуваць сябе незалежнымі.

Пакуль страх, хлусня, двудушша, халуйства не пакіне наша грамадства, не сыдзе з сэрца і душы большасці жыхароў, не зможам пабудаваць самастойную дзяржаву.

Калі жыццёвыя і сацыяльныя ўмовы ў Беларусі будуць такімі, што яе грамадзяне не захочуць папаўняць рэкі «ўцечкі мазгоў», пакідаць сваю радзіму ў пошуках лепшага жыцця і працы, а наадварот, родная краіна зробіцца прыцягальнай для вяртання тысяч суайчыннікаў, кожны трэці з якіх жыве цяпер па-за межамі бацькаўшчыны, тады ёсць надзея на незалежнасць Беларусі.

Добрыя, раўнапраўныя і ўзаемавыгадныя адносіны з усімі краінамі свету і асабліва з нашымі суседзямі — Расіяй, Украінай, Польшчай, Літвой і Латвіяй — дазволяць стаць Беларусі суверэннай дзяржавай, якую прызнае ўвесь свет і якая будзе карыстаецца вялікай павагай як цывілізаваная краіна.

Толькі нацыянальнае адраджэнне, якое павінна быць інтэгральным і закрануць усе сферы жыцця, толькі нацыянальнае абуджэнне, якое авалодае народамі Беларусі, прывядуць да пабудовы сапраўды незалежнай багатай еўрапейскай краіны, у якой будзе заможна, культурна і шчасліва жыць кожны чалавек, незалежна ад нацыянальнасці і канфесійнай прыналежнасці. Вось тады нарэшце мы дойдзем да Беларусі, якая будзе існаваць вечна!

# НАВУКА І ЯЕ ДЗЕЯЧЫ

## РЭПРЭСІІ ВУЧОНЫХ БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК*

Вытокі Беларускай акадэміі навук (БАН) пачынаецца з утварэння ў 1921 г. Навуковай тэрміналагічнай камісіі, якая на наступны год была ператворана ў Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт). Апошні, па сутнасці, пачаў выконваць ролю нацыянальнай акадэміі навук, і таму ўжо ў 1924 г. кіраўнікі Інбелкульта звярнуліся да ўрада БССР з прапановай ператварыць гэты інстытут у Беларускую акадэмію навук. Але дазвол трэба было атрымаць у Маскве, і ён прыйшоў толькі праз 4 гады. 13 кастрычніка 1928 г. Савет Народных Камісараў БССР прыняў пастанову аб арганізацыі БАН на базе Інбелкульта. 26 снежня 1928 г. спісы акадэмікаў у колькасці 31 чалавека, папярэдне абраных спецыяльнай грамадскай камісіяй, былі зацверджаны СНК БССР, а 1 студзеня 1929 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё БАН, якое прымеркавалі да 10-годдзя Савецкай Беларусі. Прэзідэнтам БАН быў прызначаны вядомы гісторык У. М. Ігнатоўскі.

Першымі акадэмікамі-заснавальнікамі БАН былі абраны такія выдатныя пісьменнікі, як Янка Купала і Якуб Колас, буйныя вучоныя — мовазнаўцы М. М. Дурнаво, С. М. Некрашэвіч, Я. Ю. Лёсік, гісторыкі В. Ю. Ластоўскі, У. І. Пічэта, А. Н. Ясінскі і інш. Самым маладым (28 год) быў эканаміст Г. І. Гарэцкі — дырэктар Беларускага навукова-даследчага інстытута сельскай і лясной гаспадаркі. Наогул БАН па складу і накірунку дзейнасці атрымалася дастаткова нацыянальнай. Хаця 9 сяброў былі абраны з АН СССР і Усеукраінскай акадэміі навук. У той жа час ужо тады «палітычнае сіта» не прапусціла такіх буйных беларускіх вучоных, як Я. Ф. Карскі, А. К. Сержпутоўскі, М. В. Доўнар-Запольскі, А. А. Смоліч, І. Л. Дыла, вядомы пісьменнік М. І. Гарэцкі.

Яшчэ ў канцы 1927 г. XV з'езд УКП(б) намеціў курс на калектывізацыю сельскай гаспадаркі і «наступ сацыялізму па ўсім фронце». На наступны год узмацнілася барацьба супраць усякіх праяў «антикоммунистических идеологий и немарксистских уклонов», «буржуазной нацдемовщины» і г. д. 1929 г. — год «великого перелома», супольнай калектывізацыі, новай «чисткі» партыі пад знакам барацьбы супраць трацкістаў, правых апартуністаў, буржуазных нацыяналістаў і г. д. Гэта быў год пераходу да дзікіх таталітарных метадаў кіраўніцтва краінай, калі, па словах Сталіна, «репрессии в области социалистического стро-

* Выступленне на Міжнародным кангрэсе «Ацэнка злачынстваў камунізму» (2000, Вільнюс).

ительства являются необходимым элементом наступления». Савецкі Саюз паступова ператвараўся ў сапраўдны «архіпелаг ГУЛАГ».

Незадаволенасць выклікала і новастораная БАН, якая здавалася занадта нацыянальнай. З Масквы прагучаў сігнал супраць «нацдэмаў» у выглядзе шэрага артыкулаў, якія надрукавала газета «Комсомольская правда». Яны мелі выразныя назвы: «Тени прошлого», «Призрак Столыпина в стенах Наркомзема», «Любимая мозоль национал-демократов», «С камнем за пазухой», «Под прикрытием национальных особенностей», «Кулацкая политика под советским флагом. Тайное стало явным», «Новая национал-демократическая вылазка». У гэтых артыкулах крытыкавалася дзейнасць новых акадэмікаў З. Жылуновіча, Я. Лёсіка, С. Некрашэвіча, У. Пічэты, А. Баліцкага, Г. Гарэцкага, «бывшего белогвардейца» В. Ластоўскага, «бывшего деникинца» І. Замоціна, а таксама М. Гарэцкага, І. Цвікевіча і інш.

Ужо ў канцы 1929 г. знялі з пасады і выключылі з партыі А. Баліцкага — наркама асветы, вызвалілі ад абавязкаў віцэ-прэзідэнта БАН С. Некрашэвіча і неадменнага сакратара БАН В. Ластоўскага. У верасні выключылі з БАН акадэміка М. Дурнаво, а ў пачатку 1930 г. — акадэміка М. Яворскага (Украіна), якога аб'явілі авантурыстам і немарксісцкім гісторыкам і арыштавалі ў сувязі з працэсам «Саюза вызвалення Украіны».

У 1930 г. па інспіраваных АДПУ справах «Саюза вызвалення Беларусі (СВБ)» і «Беларускага філіяла Працоўнай сялянскай партыі (ПСП)» былі асуджаны вялікія групы беларускай інтэлігенцыі: па першай справе 86 чал., па другой — 59. Праз год па справе «СВБ» без суда 4 чал. былі прысуджаны да пазбаўлення волі тэрмінам на 10 гадоў, астатнія — да 5 гадоў высылкі ці канцлагера, па справе «ПСП» 6 чалавек — да расстрэлу (чатыром замянілі на 10 гадоў зняволення ў канцлагеры), 13-ці — да такога ж тэрміну, астатнім — розныя тэрміны адбыцця ў лагеры ці высылкі.

З БАН у ліку асуджаных па гэтых справах аказалася 30 вучоных, што склала амаль $^1/_3$ усяго складу акадэміі, якая ў той час налічвала каля 100 супрацоўнікаў. Тады ж была прынята пастанова СНК БССР, у якой пісалася, што «в связи с установлением вредной деятельности группы академиков Белорусской академии наук, деятельность которых была направлена против диктатуры пролетариата и на срыв успешного социалистического строительства, Совет Народных Комиссаров БССР постановляет исключить из состава Белорусской академии наук академиков В. Ю. Ластовского, В. И. Пичету, И. Ю. Лёсика, С. М. Некрашевича, Г. И. Горецкого, А. Д. Дубаха, лишив их звания академиков как врагов пролетарской диктатуры.

Председатель Совета Народных
Комиссаров БССР *Н. Голодед*».

Гэтая пастанова была прынята да рашэння пазасудовага органа АДПУ і таму з'яўлялася незаконнай.

Сярод асуджаных быў не толькі мой бацька — акадэмік Гаўрыла Гарэцкі, але і яго брат Максім Гарэцкі — пісьменнік і літаратуразна-

вец. Бацька быў асуджаны па артыкулах 58-6 (шпіянаж), 58-7 (падрыў дзяржаўнай прамысловасці, транспарту, гандлю, грашовага звароту, кааперацыі), 58-11 (арганізаваная антысавецкая дзейнасць ці ўдзел у антысавецкай арганізацыі) і прысуджаны да расстрэлу, з пазнейшай заменай гэтага пакарання на зняволенне ў канцлагеры тэрмінам на 10 год. Ён быў адасланы ў Салаўкі, але затым трапіў на будаўніцтва Беламорска-Балтыйскага канала ў Карэлію. Максім Гарэцкі быў асуджаны на 5 гадоў высылкі ў г. Вятку (Кіраў).

Прэзідэнт БАН гісторык У. Ігнатоўскі быў абвінавачаны ў тым, што «вёл борьбу против национальной политики партии..., служил ширмой для прикрытия национал-демократических элементов и превращения Белорусской академии наук в плацдарм для контрреволюционной деятельности нацдемовской организации», затым быў выключаны з партыі. У. Ігнатоўскі не вытрымаў гэтых здзекаў, не бачыў выйсця з такой сітуацыі і 4 лютага 1931 г. скончыў жыццё самагубствам.

Ужо ў 1933 г. была сфабрыкавана новая справа неіснуючай «контрреволюционной повстанческой и шпионско-диверсионной организации» пад назвай «Беларускі нацыянальны цэнтр». Пакаранне панеслі 97 чал. (галоўным чынам гэта людзі, якія ўнеслі значны ўклад у справу беларускага нацыянальнага адраджэння ў Заходняй Беларусі). Сярод іх 26 чал. прысуджаны да расстрэлу (16-ці замянілі на 10 гадоў лагераў). 16 супрацоўнікаў БАН было арыштавана і выслана.

Найбольш магутны удар па навуковых кадрах БАН быў нанесены ў 1937 – 1938 гг. Тады арыштавалі многіх буйных вучоных, у тым ліку 13 акадэмікаў і 6 членаў-карэспандэнтаў. Сярод іх пісьменнік і грамадскі дзеяч — першы старшыня Часовага рэвалюцыйнага ўрада Савецкай Беларусі ў 1919 г. З. Жылуновіч (Цішка Гартны), прэзідэнты БАН П. Горын (Каляда) і І. Сурта, лідэр Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі, кіраўнік беларускай парламенцкай фракцыі Сейма Пальшчы, аўтар першай «Беларускай граматыкі для школ» Б. Тарашкевіч.

Усе абвінавачанні і справы былі сфабрыкаваны АДПУ — НКУС, прызнанні атрыманы шляхам маральнага і фізічнага ціску (у тым ліку карцэры, так званыя «парылкі», уяўныя расстрэлы, катаванні). Арыштам садзейнічала грамадская атмасфера таго часу — страх, хлусня, падазронасць, недавер'е, што выклікала даносы, абвінавачанні.

БАН у адносінах да навуковых кадраў аказалася настолькі аголенай, што павінны былі зачыніць Інстытуты філасофіі і савецкага будаўніцтва, фізіка-тэхнічны, а Інстытут эканомікі перавесці ў Дзяржплан БССР.

У 1930 г. у БАН было арыштавана 33 супрацоўніка, у 1933 г. — 16, 1936 г. — 15, 1937 г. — 45, 1938 г. — 27. Усяго каля 140 чал., сярод якіх людзі розных нацыянальнасцяў, але галоўным чынам беларусы (96 чал.). Трэба ўлічыць, што ў 1937 г. агульная колькасць супрацоўнікаў БАН складала 580 чал. Па афіцыйных матэрыялах, якія атрыманы з КДБ БССР, вызначана, што 42 чал. з ліку арыштаваных былі расстраляны ў канцы 30-х гг. у Мінску (М. В. Токараў, 1992). Сярод іх амаль усе акадэмікі і члены-карэспандэнты. Усе яны цяпер рэабілітаваны. Тое ж можна сказаць і пра большасць астатніх рэпрэсаваных вучоных БАН.

Больш канкрэтна далейшы лёс вучоных можна прасачыць на прыкладзе маіх бацькі і дзядзькі — братоў Гарэцкіх.

Бацьку з улікам паспяховай працы тэрмін зняволення быў скарочаны, і ён ўжо ў 1934 г. быў вызвалены, але яму строга раілі застацца на будаўніцтве Беламорска-Балтыйскага канала, дзе ён і працаваў у Мядзведжай Гары (Карэлія) інжынерам-геолагам і куды перавёз сваю сям'ю з Менска. У Максіма Гарэцкага ў 1935 г. таксама скончыўся тэрмін высылкі, і ён разам з сям'ёй пераехаў у пас. Пясочня (пазней г. Кіраў) Смаленскай вобл., дзе працаваў у сярэдняй школе настаўнікам рускай мовы і літаратуры.

У 1935 г. у в. Малая Багацькаўка (на Мсціслаўшчыне, Беларусь) памерла маці Гарэцкіх і, нягледзячы на тое, што яны ўжо былі вызваленыя, яны не атрымалі дазволу, каб паехаць на пахаванне.

У ноч з 3 на 4 лістапада 1937 г. Максім Гарэцкі быў зноў арыштаваны. Яго перавезлі ў турму г. Вязьма, а ўжо 5 студзеня 1938 г. рашэннем «тройкі» ён быў прыгавораны да расстрэлу.

М. М. Ількевіч — начальнік цэнтра грамадскіх сувязяў Упраўлення Федэральнай службы контрразведкі РФ па Смаленскай вобласці — надрукаваў у сувязі з гэтым два дакумента (1994). Першы дакумент складзены за 14 дзён да расстрэлу Максіма Гарэцкага. Гэта пратакол №85 ад 5 студзеня 1938 г. пад грыфам «Сов. секретно»:

*«Нач. особой оперативной группы*
*УНКВД с/о ст. лейтенанту милиции*
*тов. Завьялову (лично).*

Препровождая при этом выписки из протокола № 85 Заседания Тройки УНКВД с/о от 5 января 1938 года ПРИКАЗЫВАЮ привести в исполнение решение Тройки в отношении осужденных К РАССТРЕЛУ:

[далей ідзе пералік прозвішчаў, імён і імён па-бацьку 43 чал. і пад №30 — «Горецкого Максима Ивановича»].

Акт о расстреле и выписки из протокола передайте в 8 Отдел УГБ УНКВД Смол. обл.

Приложение. 43 выписки.

Зам. нач. Управления НКВД Смол. обл.
капитан Государственной Безопасности
*(Викторов)»*.

Каб уявіць маштаб рэпрэсій і тэрора ўлад супраць свайго народа, М. Ількевіч прааналізаваў гэты пратакол. Ён налічвае 45 лістоў машынапіснага тэксту. Усяго разгледжана 84 угалоўна-следчых спраў, па якіх праходзіла 450 чал., з іх 220 чал. прыгавораны да расстрэлу. Гэтым днём (5 студзеня) афармлена 4 пратаколы пасяджэння «тройкі». Было разгледжана 406 угалоўна-следчых спраў па абвінавачанню 930 чал., з якіх 587 (63%) былі прыгавораны да расстрэлу і пазней расстраляны. Усе яны цяпер рэабілітаваныя.

Другі дакумент:

*«Совершенно секретно:*

АКТ

1938 года, февраля 10-го дня. Мы, нижеподписавшиеся, Начальник Особой Оперативной Группы Управления НКВД СССР Смоленской области — Старший Лейтенант Милиции Завьялов, Врид Коменданта Управления НКВД СССР Смоленской обл. — Младший Лейтенант Государственной Безопасности Власов и Помощник Коменданта Управления НКВД Смоленской области Грибов, сего числа, на основании предписания Зам Нач Управления НКВД СССР Смоленской области — Капитана Государственной Безопасности тов. Викторова от 28-го января 1938 года за № 60253/8, привели в исполнение решение Заседания Тройки УНКВД Смоленской области от 5-го января 1938 года (протокол № 85) в отношении осужденных к расстрелу:

[далей ідзе пералік 40 прозвішчаў, імён і імён па-бацьку, пад № 30 «Горецкого Максима Ивановича»].

Перечисленные осужденные, всего в числе сорока человек, из места содержания под стражей были взяты в 14 часов 45 минут 10-го февраля 1938 года, а решение Заседания Тройки приведено в исполнение путем расстрела в 15 часов того же 10-го февраля 1938 г.

Трупы зарыты на установленную глубину, о чем и составлен настоящий акт в одном экземпляре.

Нач. Особ. оперативной группы

Ст. Лейтенант Милиции

*(Завьялов)*

Врид Коменданта Управления НКВД СССР

Млад. Лейтенант Госбезопасности

*(Власов)*

Помощник Коменданта Управления НКВД

*(Грибов)».*

У акце пералічаны прозвішчы 40 чал., 3 чал. былі расстрэляны гэтымі катамі пазней. Максім Гарэцкі не дажыў да 45 гадоў 8 дзён.

У канцы кастрычніка 1937 г. у Мядзведжай Гары быў арыштаваны і Гаўрыла Гарэцкі, — лічылася, што асуджаныя па артыкуле 58-6 (шпіянаж) «не разоружились», ды і наогул дабіралі недабітых «ворагаў народа». Як найбольш «небяспечнага», яго адаслалі на допыт у Маскву, пасля чаго вызвалілі. А ў гэты час з 27 кастрычніка па 4 лістапада (усяго за 1 тыдзень) пад Мядзведжай Гарой ва ўрочышчы Сандармох было расстраляна каля 9 тысяч зняволеных з розных турмаў БелБалтлага. Як было надрукавана ў газеце «Народная воля» (публікацыя А. Кобец-Філімонавай 19 снежня 1997 г.), толькі ў Салавецкай турме было расстраляна 1111 зняволеных і сярод іх 102 беларусы, а ў ліку апошніх акадэмікі БАН М. Яворскі і М. Дурнаво.

Сітуацыя паўтарылася на наступны год, калі Гарэцкі з 8 траўня 1938 па 22 чэрвеня 1939 г., больш за год, адседзеў у сталінскіх казематах,

прычым адведаў голад і пабоі, карцэры і здзекі. Дайшоў да таго, што хацеў лязом скончыць жыццё самагубствам. Зноў яго адправілі ў маскоўскую Бутырку, а ў гэты час групу зняволеных, у якую спачатку ўваходзіў і Гарэцкі, расстралялі пад Мядзведжай Гарой.

Гаўрыла Гарэцкі быў рэабілітаваны ў 1958 г., але ў званні акадэміка яго аднавілі толькі ў 1965 г., у Мінск дазволілі вярнуцца ў 1969 г., амаль пасля 40 гадоў выгнання. Ён стаў заснавальнікам новай навукі — палеапатамалогіі (вучэнне пра рэкі геалагічнага мінулага), стварыў вядомую ў свеце беларускую школу даследчыкаў геалогіі антрапагену, быў на чале Камісіі па вывучэнню чацверыковага перыяду АН СССР, савецкай секцыі Міжнароднай асацыяцыі па вывучэнню чацверыковага перыяду, надрукаваў шэраг манаграфій, за якія атрымаў Дзяржаўную прэмію СССР, а затым разам са сваімі вучнямі — Дзяржаўную прэмію БССР.

У гонар Максіма Гарэцкага, якога прызналі класікам беларускай літаратуры, названы вуліцы ў Мінску, Мсціславе, Горках, працуе музей у Малой Багацькаўцы, ёсць помнікі ў Мінску і Вязьме і шэраг мемарыяльных дошак.

Па падліках У. І. Адамушкі (1994) і іншых гісторыкаў, толькі па архіўных матэрыялах Беларусі ў 1920—1950 гг. судовымі і несудовымі органамі рэспублікі па палітычных матывах было пакарана больш за 250 тыс. грамадзян. З іх за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да расстрэлу прыгаворана больш за 35 тысяч чалавек, прычым гэта праходзіла кожны год, з 1919 і па 1953 г. (выключэннем быў толькі 1923 г., калі па палітычных матывах нікога не пакаралі), а пікі такіх спраў прыпалі на 1929—1933 гг. і асабліва 1937—1938 гг. Адміністратыўную высылку атрымалі больш за 350 тыс. чалавек. Значыць, усяго толькі па афіцыйных дадзеных, якія пацверджаны дакументамі, рэпрэсіўныя меры былі прыменены больш чым да 600 тыс. чалавек. Гэта лічба мінімальная. У сапраўднасці лічба рэпрэсаваных значна большая, асабліва калі ўлічыць перыядычнае знішчэнне дакументаў у адпаведных органах, прымусовае і «дабрачыннае» перасяленне родных і блізкіх разам з рэпрэсаванымі, асуджэнне жыхароў Беларусі па-за межамі рэспублікі, паўторныя пакаранні і г. д. Па думцы гісторыка І. М. Кузняцова, які спецыяльна даследуе гэтую тэму, лічба рэспрэсаваных жыхароў Беларусі набліжаецца да 1,5 млн. чалавек.

Так было. Але гэта ніколі не павінна паўтарыцца!

## ДА ЮБІЛЕЮ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ*

У гэтыя дні краіна ўрачыста адзначала 70-годдзе з дня ўтварэння Беларускай акадэміі навук — галоўнага цэнтра навукі. Усім зразумела, што без навукі няма развіцця, няма прагрэсу. Гэта добра ведалі і ў былым Савецкім Саюзе, таму найбольшы ўздым навуковых даследа-

* Студзень 1999 г.

ванняў і ў нашай акадэміі прыйшоўся на 70—80-я гады. Цяпер НАН Беларусі перажывае, як і ўся краіна, нялёгкія часы, але жыве і працуе. У юбілейныя дні трэба ўспамінаць не толькі дасягненні і поспехі, але нагадаць і тыя цяжкасці і адмоўныя з'явы, якія ўставалі на шляху навукі і яе дзеячаў, не забываць гістарычныя крокі развіцця навукі і адсюль рабіць адпаведныя вывады на будучыню.

На жаль, у развіцці савецкай навукі вялікую ролю адыгрывалі самыя розныя палітычныя моманты, валюнтарыстцкія дзеянні асобных палітычных кіраўнікоў СССР. Дастаткова ўспомніць высылку «вон из России» лепшых прадстаўнікоў «буржуазной науки», якую зрабіў Ленін у 1922 годзе, знішчэнне выдатных вучоных у сталінскіх лагерах, трагічныя сітуацыі, якія стварыліся вакол такіх навук, як кібернетыка, біялогія і асабліва генетыка ў час праслаўтай лысенкаўшчыны, мовазнаўства, якое вызначалася «выдатнейшымі» творамі «самого мудрого ученого», пошукі «касмапалітызму» ў навуцы, «ворагаў» ад сіянізму ў медыцыне і г. д.

Усе гэтыя праявы таталітарызму моцна паўплывалі на развіццё навукі і ў Беларусі. Пасля арганізацыі ў 1922 г. Інстытута беларускай культуры, які адыграў вялікую ролю ў станаўленні беларускай навукі і культуры, а таксама ў беларусізацыі ўсёй грамадскасці рэспублікі, ужо праз два гады вучоныя інстытута ўзнялі пытанне аб утварэнні Акадэміі навук, прычым такую ініцыятыву падтрымала і кіраўніцтва БССР. Але самастойна вырашыць гэтую праблему было немагчыма — патрэбен быў дазвол Масквы, які па самых розных — галоўным чынам палітычных — матывах быў атрыманы толькі ў самым канцы 1928 года. Зноў па тых жа прычынах сярод акадэмікаў-заснавальнікаў Беларускай акадэміі навук (1 студзеня 1929 г.) не было імёнаў такіх выдатных навукоўцаў таго часу, як Я. Карскі, А. Смоліч, М. Доўнар-Запольскі і некаторых іншых.

Трэба адзначыць, што перад гэтай гістарычнай падзеяй былі вялікія спрэчкі аб тым, якой павінна быць БАН. Г. Гарэцкі напісаў спецыяльную запіску «Аб арганізацыйных прынцыпах будовы Беларускай акадэміі навук»*, у якой падкрэсліў: «... акадэмія навук павінна быць усебаковай і ахопліваць як навуковыя дысцыпліны са сферы культуры (гуманітарныя дысцыпліны), у сферы прыроды (так званыя точныя і «чыстыя» навукі), так і са сферы тэхнікі і гаспадаркі (так званыя прыкладныя навукі) [...]. Сыстэма навукі адзіна, і тэхнічныя дысцыпліны ў такой жа меры навукі, як і кожная з «чыстых» навук, калі толькі ў тэхнічнай дысцыпліне ўжываецца навуковы мэтад [...]. Беларуская акадэмія навук павінна сканцэнтраваць і плянаваць усю навукова-даследчую працу ў БССР». Тым не менш у БАН тады быў зроблены перакос у бок гуманітарнай сферы: было абрана 20 акадэмікаў-гуманітарыяў і 10 — прыродазнаўцаў.

Ужо праз 1,5 гады пасля стварэння БАН амаль усе яе заснавальнікі былі арыштаваны, асуджаны як «нацдэмы», высланы за межы рэспу-

---

* Нацыянальны архіў РБ. Ф. 101, вып. 1, спр. 2968, арк. 1—4.

блікі, а ў сярэдзіне і канцы 30-х гадоў многія з іх расстраляны. Гэтыя выдатныя вучоныя загінулі разам з сотнямі лепшых прадстаўнікоў культуры, навукі, народнай гаспадаркі Беларусі. Цяпер яны поўнасцю рэабілітаваныя за адсутнасцю складу злачынства.

Наш вядомы скульптар А. Шатэрнік зрабіў мемарыяльную дошку з імёнамі тых вучоных і грамадскіх дзеячаў, якія працавалі ў Інбелкульце. Многія з іх былі першымі акадэмікамі Беларускай акадэміі навук і сярод іх першы прэзідэнт У. Ігнатоўскі, мовазнаўцы С. Некрашэвіч і Я. Лёсік, паэты Янка Купала і Якуб Колас, гісторыкі В. Ластоўскі і першы рэктар БДУ У. Пічэта і інш. Як было б прыгожа адкрыць гэтую дошку на былым будынку Інбелкульта (Рэвалюцыйная, 15) у юбілейныя дні! Але яна ўжо амаль год пыліцца ў памяшканні Нацыянальнага культурна-асветніцкага цэнтра імя Ф. Скарыны, які знаходзіцца ў тым жа будынку. Нехта, каму не падабаюцца некаторыя імёны, адзначаныя на дошцы, зноў жа па нейкіх палітычных матывах не дазваляе яе адкрыццё, не хоча, каб ушанавалі памяць беларускіх вучоных — ахвяр бальшавіцкага рэжыму.

У далейшым развіцці Акадэміі навук Беларусі, асабліва пасля вайны, адбыўся значны перакос у бок фізіка-матэматычных і тэхнічных навук, якія атрымалі шпаркі рост, і наадварот, марудны ўздым мелі гуманітарныя навукі і зусім слабы — навукі аб Зямлі. Цяпер у акадэміі 10 устаноў фізіка-матэматычнага профілю і ў іх 40 акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў, у фізіка-тэхнічных навуках 12 устаноў і 35 членамі акадэміі, у гуманітарных — 8 устаноў з зусім малой колькасцю супрацоўнікаў і 36 членаў акадэміі, а навукі аб Зямлі маюць толькі 4 установы і 10 членаў акадэміі і нават не вылучаны ў асобнае аддзяленне навук.

Калі Беларусь стала суверэннай дзяржавай, асабліва ўзрасла роля «рэгіянальных» навук, такіх, як геалогія, геаграфія, экалогія, глебазнаўства, заалогія, батаніка, аграномія, гісторыя, літаратуразнаўства, мовазнаўства і г. д., бо толькі беларускія вучоныя могуць мэтанакіравана і эфектыўна працаваць у гэтых напрамках. Без належнага ўзроўню такіх навук не можа інтэнсіўна развівацца народная гаспадарка.

За ўвесь час існавання Акадэміі навук яе кіраўніцтва «выбіралася» толькі пасля ўзгаднення кандыдатур з уладамі рэспублікі і з Масквой. Адзінае выключэнне — выбары Прэзідыума АН Беларусі на чале з акадэмікам Л. М. Сушчэням (красавік 1992 г.) у часы кіравання С. С. Шушкевіча і В. Ф. Кебіча. У Савецкім Саюзе наша «самастойнасць» была настолькі «вялікай», што ўсе планы і праграмы прац АН БССР, кожную кандыдатуру акадэміка і члена-карэспандэнта і г. д. трэба было ўзгадняць не толькі з рэспубліканскім ЦК КПБ, але і з Акадэміяй навук СССР у Маскве. Як прыклад умяшання ўладаў можна нагадаць выключэнне са спісу кандыдатур для выбараў у акадэмікі Алеся Адамовіча. У тыя часы без дазволу ЦК КПСС і СМ СССР (Масква) не тое што адчыніць новы інстытут, але нават даць іншую назву ўжо існуючаму было немагчыма.

Усё гэта ўспамінаецца таму, што 70-годдзе НАН Беларусі праходзіць на фоне палітыкі аб'яднання Беларусі і Расіі ў адну дзяржаву. Праўда, тут жа ідзе агаворка аб захаванні самастойнасці краін. Поў-

ная алагічнасць! Ці не будзе падобна такая «самастойнасць» на толькі што ўзгаданае з нашага мінулага жыцця? Ці будзе ў новай дзяржаве самастойная Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, а не ператворыцца ў Мінскі навуковы цэнтр Саюзнай акадэміі навук (накшталт Санкт-Пецярбургскага ў РАН) ці Беларускага аддзялення (падобнага да Сібірскага ў РАН)? Няўжо па кожнай кандыдатуры акадэміка, па кожнай праграме зноў прыйдзецца ездзіць у Маскву? Зараз сітуацыя склалася так, што нават на навуковую канферэнцыю паехаць у Расію — гэта фінансавая праблема. Такія ж фінансавыя цяжкасці і ў расійскіх вучоных, якія не могуць часта прыехаць не толькі ў суседнія рэспублікі, але і адзін да аднаго. Аб'яднанне краін грошай не дабавіць. Супрацоўнічаць і распрацоўваць агульныя тэмы ніхто не перашкаджае і цяпер, як з расійскімі, так і з вучонымі іншых краін.

Урачыстасці навялі на вялікі сум і ў сувязі з моўнай праблемай. Пасля таго як Акадэмія навук Беларусі па ўказу прэзідэнта РБ стала называцца Нацыянальнай, з ужывання прэзідыума акадэміі, яе агульных сходаў, афіцыйных дакументаў амаль зусім знікла родная беларуская мова. Замест таго каб паказваць прыклад у пашырэнні карыстаннем мовы, кіраўнікі і большасць супрацоўнікаў Акадэміі навук — эліта беларускай інтэлігенцыі — стараецца толькі дагадзіць, цалкам «працаваць» пад сучасную ўладу (не дай бог, абвінавацяць у нацыяналізме — страх бярэ!). Было сорамна, калі на ўрачыстым сходзе ў Вялікім тэатры оперы і балета, прысвечаным юбілею, ад беларускіх дзеячаў (ні з вуснаў прэзідэнта краіны, ні з вуснаў прэзідэнта акадэміі) не прагучала ніводнага беларускага слова. Прысароміў усіх прадстаўнік «старшага брата» віцэ-прэзідэнт РАН акадэмік У. Кудраўцаў, які зачытаў сваё прывітанне на беларускай мове. Зусім нядаўна ў Кіеве адзначалася 80-годдзе Нацыянальнай акадэміі навук Украіны — там шырока гучала ўкраінская мова. Вядома, як паважаеш сваю родную мову, так паважаюць і цябе.

Хацелася б пажадаць, каб наша акадэмія па-сапраўднаму была нацыянальнай, захавала сваю самастойнасць у цеснай садружнасці з навукоўцамі ўсяго свету і ў першую чаргу суседніх краін — Расіі, Украіны, Польшчы, краін Балтыі, далей пашырала навуковыя даследаванні, дасягнула новых вяршынь у навуцы на карысць сваёй Бацькаўшчыне і ўсіх людзей планеты.

## АКАДЭМІЧНУЮ НАВУКУ — У АДМІНІСТРАТЫЎНА-КАМАНДНУЮ ТРУНУ?*

Дэмакратычныя плыні ў НАН Беларусі імкліва скарачаюцца, і ім на змену прыходзіць жорсткая адміністратыўна-камандная сістэма.

Як кожная арганізацыя, НАН Беларусі мае свой Статут — звод правілаў, па якіх яна жыве. Заўсёды ў НАН Беларусі Статут, змены ў ім

* Народная воля. 2002. 10 ліп. Пад назваю «Навуку — у труну?».

і дапаўненні прымаліся вельмі дэмакратычна: агульны сход прызначаў камісію з выдатных членаў акадэміі, якая распрацоўвала на рускай і беларускай мовах Статут; яе прапановы шырока абмяркоўваліся ўсімі супрацоўнікамі, і канчаткова Статут прымаўся на агульным сходзе, а затым зацвярджаўся Саветам Міністраў. Апошні Статут быў зацверджаны СМ РБ 15 кастрычніка 1998 г. У другой палове мінулага года А. Лукашэнка вырашыў рэфармаваць НАН Беларусі і «взялся» за яе, але не шляхам выпрацоўкі новага Статута, а парушэннем шэрагу артыкулаў існуючага. Як ужо вядома, ён сваім указам у кастрычніку 2001 г. прызначыў прэзідэнтам НАН Беларусі маладога (з 1998 г.) доктара эканамічных навук (па Статуту павінен быць абраны агульным сходам акадэмік); затым без згоды агульнага сходу ўключыў у НАН Беларусі Аграрную акадэмію навук і іншыя структуры і гэтым наблізіў акадэмію да міністэрства навукі. Толькі ў красавіку 2002 г. прызначыў чатырох віцэ-прэзідэнтаў і галоўнага вучонага сакратара, якія склалі бюро прэзідыума (заўсёды на гэтыя пасады выбіраліся агульным сходам) і г. д.

Агульны сход НАН Беларусі цяпер не мае права абраць свой прэзідыум. Стары распушчаны, а новы прэзідыум Лукашэнка дагэтуль не зацвердзіў — вось і працуе акадэмія ўжо доўгі час без прэзідыума. Пры адначасовымператрусу быў зняты з пасады і старшыня Вышэйшага атэстацыйнага камітэта, а новага таксама ўжо каля паўгода не зацвярджае, — можна ўявіць, якая вялая праца ідзе ў ВАКу без кіраўніка. Невядома, што будзе далей, але зараз НАН Беларусі знаходзіцца ў самым цяжкім фінансавым становішчы за ўсё апошняе дзесяцігоддзе (нават няма магчымасці выдаць поўную зарплату, і большасць супрацоўнікаў інстытутаў пераведзены на 0,5—0,7 стаўкі ці адпраўлены ў адпачынак за свой кошт), многія навукоўцы (у тым ліку і маладыя) шукаюць дадатковую, а часам і зусім іншую працу, бо цяжка стала пракарміць свае сем'і.

Каб усе пераўтварэнні, якія патрабуе жыццё, былі законнымі, спачатку прымаюць змены ў Статуце, а потым дзейнічаюць ужо ў адпаведнасці з новым Статутам. У нас жа ўсё наадварот: ужо многа чаго нарабілі, а цяпер прапануюць новы Статут, праект якога паступіў у аддзяленні навук НАН Беларусі. Характэрна, што ён складзены толькі на рускай мове, хто яго распрацоўваў — невядома, і, як піша віцэ-прэзідэнт НАН Беларусі член-карэспандэнт Ю. М. Плескачэўскі, НАН Беларусі «разработала, согласовала с заинтересованными органами государственного управления и направила в установленном порядке в Совет Министров Республики Беларусь проект Устава, который направляется для *сведения*». Як бачым, праект Статута не абмяркоўваўся ні ў аддзяленнях, ні ў інстытутах і тым больш сярод радавых членаў акадэміі.

Зразумела, што праект новага Статута зацвярджае ўжо зробленае: надзяляе НАН Беларусі «отдельными функциями республиканского органа государственного управления» (значыцца, робіць яе амаль міністэрствам); адмяняе выбарнасць усіх кіруючых пасад у акадэміі (прэзідэнта, бюро прэзідыума і прэзідыум, прызначае прэзідэнт РБ; кіраўнікоў аддзяленняў, дырэктараў інстытутаў — прэзідэнт акадэміі

на конкурснай аснове; усе яны могуць быць вызвалены з пасады ў любы час); замест Аграрнай акадэміі навук у НАН Беларусі адкрываецца Аддзяленне аграрных навук (дарэчы, прэзідэнт гэтай акадэміі В. С. Антанюк у час такіх рэфармаванняў раптоўна памёр на 62-м годдзе жыцця).

Як бачым, адміністратыўная «вертыкаль» у НАН Беларусі пабудавана і пакуль што шляхам тайнага галасавання праводзяцца выбары толькі прадстаўнікоў навуковых арганізацый НАН Беларусі, міністэрстваў, іншых рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага ўпраўлення, вышэйшых навучальных устаноў на агульны сход НАН Беларусі (прычым да 25% там павінны прысутнічаць прадстаўнікі неакадэмічных устаноў), а таксама выбіраюцца акадэмікі і члены-карэспандэнты. Але гэты артыкул мае цікавую асаблівасць: «Общее собрание Академии наук проводит выборы действительных членов (академиков) и членов-корреспондентов тайным голосованием, за исключением проведения выборов действительных членов (академиков) и членов-корреспондентов по вакансиям, открываемым в связи с созданием нового отделения по решению государственных органов, выборы по которым осуществляются открытым голосованием». Глядзім далей, што гэта за новае аддзяленне? Аказваецца — «Отделение экономики и управления», хаця навуковых устаноў такога напрамку зусім мала. Не цяжка здагадацца, у чым тут справа. А вось Аддзяленне хімічных навук і навук аб Зямлі застаецца нязменным, нягледзячы на тое, што аб раздзяленні такіх розных навук ідзе размова не першы дзесятак гадоў. І ў першым, і ў другім выпадках асабістая зацікаўленасць вышэй, чым справа.

Апошні артыкул аб прыняцці Статута: «95. Устав Национальной академии наук Беларуси утверждается Президентом Республики Беларусь. Изменения и дополнения в Устав Академии наук утверждаются Президентом Республики Беларусь». Такім чынам, цяпер Статут будзе распрацоўвацца, абмяркоўвацца, прымацца і зацвярджацца адміністратыўнай «вертыкаллю» без удзелу вучоных (у тым ліку і членаў акадэміі), якім толькі будзе дазволена выконваць тое, што прапішуць для іх чыноўнікі.

Грамадскасць НАН Беларусі і ўсёй краіны бачаць небяспеку ў такім рэфармаванні навукі, выказваюць занепакоенасць і часта задаюць пытанне: «Чаму маўчаць, як прамудрыя печкуры, акадэмікі і члены-карэспандэнты — гэтыя не шахматныя, а навуковыя каралі і каралевы, з якімі чыноўнікі абыходзяцца як з пешкамі?» На жаль, іх зразумець можна, бо яны, як і іншыя слаі нашага насельніцтва, ахоплены найбольш шырока распаўсюджаным сярод жывых істот пачуццём — страхам, баязлівасцю. Адны баяцца згубіць кіруючую пасаду, бо кожнага ў любы момант могуць з яе зняць, другія — пазбавіцца службовай машыны, цёплага кабінета ці падтрымкі начальства і г. д., а радавы член акадэміі — згубіць надбаўку за званне, якая спачатку зацвярджаецца бюро прэзідыума НАН Беларусі, а канчаткова — Лукашэнкам (пры нашым «багатым» жыцці гэта вельмі непажадана). Таму лягчэй «выпусціць пар» нязгод шэптам у калідоры, а на агульным сходзе падтрымаць начальства апладысментамі ці сціплым маўчаннем.

Але сапраўдны навуковец, што б з ім ні рабілі, куды б яго ні штурхалі ў час рэфармавання, як бы яму ні перашкаджалі, будзе пільна працаваць (праўда, менш эфектыўна), бо галоўнае для яго — адданасць навуцы, пошукі ведаў і ісціны...

## АДАМ БАБАРЭКА — ВЫДАТНЫ БЕЛАРУСКІ АДРАДЖЭНЕЦ І ЛІТАРАТУРНЫ КРЫТЫК*

Роўна 100 гадоў таму, 14 кастрычніка 1899 г., у сям'і беззямельнага селяніна вёсцы Слабада-Кучынка, што на Капыльшчыне, прыгожым і багатым кутку Беларусі, нарадзіўся Адам Бабарэка — славуты беларускі адраджэнец, паэт, празаік, літаратуразнавец, таленавіты літаратурны крытык. Лёс Адама Бабарэкі, як і большасці яго паплечнікаў, не быў лёгкім, а жыццё доўгім — ён пражыў усяго 39 гадоў. Рана застаўся без бацькі, які хварэў на сухоты. Вучыўся ў Слуцкай бурсе, Мінскай духоўнай семінарыі, стаў настаўнікам. У час польскай акупацыі ўдзельнічаў у партызанскім руху, быў арыштаваны польскімі ўладамі — рубцы ад бізуноў захаваліся на ўсё жыццё. Служыў у Чырвонай Арміі. У далейшым закончыў этнолага-лінгвістычнае аддзяленне Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Першыя літаратурныя спробы адносяцца да 1918 г., калі ён стаў селькарам, а ўжо ў 1921 г. яго творы з'явіліся ў рэспубліканскім друку. Адначасова з вучобай у БДУ працаваў у рэдакцыі газеты «Савецкая Беларусь», выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў школе, а пазней — і ў Беларускім камуністычным універсітэце.

У 1925 г. выйшла з друку асобная кніга А. Бабарэкі «Апавяданні». Угэтым жа годзе ён выдаў сваё апошняе мастацкае апавяданне і надрукаваў свае апошнія вершы — вырашыў поўнасцю пераключыцца на літаратуразнаўства і літаратурную крытыку і ў гэтым дасягнуў такога высокага ўзроўню, што яго называлі «беларускім Бялінскім».

Адам Бабарэка найбольш вядомы як адзін з арганізатараў і кіраўнікоў (не столькі фармальны, колькі па сутнасці) літаратурна-мастацкіх аб'яднанняў «Маладняк», а пазней — «Узвышша». Нягледзячы на зусім кароткі творчы ўзлёт Адама Бабарэкі — усяго 9 гадоў, ён зрабіў вельмі многа, пакінуў вялікую спадчыну, якая яшчэ ў значнай ступені не раскрыта, слаба вядома сучаснаму чытачу і патрабуе больш шырокай і грунтоўнай публікацыі як твораў самога аўтара, так і разгляду яго жыцця і дзейнасці. Ён адзін з першых сярод маладнякоўцаў пачаў барацьбу за культуру, за высокі мастацкі ўзровень літаратуры, падкрэсліўшы, што «мастацтва — гэта важнейшы крытэрый таго культурнага ўзроўню, да якога падняўся той ці іншы народ або нацыя». А. Бабарэка адзін з першых убачыў у фальклоры невычэрпную скарбніцу эстэтычных каштоўнасцяў. Ён даследаваў творчасць М. Багдановіча, К. Чорнага,

* Уступнае слова на навуковай канферэнцыі, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння А. Бабарэкі, 14 кастрычніка 1999 г.

У. Дубоўкі, Я. Коласа, З. Бядулі і інш. Ён распрацаваў навуковую сістэму поглядаў на працэс гістарычнага развіцця беларускай літаратуры.

Ужо ў 1930 г. разам са многімі Адам Бабарэка трапіў у «архіпелаг ГУЛАГ». Хачу адзначыць, што светлай ніццю ў жыцці Адама Бабарэкі і Максіма Гарэцкага, а таксама іх сямей прайшло іх шчырае сяброўства не толькі на Радзіме, але і ў выгнанні. Прыблізна ў такія ж восеньскія дні кастрычніка, а менавіта 10 кастрычніка 1938 г., Адам Бабарэка памёр ад запалення нырак у лагерным лазарэце УхтПечлага НКУС СССР (Рэспубліка Комі). Пра апошнія дні яго жыцця нядаўна напісаў М. М. Ількевіч у дакументальным нарысе «Адам Бабарека: арест — лагерь — смерть: Расправа со ссыльными белорусами в Кирове в 1937 — 1938 гг.» (Смаленск: «Посох», 1999).

У сваёй манаграфіі «Адам Бабарэка» (1976) Уладзімір Конан пісаў: «Яго прыродная дабрата, мяккасць, далікатнасць і сціпласць — гэтыя ўзятыя ў спадчыну тыповыя рысы нацыянальнай псіхалогіі свайго народа — былі памножаны на выпрацаваныя ў літаратурнай дзейнасці прынцыповасць і рашучасць у змаганні за праўду ў жыцці і мастацтве. Ён быў сапраўдны крытык, і таму нават яго паасобныя залішне суб'ектыўныя мастацкія ідэі засталіся ўсё ж ідэямі, гэта значыць, каштоўнасцямі, якія пазней прынеслі свой плён».

## «УСЁ, ШТО Я РАБІЎ У СВАІМ ЖЫЦЦІ, Я РАБІЎ ДЛЯ МАЁЙ РАДЗІМЫ І ЯЕ СЛАВЫ...»*

Адначасова з развалам СССР рвалася «жалезная заслона» паміж Усходам і Захадам, і да нас паступова пачалі вяртацца многія невядомыя нам раней імёны славутых землякоў. Адбылося вяртанне і Барыса Кіта. Толькі амаль праз 50 гадоў жыцця за межамі Беларусі ён змог прыехаць на Бацькаўшчыну. Гэта здарылася ўлетку 1992 года, калі і я змог пазнаёміцца са знакамітым беларусам. К таму часу я ўжо даведаўся пра Б. Кіта з артыкулаў Б. Сачанкі, Я. Лецкі. Апрача таго, да мяне як віцэ-прэзідэнта Акадэміі навук Беларусі, які вёў у прэзідыуме кадравыя пытанні, паступілі звароты акадэміка Юрыя Астроўскага і прафесара Адама Мальдзіса з прапановай абраць Барыса Кіта ганаровым членам нашай Акадэміі навук.

Барыс Кіт многа сіл аддаваў навуцы, калі працаваў у ЗША ў галіне астранаўтыкі, удзельнічаў у шматлікіх кангрэсах Міжнароднай федэрацыі астранаўтыкі, быў прафесарам шэрагу навучальных устаноў, а ў апошнія гады прафесарам Еўрапейскага аддзела Мэрылендскага універсітэта ў Гейдельбергу (ФРГ) і г. д. Мяне асабліва ўразіла і зацікавіла яго педагагічная дзейнасць у Беларусі як настаўніка і дырэктара гімназій і школ у розныя складаныя часы — і пры паляках, і пры саветах, і пры немцах, калі, як ён успамінаў сам, «пры ўсіх уладах мне даводзілася сядзець у турмах за тое, што я вучыў дзяцей беларускай мове і гісто-

* Барыс Кіт: Юбілейны альбом да 90-годдзя. Мн., 2001.

рыі». Нягледзячы на неймаверныя цяжкасці, ён заўсёды заставаўся сапраўдным патрыётам Радзімы, прыхільнікам беларушчыны, і гэтыя святыя пачуцці шчыра перадаваў сваім вучням.

Упершыню я ўбачыў Барыса Кіта, калі ён завітаў да мяне ў Акадэмію навук у згаданы прыезд. Увайшоў сярэдняга росту каржакаваты чалавек. Кідалася ў вочы выразная форма галавы з вялікім выпуклым ілбом і жвавымі разумнымі вачыма. Імклівы, рухавы, ён загаварыў хуткім тэмпам на прыгожай беларускай мове навагрудскага гатунку. Адразу адчулася яго таварыскасць і добразычлівасць, і таму ўжо праз хвілін дзесяць нам здалося, што мы даўно знаёмыя і добра разумеем адзін аднаго, бо і ахапілі ў нашай не такой і працяглай размове многія самыя разнастайныя тэмы.

Зноў мы сустрэліся з Барысам Кітом у верасні 1994 г. на Генеральнай асамблеі Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі ў Мінску, калі мы, заснавальнікі акадэміі, ва ўрачыстых абставінах аднагалосна абралі нашага славутага земляка членам акадэміі і яе віцэ-прэзідэнтам. У тыя гады адбылося выбуховае прызнанне на Радзіме Б. Кіта: ён быў абраны ганаровым членам Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, ганаровым доктарам навук Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы (г. Гродна), ганаровым грамадзянінам горада Навагрудка і г. д. У друку з'явілася вялікая колькасць артыкулаў пра жыццё і дзейнасць вучонага і грамадскага дзеяча. Выйшлі з друку найбольш поўныя працы аб ім — кнігі Лідіі Савік «Вяртанне» (1993) і «Космас Беларуса» (1996). Тады ж ён быў абраны паўнапраўным членам Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі (Францыя) і ўзнагароджаны залатым медалём Германа Обэра (ФРГ).

Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» разам з Нацыянальным навукова-асветніцкім цэнтрам імя Францыска Скарыны вельмі цёпла, урачыста і ўзнёсла адзначылі юбілейныя даты Барыса Кіта — 85-годдзе і 90-годдзе з дня яго нараджэння. На жаль, у сувязі са зменай палітычнай сітуацыі ў Беларусі Барыс Кіт не змог прыехаць і прысутнічаць на гэтых урачыстасцях, але яго вера ў нацыянальную беларускую ідэю, яго любоў да Бацькаўшчыны натхняе ўсіх сапраўдных беларусаў на змаганне за нацыянальнае адраджэнне і пабудову незалежнай, багатай, еўрапейскай дзяржавы — вольнай Беларусі.

## АКАДЭМІК КАНЫШ ІМАНТАЕВІЧ САТПАЕЎ — ВЫДАТНЫ СЫН КАЗАХСКАГА НАРОДА*

12 красавіка 1999 г. споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння К. І. Сатпаева (памёр 31 студзеня 1964 г.) — першага сярод казахаў горнага інжынера, першага прэзідэнта АН КазССР, першага дырэктара Інстытута геалагічных навук АН КазССР, першага акадэміка АН СССР сярод

* Літасфера (Мінск). 1999. № 10–11.

вучоных рэспублік Сярэдняй Азіі і Казахстана, лаўрэата Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій.

Імя К. І. Сатпаева — выдатнага геолага і арганізатара навукі, буйнога дзяржаўнага дзеяча — шырока вядома па-за межамі Казахстана, у тым ліку і ў Беларусі. Яго дзейнасць вельмі разнастайная. Вялікі яго ўклад у асваенні нетраў Казахстана: гэта медзь Джэзказгана, вугаль Байканура, жалеза Карсакпая, поліметалы Каратаў, марганец Жезды і многія іншыя. У гады вайны адкрыццё апошняга з названых радовішчаў было рашаючым для арганізацыі выплаўкі ферамарганца, што дазволіла не спыніць вытворчасць танкаў. К. Сатпаеў — адзін з заставальнікаў навукі аб металагеніі, кіраўнік групы геолагаў па стварэнню знакамітых прагнозных металагенічных карт Казахстана. Дыяпазон яго ведаў быў вельмі шырокі: яго цікавілі казахская гісторыя, літаратура, культура, этнаграфія, музыка, фальклор. Вядомы яго археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Цэнтральнага Казахстана.

Мае геалагічныя настаўнікі — выдатнейшыя вучоныя сучаснасці акадэмікі М. С. Шатскі і А. Л. Яншын — сябравалі з К. Сатпаевым і з вялікай павагай адносіліся да яго. Разам з імі і мне пасчасціла неаднаразова сустракацца з Канышам Імантаевічам у Маскве і Алмаце. Яго эрудыцыя, інтэлігентнасць, добразычлівасць, прастата рабілі глыбокае ўраджанне, і яго светлы вобраз да гэтага часу застаецца ў маёй памяці.

Хаця нашы краіны знаходзяцца далёка адна ад адной, але казахскі і беларускі народы, а таксама іх асобныя прадстаўнікі звязаны паміж сабой глыбокімі вузамі дружбы, сімпатыі і дзелавога супрацоўніцтва. Вядома, які значны ўплыў на лёс К. Сатпаева ў маладосці зрабіў старшыня Паўладарскага павятовага рэвкама беларус Павел Пазднякк. Сярод першых 14 акадэмікаў АН Казахстана было два беларуса — вядомыя вучоныя: заснавальнік астрабатанікі Гаўрыла Андрыянавіч Ціхаў, родам са Смалявіч (ён таксама быў абраны і ганаровым акадэмікам АН БССР), і паразітолаг Іларыён Рыгоравіч Галуза з Магілёўскай губерні. Яны сябравалі з К. Сатпаевым, які вельмі высока цаніў іх навуковую і навукова-арганізацыйную дзейнасць. Менавіта па іх прапанове першым прэзідэнтам АН КазССР быў абраны К. Сатпаеў.

100-годдзе вучонага было ўключана ў каляндар памятных і юбілейных дат ЮНЕСКО 1999 г. З 12 па 14 красавіка ў Алмаце адбыліся ўрачыстыя юбілейныя мерапрыемствы: сход грамадскасці і юбілейная сесія Нацыянальнай акадэміі навук у Палацы рэспублікі, адкрыццё помніка ў цэнтры горада, ускладанне вянкоў каля надмагільнага помніка, міжнародная навукова-тэарэтычная канферэнцыя «Акадэмік К. І. Сатпаеў — выдатны вучоны, арганізатар навукі і індустрыялізацыі Казахстана», Міжнародны сімпозіум «Мінерагенія і перспектывы развіцця мінеральна-сыр'евой базы Казахстана» і інш. Ва ўрачыстасцях прынялі ўдзел Прэзідэнт Рэспублікі Казахстан Н. А. Назарбаеў, члены ўрада РК, міністр навукі і вышэйшай адукацыі У. С. Школьнік, прэзідэнт Нацыянальнай акадэміі навук РК Н. А. Айтходжына, дочкі вучонага — Каніса Канышаўна (доктар медыцынскіх навук), Шамшыябану Канышаўна (доктар філалагічных навук, член-карэспандэнт АН РК), Меіз Канышаўна (доктар геолага-мінералагічных навук), прадстаўнікі

акадэмій навук Расіі (у тым ліку Сібірскага аддзялення), Беларусі, Кыргызстана, Таджыкістана, Узбекістана, ЮНЕСКО, прадстаўнікі шэрага пасольстваў (у тым ліку пасол Беларусі Л. У. Пакуш), усіх абласцей Казахстана, навучальных устаноў і інш. Урачыстасці прайшлі і будуць яшчэ ісці ў многіх гарадах Казахстана, у ЮНЕСКО ў Парыжы, у Томску, Душанбе і іншых гарадах суседніх краін.

Імем акадэміка К. І. Сатпаева названы горад у Карагандзінскай вобласці, Інстытут геалагічных навук АН РК, Джэзказганскі горна-металургічны камбінат, вуліцы і школы ў Алмаце і многіх гарадах і пасёлках Казахстана, ледавік і горная вяршыня Жунгарскага Алатаў, мінерал, гатункі кветак і інш. Прызначана прэмія Нацыянальнай акадэміі навук Казахстана імя К. І. Сатпаева ў галіне прыродазнаўчых навук, друкуецца 8-томны Збор твораў акадэміка (4 ужо выйшлі ў свет), шэраг кніг з успамінамі, дакументамі, пісьмамі і інш.

## ИЗВЕСТНЫЙ ГЕОЛОГ А. В. МАКЕДОНОВ — ВИДНЫЙ ЛИТЕРАТУРОВЕД*

Адриан Владимирович Македонов, 90-летие со дня рождения которого мы будем отмечать в мае 1999 года, — выдающийся ученый, внесший существенный вклад в две весьма отдаленные друг от друга области знаний — геологию и литературоведение.

А. Македонов родился в Смоленске, окончил педагогический техникум, а затем отделение языка и литературы Смоленского университета и сразу же окунулся в литературную жизнь города. Здесь он подружился с будущим классиком русской литературы А. Т. Твардовским, который впоследствии отметил: «Как поэт во многом обязан ему своим творческим развитием». Поэт ценил обширные знания, проницательный ум с философским уклоном Адриана Владимировича и поэтому полушутя называл его Сократом и «своим университетом».

В области истории и теории литературы А. Македонов оставил после себя шесть книг и около 200 статей. Монография «Творческий путь Твардовского: Дома и дороги» (М., 1986) — одна из лучших книг о поэте. Он исследовал творчество многих русских и иностранных классиков, советских писателей. В первой половине 30-х годов, когда А. Твардовский подвергся злобным нападкам и клевете, имевших характер политических обвинений, А. Македонов бесстрашно выступил в защиту лучшего советского поэта. Однако и вокруг Адриана Владимировича сгустились черные тучи, и когда в июне 1937 г. открылось заседание ученого совета для проведения защиты его кандидатской диссертации «Проблема героя в эстетике Белинского», из-за поступившего доноса защита не состоялась, а уже в августе Македонов был арестован и осужден на 8 лет лагерей. Так он оказался в Воркуте, где освоил специальность геолога.

---

* Литология и полезные ископаемые (Москва). 1999. № 1.

А. Македонов заочно с отличием закончил географический факультет Саратовского университета, защитил кандидатскую, а затем и докторскую диссертации по геолого-минералогическим наукам. Он был полностью реабилитирован, с 1960 г. жил в Ленинграде и работал старшим научным сотрудником лаборатории угля, а затем ВСЕГЕИ. Его работы по геологии и в особенности по литологии (общее их число превышает 200, в том числе 5 монографий) широко известны геологической общественности. До самой смерти (15 октября 1994 г.) Адриан Владимирович активно работал одновременно и в области геологии, и на поприще литературоведения. А проблему диссимметрии он, совместно с профессором В. С. Баевским, хотел перенести из естествознания в теорию литературы, однако это намерение так и не успел довести до конца.

Относительно недавно (в 1996 г.) в Смоленске была опубликована интересная книга, которая состоит из посмертной монографии А. В. Македонова «Эпохи Твардовского» и двух исследований, посвященных ему самому: «Смоленский Сократ» В. С. Баевского и «Дело» Македонова» Н. Н. Илькевича. Монография освещает первое десятилетие литературной деятельности А. Твардовского. В статье В. Баевского — друга и соратника Адриана Владимировича — на основании личных воспоминаний и многочисленных писем к нему описана жизнь и деятельность Македонова. Н. Илькевич на базе архивных материалов Федеральной службы безопасности исследовал историю репрессий против Смоленской писательской организации (1937—1938), центральное место в которой занимает А. Македонов. Несомненно, все эти материалы с большим интересом будут прочитаны широким кругом читателей и в особенности геологами и литераторами, которые знали замечательного ученого и человека Адриана Владимировича Македонова.

## АКАДЭМІК АНДРЭЙ АЛЯКСЕЕВІЧ ТРАФІМУК*

24 сакавіка 1999 г. на 88-м годзе жыцця памёр буйнейшы вучонынафтавік, выдатны арганізатар навукі, дзяржаўны і грамадскі дзеяч, адзін з заснавальнікаў Сібірскага аддзялення Расійскай акадэміі навук, ганаровы грамадзянін Новасібірска, тройчы лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР і Расіі, лаўрэат прэміі імя І. М. Губкіна, Герой Сацыялістычнай Працы, наш зямляк акадэмік Андрэй Аляксеевіч Трафімук.

А. Трафімук нарадзіўся 16 жніўня 1911 г. на Беларусі ў вёсцы Хветкавічы, у 1933 г. скончыў геалагічны факультэт Казанскага дзяржуніверсітэта і да 1950 г. працаваў у аб'яднанні «Башнафта». Тут ён стаў першаадкрывальнікам шэрага буйнейшых радовішчаў «другога

* Літасфера. 1999. № 10—11.

Баку». За гэта ён у 1944 г., першы сярод геолагаў краіны, быў удастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы.

З 1957 г. А. Трафімук працаваў у Сібірскім аддзяленні Акадэміі навук СССР. Ён арганізаваў і больш за 30 гадоў узначальваў Інстытут геалогіі і геафізікі. Як першы намеснік старшыні Сібірскага аддзялення (з 1962 па 1988 г.), ён прыклаў вялікія намаганні ў арганізацыі і станаўленні навуковых цэнтраў Сібірскага аддзялення Акадэміі навук у розных сібірскіх рэгіёнах, у вызначэнні і ажыццяўленні стратэгіі развіцця навукі ў Сібіры. Глыбокая ўпэўненасць А. Трафімука ў неабходнасці найбольш поўнага выкарыстання прыродных багаццяў і энергетычных рэсурсаў Сібіры дзеля павышэння эканамічнага патэнцыялу краіны была рэалізавана ў яго працы па стварэнню шырокавядомай рэгіянальнай навукова-даследчай праграмы «Сібір», навуковым кіраўніком якой ён быў амаль 15 гадоў і згуртаваў навуковыя сілы Сібіры незалежна ад іх ведамаснай падпарадкаванасці.

Але галоўнай яго любоўю і працай усяго жыцця заставалася геалогія нафты і газу. Шырокае прызнанне ў свеце набыла сібірская школа геолагаў і геафізікаў-нафтавікоў, якую ўзначальваў Андрэй Аляксеевіч. А. Трафімук быў самым вядомым геолагам-нафтавіком. Ён быў гарачым прыхільнікам пошукаў сібірскай нафты: яго навуковыя прагнозы бліскуча пацвердзіліся нафтавымі фантанамі ў Заходняй Сібіры. У наступныя гады А. Трафімук са сваімі паплечнікамі даказаў найбагацейшыя магчымасці выяўлення і асваення новых нафтагазаносных правінцый Усходняй Сібіры. З яго імем звязана адкрыццё невядомай раней прыроднай з'явы — цвёрдага прыроднага газу ў выглядзе газагідратаў, запасы якіх на планеце, па яго ацэнцы, у дзесяткі разоў перавышаюць рэсурсы звычайных газавых радовішчаў. Нават у пажылым веку, апанаваны хваробамі, ён горача ўдзельнічаў у грамадскім жыцці ў якасці актыўна дзейнічаючага ганаровага члена прэзідыума РАН і СА РАН, ганаровага дырэктара Аб'яднанага інстытута геалогіі, геафізікі і мінералогіі.

А. Трафімук больш за паўвека працаваў у Саветах народных дэпутатаў, пяць разоў выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета РСФСР, а таксама ў партыйныя органы, дэлегатам з'ездаў. На пасадзе старшыні Навуковага савета па Байкале ён настойліва абараняў захаванне чысціні унікальнага возера. Абараніў права Новасібірска на будаўніцтва метро, першага ў Сібіры. А. Трафімук заўсёды цікавіўся геалогіяй Беларусі, асабліва станам нафтавай геалогіі і нафтаздабываючай прамысловасці. Ён неаднаразова наведваў сваю родную Беларусь, кансультаваў многіх беларускіх вучоных, удзельнічаў у экспертызах, прысвечаных праблемам пошукаў і разведкі нафты на тэрыторыі Беларусі.

Смерць Андрэя Аляксеевіча Трафімука — цяжкая, незаменная страта для навукі, для Сібіры, усёй Расіі, краін СНД і асабліва Беларусі. Беларускі народ і перш за ўсё вучоныя-геолагі і нафтавікі назаўжды захаваюць памяць пра свайго знакамітага земляка.

## АЛЯКСАНДР ЛЕАНІДАВІЧ ЯНШЫН*

На 89 годзе жыцця 9 кастрычніка 1999 г. пайшоў ад нас выдатнейшы геолаг, географ і эколаг, адзін з апошніх прадстаўнікоў класічнай школы рускіх прыродазнаўцаў, да якой належалі яго настаўнікі У. І. Вярнадскі, А. Дз. Архангельскі і М. С. Шатскі. Віцэ-прэзідэнт АН СССР, дырэктар, а затым ганаровы дырэктар Інстытута літасферы АН СССР, прэзідэнт Маскоўскага таварыства даследчыкаў прыроды і Расійскай экалагічнай акадэміі, член некалькіх замежных акадэмій навук і геалагічных таварыстваў, народны дэпутат СССР, Герой Сацыялістычнай Працы, двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Залатога медаля і прэміі імя А. П. Карпінскага — вось невялікі пералік пасад і ўзнагарод вучонага. Да гэтага трэба было б дадаць велізарны спіс яго ўдзелу ўякасці кіраўніка многіх навуковых праграм і праектаў, старшыні і члена шматлікіх камісій, саветаў, рэдкалегій, дэлегацый, аргкамітэтаў і г. д.

Галоўны напрамак навуковай дзейнасці А. Яншына — тэктоніка, але значны шэраг першакласных прац ім выканана па стратыграфіі, літалогіі, палеагеаграфіі, геалагічнаму карціраванню, гідрагеалогіі, геамарфалогіі, чацвярыковай геалогіі, геалогіі карысных выкапняў, гісторыі геалагічных навук, геаграфіі, палеакліматалогіі, экалогіі.

Аляксандр Леанідавіч — неардынарная асоба, якая прываблівала да сябе людзей шматграннасцю таленту і чалавечымі рысамі: апантаны навукай, якой ён аддаваў увесь свой час і сілы, энцыклапедычныя веды не толькі ў навуках аб Зямлі, але і ў гісторыі, паэзіі, мастацтве; яскравыя і палкія выступленні — як лагічныя і змятоўныя, так і выкананыя з вялікімі аратарскімі і артыстычнымі здольнасцямі (апошняя, відаць, была закладзена генетычна — стрыечны брат Міхаіл Яншын — народны артыст СССР, бацька — адвакат па прафесіі — доўгі час кіраваў мастацкай самадзейнасцю ў Геалагічным інстытуце АН СССР); высокія чалавечыя якасці — сіла волі, мужнасць, добразычлівасць, абаяльнасць, даступнасць, гумар. Нават мімалётныя сустрэчы з Аляксандрам Леанідавічам давалі надзвычайны зарад бадзёрасці, аптымізму, упэўненасці і прасветленасці.

Мне пашчасціла пазнаёміцца з Аляксандрам Леанідавічам падчас палявых работ увосень 1951 г., калі я быў студэнтам-дыпломнікам Маскоўскага нафтавага інстытута, а ён кандыдатам навук, але ўжо шырока вядомым геолагам — лепшым знаўцам геалогіі Заходняга Казахстана. Высокі, худы, з мяккай усмешкай, добрым і адначасова пранікнёным позіркам шэрых вачэй на прадаўгаватым твары, гучным і выразным голасам, невялічкай кульгавасцю і кійком у руцэ — такім упершыню я ўбачыў яго. Апошняе было звязана з тым, што ён у бады паляцеў у 24-метровы шурф. Толькі сіла волі і мужнасць выратавалі яго ад смерці. Некалькі складаных аперацый, пагроза ампутацыі нагі і амаль год у бальніцы — пасля гэтага на ўсё жыццё засталася кульгавасць і страшэнны траўматычны дыябет, які прымушаў кожны дзень рабіць

* Літасфера. 1999. № 10–11.

уколы інсуліну і нечакана прыводзіў да каматознага стану. Асаблівыя цяжкасці былі ў полі. Такіх ком А. Яншын перанёс рэкордную колькасць — не менш за 30. Нягледзячы на такую цяжкую хваробу, ён працягваў жыць, поўны нястомнай і нястрымнай энергіі.

Я ўспамінаю, як мы працавалі над манаграфіяй «Тэктанічны аналіз магутнасцяў». Жылі мы тады недалёка адзін ад аднаго ў раёне Арбата. Нярэдка Аляксандр Леанідавіч званіў мне познім вечарам а 20—22 гадзіне і прыблізна казаў так: «Паглядзіце, калі ласка, што піша У. Белавусаў па такому-то пытанню і прыходзце да мяне абмеркаваць гэтую праблему, а па дарозе зайдзіце да Ганны Львоўны (наша машыністка) і забярыце ўсё, што яна ўжо надрукавала». Мы сядзелі гадзіны дзве-тры, абмяркоўвалі, гаманілі і абавязкова са шклянкай моцнага індыйскага чаю № 2. Пасля такой сустрэчы я адчуваў уздым і магутны імпульс для напісання новых старонак манаграфіі.

А. Яншын — адзін з заснавальнікаў вучэння аб маладых платформах, ён значна развіў праблему спадчыннасці ў тэктоніцы, распрацаваў тэктанічны аналіз магутнасцяў. Пад яго кіраўніцтвам створаны тэктанічныя карты Еўразіі, Еўропы і іншых кантынентаў, 15-томная манаграфія «Гісторыя развіцця рэльефу Сібіры і Далёкага Усходу». Шырока вядомы яго працы па салярodных басейнах, некампенсаваных прагінах, механізме фарміравання і тыпізацыі структур зямной кары, эвалюцыі геалагічных працэсаў у гісторыі Зямлі і г. д. Ён аўтар больш за 600 навуковых артыкулаў, манаграфій, карт, навукова-папулярных выданняў. Многія з іх сталі класічнымі. У апошнія гады яго асаблівая ўвага была прыкавана да праблем экалогіі. Яго цікавілі праблемы паходжання атмасферы, палеакліматалогія, прагноз змены клімату і інш.

А. Яншын адкрыў многія радовішчы карысных выкапняў (вуглі, фасфарыты, калійныя солі, падземныя воды, жалезныя руды, газ і інш.) на Урале, у Казахстане і Сібіры (у тым ліку унікальны Непскі каліяносны басейн у Іркуцкай вобласці і Хубсугульскі фасфарытаносны басейн на поўначы Манголіі).

А. Яншын ніколі не быў у баку ад сучасных праблем краіны і грамадства, заўсёды кідаўся ў іх гушчыню і прыкладаў усе намаганні, каб іх найлепш вырашыць. Гэта — барацьба за праўду ў біялагічнай навуцы і супраць выгнання геалагічнай навукі з Акадэміі навук, змаганне за чысціню Байкала і Ладагі, захаванне абмялеўшага Аральскага мора, перакідку паўночных рэк і інш.

Ураджэнец Смаленска, А. Яншын заўсёды цікавіўся геалогіяй захаду Усходне-Еўрапейскай платформы, Заходняй Еўропы, дапамагаў парадамі, водгукамі на працы геолагаў Беларусі, многа разоў удзельнічаў у розных нарадах, геалагічных экскурсіях па Беларусі разам з беларускімі геолагамі.

Памяць аб гэтым выдатнейшым вучоным, арганізатары навукі, настаўніку, добразычлівым чалавеку, яго класічныя працы назаўсёды застануцца ў гісторыі навукі.

# ДОРОГОЙ МОЙ УЧИТЕЛЬ И ДРУГ*

## ПЕРВАЯ ВСТРЕЧА

Начало 1951 года. Мы, студенты, уже дипломники геологоразведочного факультета Московского нефтяного института им. акад. И. М. Губкина, подыскивали себе учреждение и место для прохождения дипломной практики и сбора материалов для написания диплома, мечтая попасть на официальную должность с зарплатой, потому что на одну степендию прожить трудно и хотелось бы немного подработать. В то время это было сделать достаточно легко, так как специалистов всюду не хватало и было много вакансий. Часть студентов, прикрепленных к кафедре общей геологии, по рекомендации профессора М. М. Чарыгина — декана геологоразведочного факультета — и профессора М. П. Казакова была направлена в Казахстанскую экспедицию № 12 Всесоюзного аэрогеологического треста. Оба профессора там были консультантами, а главным геологом экспедиции работал недавний выпускник кафедры и института Ю. М. Васильев. В эту группу студентов попал и я.

Экспедиция вела государственную геологическую съемку 1:200000 масштаба территории Прикаспийской впадины, главным образом центральной ее части в пределах Казахстана. Там действовали постоянные геологические партии с опытными геологами, в Гурьеве была достаточно хорошо организованная база экспедиции. Работа была налажена. В том году было решено расширить исследования и включить в геологическую съемку самые восточные бортовые части Прикаспийской впадины, уже в районе Примугоджарья примыкающей к Мугоджарским горам — самым южным отрогам Уральской горной системы. Постоянных штатных сотрудников на вновь организуемые геологические партии не было, и поэтому руководство экспедиции решило набрать временных работников из числа студентов-дипломников.

Нам предложили провести эту геологическую съемку, причем создавались две геологические партии: одна, северная, для работ в районе ст. Эмба и другая, южная, на Чушкакульской антиклинали, которая отвечала одноименной возвышенности, лежащей на прямом продолжении к югу Мугоджар. Начальником северной геологической партии был назначен Р. Б. Сейфуль-Мулюков, а южной — я. В мою партию геологом была зачислена Светлана Артамонова — студентка нашей группы, вторым геологом — Семен Коробов — студент младше нас курсом, но имевший небольшой опыт работы по геологической съемке и в определении ископаемой фауны мелового возраста, геоботаником — Тамара Садовникова — студентка последнего курса Московского госуниверситета. Кроме того, в партии была радистка для связи с геологической базой, повариха и трое рабочих.

---

* Напісана ў 2001 г. для кнігі «Академик А. Л. Яншин. Воспоминания». Друкуецца ўпершыню.

То ли кинофильм о змеях, который я видел совсем еще маленьким, то ли книга об Индии с красочными иллюстрациями, изображающими заклинателей змей и другие экзотические чудеса, то ли рассказы моего дедушки, который много путешествовал по Средней Азии, — не знаю, что так на меня повлияло, но я с детства мечтал завести себе удавчика. И вот я уже студент, а это необъяснимое желание нет-нет да и появится вновь...

Моя будущая специальность — геолог, правда, учусь я еще только на втором курсе, вернее, перешел на второй, но все в доме, в котором я живу, знают о моей давней страсти ходить в походы и собирать камни и поэтому часто зовут меня геологом. Геолог — это не только романтика путешествий и песни у костра, но и вечный поиск нового, неизведанного. А что может быть интереснее и увлекательнее для человека, как не постоянные открытия? И я уверен, что стану настоящим геологом.

Экзамены и геодезическая практика позади. В оставшиеся до начала занятий полтора месяца я договорился поехать в экспедицию коллектором. И куда бы вы думали? В Казахстан, в пустыню на берега Аральского моря. Синева моря и дикая сказачность этих мест, которые я представлял себе только по репродукциям картин Тараса Шевченко да по кинофильму «Сорок первый», давно меня привлекали. Мне виделись картины бескрайней жаркой пустыни, когда мы пели в походах одну из наших любимых туристских песен:

Иль под солнцем безжалостным жаришься
Где-нибудь в казахстанской степени...

Образ пустыни связывался с верблюдами, ящерицами, фалангами, скорпионами и, конечно, с массой всевозможных змей. И, как говорил Остап Бендер, «хрустальная мечта детства» вновь с неудержимой силой вспыхнула во мне: я очень хотел привезти из Казахстана небольшого — ну этак с полметра — серого эластичного удавчика. Я ванну превратил бы в террариум, где жил бы мой удавчик. Конечно, мои родичи не были бы в восторге от этого, но зато как бы удивились наши ребята, да и Лильке я бы его обязательно показал...

Вы не знаете Лильку? Да это девчонка из нашего дома, такая худенькая, беленькая, с большими синими глазами — синеглазкой мы ее зовем. Я вместе с ней в школе учился. Она мне раньше никогда не нравилась: такая вертлявая, всюду лезет, выскочка, да и надо мной вечно насмехается. Я ее, можно сказать, терпеть не мог. А вот в последний год я стал замечать, что мне ее почему-то хочется чаще видеть. Я даже в институт выхожу на 20 минут раньше, чтобы встретить Лильку, когда она бежит на работу. Я иду за ней и смотрю на ее светлые вьющиеся волосы, гибкую фигурку, легкий взмах рук и какую-то летящую походку. Так бы и шел за ней... Я даже узнаю стук ее каблучков и, заслышав его, выхожу на балкон и украдкой слежу за пробегающей мимо синеглазкой. Я сам себе боюсь признаться, что Лилька с каждым днем занимает в моих мыслях все большее и большее место.

Сегодня я встретил Лильку, и она меня окликнула: «Алик! Что это ты такой радостный?» (Вот вредная! Ведь знает, что я не люблю, когда меня так зовут. Как будто я маменькин сыночек — «Алик, Алик!». Нет чтобы просто сказать: «Саша или Саня»).

— В Казахстан еду, в экспедицию.

И, поборов смущение, которое я нередко испытывал при разговоре с Лилькой, неожиданно для самого себя добавил: «Поедем вместе, там как раз еще один человек нужен». Сердце мое учащенно забилось, и я с тревогой и надеждой ждал ее ответа.

— Что же, едем! У меня отпуск накопился, и я не знала, как его лучше провести.

В этом быстром ответе она была вся — энергичная, решительная, порывистая и немного взбалмошная.

Итак, я еду в Казахстан, да еще вместе с Лилькой! Какой сегодня замечательный, везучий день!

Уже через несколько дней мы ехали на экспедиционной машине по казахской степи, продвигаясь все дальше на юг, к Аральскому морю, на берегу которого стояла наша партия. Нас встретил старший геолог партии Андрей Иванович. Он нам понравился: высокий, крепкий, улыбчивый, с довольно правильными чертами волевого лица, весь загорелый — настоящий геолог. Он после окончания института уже лет десять работал в Казахстане на геологической съемке различных районов и прекрасно знал здешнюю геологию, быт и обычаи местных жителей, легенды этого края.

Мы с Лилькой сидели наверху, в кузове, и во все глаза смотрели на невиданный нами доселе пейзаж. Кругом было ровно-ровно, и эта равнина где-то далеко подходила к голубому, совершенно безоблачному небу. Там возникали какие-то удивительные сказочные миражи: озера с густыми лесами по берегам, реки, поросшие камышом, белоснежные замки на островах... Только редкие холмы с казахскими могилами в виде каменных или саманных стен и маленьких домиков да неглубокие балки, возле которых полоска дороги начинала петлять, нарушали исключительную равнинность местности. Изредка по дороге смешно прыгали земляные зайчики — тушканчики, с длинными хвостами и любопытными мордочками. В стороне встречались крупные степные

орлы, которые при приближении машины с неохотой разбегались, расправляли свои огромные крылья и плавно поднимались в воздух. Было жарко. Но эта жара давила и угнетала только тогда, когда Андрей Иванович на пять минут останавливал машину и высовывался из кабины, чтобы рассказать нам о геологии тех мест, которые мы проезжали, или о случае, произошедшем здесь когда-то, или показать характерные для степей кустик полыни, стебелек ковыля. Когда машина шла, нас щедро обдувал горячий пахучий воздух степи и мы с удовольствием подставляли ему наши лица.

Мы ехали уже почти весь день, а пейзаж оставался все тем же. За все время нам встретилась одна машина, три одинаковых юрты и большая отара овец, которую пас старик-чабан, сросшийся воедино с небольшой унылой лошаденкой. Мы казались себе маленькими существами, медленно ползущими по огромной жаркой равнине, которой нет конца. Вот где ощущались бесконечные просторы и ширь земли!

Я взял Лильку за руку и тогда почувствовал, что не просто еду на машине, а мчусь с невероятной скоростью высоко в синем небе над этими бескрайними просторами куда-то далеко-далеко... Мне хотелось, чтобы навеки было так ... До чего же здорово жить на свете!

В лагерь партии мы приехали уже ночью. Аральского моря не было видно. Хотелось спать. Разместили нас в палатках: я оказался вместе с одним молодым геологом — тоже Сашей, а Лилька — в соседней палатке.

Начались будни геологической работы. Вставали мы очень рано и после завтрака сразу же отправлялись в маршрут, который длился весь день. Возвращались уже затемно. За день так находишься, так налазишься по всяким обрывам, так натаскаешься тяжелых образцов пород (да все это в неимоверную жару), что к вечеру просто валишься с ног и никак не можешь выспаться. Но такое состояние измотанности продолжалось только первую неделю, а потом я втянулся в подобный режим, как-то окреп, мне стало легче, и я смог более внимательно осмотреться вокруг.

Наш лагерь стоял на самом берегу моря, которое поразило нас своей синевой. Цвет моря был настолько неестественно синим, что казалось, будто вода густо подкрашена синькой. Вот оно сказачное Синее море наших предков! Тонкий песок, чистая прозрачная теплая вода и ровный дикий пляж, тянущийся на многие километры, и кругом никого, только мы и море. А море ласковое, тихое. Вдоль берега за нами возвышаются крутые обрывы — чинки плато Устюрт, сложенные породами самого различного цвета: зелеными, коричневыми, желтыми, красными, серыми, а на самом верху снежно-белыми. Сочетание красок изумительное: синее-синее море, на горизонте четко окаймленное нежной голубизной неба, и пестроцветная гамма береговых обрывов.

Я каждый день уходил в маршрут с Сашей или Андреем Ивановичем, а Лилька оставалась в лагере. Но где бы я ни был, я все время ощущал ее рядом. Когда я смотрел на синюю гладь моря, я видел глаза моей синеглазки. В стройных летящих вверх белых обрывах я угадывал ее легкую фигурку. Мягкий сыпучий песок, который я брал в руки, ка-

зался ее нежным рукопожатием. Когда в полдень, изнемогая от жары, мы, усталые, с трудом находили небольшую тень, ложились немного отдохнуть, я закрывал глаза и явственно видел перед собой Лильку и думал о том, что она сейчас делает. Ярко-белые полоски облачков, недвижно висящие в голубом небе, представлялись мне белозубой ее улыбкой, красный луч солнца — яркими ее губами. Когда я бросался в приятно охлаждающие волны моря, я попадал в ее мягкие объятия. Когда слабый ветерок обдувал разгоряченное мое лицо, я слышал ее тихое дыхание. А вечером, когда мы тяжело шагали к лагерю, в лучах заходящего солнца появлялась яркая Венера, и мне казалось, что на меня смотрит моя Лилька.

Самыми прекрасными моими минутами были те, когда после ужина я и Лилька шли прогуляться перед сном. На землю опускалась вечерняя прохлада, которая была особенно приятна после жаркого томительного дня. Воздух наполнялся удивительной звенящей тишиной. Земля вместе с нами накрывалась темным куполом южного неба с бесконечным множеством ярко мерцающих звезд. Мы брались за руки и медленно шли вдоль пляжа. Море едва плещется. Кругом умиротворенное спокойствие. Мы сливались с природой...

В маршрут я особенно любил ходить с Андреем Ивановичем. С ним всегда было легко и интересно. Он все время рассказывал о геологии, о том, какие месторождения полезных ископаемых можно найти в наших местах. Он научил меня многим геологическим премудростям. Он много знал и охотно делился своими знаниями с окружающими. Ровный в обращении, доброжелательный, неунывающий, умеющий найти в трудную минуту подбадривающее слово — с ним было очень легко. Андрей Иванович стал для меня примером, и я во всем ему подражал.

Вы, наверное, думаете, что я совсем уже забыл про удавчика? Нет! Я все время помнил о нем и искал его, но до сих пор он не попадался. Нам встречались и ящерицы разные, и скорпионы, и змеи ядовитые, но удавчика все не было и не было. И только несколько дней назад, когда до нашего отъезда домой оставалось меньше недели, я, наконец, увидел удавчика. Он неподвижно лежал в тени небольшого кустика и, видимо, дремал после удачной охоты. Саша, который очень боялся змей, тут же отошел подальше. Я же, рассмотрев внимательно змею и убедившись, что это действительно безобидный удавчик, смело взял его в руки. Куда только девался сонный вид удавчика?! Его эластичное тело напряглось, задергалось, стараясь высвободиться из человеческих рук. Круглые глаза удивленно, неприязненно и боязливо смотрели на меня. Я посадил его в мешочек для образцов и принес в лагерь. Наконец-то я был счастливым обладателем удавчика!

Мы насыпали песка в большую стеклянную банку и посадили в нее удавчика. Несколько дней он был явно враждебно ко всем настроен, ничего не ел, что бы мы ему ни предлагали, и, свернувшись в клубок, спал и спал. Как-то раз мы поймали маленькую ящерицу и, собравшись вокруг банки с удавчиком, наблюдали, что он будет делать с ней. Вначале он не обращал на нее никакого внимания, и она, осмелев, начала спокойно бегать. Он все продолжал спать. Ящерица несколько раз даже

наступила ему на голову. Вдруг удавчик открыл глаза, тело его быстро мелькнуло в воздухе и через мгновение вся голова ящерицы была уже в его глотке. Постепенно он заглотнул ящерку и вновь задремал. С тех пор удавчик совсем не боялся людей и охотно глотал ящериц, мух и жучков, которых мы ему давали.

И вот настал последний мой маршрут, в котором я был вместе с Сашей. Мы попали на обрыв, разрез которого был необычен, такой нам еще не встречался. Нам хотелось его описать как можно подробнее. Дневного времени нам не хватило, и мы задержались. Вернулись в лагерь, когда уже совсем стемнело, все поужинали и разбрелись по своим палаткам. Я заглянул в палатку к Лильке, ее там не было. Поужинав, я вновь не застал ее на месте. Я пошел к морю и бесцельно побрел по пляжу. Погода была прохладная, по небу неслись темные тяжелые рваные тучи. Дул ветер, море равномерно шумело, а крутые волны иногда достигали моих сапог. Было совсем темно. Вдруг сквозь разрыв туч брызнул яркий свет луны, и я увидел выхваченные из темноты две фигуры, тесно прижавшиеся друг к другу. Я замер. Через минуту я снова еще более отчетливо увидел их. Это были Лилька и Андрей Иванович. Они целовались.

Я повернулся и бросился прочь. Я долго бежал, потом брел, снова бежал. Несколько раз я падал, спотыкаясь о камни и кусты. Я вновь вставал и бежал, затем куда-то бездумно брел. Наконец обессиленно опустился на песок. Было тяжело, ноги дрожали, в груди ныло, в горле стоял комок, перед глазами все плыло. Огромные волны накатывали прямо на меня, и я плыл куда-то, а из волн все наступали и наступали на меня две обнявшиеся фигуры...

Очнулся я только с рассветом. Было холодно, шел дождь, дул ветер. Море гудело. Кругом мрак. Я пошел к лагерю. Все спали. Возле своей палатки я увидел банку. Удавчик держал в глотке маленькую ящерицу и медленно ее заглатывал. Я не сводил с него глаз. И вот он стал все увеличиваться и увеличиваться и превратился в огромное чудовище, которое усмехалось мне веселой улыбкой Андрея Ивановича. В зубах чудовища мелькнула знакомая до боли милая фигурка с ярко синими глазами, которые стали такими печальными. Фигурка медленно уползала в пасть чудовища... Я не выдержал, схватил молоток и со всей силы ударил по банке.

Домой я возвращался один...

*1971 г., Москва*

## ГОРЕ

Она закрыла дверь за Зиной и осталась в квартире совсем одна не на вечер или два, а навсегда... Предстояла первая одинокая ночь, а за ней много таких ночей и дней, и все одной, одной, без него... Страшно... И какая Зиночка молодец, настоящая подруга: все эти тяжелые

дни не отходила от нее. В квартире, обычно такой шумной от многочисленных гостей, стояла густая настороженная тишина, нарушаемая лишь монотонным тиканием старинных часов. Сейчас в этой всегда такой уютной родной квартире она чувствовала себя совсем чужой. Она бесцельно обошла одну комнату, вторую, а в третьей — его кабинете — устало опустилась в кресло, в его любимое кресло. Сказались последние бессонные ночи, и веки сами сомкнулись, но сон не шел, а перед глазами проходил калейдоскоп недавних жутких событий, которые еще окончательно не дошли до ее сознания и которые, казалось, касаются вовсе не ее.

Красный гроб никак не могут развернуть в этой узкой прихожей их современной квартиры. И почему гроб такой красный? На его фоне бледное лицо с неестественно вытянутым носом становится еще более бледным. Неужели это он, ее Сергей? Директор завода с огромной лысиной, которая стала еще больше, когда он нагнулся к ее руке и прошептал: «Нина Петровна, примите мои искренние соболезнования». Затем всё — люди, неуютно толпившиеся в квартире, гроб, лестница — наклонилось, закачалось, исчезло куда-то. Наступила тьма... Кто-то (да это, конечно, Зиночка) до боли стиснула локоть. Шепот одной из старушек, с любопытством разглядывавших процессию у подъезда: «Глянь-ка, инженерша-то какая бледная — он в гробу краше». И опять бледное худое лицо с заостренным носом. Какой же он был живой? Нет, перед глазами только это бледное мертвое лицо.

Его завод. Автобусы, машины, люди. В вестибюле бледное полотно с надписью: «... сообщают о безвременной скоропостижной смерти главного инженера завода...» Здесь же увеличенное фото Сергея. Ее любимое. Сергей должен улыбаться на нем. Ведь он такой веселый, жизнерадостный, красивый и добрый. Но что это? Она видит, как на бледном фото вновь выплывает то же бледное худое лицо. Опять мрак...

Мелькают красные повязки почетного караула. Венки, кажется, катятся по стенкам, по потолку. Серые лица людей. Духота и какой-то особый удушливый запах. Давит грудь. Слез уже нет. Опять его бледное лицо, и рядом откуда-то глядят удивительно красивые черные бархатистые глаза, полные тоски и невыносимой скорби... «О боже! Неужели я никогда больше не смогу представить его живым?» — прошептала Нина Петровна, растирая совсем онемевшую ногу, и еще глубже вжалась в кресло. Все плыло, качалось, давило...

Вот она молодая бежит навстречу его протянутым ласковым рукам и ясно ощущает их объятия. Затем поездка за город. Солнце. Поле высокой ржи, и над ней синее небо, синие васильки, его синие глаза... Они одни во всем мире, и только счастье с ними. Но где же его живое лицо? Где? Хочется кричать, выть...

Надтреснутый глуховатый голос директора завода, сухое официальное выступление представителя министерства, слезы после слов их друга Николая. Красные повязки, венки, серые лица, удушье, валидол и темень...

Сергей купает их малышку Оленьку, а она стоит рядом и любуется его нежными осторожными движениями. А вот он уже в военной гим-

настерке забежал попрощаться перед отправкой на фронт. Маленький деревянный домик на краю небольшой деревушки. Она при свете лучины штопает единственные штанишки сыну Славке, а Оленька чистит три картофелины — это все, что им положено на весь день. У нее опухшие от голода ноги. И они все время ждут писем от Сергея, ждут его самого, ждут конца войны... Тогда была надежда, было кого ждать, а теперь? Опять перед глазами красный гроб, бледное лицо, слышны слова утешения, реквием...

Наконец, дождались они счастливого дня окончания войны, дождались и письма от Сергея из Магадана, в котором сообщалось, что он контуженный попал в плен. Опять они ждали его и все же дождались... Десять лет счастливой мирной жизни в большом городе, куда они переехали после возвращения Сергея, неожиданно оборвалось...

Крематорий. Красный гроб, бледное лицо, какие-то слова, слезы, серые люди и опять черные скорбящие глаза. Чьи это глаза? Откуда они? Почему они вдруг всплывают в памяти? Душно, мутно, жутко, одиноко... Раздирающие душу звуки органа. Моцарт? Бетховен? Звук все шире, громче. Он налетает, давит, звучит трубой, колоколом. Нина Петровна открыла глаза. Звук все несется. Реквием гремит, но вдруг он превращается в звонок. Ах, это звонят в дверь их квартиры. Почтальон подает заказное письмо.

Она вскрыла конверт, из него выпал десяток писем с почерком Сергея, а сверху записка: «Дорогая Нина Петровна! В это тяжелое для Вас время я не мог остаться в стороне. Мне больно смотреть, как Вы убиваетесь по этому человеку. Он ведь совсем не достоин Вас. Он низкий обманщик. В доказательство посылаю Вам его письма к любовнице. Бросьте думать о нем. Вы еще достаточно молоды, красивы, и Вам следует обратить внимание на некоторых окружающих Вас мужчин, Вами интересующихся. Доброжелатель».

Все было так неожиданно, что Нина Петровна не сразу поняла текст записки и вынуждена была перечитывать ее снова и снова. Смысл записки медленно доходил до сознания. Нина Петровна взяла первое письмо. Сергей писал: «Милая моя, дорогая ласточка черноокая! Целую вечность не видел тебя, не слышал твоего голоса и не читал писем твоих. Что же ты молчишь? Не случилось ли что с тобой, ласковая Машенька моя?...»

«Подумать только, как он нежно называет эту Машеньку! Так обманывать меня, притворяться!» Судя по числу, письмо четырехлетней давности. Что же тогда было? Ах, да, я сильно болела, несколько месяцев не вставала с постели. И он был ко мне такой ласковый, внимательный. А на самом деле в это время он любил какую-то Машеньку! Притвора!

Невольно росло чувство обиды, горечи. Обман человека, которого так любишь и которому так веришь, невыносим, даже после его смерти. Отдать всю себя ему, вынести ради него столько страданий и вдруг такая неблагодарность! Зачем еще это свалилось на нее сейчас?

В следующем письме она прочла: «...ты пишешь, что тебе одиноко и тоскливо, что без меня ты жить больше не можешь. Я понимаю все. Меня тоже тянет к тебе, но у меня семья, дети. Оторвать себя от

детей своих я не могу. К сожалению, я тебе могу дать только любовь, но не всего себя...»

— Чертовка! Хотела разлучить Сергея с семьей!

Так от письма к письму Нина Петровна чувствовала, как к тому невыносимому горю, которое она еще не успела пережить, прибавляется новая жестокая боль и горькая обида. Эти письма не принесли ни малейшего облегчения, о котором писал «доброжелатель». Наоборот, она еще более ощутила потерю Сергея, она еще больше любила его, она даже ревновала его... Сердце непрестанно ныло, в груди что-то давило и душило.

Постепенно мысль обратилась к женщине, с которой в последние годы Сергей разделял любовь к ней и которая, судя по письмам, также любила его. Кто она? Волна глухой неприязни, граничащей с ненавистью, поднималась все сильнее и ощутимее. Казалось, что именно эта Машенька во всем виновата — и в смерти Сергея, и во всех мелких недомолвках, которые иногда возникали между ними, и в том, что она теперь совсем одна. Захотелось как-то отомстить этой женщине, унизить ее, высказать ей все презрение, которое переполняло душу. «Доброжелатель» и здесь пришел на помощь. На обороте его записки Нина Петровна нашла адрес Машеньки, которая, оказывается, уже год жила в том же городе, что и они с Сергеем.

«Да, я немедленно должна поехать к ней и швырнуть эти письма ей в лицо!» — решила Нина Петровна, быстро одеваясь. По дороге она попробовала вообразить себе эту женщину. Ей виделась крупная полная блондинка с красивым лицом и холодными глазами хищницы. Она представляла себе, как она со спокойным достоинством войдет, медленно достанет письма, бросит их этой Машеньке, несколькими жесткими словами выскажет ей все, что она о ней думает, может даже даст пощечину и гордо выйдет.

Через полчаса она звонила в однокомнатную квартиру на третьем этаже. Дверь ей открыла вовсе не крупная блондинка, а стройная, небольшого роста молодая женщина с мягкими чертами нежного лица. На Нину Петровну смотрели те самые черные бархатистые глаза, которые почему-то так врезались в память на похоронах. Машенька не удивилась приходу Нины Петровны, а как будто ждала ее. Она была опрятно, со вкусом одета. В чистенькой уютной комнатке в углу Нина Петровна сразу же увидела небольшую фотографию Сергея и букет цветов около нее. Нина Петровна вдруг совершенно отчетливо представила себе живого Сергея, сидящего вон на том диване.

— Садитель, пожалуйства, — сказала Машенька, пододвигая стул.

В ее черных выразительных глазах было столько горя, тоски и какой-то дикой опустошенности, что вся решимость Нины Петровны куда-то исчезла. Она достала пачку писем, положила их на стол и тихо выговорила: «Вот». Увидев письма, Машенька схватила их, прижала к груди и вскрикнула: «Нашлись! Как я Вам благодарна! Это самое дорогое, что у меня есть в жизни. Они у меня пропали куда-то. Я их всегда носила с собой в сумочке. Их кто-то украл у меня. Еще раз огромное спасибо!»

Нина Петровна вдруг поняла, что у этой женщины тоже большое горе. В ней она увидела как бы отражение самой себя. У Машеньки также, как и у нее, были опухшие от бессонницы и слез глаза, болезненная бледность лица, такая же невыразимая мука во всей фигуре и полные безысходного горя и тоски глаза. Нину Петровну поразило то, что ее горе и Машенькино горе было одно и то же, общее их горе: обе они потеряли самого любимого и дорогого для них человека — их Сергея. Ей невольно стало жалко Машеньку. Она подошла к ней и обняла. Обе навзрыд заплакали, почувствовав вдруг некоторое минутное облегчение, как будто бы разделили одно общее их горе пополам.

*1971 г., Москва*

## ПТУШКА

Прачнуўся ад яскравых промняў сонца, якія весела гулялі па твары. Гляджу — на градцы маленькая птушачка: шэранькая, а грудка лілова-карычневая, вочкі чорненькія, круглявыя — так і бегаюць, ножкі высокенькія, стромкія — цудоўная прыгажуня лясная. Убачыўшы мяне, прыціхла, не варушыцца, каб не заўважыў. Я падышоў бліжэй — не ўлятае. Я тоненька пасвістаў. Устрапянулася, прыслухалася, узняла галоўку, пакруціла ёю у адзін бок, другі і раптам адказала падобным свістам. Я паўтарыў — яшчэ больш падобней. Яна азірнулася і шукае Яго. Няма. Я зноў свіснуў. Адказала, а свайго сябра не бачыць. Але на ўсякі выпадак узнялася на лапкі, распусціла сваю каляровую грудку, ускінула галоўку — глядзі, якая я прыгожая, ідзі сюды, вясна ж заве! Я засвістаў яшчэ больш танюсенька, больш ласкава... Яна адазвалася мілагучнай трэллю і закруцілася на тонкіх лапках у танцы радасці і гукання. Так мы размаўлялі хвілін пяць, радуючыся аднаўленню прыроды, вясноваму подыху, шчасцю жыцця. Раптам я аступіўся, ад чаго і свіст мой здаўся нейкім нізкім, грубым. Птушка анямела, глянула на мяне пужліва, зразумеўшы, што гэта пяе не Ён, а нейкае вялікае страшэннае чудзішча. Яна адразу прыпала да зямлі, грудка сціснулася, галоўка ўехала ў цельца, вочкі схаваліся. Разбеглася і паляцела шукаць сапраўдную песню кахання, свайго любага, сваё шчасце...

*1995 г.*

## ЧМЕЛЬ

У пакой дачнага доміка ўляцеў вялізны чмель. Гудзе, лётае з месца на месца, кідаецца на акно, але выйсці на волю няма як. І мне страшна: раптам сядзе да кусьне. А яму яшчэ больш страшна: трапіў у палон і выбрацца з яго не можа. Ад хвалявання ён яшчэ больш шпарка лётае, гудзіць прарэзліва. Я адкрыў дзверы і стараюся яго направіць у вольны

свет, але ён так нервуецца, што кідаецца куды заўгодна, апрача адчыненых дзвярэй. Пужаў ён мяне, яшчэ больш пужаў яго я, але нічога ў нас не атрымлівалася. Я стаміўся, і ён ужо шумеў з апошніх сіл. Тады я выйшаў у суседні пакой і стаў так, каб мяне не было відаць. Чмель сеў, супакоіўся, аглядзеўся і праз хвіліну шпарка сігануў у адкрыты свет, на волю.

*1995 г.*

## У КРАЙ «ШЧАСЛІВАГА» ДЗЯЦІНСТВА

Запрасілі ўдзельнічаць у Міжнароднай канферэнцыі «Глыбінная будова і геадынаміка літасферы», якая павінна адбыцца ў верасні 2002 г. у сталіце Рэспублікі Карэліі Петразаводску. Адразу даў згоду не толькі таму, што тэматыка канферэнцыі цікавая і ёсць што самому расказаць і абмеркаваць гэтыя праблемы, але яшчэ і таму, што пацягнула пабачыць тыя мясціны, дзе прайшло ўжо на жаль далёкае па часе дзяцінства, а ў Карэліі і на Кольскім паўвостраве я пражыў амаль пяць гадоў (1934–1939) з малымі перапынкамі.

Вось я ўжо ў досыць утульным і цёплым купе. Няма больш добрага часу і лепшага месца, чым цягнік, калі не трэба нікуды спяшацца, можна спакойна падумаць і ўспомніць мінулае, асабліва калі трапяць маўклівыя суседзі ці пашанцуе аказацца зусім аднаму. Пад лёгкае пакалыхванне і ціхае пагрукванне колаў пачалі ўсплываць малюнкі дзяцінства, якое цалкам прайшло пад лозунгам: «Спасибо великому Сталину за наше счастливое детство!» Наогул большая частка жыцця майго ды і папярэдняга пакалення праходзіла пад бадзёрыя бальшавіцкія заклікі, якія былі паўсюдна: на вуліцах, у газетах, радыё, кнігах, падручніках, словах настаўнікаў, начальнікаў і амаль усіх людзей... Насуперак рэаліям нашага жыцця, яны паступова рабілі сваю справу і так моцна ўбіваліся ў галовы, што замбіравалі душы і думкі людзей ды так магутна, што многія і да гэтага часу не могуць вызваліцца ад іх.

Дык якое было тое маё маленства? Калі больш сталае жыццё праходзіць у памяці многімі падрабязнымі кадрамі, дык дзяцінства — толькі асобнымі, часта не надта значнымі, і таму не зусім зразумела, чаму менавіта тымі, якія захаваліся і ўсплываюць у канцы жыццёвага шляху. Найбольш ранні ўспамін — гэта сустрэча бацькі на менскім вакзале летам 1930 года, калі мяне малога, які толькі-толькі навучыўся вымаўляць першыя словы — «мама» і «тата», — вайсковец са стрэльбаю не пускае да сумнага, няголенага, але такога роднага чалавека. Я цягнуся да яго, крычу: «Тата, тата!» і горка ў адчаі плачу. Адабралі бацьку ад малога, які зноў убачыць свайго тату толькі праз чатыры гады... Пачалося блуканне па свеце.

Успомніліся жудасныя болькі ў страўніку і мой бясконцы крыклівы плач, які маці і дзядзька Парфір стараюцца хоць як-небудзь троху зменшыць, бо вельмі незадаволены гаспадары чужой хаты, дзе

прытулілася маці з дзеткамі (мной і маім братам) пасля таго, як жонку «ворага народа» выгналі з кватэры і звольнілі з працы.

А вось і Брылёва пад Гомелем, куды, нарэшце, узялі маці на працу аграномам-селекцыянерам. Маці ў поле на градках сярод перцаў, бабоў і іншай гародніны, а мы, малыя хлопчыкі і дзяўчынкі, каля вялікага двухпавярховага сарая, на страху якога можна забрацца па лесвіце, а туды так цягне... Спрачаемся — хто туды залезе і скокне. Я паціхеньку ўзяў у маці парасон, і пад бадзёрыя крыкі сваіх сяброў забіраюся на самы верх, расчыняю парасон, хоць і вельмі страшна, але скачу ўніз. Добра, што трапляю на капу сена, але ўсё роўна ўвесь тыдзень кульгаю, а ад маці атрымліваю моцную прачуханку. Асабліва страшна было праходзіць міма пчэльніка, бо шмат гаварылі пра куслівых пчол. А хто баіцца, на таго яны часцей і накідваюцца. Аднойчы і мне дасталося — толькі і выратавала бочка з вадой, у якую я цалкам улез. Доўга хадзіў з прыпухлымі вачыма.

Некаторы час жылі ў сям'і цёці Лёлі — жонкі Максіма Гарэцкага, а затым там застаўся мой брат Усяслаў, а мяне з бабуляй маці адаслала да свайго бацькі Восіпа Іванавіча, які працаваў начальнікам чыгуначнага вакзала на станцыі Мокрае ў Запарожжы. Невялікі пакойчык на самім вакзале з шырокім падваконнем, дзе я гадзінамі сядзеў зусім адзін і лупіў вараную бульбу, бо дзед быў на працы, а бабуля ездзіла па прадукты аж у Запарожжа. Глядзеў у акно, як рухаюцца туды-сюды паравозы, цягнікі, і хоць быў яшчэ зусім малы, але таксама хацелася некуды ехаць і вандраваць. Можа, ужо тады пасялілася ў душы цяга да вандраванняў, якая і прывяла мяне да прафесіі геолага.

Цяпер я еду па шляху, па якому 71 год таму везлі не ў камфортным купе, а ў перапоўненай вязнямі цяплушцы для жывёлы майго бацьку на Салаўкі. У Оршы — перасыльным пункце Беларусі — ён развітаўся з жонкай, маці, братам Іванам, і ўсе яны не ведалі, на які час, а можа, і назаўсёды. Дзівіўся мужнасці жанчын, якія не пралілі пры ім ніводнай слязінкі. Дабрыня, ласка, любоў родных моцна падтрымалі, падбадзёрылі. У Віцебску высадзілі з вагонаў і трымалі пад дажджом больш дзвюх гадзін — прамоклых, змерзлых, прыніжаных адкрытым здзекам... А далей былі Ленінград, Петразаводск, Кемь... Праз чатыры гады бацька як ударнік працы быў вызвалены датэрмінова, прыехаў за намі ў Менск, і мы ўсёй сям'ёю зноў прарабілі гэты шлях да Кольскага паўвострава (пасёлкі Кола і Мурмашы пад Мурманскам), а затым і Мядзведжай Гары — цэнтра будоўлі Беламорска-Балтыйскага канала. Хоць і быў бацька фармальна вольным, але яму катэгарычна раілі (як казалі ў сталінскі час — «дабравольна-прымусова») заставацца працаваць на будоўлі канала ў якасці вольнанаёмнага.

У мяне цяпер, як і тады ў бацькі, калі я глядзеў у вакно на цудоўныя беларускія краявіды, узнікалі амаль аднолькавыя думкі, як быццам і не мінула больш за 70 гадоў. Чаму так цяжка народу беларускаму на такой прыгожай зямлі? Чаму беларусам, якія маюць такую багатую гісторыю з амаль 1000-гадовай гісторыяй сваёй дзяржаўнасці, так і не задалося ўтрымаць самастойнасць і цяпер, калі афіцыйна абвешчаны суверэнітэт дзяржавы, зноў трэба адстойваць незалежнасць? Чаму

беларусы, якія далі свету многа славутых імён, не могуць адстаяць беларушчыну, а больш служаць то аднаму, то другому суседу? Чаму такі працавіты, добры, таленавіты народ застаецца абяздоленым? Чаму беларусам, якія так любяць сваю зямлю, часта зусім няўтульна жыць у родным краі, чаму іх тут крыўдзяць, і яны ніяк не могуць дасягнуць таго, каб «людзьмі звацца»? Чаму лепшыя шчырыя беларусы знішчаліся, сядзелі за кратамі, вымушаны былі пакінуць сваю бацькаўшчыну? Несправядлівы лёс расцярушваў жыхароў краіны па ўсім свеце, моцная асіміляцыя, як іржа, раз'ядала самасвядомасць беларусаў. Чаму хвалі нацыянальнага адраджэння былі такімі кароткімі і хутка змяняліся працяглымі прымаразкамі? Такіх пытанняў бясконца шмат — на многія ёсць адказы, але не меншую колькасць цяжка дасканала растлумачыць. І сэрца сціскаецца ў страшэнным жаху, калі пры сучаснай тэндэнцыі развіцця падзей (палітычных, эканамічных, дэмаграфічных, экалагічных і інш.) пачынаеш ўяўляць, што і сапраўды можа знікнуць Беларусь з геаграфічнай карты Еўропы, а пра беларусаў як нацыю будуць успамінаць толькі ў кніжках...

Петразаводск — чысты, зялёны, прыгожы горад, які прытуліўся да адной з затокаў Анежскага возера і выцягнуўся ўсцяж яго амаль на 25 км. Апошняе, калі зірнуць на геаграфічную карту, мае выгляд далоні, пальцы якой на поўначы ўяўляюць некалькі вузкіх затокаў і завуцца губамі. Найбольш кароткая з іх на захадзе — гэта і ёсць Петразаводская губа, а на ўсходзе — самая працяглая Мядзведжагорская губа, на кончыку якой знаходзіцца горад Мядзведжагорск — у маім дзяцінстве пасёлак Мядзведжая Гара. Амаль 300 тыс. жыхароў Петразаводска рыхтуюцца да 300-годдзя горада. У 1703 г. у вусце ракі Ласасінкі Пётр I заклаў гарматаліцейны завод, вакол якога вырас пасёлак Пятроўская слабада. Горад мае стандартны набор савецкіх назваў: вуліцы Кірава, Дзяржынскага, Куйбышава, Калініна, Пушкіна, Горкага, праспекты Карла Маркса, Актябрскі, плошча Кірава, помнікі Кіраву, К. Марксу і Ф. Энгельсу, Пятру I і г. д. Галоўны праспект — імя Леніна. Апошні ўліваецца ў Круглы пляц (цяпер плошча Леніна) з вялікім помнікам правадыру, які выцягнутай угару рукой паказвае правільны шлях да камунізму. Карэльскі навуковы цэнтр Расійскай акадэміі навук, дзе праходзіла наша канферэнцыя, знаходзіцца ў спецыяльна пабудаваным добрым будынку на набярэжнай, якая акуратна і прыгожа апранута ў скальныя Карэльскія камяні і якая пачынаецца троху далей праспекта Леніна. Тут стаіць вялізны, магутны помнік сапраўднаму бальшавіку Ота Вільгельмавічу Куусінену. Набярэжная — найбольш любімае месца прагулак петразаводцаў. І праўда, ідзеш па ёй — з аднаго боку шырокая роўнядзь возера з ціхім шэптам невялікіх хваляў, з другога — разнастайная зеляніна кудлатых куп дрэў і кустоў. Лепшага месца для супакаення, успамінаў, роздуму цяжка знайсці. Гуляючы тут, я зноў успомніў свае дзяцінства...

Бацька, які рабіў інжынерна-геалагічныя вышукванні пад будаўніцтва Кольскага канала, Верхне- і Ніжнетуломскіх ГЭС, прывёз сваю

сям'ю ў пасёлак Кола пад Мурманскам. Пасяліліся ў доўгім бараку — былой стайні, два стойлы якой і зрабіліся нашай кватэрай.

Мы, малыя, увесь час круціліся на розных будоўлях, дзе працавалі зняволеныя, ад якіх у хуткім часе атрымалі «добрае» выхаванне: навучыліся брыдкім словам, паліць акуркі, лаяцца, біцца. Улетку — белыя ночы, у якія губляеш адчуванне часу і не ведаеш, калі закончыўся дзень і пачалася ноч. Дарослым загнаць дзетак дахаты амаль немагчыма. Успомнілася першая (і, мусіць, апошняя) адлупцоўка ад майго таты. Была гадавіна смерці яго маці (нашай багацькаўскай бабы). Ён вельмі цяжка перажываў смерць маці, якую так любіў і шанаваў і на пахаванне якой яго не адпусцілі. Гэты дзень календара быў самы горкі і самотны. Я так разгуляўся, што ніяк не хачу ісці дахаты, хоць ужо вельмі позна і тата многа разоў клікаў. Ён узяў мяне за руку і пацягнуў да ганка, а мяне раптоўна ўзяла такая злосць, што я вылаяўся матам, — вось тут тата і адлупцаваў мяне па мяккім месцы. На наступны дзень бацька растлумачыў, што гэтая лаянка, якая з'явілася ў часы мангольскага іга, утрымлівала яшчэ адно слова — «татарын» і мела сэнс, а цяпер уяўляе бязглуздзіцу і вялікі здзек над жанчынай. Для мяне то быў добры ўрок. Але больш успаміналася прыемнае: лоўля камбалы ў час адліву ў Кольскай затоцы і сёмгі на рацэ Кола, вандроўкі на крутую гару Салавараку, паходы па грыбы, ягады (асабліва марошку і брусніцы), геалагічныя маршруты з татам, у якіх мы збіралі прыгожыя каменьчыкі, кераміку і чарапкі з неалітычных стаянак чалавека... Апошняе адбывалася ўжо ў Мурмашах, куды мы пазней пераехалі і дзе я пайшоў у першы клас.

У самым пачатку 1937 года бацьку перавялі ў аддзел пошукаў Валгабуда (пас. Пераборы недалёка ад Рыбінска), дзе праводзіліся даследаванні пад Рыбінскія ГЭС і вадасховішча. Тут чамусьці значна часцей, чым на Кольскім паўвостраве, былі выпадкі, калі вохраўцы (ваенізаваная ахова) з аўчаркамі шукалі вязняў — уцекачоў. Нам дужа было шкада маладых абарваных хлопцаў, на якіх кідаліся аўчаркі, а вохраўцы білі іх прыкладамі. Да гэтага часу нярэдка бачу пасінелыя жудасныя твары двух такіх уцекачоў, якіх дасталі з прысыпаных зямлёй канаў, куды яны схаваліся і дзе задыхнуліся. Не прайшло і паўгода, як бацьку выклікаў начальнік будаўніцтва і паведаміў, што з Масквы паступіў загад, каб усіх, хто некалі быў асуджаны па артыкулу 58-6 (шпіянаж), безадкладна звольніць з працы. Ён параіў вярнуцца ў Мядзведжую Гару ў сістэму Гідрапраекта НКУС, на якую гэты загад не распаўсюджваўся. Так мы яшчэ ўлетку аказаліся ў Мядзведжцы.

Але пераезд не выратаваў — у кастрычніку бацьку арыштавалі. Маці з сям'ёй адразу выгналі са службовай кватэры. Добра, што Ізаксоны, нашы знаёмыя яшчэ з Колы, дапамаглі знайсці маленькі пакойчык плошчай каля 8 м$^2$ у драўляным доме карэлкі Еўдакіі Сямёнаўны Готшалк, якая праявіла спагадлівасць і смеласць, бо мець знаёмства, а тым больш пускаць да сябе на кватэру сям'ю «ворага народа» было вельмі небяспечна.

Каб троху было лягчэй жыць, мама адаслала мяне са сваёй маці, маёй бабуляй Марыяй Міхайлаўнай, пажыць у роднага брата Сяргея Восіпавіча, які жыў у Запарожжы з цяжарнай жонкай і дачкой Інай і працаваў майстрам-брыгадзірам на авіяцыйным заводзе. Тут я стаў

сведкам арышту майго дзядзькі Сяргея. Ноччу прыехаў «чорны воран», тры вайскоўцы некалькі гадзін рабілі вобыск. Я і мая малая стрыечная сястрычка не разумелі, што адбываецца, таму скакалі і смяяліся, бо было цікава глядзець, як сярод ночы зрабілі такі гармідар. Але калі ўвялі дзядзьку Сяргея, нашы жанчыны горка заплакалі, і мы адразу прыціхлі і таксама пачалі плакаць. Сяргея Восіпавіча ніхто з родных больш не бачыў, толькі пасля вайны прыслалі пасведчанне аб смерці — хлусню аб тым, што ён памёр ад хваробы лёгкіх у 1940 годзе. Праўду даведаліся толькі пасля смерці Сталіна: ён быў расстраляны ў канцы снежня, амаль у той час, калі нарадзіўся ў яго сын — Сяргей Сяргеевіч.

А ў Мядзведжай Гары з турмы быў выпушчаны тата, і ў красавіку 1938 года я быў разам з бацькамі. Не прайшло і месяца, як зноў мы засталіся адны, — на гэты раз на досыць доўгі час — больш года.

У Петразаводску я вырашаў пашукаць справы бацькі ў сувязі з яго арыштамі 1937 г. і 1938–1939 гадоў. У Дзяржаўным архіве навейшай гісторыі (вул. Андропава) ветліва прыняў намеснік дырэктара Аляксей Міхайлавіч Грыгаровіч. Матэрыялаў пра Гаўрылу Гарэцкага ніякіх няма. На той жа вуліцы — Упраўленне Федэральнай службы бяспекі Расіі па Рэспубліцы Карэліі. Ніякіх звестак. У архіве Міністэрства ўнутраных спраў ёсць справы на большасць людзей, якія працавалі на будаўніцтве Беламорска-Балтыйскага канала. Гэтых спраў больш за 600 тысяч, але разабрана з іх і прыведзена ў парадак толькі 6 тыс. Сярод апошніх бацькавай справы няма. Прэзідэнт Акадэміі сацыяльна-прававой абароны (грамадская арганізацыя), кіраўнік карэльскага «Мемарыяла» Юрый Дзмітрыеў у сваім камп'ютары таксама не знайшоў імя майго таты.

Нарэшце, трапіў у Карэльскі дзяржаўны краязнаўчы музей (плошча Леніна), які займае частку былога палаца генерал-губернатара Алонецкай губерні. Тут ведаюць пра акадэміка Г. І. Гарэцкага — былога вязня БелБалтлага, нават маюць яго фотаздымак, некаторыя звесткі з біяграфіі, але аб арыштах 1937 і 1938–1939 гадоў нічога няма. У музеі добра і багата пададзена прырода Карэліі, шырока прадстаўлены матэрыялы рэвалюцыйных падзей і ўстанаўлення савецкай улады, Вялікай Айчыннай вайны. Экспазіцыя пра Беламорска-Балтыйскі канал зусім малая: людзі ў ватоўках дзяўбуць скалы прымітыўнымі прыладамі працы таго часу (рыдлёўкі, ламы, кіркі, тачкі і інш.), панарама шлюза, некалькі лозунгаў пра сацыялістычную працу, газеты з партрэтамі ўдарнікаў і г. д.

Людзі, з якімі я сустракаўся ў гэтых установах, вельмі прыхільна ставіліся да мяне і асабліва пасля таго, як даведваліся, што я з Беларусі, бо большасць з іх самі былі выхадцамі з нашай краіны ці мелі родных і знаёмых беларусаў.

Аляксей Міхайлавіч Грыгаровіч прапанаваў на яго «Волзе» з'ездзіць у Мядзведжагорск, які ляжыць прыблізна ў 120 км на поўнач ад Петразаводска. Добрая асфальтавая дарога ўецца сярод прыгожых краявідаў: праз ужо пажаўцелыя бярозы праглядвае ласкавы блакіт возера, зялёны сасняк ахоплівае ўсё вакол, амаль голыя скалы троху змрочна глядзяць шэрымі сценамі старажытных замкаў, раптам блісне

рознакаляровы гранітны «барані лоб», некалі адпаліраваны магутным ледавіком...

Аказалася, што Аляксей Міхайлавіч нарадзіўся ў Мяджведжай Гары, а яго жонка — у Павянцы, дзе яны разам вучыліся ў школе. Ён мае беларускія карані па маці і ўкраінскія па бацьку, абодва — дзеці ссыльных.

Мядзведжка за мінулыя больш чым 60 гадоў моцна змянілася, некалі амаль цалкам драўляная — абрасла цэглай і бетонам 2—5-павярховых дамоў. Пазнаў нязменныя каменныя дамы: гасцініца і кіраўніцтва Беламорска-Балтыйскага камбіната. Крыху далей, як і раней, вялізная цёмная сцяна з нацягнутым угары калючым дротам, за якой вядомая ўсім жыхарам горада турма. Сюды некалі вадзілі бацьку на допыты, у лазню з другой турмы (відаць, тыпу следчага ізалятара), якая знаходзілася на правым беразе рэчкі Кумсы. Апошняя з бурлівай паўнаводнай ракіператварылася ў значна спакайнейшую рачулку. Не плывуць па ёй, як раней, плыты і бярвенні, на якіх мы каталіся і пераскоквалі з аднаго берага на другі, рызыкуючы трапіць пад магутны лясны сплаў, як такое здарылася з прыгожым пудзелем нашых знаёмых. Няма драўлянага дома, дзе мы здымалі настолькі маленькі пакойчык, што брату і мне прыходзілася сцяліць ложак на стале і пад сталом. Кумса так зарасла дрэвамі і кустамі, што цяпер мы не маглі б убачыць з нашага берага на супрацьлеглым, дзе стаяла турма, выводзяць бацьку з яе варот ці не. Знеслі і турэмны будынак, на месцы якога зараз расчышчаюць пляцоўку для нейкай новай будоўлі.

Няма і парашутнай вышкі ў парку, дзе мы бадзяліся ледзь не да поўначы ў светлыя белыя ночы, дадаючы хваляванняў і клопатаў нашай маці, якая зранку да позняга вечара працавала настаўніцай у школе для дарослых, каб хоць троху зарабіць грошаў і пракарміць сям'ю, і замест адпачынку яна шукала нас. А я ўжо забыўся пра недарэчны вопыт скачка з парасонам у Брылёва, і мяне так вабіла вышка, так хацелася прыгнуць з парашутам, што я ўвесь час круціўся там, некалькі разоў нават карабкаўся на яе, але мяне заўсёды не пускалі ці ў хуткім часе з гвалтам здымалі і ледзь не білі, бо дужа надакучаў. Так і прайшло жыццё, а мне і не ўдалося скокнуць з парашутам, хоць і да гэтага часу троху з зайздрасцю і шкадаваннем за сябе гляджу на рознакаляровыя парашуты ў блакітным небе.

А вось і мост праз Кумсу. Раней быў вузкі драўляны, цяпер — больш шырокі і з бетону. Тут я і брат часта гадзінамі вартавалі, каб пабачыць бацьку, якога вазілі ў «чорным воране» ці вялі ў калоне, а то і аднаго ў вялікую турму на допыты, а можа, і ў лазню ці на працу. З кожным разам тата выглядаў усё больш схуднелым, слабым, страшным... Турмы былі перапоўнены — не паспявалі адных расстрэльваць, як напіхвалі новымі вязнямі. Частыя карцэры, зробленыя з сатанінскай выдумкай, здзеклівыя допыты з пабоямі, бесперапыннае недаяданне, а то і сапраўдны голад рабілі сваю працу і даводзілі зняволеных да поўнай абыякавасці, жадання хутчэй пакінуць жыццё, а то і скончыць яго самагубствам. Аднойчы мы ўбачылі тату ў зусім жудасным стане: худы, нyголены, з патухлымі вачыма, апухлымі нагамі, на якіх падра-

ныя тапачкі, прывязаныя шпагатам, бо яны і тым больш чаравікі не налазілі. Ён быў змарнелы, ледзь рухаўся. Відаць, трымацца сіл больш не было, і бацька разумеў, што наперадзе чакае яго толькі расстрэл, і таму папрасіў маці перадаць яму лязо. Добра, што потым хапіла мужнасці і вытрымкі не скарыстаць яго...

З моста дарога ішла ўгару — тут я з хлопцамі ўзімку чакаў грузавыя машыны, каб учапіцца за борт кручкамі і пракаціцца на каньках, якія мне выразаў дзед з дрэва і замест лёзаў прымацаваў тоўсты дрот. Троху далей быў кірмаш, які стаў больш упарадкаваным. Успомнілася, як мы тут лазалі па скрынях-сметніцах, знаходзілі там цукерачныя абгорткі і гулялі ў фанцікі (іншых цацак не было), іншым разам траплялісі і манеткі, на якія куплялі цукеркі — падушачкі ці сасулькі-мандарынкі (мне і да гэтага часу яны здаюцца смачнейшымі за шакаладныя). У сям'і грошай не было не то што на цукеркі, а нават на хлеб. Аднойчы, ужо пасля вызвалення, бацька на кірмашы даў мне добры ўрок: у брудзе я ўбачыў стары падраны кашэль, і з яго тырчала пачачка папяровых купюр; я ўзрадаваўся і кінуўся да кашалька, які раптам ад татавага бота паляцеў далёка ўбок, а я пачуў сярдзіты голас бацькі: «Не тваё — дык і не бяры!» Зашчаміла сэрца, калі ўспомнілася тая крыўда, якую мне тады наносілі некаторыя бацькі маіх сяброў і сябровак, забараняючы гуляць з сынам «ворага народа», і сярод іх асабліва крыклівая і злая матка прыгожай Каці.

На першым паверсе гасцініцы цяпер знаходзіцца Мядзведжагорскі гарадскі музей, дзе нас сустрэў вядучы навуковы супрацоўнік Яўген Восіпавіч Тумаш, таксама з сям'і выхадцаў з Беларусі і Польшчы. У музеі невялікі аддзел, прысвечаны БелБалтлагу. Тут асобны стэнд прысвечаны рэпрэсаванаму Міхаілу Грыгаровічу — бацьку Аляксея Міхайлавіча, шэраг дакументаў, фотаздымкаў таго часу. Сярод апошніх зацікавіў здымак групы пісьменнікаў і дзеячаў культуры на чале з Максімам Горкім. Ён стаіць наперадзе, а за ім троху збоку Янка Купала. Гэты здымак зроблены пры ўрачыстым адкрыцці Беламорска-Балтыйскага канала ў жніўні 1933 года ў Павянцы (пры будоўлі канала казалі: «Павянец — свету канец!»), дзе знаходзяцца другі і трэці шлюзы перад самым выхадам канала з Анежскага возера. Мы з'ездзілі і туды: глыбокія шлюзы, сценкі якіх цёмныя і пашарпаныя, па выглядзе адчуваецца іх сталасць і рэдкае выкарыстанне, бо цяпер асноўныя грузы ідуць не водным шляхам, а чыгункаю і аўтатранспартам. Уявіў, як амаль 70 гадоў назад тут мой бацька — Гаўрыла Гарэцкі, які быў на беразе сярод шэрага натоўпу зняволеных, сасланых і вольнанаёмных будаўнікоў канала, апошні раз здалёку ўбачыў Янку Купалу, які стаяў побач з Максімам Горкім на палубе белага парахода.

Затым паехалі ў Сандармох — мядзведжагорскія Курапаты (19 км ад Медзведжагорска). Прыгожая мясціна — пясчаныя ўзгоркі, парослыя светла-зялёнымі празрыстымі сосенкамі. Адразу ўспомнілася апавяданне В. Быкава «Жоўты пясочак». Не прыгажосць прываблівала бальшавіцкіх катаў да такіх мясцін, а лёгкасць выкапвання катлаванаў, ям і канаў для трупаў расстраляных ахвяр і такая ж лёгкасць іх засыпання на «адпаведную» па інструкцыі глыбіню. Мемарыяльны

комплекс пачынаецца выразным помнікам ахвярам Сандармоха: вялізная глыба з каменю і бетону, на пярэднім плане — падаючая фігура забітага з паніклымі крыламі, кветкамі ўнізе і вялікай даланёю, якая моцна сціскае скурчанымі пальцамі букет кветак-ахвяр, а над барэльефам угары надпіс: «Люди, не убивайте друг друга». Імя аўтара нідзе не абазначана, але пазней я з ім пазнаёміўся — скульптар і пісьменнік Рыгор Салтун тыповага выгляду мастак: жывы, гаваркі, з вялікай барадой і нядбайна адзеты.

Далей стаіць вялікі валун, на якім дошка з надпісам: «Здесь с 27 октября по 4 ноября 1937 г. расстрелены 1111 заключенных Соловецкой тюрьмы». Троху ўбаку стаіць невялікая драўляная цэркаўка. Яна пабудавана на тым месцы, дзе 21 студзеня 1938 года ў 4 гадзіны ночы два штатных ката НКУС Шондыш і Бандарэнка расстралялі 450 чалавек. А яшчэ далей па ўсім лесе на ўчастку плошчай 7,5 га расстаўлены сотні крыжоў з прозвішчамі, а часта і з фотаздымкамі расстраляных. Ёсць і сапраўдныя магілкі-холмікі. Канешне, усе яны не адпавядаюць канкрэтным месцам расстрэла і пахавання. Больш за трох соцен ям з пахаваннямі знойдзена ва ўрочышчы Сандармох.

Намаганнямі такіх людзей, як дэпутат Дзяржаўнай думы РФ Іван Чухін, трагічна загінуўшы ў траўні 1997 года, Юрый Дзмітрыеў і іншыя, нядаўна выйшла тоўстая «Кніга памяці», у якой названы ўсе жыхары Карэліі, рэпрэсаваныя ў 1937—1938 гадах. І. Чухін напісаў першую праўдзівую і пакуль адзіную кнігу пра гісторыю будаўніцтва Беламорска-Балтыйскага канала «Каналоармейцы» (1990), якую падараваў Янке Брылю, а той перадаў яе мне. Ужо пасля смерці выйшла яго кніжка «Карелия-37: Идеалогия и практика террора» (1999). Юрый Дзмітрыеў выпусціў кнігу «Место расстрела Сандармох» (1999), у якой пайменна пералічыў прозвішчы ўсіх тут расстраляных. Ён піша: «Подобно тому, как прах расстрелянных в Сандармохе вошел животворным соком в корни зеленых сосен, горькая правда о злодеянии большевитских палачей вошла в память ныне живущих народов. Преклоним колени у покрытых вязью имен надмогильных столбцов, ощутим трагическую и священную красоту этой частички карельского леса, собравшей в себе несколько тысяч оборванных человеческих жизней». Кніжка выдадзена Адміністрацыяй Старшыні ўрада Рэспублікі Карэлія, адміністрацыяй мясцовага самакіравання Мядзведжагорскага раёна і Акадэміяй сацыяльна-прававой абароны.

Па архіўных дадзеных у Сандармоху за 14 месяцаў 1937—1938 гадоў расстраляна каля 9 тысяч чалавек, якія складаюць тры групы. Першая група (3,5 тыс. чал.) — гэта мясцовыя жыхары (карэлы, фіны, радзей рускія і інш.) з розных раёнаў Карэліі, галоўным чынам сяляне, рыбакі, паляўнічыя. Яны былі асуджаны пераважна так званай «двойкой». Другая група (4,5 тыс. чал.) — зняволеныя БелБалтлага, сярод якіх большасць інтэлігенцыя са ўсіх куткоў СССР многіх нацыянальнасцяў (нават нарвежцаў, немцаў, чэхаў, іранцаў, персіянаў, палякаў і інш.), у тым ліку і беларусаў. Трэцяя група — гэта салавецкі этап. Каля 1,5 тысяч зняволеных Салавецкай турмы былі адпраўлены ў Мядзведжую Гару, але ў «жоўты пясочак» Сандармоху трапіла 1111 чалавек, іншыя

памерлі па дарозе. Тут буйныя дзяржаўныя дзеячы, вучоныя, літаратары і інш. — эліта інтэлігенцыі краіны. Сярод іх 102 жыхары Беларусі, у тым ліку акадэмікі АН БССР М. Яворскі і М. Дурнаво, член урада БССР Ф. Валынец, дзяржаўны дзеяч М. Бурсевіч і інш. Узрост большасці ахвяр — да 40—50 гадоў. Каб не тая акалічнасць, што Г. Гарэцкага («шпіёна і контррэвалюцыянера, завербаваўшага» такіх кіраўнікоў, як Чарвякоў і Галадзед) палічылі найбольш злосным і «важным» «ворагам народа», за раскрыццё якога можна было б атрымаць падзяку самой Масквы, і таму паслалі ў сталіцу, закончыў бы ён свой жыццёвы шлях у Сандармоху.

26—27 кастрычніка 1997 года, а затым 22 жніўня 1998 года — у гады «Прымірэння і згоды» — каля мемарыяльнага комплекса Сандармох прайшлі міжнародныя акцыі «Пакаянне» ў сувязі з 60-годдзем «Вялікага тэрору» ў СССР — генацыду бальшавіцкіх уладаў супраць свайго народа.

У Петразаводск мы вярталіся сумныя, маўклівыя, пад вялікім уражаннем убачанага. Колькі бязвінных ахвяр, колькі цяжкасцяў маральных і фізічных перажылі людзі! За што і для чаго? Зноў узнікалі малюнкі мінулага. Але больш перамагалі радасныя (вандраванне па лесе, пошукі ягад і грыбоў, лоўля рыбы, катанне па люстэрку тонкага лёду і да т. п.), і дзяцінства ўспаміналася шчаслівым, бо магутныя сілы маладога жыцця, як былінкі дрэў ці травы праз скальную пароду, прабівалі цвёрды асфальт жорсткасці, несправядлівасці і імкнуліся да святла, да сонца.

Плошча тэрыторыі Рэспублікі Карэлія прыблізна на $^{1}/_{4}$ меньшая за плошчу Беларусі, але жыхароў — толькі каля 800 тыс. Сярод іх карэлаў 10%, фінаў — 2,3% і вепсаў — 0,8%. На першым месцы рускія — каля 75%, беларусы — на трэццім (7%), затым украінцы (3,6%). Беларусы і ўкраінцы ўжо амаль усе рускамоўныя, ды, відаць, і многія прадстаўнікі тытульнай нацыі таксама сталі рускамоўнымі (значыць, не менш 90% жыхароў карыстаюцца толькі рускай мовай). Таму за ўвесь тыдзень майго знаходжання ў Карэліі я чуў толькі рускую мову. На тэлебачанні і радыё на карэльскай ці фінская мовах перадач няма. Не бачыў на гэтых мовах ні газет, ні часопісаў, ні надпісаў на шыльдах устаноў і магазінаў, назваў вуліц. Выключэнне — некалькі мемарыяльных дошак. Кажуць, што ёсць толькі адна школа з навучаннем на фіна-угорскай мове (да гэтай групы належыць і карэльская). Нягледзячы на тое, што старажытныя вусныя і пісьмовыя помнікі (руны) адносяцца да XIII стагоддзя і на выснове іх створаны сусветнавядомы народны эпас «Калевала», сучаснае насельніцтва поўнасцю русіфікавана, і ад карэльскага там засталася толькі назва рэспублікі, і, па сутнасці, краіна цалкам руская. Увачавідкі ўбачыў магчымую будучыню і нашай любай Беларусі.

Тыдзень хутка праляцеў, і я зноў у цёплым купе фірменнага цягніка «Санкт-Пецярбург — Мінск».

Іду па Мінску — і пазнаю яго, і не. Вось і плошча Якуба Коласа, але там нейкая іншая каменная фігура, таксама знаёмая, але ўжо і

забытая, такая вялізная, што зрабіла плошчу зусім маленькай. Прыглядаюся — дык гэта ж Сталін! Чытаю надпіс: «Площадь Сталина». Гляджу на шыльду праспекта Францыска Скарыны, але здалёку бачу толькі першую вялікую літару «Л» — няўжо зноў вярнулі назву «Ленінскі»? Аглядаю больш уважліва іншыя назвы: там была «Бульбяная» — зараз «Картофель», «Лянок» — «Ткани», «На ростанях» — «Перекресток» — Welcome. Чытаю афішу: «Посетите выставку Георгия Скаринова — великого русского первопечатника». Іду паціху па гораду і чытаю, потым — хутчэй іду, ужо бягу, ды так хутка, што задыхаюся. Што такое — ніводнага слова па-беларуску, вакол толькі рускія і больш рэдкія англійскія назвы? Успамінаю, як аднойчы «правадыр» абвясціў, што ў свеце толькі дзве вялікія мовы.

Падыходжу да кіёска, каб узяць газеты і даведацца — у чым справа, што здарылася? Невялічкая чарга, апошнім стаіць салідны дзядзька ўкапелюшы з прыемным тварам і вясёлай усмешкай. Пытаюся: «Вы апошні ў шапік?» Паглядзеўшы злоснымі вачыма, якія раптоўна зрабіліся проста шалёнымі, амаль крычыць: «Не можешь спросить на нормальном языке?» І іншыя з пагардай азірнуліся на мяне, а адна дамачка ў капялюшыку і з сабачкай на павадку нават пагразіла кулачком. Думаю пра сябе, што трэба ўзяць «Народную волю» — там хутчэй даведаюся праўду. Пытаюся: «Ці ёсць «Воля»?» — «Нет и не будет!» — «А «Свабода»? — «Нет и никогда больше не будет!» — ужо крычыць кіяскёрша. Нейкі хлопец б'е мяне ў бок і пырскае проста ў твар слінай: «Вот еще один недобитый националист откуда-то взялся!» Чую выкрыкі: «Фашист! Сволочь!» І хутчэй ад мяне ўсе пабеглі, як быццам я магу заразіць іх чумой. Аглядаючыся вакол сябе, людзі робяць выгляд, што не толькі не размаўлялі са мной, хаця больш лаяліся, але і не стаялі побач.

Адразу, як з-пад зямлі, з'явілася група моцных брытагаловых хлопцаў, чалавек 10 — усе як адзін, адрозніць немагчыма, — я зразумеў, што яны кланаваны і што гэта спецназ. Усе не толькі на адзін твар, але і адзеты зусім аднолькава: у куртках, як хакеісты, а ў руках шлемы і клюшкі, але на нагах чамусьці футбольныя буцы. Наперадзе ў такім жа адзенні дзядзька, але з рэдкімі валасамі і вусікамі (відаць, начальнік). Ён як крыкне: «Кто тут крамолу разводит?! Поддайте-ка ему, чтобы забыл этот старый, никому не нужный язык!» Накінуліся на мяне, ды так адлупцавалі, што я толькі праз гадзіну трошку ачуняў і ледзь падняўся з нейкіх калючых кустоў.

Насустрач ідзе маладая дзяўчына, прыгожая, з блакітнымі добрымі вачыма, мяккім прывабным тварам, светлымі валасамі і доўгай касой — адно заглядзенне. Вялікае дэкальтэ дазваляе убачыць белыя пульхныя грудзі, якія высока ўздымаюцца і яшчэ больш выразна выяўляюць глыбокую шчылінку паміж імі. Думаю: «Вось гэта сапраўдная беларусачка, спытаю я ў яе — што ж гэта тут робіцца?» Не паспеў я адкрыць рот, як бачу — грудзі яе растуць, пашыраюцца, абхопліваюць мой твар — мне і прыемна, так мякка і, здаецца, ласкава, але пачынаю задыхацца і чую сярдзіты голас дзяўчыны: «Думай на нормальном языке, гад недорезанный!» Паспеў спытаць яе: «Адкуль ты ведаеш, на

якой мове я думаю?» — «Да я знаю мысли любого человека, специально этому училась в службе безопасности — не скроешься от меня!» Падумаў: «Трэба ж, да чаго дайшло наша КДБ!» і згубіў прытомнасць. Падаючы, пачуў: «Если не перейдешь на мысли по-русски, напущу на тебя спецназ, и тогда тебе конец!»

Плятуся ўсцяж вуліцы, бачу — нейкія чудішчы цягнуць на насілках бабульку, раптам паклалі яе на зямлю, а самі некуды пабеглі. Падыходжу — да гэта баба Матруна з вёскі Калодзішчы каля Чэрвеня — бабуля маёй жонкі. Заўсёды поўная, з ружовым тварам, а тут зусім схуднелая, бледная. Здзіўлена пытаюся: «Баба Матруна, што Вы тут робіце? Вы ж памерлі дзесяць гадоў таму!» — «Даражэнькі, гэтыя праклятыя пачвары — «вшываблохі» — адкапалі мяне і нясуць у Курапаты, дзе хочуць расстраляць».

— А што гэта за «вшываблохі»?

— Такія былі навуковыя распрацоўкі. Як вы там кажаце, прыярытэтныя, ці што. Яны вельмі дарагія, таму з усіх людзей нават збіралі грошы.

— А што ж атрымалася, і для чаго яны?

— Кажуць, што гэта помесь вошы і блыхі, і галава ні то ад чалавека, ні то малпы. Вось такую мешаніну ростам з малога чалавека і назвалі «вшываблохамі». Яны вельмі лютыя, а зрабілі іх, каб лавіць людзей, якія гавораць па-беларуску, катаваць іх і расстрэльваць.

— Ну а чаму ж Вас схапілі, калі Вы ўжо памерлі?

— Ды адкопваюць тых, у якіх на магілках надпісы на беларускай мове, і расстрэльваюць. Я ж табе казала, зрабі мне надпіс, як на іншых магілках, а ты не паслухаўся, вось так зараз і атрымалася.

— Прабачце, баба Матруна. Я ж хацеў адзначыць, што Вы сапраўдная беларуска, якая так выдатна заўсёды размаўляла па-беларуску і, дзякуючы такім, як Вы, і захавалася наша мова.

— Ды я не крыўдую на цябе. Але ты маўчы, бо і цябе зараз гэтыя пачвары схопяць.

Не паспела яна скончыць сказ, як аднекуль выскачылі брытагаловыя, якіх, аказваецца, усё ж наслала на мяне тая прыгажуня, і пачалі мяне біць то клюшкай, то буцамі. А гэты з вусамі — іх кіраўнік — злуецца: «Плохо бьеце, слабаки! Представьте, что это перад вами футбольный мяч, который вы должны забить в ворота. Вот смотрите, как нужно!» Ён разбягаецца і б'е мне па калену, ды так моцна, што здаецца — нага ў калене пераламілася. Ён крычыць свайму памагатаму: «Не можешь бить как следует, так стреляй в него из автомата!»

Расплюшчваю вочы, чую пакалыханне цягніка, страшэнна ные калена (відаць, зноў разыграўся артрыт), а ў дзвер моцна стукае праваднiца: «Пасажыры, уставайце. Хутка будзе Мінск!»

*2002 г.*

## ЖЫЦЦЁВЫ МЕЛАНЖ

Тэрмін «меланж» шырока вядомы ў геалогіі. Ён паходзіць ад французскага слова «melange», што значыць «сумесь». Геалагічны меланж уяўляе сабой такое своеасаблівае геалагічнае цела, якое складзена з самых разнастайных парод, з іх сумесі, мешаніны, што робіць такое ўтварэнне вельмі стракатым, рознакаляровым, цікавым і загадкавым на выгляд. Такую ж назву носіць і прыгожая тканіна, якая зроблена з сумесі афарбаваных у розныя колеры валокнаў. Геалагічны меланж утвараецца пры розных стрэсавых з'явах, напрыклад, калі адзін вялікі блок, а то і магутны сегмент зямной кары насоўваецца на другі, трэцца аб яго, рухаецца ўздоўж ці ўпоперак яго з агромістай сілай. У выніку ў памежжы гэтых блокаў, у разломныя зоны, якія іх дзеляць, адрываюцца разнаітыя па рэчаваму складу і памерам глыбы і кавалкі парод, накапліваюцца тут, і ўтвараецца такім чынам геалагічны меланж.

Так і ў жыцці людзей уздзеянне чалавека на чалавека, адной супольнасці людской на другую, краіны на краіну, прыродных феноменаў і іншых самых разнастайных з'яў выклікае стрэсавыя сітуацыі як станоўчыя, так і адмоўныя, якія і застаюцца ў памяці чалавека, прытым, чым яны большага маштабу, тым большы ўплыў яны робяць на чалавека. Так узнікае «жыццёвы меланж» — сумесь самых розных з'яў, фізічных і душэўных водгукаў чалавека на рух і развіццё падзей... Яны фіксуюцца ў памяці, адлюстроўваюцца на палотнах мастакоў, у сродках масавай інфармацыі, творах пісьменнікаў, афіцыйных дакументах і г. д.

* * *

Аднойчы я трапіў на прыём да аднаго з кіраўнікоў прэзідыума Акадэміі навук БССР. Гэта быў салідны чалавек і вядомы пісьменнік, дэпутат Вярхоўнага Савета рэспублікі, дзе займаў пачэсную пасаду. Ён сядзеў у важнай позе і паблажліва слухаў мяне. Зазваніў тэлефон. Пачуўшы голас, гаспадар кабінета раптам ускочыў амаль па стойцы «смірна», слухаў уважліва і перыядычна адказваў: «Добра, будзе зроблена!» Паклаўшы трубку, сеў і з палёгкай прамармытаў: «Званілі з ЦК КПБ — інструктар».

Большасць беларусаў не толькі вельмі паслухмяныя, але і баяцца начальства, нават калі яно і зусім нязначнае.

*1986 г.*

* * *

Калі назаўсёды пакідае хату чалавек, які поўнасцю, да самага маленькага куточка запаўняў яе, наступае жудасная пустэча. Такое адчулі маці і я, калі пайшоў ад нас мой Тата. Прайшло ўжо больш як паўгода з яго смерці, а нам усё здаецца, што ён тут: чуецца, што сядзіць у сярэднім пакоі за кнігаю, дрэмле і нешта думае ў крэсле, адчыняе дзверы... Але змярцвеласць першых дзён і месяцаў патрошку прахо-

дзіць, і з'яўляюцца сілы паглядзець рэчы, рукапісы, матэрыялы, якія жывуць значна даўжэй за іх гаспадароў... Гартаючы паперы, я знайшоў невялічкі школьны сшытак з дрэнных жаўтаватых лістоў, у якім быў бацькаў нарыс «Памяць аб Купале на Волзе», датаваны 30.VIII.1946 г. У гэты час ён працаваў на Волзе ў якасці інжынера-геолага-вышукніка пад будучыя гідратэхнічныя збудаванні і калі трапіў у Пячышчы, ён не мог не ўспомніць Янку Купалу, які жыў тут у час вайны. Я падрыхтаваў нарыс да друку і перадаў у газету «Літаратура і мастацтва», у якой ён быў надрукаваны 27 кастрычніка 1989 г.

*1989 г.*

* * *

У лёсе Вітаўта Кіпеля і маім ёсць многа агульнага. Нарадзіліся ў Менску. Бацькі — «нацдэмы» з Інбелкульта — арыштаваны ў 1930 г., а пазней высланы ў Расію, куды ў хуткім часе пераехалі і іх сем'і. У вайну — эвакуацыя, але Вітаўт у Арле трапіў пад акупацыю, а я быў далей — ва Удмурціі. Вось тут напрамкі нашых рухаў разышліся: Вітаўт трапіў у Мінск і далей на Захад, а я на Усход — на Урал. Пасля вайны ён у Бельгіі стаў геолагам, а я ў Расіі таксама атрымаў спецыяльнасць геолага. Вітаўт у ЗША захапіўся праблемамі нацыянальнага адраджэння Бацькаўшчыны, зацікавіўся культурнай і літаратурнай, грамадскай дзейнасцю, нават стаў дырэктарам Беларускага інстытута культуры і навукі ў Нью-Йорку, я значна пазней, ужо па вяртанні ў Мінск у самым канцы 1971 г., таксама адчуў схільнасць да такіх жа пытанняў. І вось мы абодва сядзім побач у прэзідыуме Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Рым-IV», прысвечанай культурнаму памежжу Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны (Гродна, 1993), дзе сустрэліся ўпершыню, хаця і чулі адзін пра аднаго раней. Амаль адначасова гаворым: «Як добра сядзім разам, нам пашанцавала, а вось бацькі нашы сядзелі значна горш...»

*1993 г.*

* * *

На III Гарэцкіх чытаннях у Магілёве (сакавік 1994 г.) быў Янка Брыль. Ён мне параіў звярнуцца да жонкі Максіма Танка, якая ў пачатку 20-х гадоў вучылася ў Віленскай беларускай гімназіі ў Максіма Гарэцкага. Можа, запісаць якія-небудзь успаміны? Зайшоў да Максіма Танка па справе выбараў у Акадэмію навук Беларусі. У калясцы сядзела Любоў Андрэеўна. Я спытаў наконт успамінаў пра Максіма Гарэцкага. Яна адказала: «На жаль, ужо амаль нічога не памятаю, асабліва якія-небудзь падрабязнасці ці выпадкі. Адно вельмі добра памятую, дык гэта тое, што калі Максім Гарэцкі пакідаў нашу гімназію, мы так шкадавалі аб гэтым, што ўсе — і вучні, і настаўнікі — моцна плакалі».

*1994 г.*

* * *

На Вялікдзень каля кафедральнага сабора стаяў недалёка ад Зянона Пазьняка. Каля яго круціліся некалькі прыгожых сімпатычных дзяўчат і ўсяк стараліся, каб ён звярнуў на іх увагу. Я яму кажу: «Вось як Вас любяць дзяўчаты».

— Мяне любіць уся Беларусь.

— Ну, ёсць і такія, якія Вас не любяць.

— А я іх усё роўна люблю. Я ўсіх на Беларусі люблю. Калі б яны гэта ведалі, дык таксама мяне любілі б.

*1994 г.*

* * *

На Вялікдзень 1994 г. быў на службе ў кафедральным саборе, калі Філарэт з крыжом падышоў да В. Кебіча, той пацалаваў яму руку. Адзін з пісьменнікаў на гэта мне сказаў: «Ён зараз (а справа была перад прэзідэнцкімі выбарамі) не толькі руку, але і ж... пацалуе». Троху пазней на прыёме ў пасольстве адной з краін Захаду я стаяў побач здосыць вядомым былым супрацоўнікам ЦК КПБ. Ідзе мітрапаліт Філарэт. Мы прывіталіся, а мой субяседнік раптам кідаецца да Філарэта і цалуе яму руку. Яму неяк нялоўка перада мной, і ён кажа: «Не ведаеш, як з ім і вітацца».

*1994 г.*

* * *

Па запрашэнню Міколы Купавы — выступаў разам з Тэрэзай Голуб пра творчасць і жыццё Максіма Гарэцкага ў Мінскім мастацкім ліцэе. Поўны клас маладых, светлых, прыгожых вачанятак з цікавасцю ўважліва глядзелі на нас і сачылі за шляхам няведамага ім (на шчасце!) жахлівага жыцця ў час сталінскага «сацыялізму». Я сказаў, што многіх дзяцей прымушалі адмаўляцца ад бацькоў — «ворагаў народа». Пасля сустрэчы адна дзяўчынка адначасова са страхам і надзеяй у голасе спыталася ў мяне: «А Вы не адмовіліся?» Я адказаў, што бацькі, як і Бацькаўшчына, даюцца чалавеку ад Бога, і таму ад іх ніколі, якія б яны ні былі, адмаўляцца нельга, тым больш ад такіх цудоўных людзей, як мае. Яна знейкай палёгкай і ўдзячнасцю паглядзела на мяне — апраўдаў яе ўражанне. Дзякуй табе, дзяўчынка, за давер!

*1994 г.*

* * *

Бюро Прэзідыума АН Беларусі ў 1994 г. вырашыла абраць ганаровых і замежных членаў акадэміі. Апошнія такія выбары былі 35 гадоў таму. Я як віцэ-прэзідэнт курыраваў Аддзяленне хімічных навук і навук аб

Зямлі і Аддзяленне гуманітарных навук, таму з магчымымі кандыдатамі гэтых навуковых напрамкаў мне прыйшлося весьці размовы аб іх згодзе.

Пазваніў у Новасібірск акадэміку А. А. Трафімуку — выдатнаму геолагу-нафтавіку, намесніку старшыні Сібірскага аддзялення Расійскай акадэміі навук, члену прызідыума РАН, дырэктару Інстытута геалогіі і геафізікі, аднаму з арганізатараў СА РАН. Ён адразу рэзка адмовіўся: «Какой же я иностранный член АН Беларуси, если я белорус, родом из Брестской области. Это — моя родина, и я в ней не могу быть иностранным». Пазней А. А. Трафімук, як член КПРФ, нязгодны з палітыкай кіраўніцтва Расіі, адмовіўся ад ордэна, які па ўказу Б. Ельцына павінен быў атрымаць.

Пазваніў Васілю Быкаву. Той папрасіў падумаць, а на наступны дзень таксама катэгарычна адмовіўся: «Не хачу ніякай ласкі ад сучасных улад, у тым ліку і ад акадэміі. Я ў такой акадэміі нават ганаровым быць не хачу, бо яна поўнасцю савецкая і вы вымушаны будзеце хутка выбіраць такіх камуністаў, як Іван Антановіч, а я побач з ім сядзець не буду. Я б з прыемнасцю адмовіўся і ад мінулых узнагарод, бо яны мне перашкаджаюць жыць». І праўда, праз некалькі гадоў кандыдатам у члены-карэспандэнты АН Беларусі быў вылучаны Антановіч, але яго не абралі.

З Нілам Гілевічам вёў доўгія перамовы, бо ён хістаўся — хацеў быць не ганаровым, а правадзейным членам АН Беларусі. Так і адмовіўся даць згоду на выбары.

Янка Брыль і Пімен Панчанка далі згоду і сталі першымі ганаровымі членамі постсавецкай АН Беларусі. Асабліва быў задаволены ўжо зусім хворы Пімен Панчанка і шчыра дзякаваў нам, калі я разам з В. Банько (вучоны сакратар Аддзялення гуманітарных навук) прыехалі да яго на кватэру ўручыць дыплом ганаровага акадэміка. Мы ж былі рады, што падтрымалі настрой і дух славутага паэта перад вечным адыходам яго ў іншы свет (праз год ён памёр).

Я зрабіў так многа намаганняў, каб гэтыя выбары адбыліся, бо лічыў іх першым крокам да аб'яднання беларускай інтэлігенцыі на шляху нацыянальнага адраджэння. Адна прысутнасць на агульным сходзе АН Беларусі такіх постацей, як Максім Танк, Янка Брыль і інш. рабіла сходы больш урачыстымі, а па сутнасці, і больш нацыянальнымі, што так заўсёды не хапала нашай акадэміі.

*1994 г.*

* * *

Калі я рабіў уступнае слова на нарадзе Міжнароднага праекта «Еўрапроба» ў Мінску, я коратка расказаў пра гісторыю Беларусі, пра Вялікае княства Літоўскае. Мой навуковы настаўнік, віцэ-прэзідэнт Расійскай акадэміі навук акадэмік А. Л. Яншын, які выдатна ведае гісторыю, але тую, афіцыйна-рускую, вельмі здзівіўся многім невядомым яму фактам. Калі яго жонка, Фідан Тауфікаўна, спытала яго,

дык хто ён, як ураджэнец Смаленска, па нацыянальнасці, Аляксандр Леанідавіч, паслухаўшы мяне, напалову жартам — напалову ўсур'ёз адказаў: «Я ліцьвін».

*1994 г.*

* * *

Запрасілі на пасяджэнне Прэзідыума Вярхоўнага Савета РБ, дзе Ніл Гілевіч рабіў даклад пра выкананне Закона аб мовах. Дэпутаты Жукоўскі, Б. Савіцкі (выступалі па-руску), Булахаў (аказваецца, можа размаўляць і на беларускай мове) растлумачылі, што яны не размаўляюць па-беларуску, бо гэтая мова не надта распрацаваная, да гэтага часу ідуць спрэчкі па яе правапісу, таму лепш гаварыць па-руску, чым не зусім дасканала па-беларуску. Выходзіць, што не яны, народныя дэпутаты Беларусі, а мова ў гэтым вінавата.

*1994 г.*

* * *

На канферэнцыі «Беларуска-амерыканскія гісторыка-культурныя ўзаемадачыненні» паміж Янкам Брылём і мной сядзела пасол Польскай Рэспублікі прафесар беларускай мовы Эльжбета Смулак і паведала нам: «Неяк заходзіць да мяне вельмі сімпатычная жанчына і размаўляе на прыгожай беларускай мове. Аказваецца, гэта жонка паэта Генаддзя Бураўкіна — Юля. Пытаюсь: «Адкуль так добра мову ведаеце?» — «Навучылася ў беларускіх эмігрантаў у Амерыцы». Вось парадокс: мова беларуская лепш захавалася ў эмігрантаў у Амерыцы, чым на Бацькаўшчыне.

*1994 г.*

* * *

Калі пасля бацькі паміраe ўжо зусім старая і хворая маці, разумееш, што гэта непазбежны закон жыцця і нават ёй палёгка (як кажуць, адмучалася), усё роўна сэрца ные ад страты, а кроплі слёз самі з'яўляюцца на вачах. Пакуль жывуць бацькі, адчуваеш сябе больш спакойным і мацнейшым, а з іх адыходам сам пераходзіш у першы рад, у які ў любы момант можа прыйсці за табой хударлявая баба з касой. 2 жніўня — у вельмі гарачы летні дзень — памерла мая маці. З аднаго боку, хочацца застацца зусім аднаму і ўспамінаць яе ў мінулым, а з другога, як добра, што прыходзяць спачуванні і падтрымка ад блізкіх, сяброў і знаёмых — паняволі робіцца лягчэй. Я быў вельмі ўдзячны многім з іх, асабліва Янке Брылю, які, пачуўшы ад некага аб гэтай сумнай падзеі, прыйшоў на пахаванне, дзе ён і Роза Зінава сказалі вельмі цёплыя словы, а потым пабыў і на памінках, і гэта нягледзячы на тое, што на наступны дзень ён адзначаў сваё 77-годдзе.

*1994 г.*

* * *

На агульным сходзе Акадэміі навук Беларусі, які павінен быў пачацца а 10 гадзіне раніцы, чакалі Прэзідэнта РБ А. Г. Лукашэнку, таму асабліва глядзелі, каб усё было ў парадку. Я хвілін за 50 да пачатку зайшоў у вялікую залу паглядзець, ці ўсё падрыхтавана да сходу. У зале нікога, толькі сядзіць адзін Давід Моўшавіч Голуб — наш самы старэйшы акадэмік (яму больш за 93 гады). Пытаюся ў яго:

— Давід Моўшавіч, чаму так рана прыйшлі?

— Ды прызвычаіўся ў такі час ездзіць на працу — вось рана і апынуўся тут.

А потым дадаў: «Але Вы не думайце, што я дарма марную час. Вось бачыце, я сяджу і вывучаю англійскую мову — словы новыя вучу». І паказаў мне вялікі ліст з пералікам англійскіх слоў і іх перераводу на рускі. Вось гэта апантаннасць да ведаў!

*1994 г.*

* * *

Зноў нашы дэмакраты пасварыліся: БНФ абвінавачвае Партыю згоды (Г. Карпенка) у развале блока і наадварот. На жаль, наша дэмакратыя пакуль што не здольная стварыць нешта станоўчае, моцнае і сталае, ёй лягчэй разбурыць. Амбіцыі вышэй за справу.

*1995 г.*

* * *

Быў на канферэнцыі «Незалежнасць СМІ», якую наладзіў ПЭН-цэнтр Беларусі. Калі садзіліся ў аўтобус, перад Янкам Брылём раптам аказалася жанчына з вялікім і цяжкім чамаданам. Янка Брыль ад нечаканасці неяк разгубіўся, і ў яго міжволі само сабою вырвалася: «Як жа быць — дактары забараняюць мне падымаць што-небудзь цяжкое?» Але тут жа падхапіў чамадан і ўнёс яго ў салон аўтобуса.

*1995 г.*

* * *

На адкрыцці помніка Алесю Адамовічу на могілках у Глушы жалобны мітынг вёў Янка Брыль, які першым сказаў цёплыя, усхваляваныя, шчырыя словы пра пісьменніка. Увесь час запісвала прамовы, здымала камерай група супрацоўнікаў нашага Беларускага тэлебачання. Праз некаторы час да Янкі Брыля падыходзіць некалькі чалавек з БТ і просяць сказаць для тэлебачання «пару слоў». «Дык што Вам сказаць? Я ж толькі што выступаў», — адказвае Іван Антонавіч. «А Вы паўтарыце тое, што казалі на могілках».— «Прабачце, але я не папугай, каб паўтараць адно і тое ж». Увечары ў «Панараме» дыктар тэлебачання пры паказе

адкрыцця помніка на магіле Алеся Адамовіча перaлічвае народных пісьменнікаў, якія там прысутнічалі: Васіль Быкаў, Рыгор Барадулін, Янка Маўр... Вось яна «высокая культура» нашага тэлебачання!

*1995 г.*

* * *

Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» арганізавала сустрэчу кіраўнікоў беларускіх суполак замежжа і сяброў Вялікай рады, на якой вельмі правільна сказаў мудры Янка Брыль — прыблізна так: «Мы ўсе добра ведаем, што павінны рабіць іншыя, а самі робім мала. Калі крытыкаваць, дык канкрэтна. Займаемся самаедствам, не ўмеем займацца чарнавой справай. Трэба не шукаць недахопы адзін у аднаго, а гуртам рабіць справу нацыянальнага адраджэння». Наконт агульнай цяжкай сітуацыі, на якую многія скардзіліся, ён, спаслаўшыся на народныя выказванні ў сваёй вёсцы і папрасіўшы прабачэння за грубыя словы, адзначыў: «Пережылі лета гарачае, пережывём і г... сабачае».

*1995 г.*

* * *

На дачы разбіраў лісты бацькоў. Яшчэ раз здзівілі гены, якія прырода выпрацавала за многія стагоддзі: гляджу на некаторыя татавы лісты і нават сам адразу не магу адрозніць, хто пісаў — ці Тата, ці я. І Дзімка — мой унук таксама заўважыў вялікае падабенства почыркаў.

Успомніў, як многа гадоў таму — мусіць, у сярэдзіне 50-х, я часта працаваў у бібліятэцы Аддзялення геалогіі АН СССР на Стараманетным завулку ў Маскве. Аднойчы падыходзіць да мяне незнаёмы мужчына і пытаецца:

— Вы Гарэцкі?

— Так.

— А я даўно прыглядаюся да вас і бачу, што сядзіць малады Гурык.

Аказалася, што гэта быў Сяргей Ждановіч — даўні сябра маіх бацькоў, які таксама, як і Тата, быў асуджаны па справе Працоўнай сялянскай партыі ў 1930 г. і высланы з Беларусі. З таго часу яны не бачыліся і не ведалі нічога адзін пра аднаго. Праз мяне яны зноў пачалі перапісвацца і сустракацца.

Гены ў спадчыну перадаюць не толькі аблічча, характар, звычкі некаторыя, але нават і почырк.

*1996 г.*

* * *

На першым сходзе «Белорусского профессорского собрания» не прагучала ніводнага слова па-беларуску. Сход прайшоў у старым стылі савецкай рэчаіснасці: «Одобрям-с». Такое ўраджанне, што як быццам

гэта зусім не 1996 год, — «машина часу» адкінула нас на гадоў 20 назад, зноў у самае «лепшае» грамадства — «развіты сацыялізм». Прэзідэнт РБ прапанаваў беларускім прафесарам «заключить сделку»: «Я вам дам льготы, которые вы просите (повысить зарплату, дать пенсию на том уровне, как ее получают полковники и т. д.), а вы правильно проголосуйте на референдуме». Цікава, ці многія прафесары клюнуць на гэтую прыманку?

*1996 г.*

* * *

Яшчэ крываточыць глыбокая рана, якую сэрца атрымала ад раптоўнай смерці аднаго з маіх лепшых вучняў і адданага сябра Уладзіміра Кажэнава (25 красавіка 1996 г.), як лёс нанёс новы нечаканы ўдар: а 7 гадзіне раніцы пазваніў мой калега па працы Раман Айзберг: «Ноччу памёр Эрык...» Э. А. Ляўкоў — адзін з таленавіцейшых геолагаў Беларусі, living разнабаковых зацікаўленасцяў чалавек, сапраўдны інтэлігент. Вялікая згуба! Нічога не хацелася рабіць, куды-небудзь ехаць — абыякавасць ахапіла ўсяго, легчы б і сумаваць, ды і ў самога нешта сэрца забалела. Але трэба! Мо ўнутраны прымус, абавязак перад грамадствам і ратуе нас. І пачаўся сапраўдны «жыццёвы меланж»: абмеркаванне колькасці месц і кандыдатур на будучыя выбары членаў АН Беларусі; клопат пра месца на могілках для Э. Ляўкова — Чыжоўка (там маці яго пахавана) ці Паўночныя; святкаванне 50-годдзя маёй памочніцы Ларысы Аляксандраўны Лецка; Вучоны савет геафака БДУ; адкрыццё Міжнароднага форуму «Улада і свабода слова» і г. д. Прымус, а затым жыццёвы меланж закручвае ў віхуры спраў, прымушае з нечым змагацца, адхіляе ад суму і гора, троху забыцца пра іх, — і зноў рухаешся, не паспяваючы адлічываць, як бяжыць такі шыбкі час...

*1996 г.*

* * *

Як кажуць, «Бог любіць тройцу»: у мінулым годзе памерлі У. Кажэнаў і Э. Ляўкоў, а ўжо 29 студзеня 1997 г. зноў непапраўная страта блізкага вучня і сябра — ад інсульта раптоўна памёр Косця Манкевіч, якога пахавалі на яго радзіме — вёсцы Ціханава Слабада. Успомнілася, як мы разам з бацькам любілі сюды прыязджаць па грыбы, і кожны раз сустрэча з гэтымі цудоўнымі мясцінамі прыносіла вялікую радасць, а спатканне і размовы з добрымі і сардэчнымі бацькай і маці Косці, з тутэйшымі вяскоўцамі, якія размаўлялі на прыгожай беларускай мове, былі такімі прыемнымі. Пра многіх з іх, якім давалі выразныя клічкі, Косця цікава апавядаў. Вось адзін з лепшых дамоў у Ціханавай Слабадзе — тут жыве Амерыканец, які з'ехаў у Амерыку, а потым вярнуўся на Бацькаўшчыну. Бліжэй да лесу хата Адзінока, — ён так моцна кахаў адну жанчыну, якая выйшла замуж за іншага і паехала з сям'ёй у

Польшчу, што так і застаўся адзін. Тут жыве Воўк — ён разам з сябрам пасвіў авечак, і на іх напаў воўк, якога сябра рукамі задушыў, а наш герой так напужаўся, што ўцёк, а потым бясконца ўсім хваліўся, як ён і яго сябра задушылі воўка. Як тады было радасна спаткацца з добра знаёмай вёскай, так сумна і балюча было прыводзіць сюды нашага дарагога Косцю ў апошні яго шлях на радзіму.

*1997 г.*

* * *

У газеце «Рэспубліка» прачытаў, што аўтар (слоў і музыкі) неафіцыйнага гімна Амерыкі «Боже, храні Амерыку» (1939) — Ізя Бейлін з Магілёва. У Амерыцы ён стаў Ірвінгам Берліным — каралём амерыканскай песні і пражыў 102 гады. Колькі беларуская зямля нарадзіла выдатных дзеячаў і творцаў не толькі з беларусаў, але і з габрэяў, і іншых нацыянальнасцей!

* * *

24 студзеня 1997 г. у галоўнай зале Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі праходзіла юбілейная сесія, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння былога прэзідэнта Акадэміі навук БССР Васілія Феафілавіча Купрэвіча. Адкрыў сесію намеснік старшыні Савета Міністраў РБ В. Русакевіч, з дакладамі выступілі прэзідэнт НАН Беларусі Л. М. Сушчэня і дырэктар Інстытута эксперыментальнай батанікі В. І. Парфёнаў. З вялікім здзіўленнем пачуў, што ўсе яны выступаюць на беларускай мове (нават Парфёнаў, ад якога я ніколі не чуў слова па-беларуску). Спытаўся ў галоўнага сакратара, у чым справа. Аказалася, што чамусьці быў такі загад з Адміністрацыі прэзідэнта РБ. Беларус вельмі шкадуе, калі ў гасцях не было прымусу, а карыстацца роднай мовай без прымусу нават вучоныя Нацыянальнай акадэміі навук не заўсёды здольныя.

*1997 г.*

* * *

Каля ўвахода ў будынак Вялікага тэатра оперы і балета, дзе праходзіў Першы з'езд беларусаў свету (1993), апынуліся за размовай Вітаўт Кіпель, Мая Кляшторная, Алеся Бабарэка, Ганна і Марыя Смоліч і я. Галя, мая жонка, зрабіла фота: «Дзеці нацдэмаў», ці «Дзеці Інбелкульта» — нашчадкі беларускіх адраджэнцаў, якія працавалі ў Інбелкульце. Пазней пад апошнім надпісам гэтае фота было змешчана ў кнізе «Першы з'езд беларусаў свету».

*1997 г.*

* * *

На Другім з'ездзе беларусаў краін Балтыі (верасень 1998 г.) быў Зянон Пазьняк, які прыйшоў праводзіць нашу групу ўдзельнікаў з Мінска. Мы з жартамі, вясёлыя садзіліся ў мікрааўтобус. Зянон — заўсёды такі мужны чалавек з цвёрдым характарам — падышоў да нас і з вялікім сумам у вочах ціхім хрыплаватым голасам, які крыху зрываўся і ў якім нават адчуваліся далёкія слёзы, сказаў: «Я нікому і ніколі не зайздросціў, а вось зараз усім вам моцна-моцна зайздрошчу — вы варочаецеся ў Менск, на радзіму. Мне так хацелася б быць з вамі, так дадзела быць у замежжы, так нуджуся па Бацькаўшчыне». Сумна-сумна паківаў нам галавою і памахаў рукою, усмяхнуўшыся з гаркотай на вуснах. Як цяжка жыць на чужыне, калі сэрца рвецца на Радзіму! Хлопцы ўсю дарогу без перапынку спявалі розныя песні, а я сядзеў моўчкі, і ўвесь час у вачах стаяла сумная адзінокая постаць Зянона, якая і дагэтуль не-не ды зноў у памяці маёй усплыве...

*1998 г.*

* * *

У пятніцу ішоў у інстытут на працу. Сустрэў некалькі знаёмых — яны такія змрочныя, сумныя, незадаволеныя, усё жаліліся на жыццё, агульныя падзеі, палітычную сітуацыю... Усё так, але...

Я крочыў па полю праз наш Музей валуноў, глядзеў на зялёны-зялёны лес удалечыні, разглядаў цудоўны ўзор бяроз, сасёнак, клёнаў зблізку, зноў, ужо каторы раз, дзівіўся валунам — сапраўдным маўклівым сведкам далёкай мінуўшчыны, жмурыўся ад яснага яркага сонейка, адпачываў вокам на блакітна-сінем небе з мудрагелістымі фігурамі хмарак і адчуваў, як некалі ў дзяцінстве, што «радасць прыгае ў грудзёх», быў удзячны лёсу і шчаслівы, што ў 70 год я яшчэ магу бачыць такія цуды прыроды...

*1999 г.*

* * *

10 красавіка 2000 г. у галоўнай канферэнц-зале Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адбылася канферэнцыя, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння майго бацькі — акадэміка Гаўрылы Іванавіча Гарэцкага.

Усе беларускія выступоўцы (А. П. Вайтовіч, В. С. Аношка, А. А. Махнач, А. В. Мацвееў, М. А. Барысевіч, Янка Брыль, Ніл Гілевіч, Анатоль Вярцінскі, Васіль Зуёнак, я) успаміналі Г. І. Гарэцкага вельмі цёплымі і шчырымі словамі, якія рабіліся яшчэ больш блізкімі і даходлівымі слухачам, бо ўсе яны гучалі на беларускай мове (у адносінах да гэтага вучонага, які на радзіме размаўляў толькі на сваёй прыгожай роднай мове, інакш і не магло быць). Мой сябра акадэмік Уладзімір Піліповіч пасля канферэнцыі, як мне здалося, з радасцю за сучасную нараду і жалем за ўсе іншыя — сказаў: «Ведаеш, я першы раз за ўвесь час

працы ў акадэміі адчуў, што сяджу ў зале сапраўды беларускай Акадэміі навук».

*2000 г.*

* * *

Трынаццаць гадоў таму, 20 лістапада 1988 года, памёр мой Тата — акадэмік Гаўрыла Гарэцкі. Амаль на Дзяды. У гэтыя дні памяць больш яскрава высвечвае яго аблічча, яго постаць, усё яго жыццё... А жыццё было такім складаным, такім нялёгкім, а нярэдка і трагічным. Як і многія беларускія інтэлігенты таго часу, ён прайшоў страшэнны гулагаўскі лабірынт сталінскага бальшавізму. Я заўсёды здзіўляўся мужнасці гэтых людзей. Што ім дапамагала перанесці ўсе тыя жудасныя пакуты і ўсё ж заставацца сапраўднымі добразычлівымі людзьмі з чыстымі душамі? Гэта — прага да жыцця, бязмежная любоў да сваёй Бацькаўшчыны, уменне знаходзіць задавальненне ў рознай, як разумовай, так і фізічнай, працы, а каму пашчасціла — вялікае каханне... Мы справядліва схіляем галовы перад мужнасцю, вернасцю, магутным каханнем дзекабрыстак. Але многія беларускія жанчыны — жонкі рэпрэсаваных «нацдэмаў» — перанеслі непараўнальна значна большыя пакуты, праявілі здзіўляючую мужнасць, адданасць сваім абраннікам. Да такіх гераінь належыць Ганна Іванаўна Бабарэка, Марыя Пятроўна Дубоўка, Аляксандра Ігнатаўна Смоліч, Леаніла Усцінаўна Чарняўская-Гарэцкая і інш. Такой была і мая любая маці — Ларыса Восіпаўна Парфяновіч-Гарэцкая. 8 ліпеня 1939 г. з турмы пасёлка Мядзведжая Гара (цэнтр будаўніцтва Беламорска-Балтыйскага канала) Гаўрылу (Гурыка, як яго звала маці і жонка) удалося перадаць ліст да жонкі, у якім выказаў сваё вялікае каханне да яе і які нейкім цудам захаваўся да нашага часу. Відаць, таму, што гэты арышт быў апошні і вобыскаў-ператрусаў болей не было. Ліст напісаны алоўкам дробнымі літарамі на маленечкіх папяросных лісточках, якія «Київ-поліграф» выпускаў пад назвай «розкурка» ў якасці «цигаровий папер». Гэты ліст я пад назваю «Ліст з турмы пра каханне» надрукаваў у газеце «Літаратура і мастацтва» 16 лістапада 2001 г.

*2001 г.*

* * *

Калі ў пачатку 90-х гадоў некаторыя супрацоўнікі (у тым ліку і я) прапаноўвалі надаць Акадэміі навук Беларусі статус Нацыянальнай, дык большасць успрымала гэта вельмі адмоўна і нават ваяўніча-варожа, бо слова «нацыянальны» ў свядомасці савецкіх людзей заўсёды несла негатыўнае адценне, як «нацыяналістычнае», як «нацыяналізм» (супрацьлеглы шырока рэкламаванаму прагрэсіўнаму «інтэрнацыяналізму»). З часам такое стаўленне да паняцця «нацыянальны» стала змяняцца, і ўсё больш вучоных пачалі падтрымліваць назву Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. Але адначасова разам са зменай уладаў, пасля выбараў

першага прэзідэнта і асабліва пасля ганебнага рэферэндуму 1996 г., калі дзяржаўнай была абвешчана не толькі беларуская, але і руская мова, усё менш пачала гучаць спачатку ў начальства афіцыйных колаў, а потым і ва ўсіх астатніх, роднае беларускае слова і калі, нарэшце, Акадэмію навук перайменавалі ў Нацыянальную, беларуская мова амаль знікла з ужывання ў акадэміі. Вось такі парадокс: чым больш гаворым «нацыянальная», тым менш гучыць мова беларуская, як быццам нацыянальная і мова не ходзяць поруч, а нешта супрацьлеглае. Відаць, такое магчыма толькі ў нас: «нацыянальнае на чужой мове».

*2001 г.*

* * *

У краінах Скандынавіі двух- і трохпавярховыя катэджы — галоўнае жыллё ў гарадах і вёсках. Вакол катэджаў невялікія чыста ўходжаныя ўтульныя зялёныя дворыкі з асобнымі дрэвамі ядлоўца, сосен, елачак ці нават кіпарысаў. Шырокія і вузкія веранды, вокны абстаўлены рознымі прыгожымі кветкамі. У дворыках таксама акуратныя кветнікі, іншы раз скульптуркі, хатачкі, млыночкі — спакойнае жыццё, ідылія...

На адной хаце над уваходам стаіць невялічкі ветрачок-флюгер, ад вярчэння якога два чалавечка круцяць ручку-калаўрот, — калі глядзіш, дык адразу незразумела, хто кім круціць, і здаецца, што чалавечкі круцяць ветрачок, але потым разумееш, што ўсё наадварот... Чалавечкі поўнасцю падобны да першага прэзідэнта адной дзяржавы ў цэнтры Еўропы, як быццам іх зрабіў не скандынаўскі жыхар, а нашы выдатныя мастакі, два Алеся — Пушкін і Мара. Так і ў той дзяржаве галоўны чалавечак думае, што ён круціць усёй «вертыкаллю» чыноўнікаў сваіх, усёй краінай, а другі раз яму здаецца, што і ўсім славянствам, усёй Расіяй і нават светам. Але калі прыгледзецца, дык няведама, ці так гэта...

*2002 г.*

* * *

Аднолькавым прафесійным прыёмам (непрыкметна тупым цвёрдым прадметам са спіны па галаве) каля сваіх дамоў увечары збілі шэраг «апазіцыйных» прадстаўнікоў інтэлігенцыі: Ю. Хашчавацкага, В.Мазынскага, А. Караля, А. Мальдзіса і інш. Падумаў: «Хто ж на чарзе?». Аказалася — я. 17 студзеня 2003 г. быў на пасяджэнні Аргкамітэта па падрыхтоўцы святкавання 25 Сакавіка, аб чым размаўляў з некалькімі людзьмі па тэлефоне. У 19.30 каля першага пад'езда нашага дома (а я жыў у 4-м пад'ездзе) атрымаў такі ж удар. У выніку, як засведчылі ўрачы «Хуткай дапамогі», а затым і неўрахірургі адпаведнага аддзялення бальніцы № 9, у мяне чэрапна-мазгавая траўма сярэдняй цяжкасці і страсенне мазгоў. У свядомасць пачаў прыходзіць толькі праз тры гадзіны. Следчы, які займаўся гэтай справай, сказаў: «Вось развялося розных бамжэй, беспрацоўных...» Я адказаў: «Не ведаў, што людзі

такой катэгорыі цяпер ездзяць на «Опеле!» (Як я пазней даведаўся, гэтую акцыю зрабілі два маладых здаровых хлопца, якія чакалі мяне на «Опеле» сіняга колеру.) Амаль праз 1,5 месяца, калі ўжо выпісаўся з бальніцы, сустрэў А. Мальдзіса, які з гумарам прывітаў мяне: «Віншую Вас з уключэннем у кагорту «недабіткаў»!»

*2003 г.*

* * *

Некалькі гадоў таму на агульным сходзе НАН Беларусі, у час перапынку, падышоў да мяне адзін фізік-тэхнік, салідны прафесар, доктар навук і спытаў: «Кажуць, вы родны пляменнік Максіма Гарэцкага?» Пасля майго станоўчага адказа дадаў: «Мне вельмі падабаюцца яго вершы». Значна пазней аналагічны паўтор атрымаўся ў першага прэзідэнта Беларусі, які ў перадачы «Глас народа» Расійскага тэлебачання НТВ сказаў, што ён «учился и воспитывался на стихах Василя Быкова».

*2003 г.*

* * *

Калі першы раз арыштавалі праф. Юрася Хадыку (красавік 1996 г.) за арганізацыю несанкцыянаванага мітынгу, большасць людзей была ўпэўнена, што гэта парушэнне Канстытуцыі і таму лічылі, што арыштавалі ні за што. Я таксама вельмі быў узрушаны такімі паводзінамі ўладаў, перажываў за Хадыку, асабліва пасля таго, як ён аб'явіў галадоўку. Я звярнуўся да прэзідыума АН Беларусі з прапановай выказаць пратэст сілавым структурам краіны за незаконны арышт нашага вядомага навукоўца доктара навук, прафесара, загадчыка лабараторыі Інстытута фізікі АН Беларусі, але ніхто мяне не падтрымаў, бо не хацелі выклікаць незадаволенасць уладаў, баяліся, што гэта адаб'ецца на іх адносінах да АН Беларусі, яе фінансаванні, а некаторыя члены прэзідыума нават падтрымлівалі такія дзеянні.

Цяпер, пасля 8-гадовага панавання прэзідэнцкай улады, настолькі ўжо прызвычаіліся да такіх арыштаў, што многія лічаць гэта амаль за нармальную з'яву і нават не заўважаюць, чаму на якім-небудзь мерапрыемстве апазіцыі не бачна таго ж Ю. Хадыку, і са здзіўленнем даведваюцца, што ён зноў сядзіць у СІЗО.

*2003 г.*

* * *

У Нарвегіі ёсць і ўрад з рознымі міністэрствамі, і парламент (стор-цінг), і нават кіраўнік дзяржавы — кароль, але ў асноўных адміністра-тыўных адзінках — камунах, галоўная ўлада, ад якой залежаць амаль усе жыццёвыя канкрэтныя праблемы жыхароў камуны, — гэта мясцовае самакіраванне. На чале такой мясцовай адміністрацыі раз у чатыры гады народам абіраюцца дэпутаты ў праўленне, якія добра ведаюць усе праблемы жыхароў і якіх добра ведае кожны жыхар камуны. У іх усе галоўныя атрыбуты ўлад: фінансы, падаткі, сацыяльная дапамога і г. д. Сістэма значна лепшая, чым наша «вертыкаль», якой круціць не заўсёды кампетэнтны ва ўсіх справах кіраўнік і якая лезе ва ўсе дзіркі нават малой вёскі і без якой нічога нельга зрабіць на месцах свайго асабістага і карыснага. У Каралеўстве дзейнічае добра распрацаванае заканадаўства згодна Канстытуцыі 1814 года (у тым ліку сацыяльная забеспячэнне). У выніку — няма крымінальных з'яў, няма жабракоў і бамжэй, няма галодных людзей.

*2003 г.*

* * *

Кіраўнік дзяржавы ўсё будуе Лядовыя палацы. Наш аэрапорт таксама стаў як «лядовы» палац. Асабліва адчуваеш гэта пасля пры-лёту з іншых аэрапортаў Еўропы, у якіх жыццё кіпіць. У нас жа ўсё замарожана. Гук самалёта адчуеш рэдка-рэдка, людзей амаль няма, а калі сустракаюцца, дык нейкія замаруджаныя, ходзіш па пустых вя-лікіх мармуравых залах, як у лядовай пячоры, — вось так адгукаецца палітычная сітуацыя ўкраіне.

*2003 г.*

* * *

У апошняе дзесяцігоддзе я згубіў шмат сваіх блізкіх, сяброў, калег, знаёмых — і старэйшых за мяне і маладзейшых — і разам з вялікім сумам у сэрцы ад гэтых непапраўных згуб яшчэ болыд шаную жыццё, кожную яго хвіліну, адчуваю яшчэ болыную радасць жыцця, бо жыць так цікава...

*2003 г.*

# ЗМЕСТ

## ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ, НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ, ДЭМАКРАТЫЯ, АДРАДЖЭННЕ


І ўсё ж мы рухаемся ... 3
Беларусь — багатая еўрапейская краіна ... 10
Мінеральныя рэсурсы Беларусі
Геалагічная будова тэрыторыі Беларусі ... 11
Якія карысныя выкапні вядомы даўно ... 12
Што вядома цяпер ... 14
Што можна чакаць у будучым? ... 17
Геалогія неабходная школе ... 18
На стыку навук ... 20
Што яшчэ трэба рабіць? ... 22
Мы хочам жыць дружалюбна з Расіяй, але незалежна ... 25
Большая часть белорусов хочет жить в независимом государстве ... 27
Незалежнасць Беларусі ... 28
Дваццатае стагоддзе сям'і Гарэцкіх ... 35
Радзім Гарэцкі: Я адказны за свой род і Беларусь ... 42
Беларусь і беларусы на мяжы тысячагоддзяў ... 47
Наша найвялікшая каштоўнасць ... 49
Зноў «Савецкі Саюз»? Немагчыма! ... 49
Ганебны ўціск усяго беларускага ... 51
Не, не ўсё яшчэ страчана ... 52
Ствараць беларускамоўнае асяроддзе ... 54
Моўная трагедыя беларускага народа ... 56
Твар беларускай інтэлігенцыі ... 59
Кантрасты дзесяцігоддзя ... 61
85-я ўгодкі БНР ... 64
Незалежнасць ... 65


## НАВУКА І ЯЕ ДЗЕЯЧЫ


Рэпрэсіі вучоных Беларускай акадэміі навук ... 69
Да юбілею Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ... 74
Акадэмічную навуку — у адміністратыўна-камандную труну? ... 77
Адам Бабарэка — выдатны беларускі адраджэнец
і літаратурны крытык ... 80
«Усё, што я рабіў у сваім жыцці,
я рабіў для маёй Радзімы і яе славы...» ... 81
Акадэмік Каныш Імантаевіч Сатпаеў —
выдатны сын казахскага народа ... 82
Известный геолог А. В. Македонов — видный литературовед ... 84
Акадэмік Андрэй Аляксеевіч Трафімук ... 85

Аляксандр Леанідавіч Яншын ........ 87
Дорогой мой учитель и друг ........ 89
Первая встреча ........ 89
На работу к А. Л. Яншину ........ 94
Первая совместная полевая экспедиция ........ 96
Защита докторской диссертации ........ 100
Встретились в названии одном ........ 102

ЖЫЦЦЁВЫ МЕЛАНЖ

*АБРАЗКІ*

Картина ........ 105
«Санки» ........ 106
Веснушчатая весна ........ 107
Удавчик ........ 108
Горе ........ 112
Птушка ........ 116
Чмель ........ 116
У край «шчаслівага» дзяцінства ........ 117
Жыццёвы меланж ........ 128

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Гарэцкі** Радзім Гаўрылавіч

**Вечна жыве Беларусь!**

*Артыкулы, інтэрв'ю, замалёўкі*

Рэдактар *Н. Давыдзенка*
Карэктар *Н. Аляксеева*
Камп'ютэрны набор *Т. Садоўскай*
Камп'ютэрная вёрстка *Л. Ваўчок*
Адказны за выпуск *Г. Вінярскі*

Падпісана да друку 28.11.2003 г. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Ум. друк. 7,56 арк.
Ул.-выд. 9,79 арк. Наклад 300 асоб. Зак. 2666.

МГА «Беларускі кнігазбор».
220034, Мінск, вул. Фрунзе, 5.
**Тэл./факс (017) 220-70-27.**
Ліцэнзія ЛВ № 105 ад 31.12.2002 г.

Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка
ў друкарні УП «Ходр» БелТІЗ.
220004, г. Мінск, вул. Вызвалення, 9.
ЛП № 91 ад 12.12.2002 г.